МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт»
факультэт машынабудаўнічы
кафедра гуманітарных навук

УЗГОДЗЕНА
Загадчык кафедрай
__________ Л.Ю.Малыхіна
«23» ____06____ 2023 г.

УЗГОДЗЕНА
Дэкан факультэта
__________ С.Р.Аныська
«23» ____06____ 2023 г.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

для студэнтаў усіх спецыяльнасцяў

Складальнікі: Л.Ю.Малыхіна – загадчык кафедрай гуманітарных навук установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
С.М.Васовіч – дацэнт кафедры гуманітарных навук установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
Н.М.Кавалёва – дацэнт кафедры гуманітарных навук установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
В.М.Кузьміч – дацэнт кафедры гуманітарных навук установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук.

Разгледзена і зацверджана на пасяджэнні навукова-метадычнага савета ўніверсітэта 23.06.2023 г., пратакол № 6.

ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска ………………………………………………………... 3
1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ
1.1. Вучэбныя дапаможнікі ………………………………………………... 6
1.2. Тэматычныя планы лекцый ………………………………………... 8
1.3. Канспект лекцый ………………………………………………………. 12
*Лекцыя 1.* Уводзіны ў дысцыпліну. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі ………………………………………………………... 12
*Лекцыя 2.* Вялікае Княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы ………………………………………………… 20
*Лекцыя 3.* Беларусь у складзе Расійскай імперыі ……………………….. 29
*Лекцыя 4.* Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917–1941 гг. …….. 42
*Лекцыя 5.* Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея найноўшай гісторыі ……………………………………………………………………….. 51
*Лекцыя 6.* Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР ……………. 63
*Лекцыя 7.* Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь …………… 71
*Лекцыя 8.* Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы …………………… 79
*Лекцыя 9.* Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь ………………………………... 87
*Лекцыя 10.* Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады ……………….. 93
*Лекцыя 11.* Заканадаўчая і судовая галіны ўлады ………………………. 104
*Лекцыя 12.* Рэгіёны Беларусі. Палітычныя партыі, грамадскія аб’яднанні ……………………………………………………………………….. 119
*Лекцыя 13.* Этнагенэз беларусаў . Народы і рэлігіі Беларусі …………… 129
*Лекцыя 14.* Дзяржаўныя сімвалы Беларусі ………………………………. 146
*Лекцыя 15.* Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі ……….. 151
*Лекцыя 16.* Беларусь у геапалітычнай прасторы ………………………… 161
2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
2.1. Тэматычныя планы практычных заняткаў …………..………..… 172
3. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ
3.1. Тэсты ……………………..…………………………………………….. 182
3.2. Пытанні да экзамену ………………………………………………... 193
4. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ
Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне …………………………... 197
Інфармацыйна-метадычнае забяспячэнне дысцыпліны ………………... 217

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК) па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” прызначаны для рэалізацыі на I ступені вышэйшай адукацыі ў рамках цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін для студэнтаў першых курсаў усіх спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі. Вывучэнне гэтай вучэбнай дысцыпліны арыентавана на фарміраванне ўстойлівых уяўленняў аб гістарычным мінулым і напрамках далейшага развіцця беларускай дзяржавы.

Характэрнымі рысамі навучальнай дысцыпліны з’яўляюцца яе міждысцыплінарнасць, акцэнт на канцэптуальныя веды па гісторыі развіцця дзяржаўных інстытутаў, неад’емныя атрыбуты беларускай дзяржаўнасці, фармаванне практыка-арыентаваных уменняў. Навучальная дысцыпліна адлюстроўвае сістэмны падыход да гісторыі фарміравання і развіцця розных этапаў беларускай дзяржаўнасці, іх эвалюцыю з улікам унутраных фактараў і глабальных працэсаў.

ЭВМК складзены з улікам вопыту выкладання курсаў “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” і “Паліталогія” сярод студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, згодна з вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” (рэг. № УД-22-1-144/уч.), напрацоўкамі айчынных вучоных.

У структуру ЭВМК уваходзяць: тэарэтычны і практычны разделы, раздзел кантролю ведаў і дапаможны раздзел, які ўключае вучэбна-праграмную дакументацыю.

У канспекце лекцый разглядаюцца асноўныя праблемы па кожнай тэме. У іх аснову пакладзены праблемна-храналагічны падыход, які дазваляе сканцэнтраваць увагу на найбольш значных гістарычных з'явах і праблемах беларускай дзяржаўнасці і выключыць дубліраванне школьнага курса гісторыі. Змест лекцыйных і практычных заняткаў нясе ў сабе значны ідэйнапалітычны патэнцыял. Практычны раздел уключае планы семінарскіх заняткаў па тэмах, якія патрабуюць замацавання тэарэтычных ведаў, атрыманых на лекцыях і ў выніку самастойнай работы над навучальным матэрыялам.

У разделе кантролю ведаў знаходзяцца тэсты по разделах і спіс экаменацыйных пытанняў па дысцыпліне. ЭВМК таксама дае магчымаць азнаёміцца з вучэбнай праграмай і інфармацыйна-метадычным забеспячэннем дысцыпліны.

Мэта навучальнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” – фармаванне абгрунтаванай патрыятычнай пазіцыі.

У рамках пастаўленай мэты ***задачы*** дысцыпліны складаюцца ў наступным:

– фармаванне сістэмы ведаў пра гісторыю беларускай дзяржаўнасці і развіццё ўменняў асэнсоўваць падзеі і з’явы рэчаіснасці ў цеснай узаемасувязі з мінулым, сучаснасцю і будучыняй;

– стварэнне ўстойлівага ўяўлення аб гістарычным шляху і мэтах далейшага развіцця беларускай дзяржавы;

– развіццё навыкаў аргументавана і дакладна фармуляваць сваю пазіцыю па актуальных пытаннях палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сфер.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны навучэнец павінен:

***ведаць***:

– метадалагічныя асновы і перыядызацыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці;

– ключавыя катэгорыі, звязаныя з гісторыяй і дзяржаўным будаўніцтвам Рэспублікі Беларусь;

– характарыстыкі канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

– этапы фармавання беларускай нацыі;

– гістарычныя і сучасныя характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі;

***ўмець***:

– фармуляваць і аргументаваць асноўныя ідэі і каштоўнасці беларускай мадэлі развіцця;

– прымяняць атрыманыя веды ў практычнай вучэбнай і прафесійнай сферах;

– характарызаваць атрыбутыўныя рысы беларускай нацыі;

– аналізаваць асноўныя факты і падзеі ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці, даваць ім адзнаку;

***валодаць***:

– базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– сістэмным і параўнальным аналізам;

– даследчымі навыкамі;

– міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

Агульныя патрабаванні да фарміравання ўніверсальных кампетэнцый выпускніка вызначаюцца наступнымі прынцыпамі:

1) *гуманізацыі* як прыярытэтнага прынцыпу адукацыі, які забяспечвае асобасна-арыентаваны характар адукацыйнага працэсу і творчую самарэалізацыю выпускніка;

2) *фундаментальнасці*, якая спрыяе арыентацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу на выяўленне сутнасных падстаў і сувязяў паміж разнастайнымі працэсамі навакольнага свету, натуральнымі і гуманітарнымі ведамі;

3) *кампетэнтнаснага падыходу*, які фарміруе сістэму патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраваных на павышэнне ролі самастойнай працы студэнтаў, які мадэлюе сацыяльна-прафесійныя праблемы і шляхі іх вырашэння, што забяспечвае фарміраванне ў выпускнікоў умення дзейнічаць у зменлівых жыццёвых абставінах;

4) *сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі*, заснаванай на адзінстве духоўнасці, грамадзянскасці і сацыяльнай актыўнасці асобы, якая ўсведамляе сваю

непарыўнасць з мінулым, сучаснасцю і будучыняй Беларусі і дзейнічае ў інтарэсах яе развіцця і абароны;

5) *міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці* сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, рэалізацыя якога забяспечвае цэласнасць вывучэння гуманітарных ведаў і яго ўзаемасувязь з сацыяльным кантэкстам будучай прафесійнай дзейнасці выпускніка.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" павінна забяспечыць фарміраванне наступных універсальных кампетэнцый:

– умець аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей, асоб, артэфактаў і сімвалаў для сучаснай беларускай дзяржаўнасці;

– валодаць такімі асобаснымі якасцямі як патрыятызм і грамадзянскасць;
– быць здольным фармаваць свой уласны пункт гледжання на які вывучаецца працэс (з'ява);

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці" разлічана на 108 гадзін, з іх 50 аўдыторных. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 34 гадзіны, семінарскія заняткі – 16 гадзін. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

У якасці формы бягучай атэстацыі прадугледжваецца экзамен.

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ

## 1.1. Вучэбныя дапаможнікі




**Гісторыя беларускай дзяржаўнасці** : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.




**Гісторыя Беларусі : У 6 т.** / Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2011:

Т. 1. Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с. http://adverbum.org/b-hb1.htm

Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]; рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 688 с. http://adverbum.org/b-hb2.htm

Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII – XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2004. – 344 с. http://adverbum.org/b-hb3.htm

Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М.В. Біч [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – 519 с. http://adverbum.org/b-hb4

Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с. http://adverbum.org/b-hb5

Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.

## 1.2. Тэматычныя планы лекцый

Раздзел 1.1.1. **Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці**

Тэма 1.1.1.1. **Увядзенне ў навучальную дысцыпліну** (1 гадзіна)

Дзяржава як асноўны палітычны інстытут. Паняцце дзяржаўнасці. Незалежнасць і суверэнітэт. Нацыя і дзяржава. Этапы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Крыніцы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Тэма 1.1.1.2. **Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі** (1 гадзіна)

Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях. Старажытная Русь. Агульныя рысы і асаблівасці развіцця Полацкага і Тураўскага княстваў. Вадохрышча Русі як фактар цывілізацыйнага выбару. Феадальная раздробленасць. Месца ўсходнеславянскіх земляў у сістэме сярэднявечных міжнародных адносін.

Тэма 1.1.1.3. **Вялікае княства Літоўскае - поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы** (2 гадзіны)

Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўзнікнення ВКЛ. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Аб'яднанне беларускіх земляў у складзе ВКЛ. Барацьба за аб'яднанне Русі. Адносіны з Ордэнам і Залатой Ардой. Роля беларускіх земляў у ВКЛ. Крэўская унія і вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў. Магдэбургскае права.

Прававое і палітычнае значэнне Люблінскай уніі. Становішча беларускіх земляў у складзе Рэчы Паспалітай. Паланізацыя як фактар палітычнага, культурнага і грамадскага жыцця. "Шляхецкая дэмакратыя" і яе ўплыў на развіццё дзяржавы. Адносіны з суседзямі і аслабленне Рэчы Паспалітай.

Тэма 1.1.1.4. **Беларусь у складзе Расійскай імперыі** (2 гадзіны)

Раздзелы Рэчы Паспалітай. Русіфікацыя і дэпаланізацыя. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст. Паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі. Эканамічнае развіццё беларускіх земляў. Заходнерусізм і краявасць. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Часопіс "Гоман" і дзейнасць беларускіх народнікаў. Рэвалюцыйныя падзеі 1905-1907 гг. у Беларусі. “Наша ніва” і беларуская нацыянальная ідэя на пачатку XX ст.

Тэма 1.1.1.5. **Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917-1941 гг.** (2 гадзіны)

Першая сусветная вайна на беларускіх землях. Актывізацыя нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне. Усебеларускі з'езд 1917 г. Абвяшчэнне БНР. Белнацкім і

яго роля ў стварэнні ССРБ. ЛітБелССР. Польска-савецкая вайна і другое абвяшчэнне ССРБ. Падпісанне Рыжскай мірнай дамовы і яе наступствы для беларускай дзяржаўнасці. Фарміраванне Саюза савецкіх сацыялістычных рэспублік (СССР). Рэалізацыя нацыянальна-дзяржаўнай мадэлі развіцця. Стварэнне індустрыяльна-аграрнай рэспублікі. Фарміраванне межаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад БССР у 1919–1939 гг. Супярэчнасці развіцця сацыяльна-культурнай сферы ў 1930-я гг. у БССР. Дасягненні і трагедыі савецкай эпохі.

Тэма 1.1.1.6. **Вялікая Айчынная вайна - ключавая падзея найноўшай гісторыі** (2 гадзіны)

Прычыны Другой сусветнай вайны Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Напад нацысцкай Германіі на СССР. Акупацыйны рэжым у Беларусі. Нямецка-фашысцкі генацыд і дэмаграфічныя страты Беларусі ў вайне. Халакост. Размах і значэнне партызанскага і падпольнага руху ў Беларусі. Удзел беларусаў у ключавых бітвах Вялікай Айчыннай вайны. Вызваленне Беларусі. Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён". Уклад беларускага народа ў Перамогу. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў.

Тэма 1.1.1.7. **Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР** (2 гадзіны)

БССР – краіна-заснавальніца ААН. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. Нарастанне застойных з'яў у 1970-я – першай палове 1980-х гг. Грамадска-палітычныя працэсы ў БССР на мяжы 80–90-х гг. XX ст.

Тэма 1.1.1.8. **Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь** (2 гадзіны)

Распад СССР і яго прычыны. Палітычны і гаспадарчы крызіс першых год незалежнасці. Прыняцце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гадоў і іх уплыў на стабілізацыю абстаноўкі ў краіне. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця ў пачатку XXI ст. Сучасныя дасягненні беларускай дзяржавы.

Раздзел 1.1.2. **Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь**

Тэма 1.1.2.1. **Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы** (2 гадзіны)

Фарміраванне прававых традыцый у Беларусі. "Руская праўда" і Статуты ВКЛ. Савецкія канстытуцыі 1919, 1927, 1937, 1978 гадоў. Значэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце 27 ліпеня 1990 г. Прызнанне прынцыпаў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. і характар унесеных у яе змен. Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі як найвышэйшая каштоўнасць і мэта грамадства і дзяржавы, абвешчаная Канстытуцыяй. Іерархія нарматыўна-прававых актаў.

Тэма 1.1.2.2. **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
(2 гадзіны)

Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі. Асаблівасці манархічнай формы праўлення ў гістарычнай рэтраспектыве. Спецыфіка арганізацыі вышэйшага кіраўніцтва краіны за савецкім часам. Прэзідэнцкая рэспубліка – выбар беларускага народа. Парадак выбараў Прэзідэнта. Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы як гаранта захавання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян. Прэзідэнт – Галоўнакамандуючы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Тэма 1.1.2.3. **Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады**
(2 гадзіны)

Гістарычныя формы выканаўчай улады ў Беларусі. Чыны княжай адміністрацыі ў Старажытнай Русі. Асноўныя службовыя асобы цэнтральнага апарата ў ВКЛ. З'яўленне міністэрскай формы арганізацыі выканаўчай улады. Беларусы на вышэйшых дзяржаўных пасадах у Расійскай імперыі. Савет Народных Камісараў і далейшае развіццё выканаўчай улады ў савецкі час. Функцыі і задачы сучаснага ўрада. Структура Урада Рэспублікі Беларусь. Прэм'ер-міністр.

Тэма 1.1.2.4. **Заканадаўчая і судовая галіны ўлады**
(2 гадзіны)

Перадпарламенцкія формы прадстаўніцтва: веча і сеймы. Беларускія дэпутаты ў Дзяржаўных Думах Расійскай імперыі. Савецкая форма народнага прадстаўніцтва: ЦВК і Вярхоўны Савет. Нацыянальны сход - двухпалатны парламент у суверэннай Беларусі. Структура і функцыі Рады Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў.

Гістарычныя формы судовых органаў у айчыннай гісторыі. Віды і паўнамоцтвы сучасных судоў у Рэспубліцы Беларусь. Вярхоўны і Канстытуцыйны суды. Парадак падбору і прызначэнні суддзяў.

Тэма 1.1.2.5. **Рэгіёны Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні** (2 гадзіны)

Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення на беларускіх землях: удзельныя княствы, ваяводствы і паветы, губерні, паветы, воласці, раёны, акругі, вобласці. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь. Функцыі і паўнамоцтвы мясцовага кіравання і самакіравання.

Гістарычная рэтраспектыва развіцця палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі. Пераход ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнасці. Нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб'яднанняў. Тыпалагізацыя палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь.

Раздзел 1.1.3. **Беларусь на мяжы культур і цывілізацый**

Тэма 1.1.3.1. **Этнагенез беларусаў і паходжанне назвы "Беларусь". Народы і рэлігіі Беларусі** (2 гадзіны)

Асноўныя гіпотэзы аб паходжанні беларусаў. Этапы фармавання беларускай нацыі. Фактары, якія паўплывалі на генезіс і далейшае развіццё. Беларусы ў свеце, дыяспара. Белая Русь – Беларусь – Беларусь. Версіі паходжання назвы. Моўная палітыка. Білінгвізм – характэрная рыса сучаснай беларускай нацыі. Гістарычныя прыклады двухмоўя. Гісторыя фармавання асноўных этнічных груп у Беларусі.

Этнічны склад сучаснай Беларусі. Кароткая гісторыя канфесій у Беларусі. Канфесійны склад насельніцтва. Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў канфесійнай сферы.

Тэма 1.1.3.2. **Дзяржаўныя сімвалы Беларусі** (2 гадзіны)

Значэнне Гімна, Герба і Сцяга для дзяржаўнасці. Гістарычная сімволіка на беларускіх землях. Варыятыўнасць сімволікі ў іншых краінах. Гісторыя і сімвалічнае значэнне Дзяржаўнага Сцяга. Дзяржаўны Герб і яго сэнсавая трактоўка. Дзяржаўны Гімн - музычнае адлюстраванне дзяржаўнай традыцыі.

Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь і іх значэнне.

Тэма 1.1.3.3. **Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі** (2 гадзіны)

Перадумовы фармавання беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Асноўныя чыннікі сучаснага эканамічнага развіцця Беларусі. Дзяржава для народа – галоўны прынцып айчыннай сацыяльна-эканамічнай мадэлі. Усебеларускія народныя сходы. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Асноўныя паказнікі развіцця айчыннай эканомікі.

Тэма 1.1.3.4. **Беларусь у геапалітычнай прасторы** (4 гадзіны)

Геапалітычны фактар фармавання беларускай дзяржаўнасці. Характарыстыка сучаснага геапалітычнага становішча Беларусі. Шматвектарнасць знешняй палітыкі. Расія і Кітай – стратэгічныя партнёры Беларусі. Блізкая і далёкая дуга міжнародных адносін. Беларусь у інтэграцыйных супольнасцях. Саюзная дзяржава Расіі і Беларусі.

РАЗАМ – 34 гадзіны

## 1.3. Канспект лекцый

### Раздзел 1 **Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці**

### *Лекцыя 1.* Уводзіны ў дысцыпліну. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі

#### 1. Дзяржава як асноўны палітычны інстытут

Вывучэнне гісторыі дзяржаўнасці не зусім тоесна гісторыі краіны ўвогуле. Дзяржаўнасць як з’ява дае магчымась прасачыць эвалюцыю агульнай культуры народа, усвядоміць яго месца на палітычнай карце свету, абагульніць палітычныя працэсы ў гістарычнай рэтраспектыве. І галоўнае – звязаць сучасныя інстытуты і з’явы палітычнага жыцця з іх вытокамі, паказаць узаемасувязь развіцця Рэспублікі Беларусь з гістарычнымі папярэднікамі.

У агульнапрынятым разуменні пад дзяржавай трэба разумець пэўную форму арганізацыі грамадства, палітычную сістэму на вызначанай тэрыторыі, якая мае прававыя характарыстыкі выкарыстання ўлады. Чалавецтва стагоддзямі разважала над тым, чаму і як узнікла дзяржава як феномен узаемадзеяння людзей. Адной з першых узнікла крэацэанісцкая канцэпцыя паходжання дзяржавы. Гэта значыць, што паводле ўяўленняў яе прыхільнікаў дзяржава была створана звышнатуральнымі сіламі (багамі, духамі, героямі і г.д.). Напрыклад, першабытныя плямёны звязвалі ўтварэнне протадзяржаў са сваімі татэмамі, звычайна жывёламі, адкуль і ўзнікалі пачатковыя сімвалы.

Старажытныя грэкі лічылі, што дзяржава – вынік барацьбы і дамоўленасці алімпійскіх багоў. Платон даводзіў думку, што менавіта рысы характару, асабістыя якасці багоў вызначалі тып дзяржаўнага кіравання. У Сярэднявеччы, пасля таго, як хрысціянства стала ў Еўропе дзяржаўнай рэлігіяй, была распрацавана дэталёвая канцэпцыя дзяржавы. Паводле Аўрэлія Аўгусціна, любая дзяржава – прадукт Божаскай волі. У дзяржаве могуць спалучацца як божаскія, так і чалавечыя памкненні.

У антычнасці зарадзіліся таксама і натуральна-прававыя (дагаворныя) вучэнні аб паходжанні дзяржавы. Яшчэ антычныя сафісты Эпікур і Гіпій лічылі, што ўзнікненне дзяржавы стала магчымым дзякуючы натуральнаму развіццю адносін паміж людзьмі, якія дамовіліся заснаваць пэўныя рэгулюючыя інстытуты. Аднак найвышэйшае развіццё гэта тэорыя атрымала ў Новы час, найперш у працах Томаса Гоббса, Джона Локка і Жан-Жака Русо. Менавіта яны стварылі тэорыю гэтак званага “грамадскага дагавора”. Іншымі словамі, менавіта праз дамоўленасць аб стварэнні дзяржавы і абмежаванні ўласных правоў людзі выйшлі з натуральнага стану і “вайны ўсіх супраць ўсіх”, каб забяспечыць уласную і грамадскую бяспеку.

Таксама ў антычнасці ўзнікла арганічная тэорыя паходжання дзяржавы. Напрыклад, Арыстоцель меркаваў, што дзяржава нагадвае чалавечы арганізм, з’яўляецца арганічнай часткай чалавечага існавання. Ён лічыў, што чалавечая

істота ўвогуле не можа існаваць па-за дзяржавай. Самога чалавека ён называў жывёлай, але палітычнай жывёлай: менавіта наяўнасць такога інстытута як дзяржава вылучала чалавека з навакольнага дзікага свету.

З'яўленне эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна ў XIX ст. дало новы моцны імпульс развагам пра арганічны характар дзяржавы. Англійскі сацыёлаг Г. Спенсэр лічыў дзяржаву грамадскім арганізмам. Як у жывёльным свеце адбываецца барацьба за выжыванне, так і дзяржава з'яўляецца прадуктам арганічнай эвалюцыі. А ў гэтай барацьбе выжывае найбольш моцны.

Марксісты лічылі дзяржаву інструментам падаўленя эксплуататарамі падпарадкаваных слаёў насельніцтва. У. Ленін пісаў, што "дзяржава – гэта ёсць машына для падтрымання панавання аднаго класа над другім". Прыхільнікі гэтага падыходу даводзяць, што існавала тры тыпы эксплуататарскай дзяржавы: рабаўладальніцкая, феадальная і буржуазная. Першапачаткова марксісцкая тэорыя прадугледжвала, што пасля рэвалюцыі адбудзецца адміранне дзяржавы, знікнуць усе палітычныя інстытуты. Аднак потым марксісты прыйшлі да высновы аб існаванні ў якасці пераходнага этапа сацыялістычнай дзяржавы як палітычнай арганізацыі працоўнай большасці на чале з рабочым класам для будаўніцтва сацыялізму і камунізму.

У сучасным разуменні дзяржава павінна валодаць шэрагам прыкмет, якія дазваляюць вызначаць дзяржаву як асноўны палітычны інстытут. Важна памятаць, што менавіта дзяржава валодае ўнікальнай манаполіяй – на легальнае ўжыванне насілля. Гэта значыць, што толькі гэты палітычны інстытут можа прымусіць грамадзяніна да тых ці іншых дзеянняў, можа не толькі абараняць, але і абмяжоўваць правы і свабоды. Менавіта ён стварае і выкарыстоўвае рэпрэсіўны апарат, вызначае межы яго дзейнасці. Аднак тут важна памятаць пра меру ўжывання насілля

Сярод прыкмет дзяржавы можна вылучыць наступныя:

1) *наяўнасць тэрытарыяльнай еднасці*. Дзяржаўная ўлада распаўсюджваецца ў межах пэўнай тэрыторыі і на асоб, якія пражываюць на гэтай тэрыторыі;

2) *публічная ўлада*. Яна ўвасабляецца ў спецыфічных дзяржаўных органах, што дазваляе акрэсліць яе менавіта як дзяржаўную ўладу, якую ажыццяўляе асобная катэгорыя людзей, якія складаюць апарат дзяржавы. Дзяржаўная ўлада распрацоўвае і выдае абавязковыя для выканання акты, адсочвае іх ужыванне і мае права на прымяненне разнастайных санкцый;

3) *заканадаўчая манаполія*. Толькі правілы, што ўводзяцца дзяржавай, маюць статус законаў, гэта значыць найвышэйшых прававых актаў, абавязковых для выканання. Увогуле, дзяржава не можа існаваць без права, бо менавіта яно робіць уладу легітымнай і вызначае парадак адносін з насельніцтвам і іншымі інстытутамі палітыкі;

4) *легальная сістэма спагнання сродкаў*. Звычайна гэта падаткі, а таксама іншыя сборы (мыта, акцызы і іншыя), якія дазваляюць утрымліваць дзяржаву і яе апарат;

5) *дзяржаўны суверэнітэт*. У палітычнай сістэме грамадства не можа існаваць інстытут, які стаіць над дзяржавай. Яна увасабляе вяршэнства ўлады, стаіць наверсе палітычнай піраміды.

## 2. Незалежнасць і суверэнітэт. Нацыя і дзяржава

Незалежнасць і суверэнітэт з'яўляюцца неад'емнымі атрыбутамі дзяржавы, тымі катэгорыямі, якія вызначаюць статус краіны ў свеце. Але гэта не зусім тоесныя паняцці. Незалежнасць ёсць фармальна прадэклараваная непадпарадкавальнасць адной дзяржавы другой. У сваю чаргу, *суверэнітэт* – гэта права і магчымасць дзяржавы абараняць свае інтарэсы, правы і свабоды грамадзян на вызначанай тэрыторыі ў адпаведнасці з міжнароднымі законамі і нацыянальным заканадаўствам.

Суверэнітэт можа адрозніваецца па ступені свайго дзеяння. Мала якая дзяржава валодае абсалютным, поўным суверэнітэтам. Часта суверэнітэт бывае абмежаваным. Так адбываецца, калі дзяржава ўваходзіць у нейкі саюз дзяржаў, канфедэрацыю, а ў асобных выпадках і федэрацыю. Напрыклад, абмежаваным суверэнітэтам валодала БССР у межах СССР. Суверэнітэт (альбо яго частку) можна дэлегаваць. Так адбываецца, напрыклад, у краінах Еўрапейскага саюза, якія дэлегавалі частку свайго суверэнітэта наднацыянальным саюзным органам. Зараз у Арганізацыю Аб'яднанных Нацый уваходзіць 193 дзяржавы і 3 дзяржавы-назіральніцы. Але далёка не ўсе з іх з'яўляюцца нават фармальна незалежнымі, і яны моцна адрозніваюцца па ўзроўню свайго суверэнітэту. Існуюць дзяржавы, поўнасцю прызнаныя ў свеце, якія ўваходзяць у склад ААН. Яны з'яўляюцца незалежнымі і валодаюць поўным суверэнітэтам. Рэспубліка Беларусь адносіцца менавіта да такога тыпу дзяржаў.

Асобную катэгорыю ствараюць былыя дамініёны Брытанскай імперыі, а зараз гэтак званыя Каралеўствы Садружнасці (Канада, Аўстралія, Новая Зеландыя і інш.), афіцыйным кіраўніком якіх з'яўляецца англійская каралева. Таксама ёсць некаторыя дзяржавы, што дэлегавалі частку сваіх знешнепалітычных і абаронных паўнамоцтваў ЗША. Існуе і такая форма дзяржаўнага ўтварэння, як асацыяваныя дзяржавы. Напрыклад, Пуэрта-Рыка з ЗША, Ніуэ і Астравы Кука – з Новай Зеландыяй. Да нашага часу захоўваецца і вялікая колькасць залежных тэрыторый. Імі валодаюць Вялікабрытанія, Францыя, ЗША, Нідэрланды, Данія, Аўстралія і Новая Зеландыя. У свеце налічваецца амаль паўтара дзесятка дзяржаў, што існуюць фактычна, але не прызнаныя альбо часткова прызнаныя. Вакол іх статусу вядзецца вялікая міжнародная дыскусія, і яны выступаюць у якасці аб'екта напружання.

Тэрмін "дзяржава" ў сучасным разуменні гэтага слова з'явіўся ў Еўропе (Заходняй і Усходняй амаль адначасова) дастаткова позна – прыкладна ў XVI ст. У той жа перыяд пачынае ўжывацца і слова "нацыя" як сінонім слова "народ", але у значэнні палітычнай супольнасці. У 1512 г. саюз нямецкіх дзяржаў пад вярхоўнай уладай германскага імператара стаў афіцыйна называцца "Свяшчэнная Рымская імперыя германскай нацыі". А ў 1520 г. пачынальнік Рэфармацыі Марцін Лютэр звярнуўся да "хрысціянскага

дваранства нямецкай нацыі”. Больш распаўсюджаным гэты тэрмін стаў у эпоху Асветніцтва, асабліва падчас Вялікай Французскай рэвалюцыі XVIII ст. Увогуле ж лацінскае слова “natio” азначае сукупнасць людзей, аб’яднаных агульным паходжаннем, найперш племянным альбо тэрытарыяльным.

У сучаснай навуковай літаратуры маюцца два разуменні нацыі. Па-першае, нацыя мысліцца як натуральная супольнасць людзей, заснаваная на агульнасці паходжання, этнічных, гістарычных і культурных асаблівасцей. У такім разуменні нацыя не з’яўляецца палітычным утварэннем, не ўтрымлівае мэты, хоць і мае пакліканне, якое гістарычна валодае стыхійнымі магчымасцямі самараскрыцця. Па-другое, нацыяй называецца культурнае і палітычнае грамадства, якое склалася гістарычна, вышэйшая форма цывілізаванага адзінства людзей. Нацыя ў дадзеным сэнсе валодае арганізацыяй, структурамі ўлады, мэтай, грамадзянскай згодай.

Паняцце нацыянальнай дзяржавы суадносіцца з другім з пазначаных сэнсаў паняцця нацыі. Дзяржава не зводзіцца да нацыі як натуральнай супольнасці, заснаванай на прынцыпе нацыянальнасці. Варта мець на ўвазе, што гістарычна не нацыя першасная ў адносінах да дзяржавы, а дзяржава ў адносінах да нацыі.

### 3. Этапы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці

Пытанне аб характары паходжання беларускай дзяржаўнасці застаецца дыскусійным ў гістарчнай навуцы. Часам навукоўцы займаюць дыяметральна процілеглыя пазіцыі ў поглядах на падзеі, асоб айчыннай гісторыі і сучаснасці. Больш простая задача тычыцца вызначэння перыядызацыі станаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях.

Першы этап трэба вызначыць як дадзяржаўны. Гэта час прыкладна з V да пачатку IX ст., калі на беларускіх землях ішоў актыўны працэс утварэння племянных саюзаў.

Другі этап традыцыйна называюць старажытнарускім. Першая вядомая дата айчыннай дзяржаўнасці – 862 г., калі жыхары Полацка прынялі ўдзел у закліканні варагаў на кіраванне ў “Паўночнай канфедэрацыі плямён”. Гэты перыяд ахоплівае як існаванне Старажытнай Русі, альбо “імперыі Рурыкавічаў”, так і абасабленне княстваў, ў тым ліку Полацкага.

Трэці перыяд – утварэнне і існаванне Вялікага Княства Літоўскага як незалежнай поліэтнічнай дзяржавы. Ён ахоплівае час з сярэдзіны XIII ст. да 1569 г.

Чацвёрты этап – уваходжанне ВКЛ ў склад польска-літоўскай дзяржавы, вядомай як першая Рэч Паспалітая Абодвух Народаў. Ён пачынаецца з Люблінскай уніі 1569 г. і працягваецца да трох падзелаў гэтай дзяржавы ў 1772, 1793 і 1795 гг.

Пяты этап – знаходжанне беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі. Храналагічна ён працягнуўся з канца XVIII ст. да 1917 г.

Шосты – гэта савецкі перыяд, што цягнуўся (з пэўнымі перапынкамі) да 1991 г.

Сёмы – абвяшчэнне і існаванне незалежнай і суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым у гісторыі Беларусі можна вызначыць два асобныя перыяды, непрацяглыя па часу, але лёсавызначальныя для дзяржаўнасці краіны. Першы з іх – рэвалюцыйныя падзеі 1917 – пачатку 1918 гг. Тады афармілася магчымасць развіцця падзей як па савецкаму шляху, так і па альтэрнатыўным. Апошні найбольш яскрава ўвасобіўся ў выглядзе Беларускай Народнай Рэспублікі. Яна хоць і не стала поўнавартаснай дзяржавай, але непрацяглы час з’яўлялася пэўным грамадска-палітычным аб’яднаннем.

Другі асобны перыяд – Вялікая Айчынная вайна (1941 – 1945 гг.). У гэты час тэрыторыя Беларусі апынулася пад акупацыяй нацысцкай Германіі. Захопнікі ставілі мэтай поўнае знішчэнне беларускай нацыі. Беларускі народ праявіў лепшыя якасці і масавы гераізм у барацьбе за вызваленне. Нездарма Дзень Незалежнасці ў Беларусі адзначаецца менавіта 3 ліпеня – дзень, калі Мінск быў вызвалены ад акупантаў.

## 4. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі

Асновы дзяржаўнасці ў нашых продкаў узніклі яшчэ да ўтварэння Кіеўскай Русі. Дзяржаве ўсходніх славян, якую ў навуковай літаратуры прынята называць Старажытнарускай дзяржавай, або Кіеўскай Руссю папярэднічалі фераддзяржаўныя ўтварэнні. Гісторыкі называюць іх “Паўночнай канфедэрацыяй плямёнаў”. У “Аповесці мінулых гадоў” паведамляецца, што паляне, драўляне, дрыгавічы, палачане, славене, радзімічы мелі свае племянныя “княжанні”– прамежкавыя стадыі паміж саюзам плямёнаў і дзяржавай.

З сярэдзіны VIII ст. адзначаецца пранікненне скандынаваў (або нарманаў) ва Усходнюю Еўропу. У летапісе паведамляецца аб добраахвотным запрашэнні “Паўночнай канфедэрацыяй плямёнаў” у 862 г. уладара з варагаў-русі – князя Рурыка. Аб’яднанне Поўначы і Поўдня згодна з данымі “Аповесці мінулых гадоў” адбылося ў 882 г. намаганнямі князя Алега, які ў 879 г. атрымаў уладу пасля Рурыка ў “Паўночнай канфедэрацыі плямёнаў”.

Першымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на тэрыторыі сучаснай Беларусі былі Полацкая і Тураўская землі. Недзе на мяжы VIII–IX стст. вакол Полацка пачало складвацца аб’яднанне крывічоў, якое ў далейшым сфарміравалася ў самастойную тэрытарыяльную, палітычную, эканамічную адзінку. Асаблівасцю Полацкага княжання была поліэтнічнасць яго насельніцтва (крывічы, дрыгавічы, рэшткі балцкіх, а напаўночным усходзе і фіна-угорскіх плямёнаў). Княжаннем крывічоў Полацкая зямля была толькі ў тым сэнсе, што вышэйшая ўлада (княжацкая дынастыя) была ў ёй крывіцкага паходжання. Пад тэрмінам палачане трэба мець на ўвазе сукупнасць усяго насельніцтва Полацкай зямлі.

Сваім раннім узнікненнем і інтэнсіўным развіццём Полацкая зямля абавязана водным гандлёвым шляхам, што звязвалі Паўднёвую Русь, Візантыю і арабскі Усход з Паўночнай Руссю, Прыбалтыкай і Скандынавіяй. Першай

жыццёвай артэрыяй Полацкага княства стала Заходняя Дзвіна. Яна ж вызначыла і кірунак яго гістарычнага развіцця і першапачатковую накіраванасць яго дзяржаўных інтарэсаў, а разам з тым іяго асобнасць.

Рост Полацкай тэрыторыі больш-менш бесперашкодна ішоў да сярэдзіны IX ст. разам з рассяленнем крывічоў. У IX ст. гэты племянны цэнтр сканцэнтраваў вакол сябе вялікую тэрыторыю і стаў адным з важнейшых дзяржаваўтваральных цэнтраў Усходняй Еўропы. Паводле сучаснага адміністрацыйнага падзелу ў склад Полацкай зямлі ўваходзілі сучасная Віцебская вобласць і паўночная палова Мінскай. Да пачатку XIII ст. пад яе пратэктаратам знаходзілася ніжняе Падзвінне (у межах сучаснай Латвіі да Рыжскага заліву).

Полацкае княства – гэта першая беларуская дзяржава, якае мела сапраўдны суверэнітэт і ўсе атрыбуты дзяржаўнасці: заканадаўчую ўладу у выглядзе веча, выканаўчую ўладу ў асобе князя.

Першыя звесткі пра княства фрагментарныя і недакладныя. Яны звязаны з летапіснымі паведамленнямі пра сутыкненне інтарэсаў Ноўгарада, Кіева і Полацка. У летапісу пад 859 г. сказана, што варагі бралі даніну з чудзі, славенаў, меры і крывічоў, а хазары спаганялі яе з палянаў, севяранаў і вяцічаў. У 862 г. варажскі князь Рурык усталяваў сваю ўладу над Полацкам (прызначыў свайго стаўленіка – ён меў з Полацкам нейкія кроўныя сувязі). У 865 г. кіеўскія князі Аскольд і Дзір пайшлі вайной на Полацк. Полацк быў адабраны ад Рурыка.

У 882 г. Алег, апякун малалетняга Ігара Рурыкавіча падпарадкаваў сабе Кіеў, Смаленск і падначаліў сабе многія ўсходнеславянскія землі. Але Полацк не страціў цалкам самастойнасці (у 907 г. Алег хадзіў на Візантыю, і Полацк удзельнічаў у паходзе як саюзнік, з якім дзяліліся данінаю). Пад сцягам вызвалення ад хазар Алег падпарадкаваў сабе радзімічаў, але канчаткова радзімічы былі падпарадкаваны толькі ў 984 г. Пры пераемніках Алега – Ігары, Вользе і Святаславе – уплыў Кіева аслабеў. Полацк выйшаў з пад улады Кіева, аднавіў сваю самастойнасць і узмацніўся ў 40–70-я гг. X ст.

У апошняй чвэрці X ст. ў Полацку незалежна княжыць Рагвалод, які не адносіцца да роду Рурыкавічаў. У адносінах з Рурыкавічамі Рагвалод праводзіў уласную палітычную лінію, што ў выніку прывяло да трагічных для яго асабіста і Полацка наступстваў. Каля 980 г. наўгародскі князьУладзімір Святаславіч падпарадкаваў Полацк, а ў 80-х гг. X ст. землі радзімічаў у Пасожжы былі пры дапамозе зброі падначалены Кіеву. У канцы X ст. у Тураве княжыў прадстаўнік дынастыі Рурыкавічаў князь Святаполк.

У наступны час Полацкая зямля актыўна ўдзельнічала ў працэсе палітычнага распаду Кіеўскй Русі. Рагнеда была выслана ў Полацкую зямлю, прыняла манаскі сан пад іменем Анастасіі. Яе сын Ізяслаў спачатку трымаў Заслаўе, а каля 985 г. быў запрошаны ў Полацк. З ім аднавілася дынастыя полацкіх князёў, і пачаўся працэс палітычнага адраджэння княства (такога не было ў іншых землях, заваяваных Уладзімірам).

Калектыўная памяць полацкіх князёў Рагвалодавічаў таксама прадстаўляе прыклад выразнай дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі. Яе яскравым прыкладам з’яўляецца наяўнасць унікальных і рэдкіх імёнаў князёў, не характэрных для агульнарускага антрапанімікону. Полацкія князі Рагвалодавічы захавалі выключнае права на кіраванне Полацкай зямлёй і калектыўную памяць пра родапачынальніка дынастыі Рагвалода, князёў Брачыслава Ізяславіча і Усяслава Брачыславіча, пры якіх Полацкае княства як самастойная ўсходнеславянская дзяржава зведала найвышэйшы росквіт.

Разам з тым і Брачыслаў Ізяславіч, і Усяслаў Чарадзей не пакідалі надзеі апанаваць усю Русь, завалодаць Кіевам ды сцвердзіць сваю вярхоўную ўладу над усходнеславянскімі землямі. Пасля хрышчэння Кіеўскай Русі гэта ідэя богаабранасці (выратавання чалавецтва) была запазычана ўладарамі маладой усходнеславянскай дзяржавы дзеля абгрунтавання роўнага статусу ды незалежнасці Кіева ад Царграда. Гэтыя прэтэнзіі найбольш выразна былі сфармуляваны пры княжанні Яраслава Мудрага: у Кіеве сталі з’яўляцца аналагічныя канстанцінопальскім Залатыя вароты, храм Святой Сафіі, а таксама манастыр Святога Георгія і Святой Ірыны. Для нас вельмі важным з’ўляецца факт запазычання гэтай ідэі амаль у той самы час знакамітым полацкім уладаром XI ст. – Усяславам Брачыславічам. Менавіта амбіцыямі Усяслава на гегемонію ва ўсходнеславянскім свеце неабходна тлумачыць і ўзвядзенне Полацкай Сафіі, якую будавала асобная грэчаская будаўнічая арцель – гэта і абумовіла архітэктурную спецыфіку храма. Разам з гэтым, маецца і падабенства паміж усімі трыма храмамі: агульнасць ідэі, усе яны пабудаваны ў новай частцы горада. Калі Кіеў, Ноўгарад і Полацк будавалі гэтыя саборы то, такім чынам, прэтэндавалі на «мадэляванне» самога цэнтра хрысціянскага свету, Візантыйскай імперыі, Канстанцінопаля са Святой Сафіяй і імкнуліся сцвердзіць статус Богаабранасці сваёй сталіцы і зямлі.

Станаўленне і развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях было звязана з агульнаславянскімі традыцыямі ўмацавання вярхоўнай княжацкай улады, якая абапіралася на ваенную арганізацыю (дружыну). Неабходнасць працяглага існавання ваеннай арганізацыі была абумоўлена працэсвм каланізацыі новых зямель. Аднак пры гэтым захоўвалася і дэмакратычная традыцыя ўсенароднага кіравання (веча), якая выяўляла сябе час ад часу.

У пачатку XI ст. Полацкае княства знаходзілася пад кіраваннем уласнага князя. Яно падпарадкоўвалася Кіеву толькі ў сілу таго, што там на прастоле сядзеў дзед полацкага князя Брачыслава Ізяславіча Уладзімір Святаславіч (980–1015). Можна не сумнявацца, што ва ўнутранай палітыцы полацкі князь быў цалкам самастойны. Маюцца ўскосныя дадзеныя, што і на міжнароднай арэне Полацкае княства ўспрымалася як незалежная дзяржава. Брачыслаў (1003 – 1044), пражыў каля 45 гадоў. XI ст. – час станаўленя Полацкай дзяржавы, яе вайсковага і эканамічнага ўзмацнення. Полацк пашырыў свае ўладанні на захад і поўнач. У ніжнім цячэнні Дзвіны былі збудаваны гарады Кукейнас і Герсіка (тэрыторыя сучаснай Латвіі), праз якія палачане цалкам кантралявалі гандлёвы шлях па Дзвіне да Варажскага (Балтыйскага мора), збіралі даніну з ліваў і

латгалаў. Горад Браслаў якраз і вызначае напрамак тэрытарыяльнага росту Полаччыны пры Брачыславе. У першай палове XI ст. полацкія князі далучылі Віцебск (1021), Усвяты. Полацкія князі двойчы (1021 і 1066) займалі Ноўгарад, змагаліся за Пскоў. Пасля смерці Уладзіміра полацкія Ізяславічы супрацьстаялі кіеўскім Яраславічам. Такім чынам, у першай палове XI ст. Полацк зноў заявіў пра сябе як самастойная дзяржава.

*Усяслаў Полацкі* (1044 – 1101) княжыў 57 гадоў. У другой палове XI ст. Полацк стаў галоўным канкурэнтам Кіева. У 1065 г. Усяслаў Брачыславіч напаў на Пскоў (безвынікова), у 1066 – на Ноўгарад. Захопам Ноўгарада Усяслаў разбіў славу Яраслава. Сыны Яраслава вырашылі адпомсціць Усяславу. Аб'яднанае войска пайшло да Менска (гэта памежная крэпасць Полацка), які знаходзіўся на р. Менцы (прыток Пцічы). Захапіўшы Менск, Яраславічы рушылі на Нямігу, і тут 3 сакавіка 1067 г. адбылася жорсткая бітва. Горад Менск быў знішчаны. Палачане пацярпелі паражэнне. Потым Яраславічы падманам захапілі Усяслава і двух яго сыноў і пасадзілі ў цямніцу ў Кіеве. У верасні 1068 г. у Кіеве адбылося паўстанне, у выніку якога Усяслаў стаў кіеўскім князем (на працягу 7 месяцаў). Потым ён збег у Полацк, але Ізяслаў Кіеўскі пасадзіў на княжанне ў Полацку свайго сына. Для вяртання прастола Усяслаў выкарыстоўваў войска саюзных яму эстаў, ліваў, земгалаў. Канчаткова ён змог вярнуць сабе бацькоўскі прастол толькі ў 1073 г. У 1077–1078 гг. Уладзімір Манамах робіць два спусташальных пахода на Полацк. У 1084 г. Уладзімір Манамах яшчэ раз знішчыў Менск, пасля гэтага жыхары яго пакінулі (потым горад быў збудаваны ў іншым месцы).

З 1084 па 1101 гг. летапісы маўчаць пра войны Полацка і Кіева. Паказальна, што на з’езд у Любечы нават не запрасілі полацкага князя (у Полаччыне ўжо бачылі непадуладную зямлю).

Увогуле найбольш важнай асаблівасцю палітычнага развіцця Полацкай зямлі ў XI ст. было працяглае захаванне стабільнай вярхоўнай улады. На працягу цэлага стагоддзя ў Полацку ўладарылі толькі два князі. У самым жа пачатку XII ст. у Полацкім княстве пачынаецца перыяд палітычнай раздробленасці (раней надыходу раздробленасці Старажытнай Русі ў цэлым).

Тураўская зямля першапачаткова была часткай Кіеўскага княства, гэта значыць яго валасцю. Але па падліках украінскага даследчыка А. Грушэўскага, Тураўская воласць на працягу першых ста гадоў пасля смерці Яраслава Мудрага каля 40 гадоў жыла асобным жыццём, 60 гадоў – у злучэнні з Кіевам. Першым легендарным князем Турава называецца летапісам Тур (пад 980 г.). Магчыма, насамрэч у Тураве – дрыгавіцкім племянным цэнтры – сядзелі мясцовыя князі. Але з 988 г. (дата ўмоўная) у Тураве замацаваліся прадстаўнікі кіеўскай дынастыі Рурыкавічаў. Святаполк прыняў актыўны ўдзел у барацьбе за кіеўскі прастол пасля смерці ў 1015 г. Уладзіміра. Мабыць, Святаполк Акаянны пакінуў тураўскі прастол, але ў любым выпадку ўжо ў 1019 г. ён загінуў дзесьці “между ляхы и чахы”. Наступным тураўскім князем называецца Ізяслаў Яраславіч (пад 1054 г., у гэтым годзе ён стаў кіеўскім князем). Такім

чынам працяглы час Тураўская зямля аказвалася цесна злучанай з Кіеўскім княствам.

Палітычнае развіццё Полацкага і Тураўскага княстваў у канцы X–XI ст., наколькі дазваляюць судзіць крыніцы, не адрознівалася ад развіцця іншых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Старажытнай Русі. Гэта былі тыповыя раннефеадальныя княствы з моцнай княжацкай уладай. Падобныя дзяржавы сфармаваліся і на поўначы Еўропы ва ўмовах адсутнасці сінтэзу з развітай міжземнаморскай антычнай культурай. Слабая ступень запазычання (рэцэпцыі) юрыдычных норм Рымскай імперыі прадвызначыла працяглае захаванне перажыткаў родаплемяннай эпохі і позняе з'яўленне пісьмовага права. Так, у адносінах паміж князямі, як і ў іх адносінах з падданымі, увесь старажытнарускі перыяд панавала вусная форма дамоў. Нормы старажытнарускага права былі зафіксаваны ў зборніку законаў "Руская праўда" толькі ў другім дзесяцігоддзі XI ст. і дапаўняліся яшчэ на працягу стагоддзя.

## *Лекцыя 2.* **Вялікае Княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы**

### 1. Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ

Галоўнымі прычынамі, якія прывялі да ўзнікнення ВКЛ, быў шэраг фактараў. З аднаго боку – аб'ектыўныя працэсы дзяржаваўтварэння, якія адбываліся ў той час у літоўскім грамадстве. З другога боку – істотнае значэнне меў знешні фактар – мангольскае нашэсце на землі Русі, пагром і знішчэнне туменамі Бату-хана ўсходнеславянскіх княстваў ды экспансія крыжаносцаў на землі балтаў. Толькі аб'яднаўшыся, беларускія землі Русі і балцкая Літва здолелі эфектыўна супрацьстаяць абедзьвум пагрозам, стварыць і захаваць новую форму сваёй супольнасй дзяржаўнасці – Вялікае Княства Літоўскае і Рускае.

Асноўнымі прычынамі ўтварэння ВКЛ сталі: 1) эканамічныя (рост вытворчых сіл, умацаванне феадальных адносін, паглыбленне грамадскага падзелу працы, развіццё гандлю, что садзейнічала пераадольванню адасобленнасці княстваў); 2) унутрыпалітычныя (палітычнае збліжэнне, этнакультурная роднаснасць старажытнабеларускіх земель выклікала неабходнасць іх тэрытарыяльнай кансалідацыі); 3) знешнепалітычныя (беларускія княствы вымушалі да аб'яднання напады крыжаносцаў і пагроза мангола-татарскага нашэсця).

Для сучаснай беларускай інтэрпрэтацыі характару ВКЛ характэрны наступныя тэзісы.

Па-першае, ужо з моманту свайго стварэння ВКЛ было не толькі літоўскай, але і беларускай дзяржавай. Беларускія землі ўвайшлі ў яго склад пераважна мірным шляхам (В. Насевіч, А. Краўцэвіч, Г. Сагановіч, А. Кібінь).

Па-другое, ініцыятыва стварэння ВКЛ зыходзіла ад прадстаўнікоў усходнеславянскай знаці Беларускага Панямоння (В. Насевіч, А. Краўцэвіч). У найбольш радыкальных тэкстах (Мікола Ермаловіч і яго прыхільнікі) сцвярджаецца, быццам бы яны падпарадкавалі і заваявалі ўласна літоўскія землі. Гэта міф, які не адпавядае гістарычнай праўдзе.

Па-трэцяе, беларуская культура ў ВКЛ была дамінуючай, а беларусы, асабліва на першым этапе існавання дзяржавы, з'яўляліся своеасаблівымі культуртрэгерамі ў дачыненні да літоўцаў (В. Насевіч, А. Краўцэвіч). У сучаснай беларускай гістарыяграфіі, як у працах, прэтэндуючых на акадэмізм, навуковасць, гэтак жа як і ў гістарычнай, эмацыйна патрыятычнай, публіцыстыцы, ВКЛ не ўспрымаецца як дзяржава літоўскіх заваёўнікаў. Агульнасць гістарычнай традыцыі ў мінулым паміж двума нашымі народамі абумоўлівае шырокую гаму азначэнняў і ацэнак – ад псеўданавуковых уяўленняў аб ВКЛ як толькі беларускай дзяржаве ў калянавуковай публіцыстыцы да трактавання гэтага дзяржаўнага ўтварэння як калыскі беларускага народа, які мае агульную гісторыка-культурную спадчыну з літоўцамі, якую немагчыма, ды і бесперспектыўна, прыватызаваць па сучаснай нацыянальнай прыкмеце.

## 2. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Барацьба за аб'яднанне зямель Старажытнай Русі

Калі для Заходняй Еўропы у працэсе ўтварэння абсалютысцкіх манархій вызначальную ролю адыгрывалі эканамічныя прычыны, то для ВКЛ – знешнепалітычныя фактары. У 1237–1242 гг. уся паўднёвая і ўсходняя часткі ўсходнеславянскага арэала была зруйнавана мангола-татарамі. Яны прайшлі і па поўдню Беларусі. З 1201 г. (калі была збудавана крэпасць Рыга) пачалося наступленне рыцараў-крыжакоў на ўсходнеславянскія землі і на землі, заселеныя балтамі. Пачаткам ВКЛ стаў саюз дзвюх сіл: беларускіх княстваў верхняга Панямоння і найбольш моцных правадыроў балцкіх плямёнаў.

Цэнтрам будучай дзяржавы стаў горад Навагрудак, куды у пачатку XIII ст. перамясціўся цэнтр палітычнага жыцця з Полацка. У гэты перыяд беларускае Панямонне стала адносна бяспечнай тэрыторыяй. Пачатак новаму дзяржаўнаму ўтварэнню быў пакладзены балцкім князем Міндоўгам, якога жыхары Навагрудка запрасілі на княжанне. Баярства Верхняга Панямоння дзеля выратавання ад ардынскай залежнасці пайшло на радыкальны крок: разрыў са старажытнарускай палітычнай сістэмай, пры якой уся Русь лічылася сумеснай вотчынай Рурыкавічаў.

Па аднаму з летапісаў у 1246 г. Міндоўг прыняў праваслаўе і быў абраны на княжанне. Пацвярджаецца факт саюзу Міндоўга з Навагародкам супраць Галіцка-Валынскіх князёў, якія аб'яднаўся з яцвягамі і палякамі. Міндоўг у 1251 г. прыняў каталіцтва і ў 1253 г. быў каранаваны. Па гэтай прычыне Навагародак лічыцца першай сталіцай ВКЛ, хаця дакладнага разумення сталіцы ў тыя часы яшчэ не існавала. "Каралеўства Русь" – гэта нішто іншае, як Галіцка-Валынскае княства, уладар якога Данііл Раманавіч быў каранаваны

незадоўга да таго. Паміж ім і Міндоўгам сапраўды ішла зацятая барацьба за землі Беларускага Панямоння.

Міндоўг аб’яднаў пад сваёй уладаю Навагародскае, Гарадзенскае, Ваўкавыскае і Слонімскае княствы. Ягоны сын Войшалк, які спачатку арыентаваўся на Галіцка-Валынскае княства і нават перадаў Даніілу шэраг гарадоў, заваяваў Літву і падпарадкаваў балцка-літоўскія землі. Яго вярхоўную ўладу канчаткова прызнала і Полацкая зямля, якая знаходзілася ў арбіце уплыву Літвы ўжо з сярэдзіны XIII ст. Калі б літоўская ўлада была навязана ў гарадах Беларускага Панямоння і Падзвіння сілком, ніколі б не здолела Літва пасля некалькіх паходаў манголаў і залежных ад іх галіцка-валынскіх князёў, у такой складанай знешнепалітычнай сітуацыі, утрымаць іх за сабою. Менавіта з дапамогай «рускіх» княстваў першапачаткова Міндоўг, а затым і яго сын Войшалк, канчаткова ўсталявалі ў Літве сваю ўладу. Гэтыя землі сталі ядром ВКЛ. Такім чынам быў прадвызначаны будучы славянскі характар краіны, ядром якой сталі беларускія землі.

Уся тэрыторыя Беларусі канчаткова увайшла ў склад новай дзяржавы пры панаванні новай дынастыі – Гедымінавічаў. У 1315–1377 гг. улада літоўскіх князёў Гедыміна і Альгерда пашырылася на ўсю тэрыторыю Беларусі. Пачынаецца пашырэнне улады Гедымінавічаў і на украінскія землі, землі Галіцка-Валынскай Русі. Галоўнымі прынцыпамі, якімі кіраваліся літоўскія дынастыі пры ўключэнні земляў Русі – “старыны не рушым, навіны не ўводзім”. Землям, якія ўвайшлі ў склад ВКЛ мірным шляхам, добраахвотна, праз заключэнне дамовы (“ряда”) былі гарантаваны іх правы – свабода веравызнання, недатыкальнасць уласнасці, звыклыя дзяржаўныя інстытуты кіравання. Менавіта пры Гедыміне дзяржава стала называцца Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім. У выніку дзяржава стала федэрацыяй, якая складалася з “Літвы”, непасрэдна падначаленай вялікаму князю, і амаль цалкам самастойных зямель і княстваў, якія захавалі назву “Русь”. Пад Літвой ўжо ў той час разумелі балцка-славянскае ядро зыходнай тэрыторыі дзяржавы – як балцкія землі Літвы ў вузкім сэнсе, гэтак жа і тэрыторыі ўсходнеславянскіх княстваў Беларускага Панямоння, у тым ліку Наваградскую зямлю. Назву Русі ў часы Гедыміна за сабой захавалі землі сучаснай Паўночна-Усходняй Беларусі – у першую чаргу гістарычная Полацкая зямля (Полацкае, Віцебскае, Друцкае княствы), тэрыторыі Беларускага Падняпроўя.

Пры Альгердзе (1345–1377 гг.) былі падпарадкаваны Падняпроўскія воласці (Магілёў, Гомель), Мсціслаўская зямля, Кіеўская, Чарнігаўска-Северскія землі. Павялічэнню тэрыторыі дзяржавы спрыяла дэцэнтралізацыя і аслабленне Залатой Арды. У другой палове XIV ст. ВКЛ цалкам уключыла ў свой склад землі Падляшша. Этнічныя літоўцы складалі меншасць ў параўнанні з усходнімі славянамі-русінамі – продкамі сучасных беларусаў і ўкраінцаў. Літоўскі элемент дамінаваў у палітычнай, а усходнеславянскі – у культурнай і эканамічнай сферах жыцця дзяржавы. Пры Альгердзе старабеларуская (“руская”) мова стала афіцыйнай мовай дзяржавы.

У часы Альгерда Літва пачынае спаборнічаць за дамінаванне на Русі з Масквой. Адбываюцца першыя вайсковыя сутыкненні паміж гэтымі дзяржаўнымі цэнтрамі. Усходняя палітыка ўладароў Вялікага Княства, супрацьстаянне з Ардой, ішлі пад сцягамі збірання зямель Русі і вызвалення іх ад іга Арды. Гэта падмацоўвалася рэальнымі справамі – вайсковымі дзеяннямі, царкоўнай палітыкай, а таксама тытулатурай.

Альгерд абвясціў сябе пераемнікам духоўных і культурна-гістарычных традыцый старажытнай Русі. Ён праводзіў тактыку знясільвання Масквы праз падтрымку міжусобнай барацьбы княстваў (ідзе барацьба за Смаленск, Цвер, Ноўгарад, Пскоў). У 1362 г. Альгерд перамог татараў у бітве на Сініх Водах, на землях сучаснай Украіны. Міжрэчча Днястра і Паўднёвага Буга адышло пад яго кантроль. Неўзабаве Альгерд пасадзіў свайго сына Уладзіміра на княжацкі стол у Кіеве. Сакральная сталіца Старажытнай Русі стала належаць ВКЛ. Альгерд, у перапісцы з канстанцінопальскім патрыярхам на прадмет магчымасці стварэння ў ВКЛ сваёй мітраполіі, асобнай ад Масквы, называе сябе “царом”.

Ягайла не стаў пераемнікам Альгерда у аб’яднанні ўсіх рускіх зямель вакол Вільні. Перамога Масквы у Кулікоўскай бітве (1380) прымусіла Ягайлу шукаць сяброўства з Дзмітрыям Данскім. Праект саюза ВКЛ з Маскоўскім княствам не быў здейснены.

Найбольш ярка імкненне да ідэалагічнага афармлення і абгрунтавання вярхоўнага суверэнітэту над землямі Русі выявілася ў эпоху праўлення князя Вітаўта (1392 – 1430). Ён ставіў задачу стварэння Літоўска-Рускай дзяржавы, якая б уключала Маскоўскую Русь. Ён падпарадкаў Смаленск (1395), усталяваў пратэктарат над Ноўгарадам, Псковам, Разанню. У 1396 г. была ўсталявана мяжа на ўсходзе з Маскоўскім княствам па рацэ Угра, якая захоўвалася больш за 100 гадоў. Пры Вітаўце Масква прызнала вядучую ролю Вільні ў справе “усея Русі”.

Факты дазваляюць казаць, што Вітаўт сапраўды шмат у чым вызначаў палітычнае развіццё не толькі ва Усходняй Еўропе, але і ў Заходняй, рэальна кантраляваў сітуацыю на землях Арды. У Еўропе на той момант не было роўных яму манархаў па сваёй сіле і магутнасці. Бліскучая перамога на Грунвальдскім полі, актыўнае ўмяшальніцтва Вітаўта ў супрацьстаянне гусітаў з Свяшчэннай Рымскай імперыяй германскай нацыі, прымушала лічыцца з ім і Нямецкі Ордэн, і Сігізмунда Люксембургскага.

У 1430 г. тэрыторыя ВКЛ дасягнула найбольшых памераў за ўсю яго гісторыю – да 900 тысячаў квадратных кіламетраў. Усходнеславянскія землі дзяржавы пераўзыходзілі балцкія ў 12 разоў. Разам з гэтым, літоўскай знаці належала ў дзяржаве вышэйшая ўлада. Менавіта гэты фактар прадвызначыў характар развіцця ВКЛ пасля Крэўскай і Гарадзельскай уніі і палітычнае дамінаванне каталіцкай, пераважна балцкай, эліты ў важнейшых дзяржаўных інстытутах.

## 3. Узаемадачыненні з Тэўтонскім Ордэнам і Залатой Ардой

У самым пачатку XIII ст. пачынаецца агрэсія рыцараў-крыжакоў на балцкія і ўсходнеславянскія землі. Першым аб'ектам крыжацкай агрэсіі сталі ўладанні Полацкага князя на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Барацьбу з крыжаносцамі вёў князь Міндоўг, які у 1262 г. заключыў пагадненне з ноўгарадскім князем Алясандрам Неўскім. У 1284 г. Тэўтонскі ордэн завяршыў падпарадкаванне прускіх зямель, і з гэтага часу землі ВКЛ сталі аб'ектам агрэсіі ордэна. З 1300 па 1315 г. ордэнскія войскі правялі 20 рэйдаў на Жамойць, Літву, і ў першую чаргу, на Гарадню. Гедымін дзеля барацьбы з крыжаносцамі збудаваў замкі у Троках, Вільні, Лідзе, Крэве. У пачатку XIV ст. барацьбу з крыжаносцамі вядуць дружыны гарадзенскага каштэляна Давыда. У 1326 г. Давыд Гарадзенсі удзельнічаў у вялікім польска-літоўскім паходзе на Брандэнбург. У 1348 г. адбылася бітва на рацэ Стрэве, якая скончылася безвынікова. Актыўна змагаецца з Ордэнам князь Кейстут, брат Альгерда. Неабходнасць барацьбы з крыжаносцамі падштурхнула ВКЛ да саюзу з Польшчай, які аформіўся у выглядзе Крэўскай уніі 1385 г. Дзеля гэтага саюзу суседнія дзяржавы забылі былыя супярэчнасці, якія узніклі, калі Альгерд вёў барацьбу за Валынь і Падляшша.

Пасля Крэўскай уніі князь Ягайла стаў польскім каралём пад іменем Уладзіслав II, а князем ВКЛ стаў Вітаўт. Саюз гэтых двух ваяроў, дзвюх дзяржаў забяспечыў перамогу славян у Грунвальдскай бітве (15 ліпеня 1410 г.). Агрэсіі крыжаносцаў на ўсходзе быў пакладзены канец. Мірны дагавор, падпісаны ў 1411 г. у Торуні, меў значна больш сціплыя вынікі, чым гэтага хацелася Ягайлу і Вітаўту. У межах ордэнскай дзяржавы засталася польскія Кульмская зямля і Памор'е, Жмудзь і Судавы былі перадазены Вітаўту толькі на час яго жыцця. У 1422 г. пачалася новая вайна з Ордэнам. Ваенная ініцыятыва адразу апынулася на баку Польшчы і ВКЛ. 27 верасня 1422 г. каля возера Мельна быў падпісаны Мелнаўскі мір, які паставіў апошнюю кропку ў спыненні крыжацкай агрэсіі ў дачыненні да ВКЛ. Паводле яго ўмоў Жмудзь і Судавія назаўсёды вярталіся Вялікаму Княству Літоўскаму. Мяжа паміж ВКЛ і Прусіяй пасля гэтай падзеі заставалася нязменнай стагоддзямі.

У XIII – XIУ стст. мангола-татары здзяйснялі перыядычныя набегі на славянскія землі. Каля 1240 г. татара-манголы ўварваліся ў заходнерускія землі з поўдня. У выніку тураўскія і пінскія князі часова трапілі у залежнасць ад Арды. Захавалася паданне аб паражэнні татараў, якіх вёў князь Кайдан каля Дзяржынска (ранейшая назва – Кайданава). Татары здейснілі спробы захопу Брэста і Гомеля. Татарскія набегі здзяйсняліся перыядычна і надалей. Татары рабавалі беларускія землі, захоплівалі ваеннапалонных, але захапіць беларускія землі не здолелі. Князь Альгерд за два дзесяцігоддзі да Дзмітрыя Данскога атрымаў шэраг перамог над мангола-татарамі. У 1362 г. Альгерд перамог татараў у бітве на Сініх Водах, на землях сучаснай Украіны і вызваліў многія рускія землі (Кіеўскае, Чарнігава-Северскае княствы). Вітаўт спрабаваў выкарыстоўваць татар у сваіх мэтах і сапраўды дасягнуў каласальных поспехаў у падначаленні палітыкі Арды сваім уладным інтарэсам. У апошнія

дзесяцігоддзі яго праўлення ён прызначаў ханаў у Крым, у Арду. У 1399 г., спрабуючы пашырыць уладанні ВКЛ на поўдні, ён пацярпеў паражэнне на рацэ Ворскла.

## 4. Крэўская унія і вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў. Магдэбургскае права

У 1385 г. было заключана пагадненне аб дзяржаўнай уніі паміж ВКЛ і Польшчай. У дамове аб Крэўскай уніі Ягайла абяцаў “навечна далучыць” землі Літвы і Русі да Польшчы. Напачатку 1386 г. Ягайла хрысціўся ў Кракаве, пасля гэтага пабраўся шлюбам з Ядзьвігай і стаў польскім каралём пад імем Уладзіслава II. Тады ж прынялі каталіцкае хрышчэнне яго браты-язычнікі. Праз год адбылося масавае хрышчэнне літоўцаў, было заснавана Віленскае біскупства. Прывілей 1387 г. караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы надаваў асобныя правы землеўласнікам каталіцкага веравызнання, якія не распаўсюджваліся на праваслаўную знаць.

Такім чынам, Крэўская унія спрыяла ўключэнню ВКЛ у арбіту заходнееўрапейскай цывілізацыі, распаўсюджванню на землях княства еўрапейскіх прававых інстытутаў. Крэўская унія стварыла ўмовы для памкненняў з боку Польскага Каралеўства па ліквідацыі і абмежаванню суверэнітэта ВКЛ і паступовай паланізацыі эліты Беларусі, Літвы і Украіны. Крэўская унія была дынастычна-персанальнай. Дзве краіны злучаліся толькі праз асобу агульнага манарха і яго нашчадкаў.

Барацьбу за аднаўленне самастойнасці і раўнапраўны статус з Каронай узначаліў Вітаўт. Ён выступіў у 90-я гг. XIV ст. з праграмай стварэння самастойнага каралеўства «Літвы і Русі». У ходзе баявых дзеянняў з Вітаўтам Ягайла зразумеў неабходнасць кампрамісу. Згодна Востраўскім пагадненнем ад 5 жніўня 1392 г. Вітаўт быў прызначаны старэйшым сярод родных і стрыечных братоў Ягайлы на землях Літвы, Беларусі і Украіны і непасрэдным уладаром дзяржавы пад вярхоўным суверэнітэтам Ягайлы. Вітаўт пачаў тытулавацца з гэтага часу “вялікім князем літоўскім”, або “вялікім князем Літвы ды панам і дзедзічам Русі”. Ён стаў пажыццёвым намеснікам княства, але вялікім князем Літоўскім заставаўся Ягайла. Быў зроблены першы крок да аднаўлення суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага і Рускага.

У 1401 г. Вітаўт заключыў з Ягайлам новую Віленска-Радамскую унію, афіцыйна быў абвешчаны князем ВКЛ (пажыццёва) і атрымаў поўную самастойнасць ва ўнутраных справах. Гарадзельская унія (заключаная ў горадзе Гародлі над Бугам) у 1413 г. пацвердзіла адасобленасць княства, але Вітаўт абавязаўся прызначаць на дзяржаўныя пасады толькі каталікоў, якія прынялі польскія гербы. Дзякуючы гэтаму папа Рымскі прызнаў легітымнасць ВКЛ, узнікла ідэя каранацыі Вітаўта, але карона да яго не дайшла. На польскі ўзор утвараліся ваяводствы і кашталяніі.

Пасля смерці Вітаўта князем ВКЛ становіцца малодшы брат Ягайлы Свідрыгайла, які быў паслядоўнікам Вітаўта у барацьбе за поўную самастойнасць ВКЛ. Ён імкнуўся абапірацца на феадалаў праваслаўнага

веравызнання. Федалы-каталікі абвясцілі князем Сігізмунда, брата Вітаўта. Пачалася грамадзянская вайна, у якой перамог Сігізмунд. Для ліквідацыі супярэчнасцей ён у 1434 г. выдаў прывілей, якім параўнаў феадалаў праваслаўных у асноўных правах з каталікамі. Пасля смерці Сігізмунда дзяржаўная унія ВКЛ з Польшчай была ліквідавана.

У 1440 г. князем ВКЛ выбіраецца 12-цігадовы Казімір Ягайлавіч. Праз 7 гадоў ён быў абраны і польскім каралём. Персанальная унія паміж ВКЛ і Польшчай была адноўлена. Для кансалідацыі эліты ў межах усёй дзяржавы быў прыняты агульназемскі прывілей Казіміра Ягайлавіча 1447 г., які вялікі беларускі гісторык У. Пічэта называў "Вялікай Хартыяй беларускіх вольнасцей". Прывілей пацвярджаў, развіваў і абагульняў шляхецкія вольнасці ў ВКЛ. Князі, паны і баяры, незалежна ад веравызнання, атрымалі роўныя правы і свабоды. Згодна з гэтым дакументам землі і дзяржаўныя пасады надаваліся толькі мясцовым ураджэнцам. У чэрвені 1447 г. Казімір Ягайлавіч прыняў польскую карону. Пры гэтым ён заставаўся вялікім князем літоўскім. Княства захоўвала сваю самастойнасць, нягледзячы на спробы палякаў аднавіць Крэўскую унію.

У канцы XIV ст. адбываюцца істотныя змены ў жыцці беларускіх гарадоў, пачынае фармавацца па еўрапейскім узоры асаблівае саслоўе – мяшчанства. Менавіта ў гэты час гарады ВКЛ пачынаюць атрымліваць прывілеі на гарадское самакіраванне – магдэбургскае права. Першым гэтае права атрымала сталіца дзяржавы – Вільня (1387 г.). У 1390 г. магдэбургскае права атрымала Бярэсце, у 1391 г. – Гародня (Гродна).

У ВКЛ магдэбургскае права надавалася гарадскому паселішчу прывілеем вялікага князя літоўскага, у прыватных гарадах – прывілеем уладальніка, ці па яго хадайніцтве – вялікім князем. Магдэбургскае права афармляла горад як самастойную адміністрацыйную адзінку, якая мела ўсе атрыбуты, неабходныя для самакіравання – тэрыторыю, грамадзянства, інстытут улады і суда, герб, падатковую сістэму. На чале гарадскога самакіравання стаяў войт, ў час яго адсутнасці – яго намеснік (лантвойт). Непасрэднае кіраўніцтва гарадскімі справамі знаходзілася ў руках бурмістраў, радцаў і лаўнікаў, якія складалі магістрат. На тэрыторыі Беларусі ў канцы XIV – канцы XV стст. магдэбургскае права датычылася ўсіх мяшчан, магістрат падзяляўся на праваслаўную і каталіцкую палавіну.

У XVI ст. – першай палове XVII стст. у Беларусі бурна развівалася ўрбаністычнае асяроддзе – раслі гарады і мястэчкі. Калі напачатку XVI ст. іх было толькі 48, то ў сярэдзіне XVII ст. – 467, а ва ўсім Вялікім Княстве – 757. У заходніх паветах Беларусі ступень урбанізацыі была вышэйшай, чым у Падняпроўі і Падзвінні. Па багаццю і колькасці насельніцтва вылучаліся Берасце, Віцебск, Магілёў, Пінск, Полацк, Слуцк. У кожным з гэтых гарадоў налічвалася каля 10 тысяч жыхароў. Да 1563 г. Полацк істотна перавышаў усе астатнія з вышэйзгаданых гарадоў.

## 5. Прававое і палітычнае значэнне Люблінскай уніі. Становішча беларускх ямель у складзе Рэчы Паспалітай

Першыя сутыкненні паміж набіраўшым моцы другім цэнтрам, што прэтэндаваў на аб'яднанне зямель былой Старажытнай Русі, Масквой, і ВКЛ пачаліся яшчэ у XIV ст. Але ў часы Альгерда і Вітаўта Вялікае Княства Маскоўскае не было здольна на роўных канкурыраваць з Вільняй у гэтай справе. У 50 – 80-я гг. XV ст. адносіны паміж Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім і Вялікім Княствам Маскоўскім рэгуляваліся дагаворам 1449 г. Казіміра Ягайлавіча і Васіля II. У навуковай літаратуры ён кваліфікуецца як "вялікі акт падзелу Русі паміж Масквою і Вільняй".

З пачатку XVI ст. паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай ішлі практычна перманентныя войны (1500 – 1503 гг., 1507 – 1508 гг., 1512 – 1522 гг., 1534 – 1537 гг., 1558 – 1583 гг.). Катастрафічная сітуацыя на землях Вялікага Княства склалася ў ходзе Інфлянцкай (Лівонскай) вайны, якая пачалася ў 1558 г. У ходзе паспяховых вайсковых дзеянняў маскоўскага войска на тэрыторыі Беларусі ўзнікла рэальная пагроза страты незалежнасці ВКЛ. У 1562 г. маскоўскія войскі стаялі каля Віцебска, Дуброўны, Оршы, Копысі, Шклова. 15 лютага 1563 г. быў захоплены і дашчэнту зруйнаваны найстаражытнейшы горад Беларусі – Полацк. Менавіта гэта сітуацыя каталізавала набходнасць прыняцця Люблінскай уніі. Толькі ў саюзе з Польшчай беларуская, украінская і літоўская шляхта бачыла магчымасць уратавацца ад маскоўскага панавання. Перадумовамі Люблінскай уніі былі: доўгае існаванне персанальнай уніі ВКЛ і Польшчы, паступовае збліжэнне іх палітычных і дзяржаўных інстытутаў, распаўсюджванне каталіцтва. Шляхта беларускіх паветаў на палявым сойме пад Віцебскам прыняла 13 верасня 1562 г. і накіравала вялікаму князю ў Вільню акт з просьбай заключыць унію з Польшчай, каб мець агульны сойм, выбіраць адзінага караля, разам абараняцца ад ворага і мець аднолькавыя правы з польскай шляхтай. Менавіта русінская (беларуская і украінская) шляхта актыўна выступала за унію з Польшчай, бачыла ў ёй шанс увайсці ў прававую арбіту польскіх "залатых шляхецкіх вольнасцей".

10 студзеня 1569 г. пачалася праца Люблінскага сойма, якая працягвалася амаль 6 месяцаў. Калі прадстаўнікі Вялікага Княства імкнуліся захаваць самастойнасць сваёй дзяржавы і хацелі толькі абарончага саюза, то польскі бок настойваў на інкарпарацыі ВКЛ у склад Кароны Польскай. 1 сакавіка паслы ВКЛ у знак пратэсту пакінулі Люблін. Польскія сенатары і дэпутаты ў адказ паставілі пытанне перад Жыгімонтам Аўгустам аб далучэнні да Кароны Валыні, Падляшша, Падоліі. Дэпутаты Кіеўскага ваяводства таксама далі згоду на далучэнне да Польшчы. На працягу сакавіка – чэрвеня ўкраінскія ваяводствы ВКЛ увайшлі ў склад Кароны. У выніку ВКЛ страціла велізарныя тэрыторыі і звузілася да зямель сучаснай Беларусі і Літвы.

1 ліпеня 1569 г. быў падпісаны акт Люблінскай уніі. Прыняты праект уніі меў характар кампрамісу паміж першапачатковымі праектамі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Актам Люблінскай уніі абвяшчалася аб'яднанне

на аснове роўнасці Польшчы (Кароны) і ВКЛ у федэратыўную дзяржаву – Рэч Паспалітую. Але акт не агаворваў шэрагу палажэнняў і не касаваў унутраннага кіравання ВКЛ, дзякуючы чаму Княства працягвала існаваць у якасці саюзнай з Польшчай дзяржавы і пасля уніі, да канца існавання Рэчы Паспалітай.

На чале дзяржавы знаходзіўся польскі кароль (ён жа вялікі князь літоўскі), якога пажыццёва выбірала шляхта. Уладу караля абмяжоўваў агульны Сойм з двух палат – Сената і Пасольскай ізбы, у якую выбіраліся павятовымі соймікамі па два паслы (дэпутаты). Менавіта Сойм валодаў паўнамоцтвамі па выбару манарха. ВКЛ саступала Польшчы, была другарадным членам Рэчы Паспалітай, хоць і захоўвала ўсе атрыбуты асобнай дзяржаўнасці. Дэпутаты ад ВКЛ складалі 1/3 частку ў сойме, што давала магчымасць Польшчы дыктаваць свае ўмовы. Скасоўваліся мытні паміж ВКЛ і Польшчай, абмежаванні на атрыманне зямлі для польскай шляхты ў ВКЛ, а для беларуска-літоўскай – у Польшчы. Але фактычна надалей абедзве дзяржавы захавалі свой суверэнітэт, асобную дзяржаўную адміністрацыю, войскі, прававую сістэму, судовы апарат, фінансавую сістэму, эмісію грошай, мытную сістэму.

Магнаты ВКЛ, незадаволеныя ўніяй, палітычныя намаганні накіравалі на ўмацаванне самастойнасці княства ў межах Рэчы Паспалітай. У час бескаралеўя ўзнік інстытут дзяржаўных з’ездаў, на якіх прымаліся ўласныя законы. Акрамя таго, пазней ствараліся генеральныя канфедэрацыі (саюзы шляхты ВКЛ), а таксама збіраліся асобныя сесіі ВКЛ падчас пасяджэнняў вальных соймаў, што сведчыць аб захаванні важных суверэнных паўнамоцтваў ВКЛ. Новы орган улады Дзяржаўны з’езд, альбо Галоўны з’езд пачаў працаваць ў 70-я–80-я гг. XVI ст і спыніў сваё існаванне у канцы XVII ст.

Ужо ў 1572 – 1576 гг. шляхта ВКЛ дамаглася асобнай прысягі і зацвярджння сваіх правоў новым каралём. З 1673 года шляхта ВКЛ дамаглася права праводзіць кожны трэці сойм у княстве. Да гэтага соймы праводзіліся толькі на тэрыторыі Польшчы (у Варшаве).

Найбольш поўна адасобленасць Вялікага Княства Літоўскага была юрыдычна замацавана ў III Статуце ВКЛ 1588 г. У ім ніводнага разу не згадваецца акт уніі. Статутам 1588 г. абвяшчалася самастойнасць і тэрытарыяльная цэласнасць Вялікага Княства Літоўскага, недатыкальнасць яго межаў. Статут забараняў іншаземцам – у першую чаргу палякам – набываць у княстве землі, маёнткі і дзяржаўныя пасады. Галоўнае значэнне Статута 1588 г. у тым, што ён заканадаўча аформіў захаванне дзяржаўнага суверэнітэту ВКЛ насуперак акту Люблінскай уніі.

Для захавання уласнай дзяржаўна-прававой ідэнтычнасці шляхты ВКЛ вялікае значэнне мела ўключэнне ў статуты ВКЛ 1566 і 1588 гг. артыкула, які фактычна замацоўваў за старабеларускай моваю статус афіцыйнай. Гэта давала магчымасць шляхце абараняць і сваю нацыянальную ідэнтычнасць.

Пасля Люблінскай уніі актывізавалася распаўсюджванне каталіцызму на беларускіх землях. У гэтай справе вялікую ролю адыграў манаскі ордэн езуітаў і іншыя каталіцкія ордэны, якія набывалі у ВКЛ землі, утваралі кляштары, будавалі касцёлы. Каталіцызм быў прывілегіяванай рэлігіяй у Рэчы Паспалітай,

толькі каталікі мелі права на заняцце дзяржаўных пасад. Дзеці многіх праваслаўных і пратэстанцкіх магнатаў, якія навучаліся ў езуіцкіх калегіумах, пераходзілі у каталіцкую веру. Прадстаўнікі іншых рэлігій у РП называліся дысідэнтамі (іншаверцамі), былі пазбаўлены многіх правоў. Наступленне каталіцызму вяло да звужэння сферы выкарыстання беларускай мовы і паступовага апалячвання мясцовай шляхты.

Люблінская ўнія праіснавала да падзелаў Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на юрыдычную і палітычную фармальную роўнасць ВКЛ і Кароны Польскай, польскі ўплыў быў вызначальным і відавочным. Ён меў надзвычай сумныя наступствы і для беларускай, і для літоўскай, і для украінскай нацыянальнай свядомасці і культуры. У выніку культурнай і дзяржаўнай асіміляцыі, працэсаў паланізацыі, гэтыя народы страцілі сваю арыстакратыю, большую частку шляхецтва і мяшчанства, што надзвычай негатыўна адбілася на працэсах нацыяўтварэння.

## *Лекцыя 3.* Беларусь у складзе Расійскай імперыі

### 1. Падзелы Рэчы Паспалітай

Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, аслабленнем якой скарысталіся суседнія краіны. Расія, Аўстрыя і Прусія неаднаразова вылучалі розныя праекты падзелу дзяржавы. Гэтаму садзейнічала супрацьстаянне розных магнацка-шляхецкіх груповак унутры Рэчы Паспалітай, якія шукалі дапамогі за межамі краіны. Прыхільнікі рэформ і ўмацавання дзяржавы падтрымалі абранне ў 1764 г. каралём Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Намер правесці рэформы выклікаў незадаволенасць значнай часткі магнатаў і суседніх краін, якія выкарысталі для ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай дысідэнцкае пытанне. Пры падтрымцы Расіі і Прусіі былі створаны *Слуцкая* (праваслаўная) і *Торуньская* (пратэстанцкая) канфедэрацыі, якія пры дапамозе расійскіх войскаў дабіліся прыняцця у 1768 г. соймам Рэчы Паспалітай рашэння ураўнаваць ў правах католікаў і дысідэнтаў. Адначасова былі пацверджаны вольнасці шляхты.

Гарантам прынятых рашэнняў выступала Расія. Шляхта, якая была незадаволена прынятымі рашэннямі і згодніцкай палітыкай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, стварыла ў 1768 г. Барскую канфедэрацыю. Справа дайшла да ўзброенай барацьбы, аднак барскія кафедэраты пацярпелі паражэнне. Знясіленая анархіяй і ваеннымі дзеяннямі Рэч Паспалітая ў хуткім часе стала ахвярай сваіх больш моцных суседзяў. У 1772 г. у Пецярбургу было падпісана пагадненне паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расійскай імперыяй, паводле якога кожная з краін атрымала частку тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У склад Расійскай імперыі ўвайшла ўсходняя частка Беларусі. Першы падзел прымусіў больш актыўна дзейнічаць прыхільнікаў рэформ у Рэчы Паспалітай, якія спрабавалі змяніць сітуацыю ў краіне, стварыць умовы для змен у эканамічнай і

палітычнай сферах. Было абмежавана выкарыстанне права «ліберум вета», створана Адукацыйная камісія і інш.

У 1788–1792 гг. працаваў Чатырохгадовы сейм. 3 мая 1791 г. адбылося прыняцце Канстытуцыі, якая істотна змяніла дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай. Уводзілася спадчынная манархія, умацоўвалася цэнтральная ўлада, адмянялася права «ліберум вета», забаранялася стварэнне канфедэрацый. Рэч Паспалітая станавілася ўнітарнай дзяржавай, што фактычна вяло да ліквідацыі дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага. (а гэта выклікала незадаволенасць яе шляхты).

Праціўнікі рэформаў аб'ядналіся ў 1792 г. у Таргавіцкую канфедэрацыю, якую падтрымала Расія. Армія Рэчы Паспалітай не змагла супрацьстаяць аб'яднаным сілам расійскіх войскаў і таргавічан. У выніку перамогі канфедэратаў былі ліквідаваны рашэнні Чатырохгадовага сейма і Канстытуцыя 1791 г. Услед за гэтым у студзені 1793 г. была заключаны пруска-расійскі дагавор аб чарговым падзеле Рэчы Паспалітай. У склад Расійскай імперыі ўвайшла цэнтральная частка Беларусі.

У Рэчы Паспалітай другі падзел выклікаў імкненне з боку эліт знайсці шляхі да захавання і адраджэння дзяржавы. Найбольш радыкальныя з іх імкнуліся дасягнуць мэты праз паўстанне. Узброенае выступленне пачалося ў сакавіку 1794 г. у Кракаве. Кіраўніком яго стаў ураджэнец Беларусі Т. Касцюшка. Мэтай паўстання стала аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. і працяг рэформ. На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ўзброеныя дзеянні пачаліся ў красавіку і працягваліся да верасня. Тут паўстанцаў узначаліў Я. Ясінскі. У падаўленні паўстання прынялі ўдзел узброеныя сілы Аўстрыі, Расіі, Прусіі. Пасля яго паражэння ў хуткім часе (1795 г.) адбыўся апошні раздзел Рэчы Паспалітай. Заходнія землі Беларусі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Падзелы Рэчы Паспалітай прывялі да таго, што адной з галоўных праблем палітыкі еўрапейскіх краін XIX – пачатку XX ст. стала «польскае пытанне» – праблема аднаўлення дзяржаўнасці на землях, якія ўваходзілі ў склад гэтай дзяржавы. Вакол яе пастаянна ўзнікалі палітычныя і ўзброеныя канфлікты. Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адкрыла новы этап у айчыннай гісторыі. На гэтым этапе адбыліся лёсавызначальныя змены, якія акрэслілі абрысы сучаснай беларускай нацыі, кірунак фарміравання элементаў грамадзянскай супольнасці. Гэта быў час рэформ і контррэформ, які на тэрыторыі Беларусі набыў адметнасць з-за спроб ураду Расійскай імперыі вырашыць нацыянальнае пытанне і прымушаў пастаянна змагацца супраць польскіх уплываў. Абазначаны кірунак урадавай палітыкі наклаў адбітак нават на сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы, вырашэнне сялянскай справы. Беларусь адносілася ў той час да ліку рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе нацыянальнае пытанне стаяла найбольш востра, але ўласна беларускі аспект у ім займаў нязначнае месца. У другой палове XIX ст. фактычна адбылася канчатковая ломка той сацыяльнай сістэмы грамадства ў Беларусі, якая

сфарміравалася на старашляхецкіх традыцыях ВКЛ і Рэчы Паспалітай і прадаўжала ў значнай ступені функцыянаваць у першай палове стагоддзя.

### 2. Русіфікацыя і дэпаланізацыя

Урад Расійскай імперыі не разглядаў беларусаў як самастойны народ, які мог прэтэндаваць на ўласную этнапалітычную адметнасць. Адсутнасць уласнай незпаланізаванай эліты ўспрымайлася ўрадавымі коламі як сведчанне неразвітасці высокай культуры і мовы, з якімі патрэбна было лічыцца. Накірунак урадавай палітыкі наклаў адбітак на погляд на беларусаў як на «рускіх».

Тым не менш, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. расійскія ўлады дастакова лаяльна паставіліся да ўзмацнення польскага грамадска-культурнага руху на беларускіх землях. Створаны ў 1803 г. Віленскі ўніверсітэт у хуткім часе стаў польскім па свайму духу. Адначасова ён славіўся сваёй прафесурай і выпускнікамі, быў цэнтрам навуковай і грамадскай думкі. Тут аформіліся патрыятычныя студэнцкія арганізацыі філаматаў і філарэтаў. Амаль трэцяя частка студэнтаў прыняла ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. Пасля паўстання былі зроблены пэўныя крокі да абмежавання польскага і ўзмацнення расійскага уплываў. Да 1840 г. было канчаткова спынена дзеянне Статута Вялікага Княства Літоўскага і ўведзена расійскае заканадаўства. У 1831 г. расійскі ўрад узмацніў працэс “разбору шляхты”.

З 1831 да 1848 гг. у якасці дарадчага органа пры імператары дзейнічаў Камітэт Заходніх губерняў, які разглядаў праекты адміністрацыйных і палітычных мерпрыемстваў у дачыненні да Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны з мэтай іх інтэграцыі ў агульнаімперскую прастору. Аднак рэалізаваць гэту задачу расійскаму ураду не ўдалося.

У завершаным выглядзе палітыка русіфікацыі аформілася пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., якое стала важным этапам у эвалюцыі урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, фарміравання грамадска-палітычнага руху і думкі. Так, становіцца менш адчувальным упольскі ўплыў. У польскім грамадстве пашырылася новая ідэалагічная і грамадская плынь, якая атрымала назву «*варшаўскі пазітывізм*». Яе прыхільнікі ставілі першачарговую задачу эканамічнага развіцця Польшчы з мэтай ўзбагачэння нацыі. Барацьба за нацыянальнае вызваленне адкладвалася на перспектыву. Расійскія ўрадавыя колы і грамадская думка схіліліся да канцэпцыі агульнарускай нацыі, у склад якой уключылі вялікаросаў, маларосаў і беларусаў. У сувязі з гэтым актуальным стаў мэтанакіраваны адрыў  насельніцтва беларускіх губерняў ад гістарычнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, настойлівая рэалізацыя ўніфікацыйных мерапрыемстваў і часам добраахвотная русіфікацыя ў межах мадэрнізацыйнай перспектывы.

Пасля паўстання 1863–1864 гг. беларускія і літоўскія губерні расійскімі ўрадавымі коламі разглядаліся як рэгіён, дзе адбывалася найбольш жорсткае супрацьстаянне польскім уплывам. На самой жа тэрыторыі Царства Польскага ніколі задачу знішчэння польскай мовы і культуры не ставілі.

### 3. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст.

Ліквідацыя Вялікага Княства Літоўскага ў перыяд падзелаў Рэчы Паспалітай, няўдалая спроба яго аднаўлення ў 1812 г., мэтанакіраваная палітыка расійскіх улад прывялі да паступовага адмірання ідэі аднаўлення дзяржаўнасці на беларускіх землях у выглядзе Вялікага Княства Літоўскага. Таму напярэдадні паўстання 1830–1831 гг. сярод мясцовых зпаланізаваных эліт на першы план выйшла імкненне да аднаўлення Рэчы Паспалітай з далучэннем да яе беларуска-літоўскіх губерняў. Нацыянальны рамантызм і лібералізм складалі аснову светаўспрымання нешматлікіх тайных студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў 30–50-х гг. XIX ст., іх удзельнікі праяўлялі ліцвінскі патрыятызм, любілі і вывучалі родны край, што стварала неабходныя ўмовы для фарміравання ў недалёкім будучым беларускай нацыянальнай ідэі. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Еўропе ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі пачаў фарміравацца рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак.

«Дэмакратычнае таварыства» Ф. Савіча (1836–1838 гг.), «Саюз свабодных братоў» пад кіраўніцтвам братоў Ф. і А. Далеўскіх (1846–1849 гг.) ужо ўздымалі пытанне аб сацыяльным вызваленні сялянства і выступалі за права народаў на самавызначэнне. Члены «Дэмакратычнага таварыства» прапагандавалі ідэі дружбы народаў у барацьбе супраць расійскага самадзяржаўя. «Саюз свабодных братоў» выступаў за права нацый на самавызначэнне.

Прыкладана ў гэты час з польскамоўнага літаратурнага асяродку Беларусі выдзелілася беларуская школа, творчасць прадстаўнікоў якой было звязана з беларускай тэматыкай.

### 4. Паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі

У лістападзе 1830 г. у Варшаве пачалося паўстанне, кіраўнікі якога ставілі за мэту аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Вясной 1831 г. паўстанне ахапіла Літву і Заходнюю Беларусь. Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт як кіраўнічы орган узброенай барацьбы не змог цалкам кансалідаваць дзеянні паўстанцкіх атрадаў. Па сацыяльным складзе паўстанне насіла пераважна шляхецкі характар. Сялянства слаба ўдзельнічала ў паўстанцкім руху, паколькі не бачыла у ім вырашэння сваіх сацыяльных праблем. З тэрыторыі Польшчы ў Беларусь і Літву былі накіраваны узброеныя атрады, якія павінны былі стаць ядром паўстанцкага руху. Аб'яднаныя сілы паўстанцаў 19 чэрвеня 1831 г. спрабавалі захапіць Вільню, аднак безпаспяхова. Пасля гэтага паўстанне пайшло на спад і ў жніўні было практычна падаўлена. Яго ўдзельнікі былі рэпрэсіраваны, сотні з іх высланы, многія эмігрыравалі.

Зямельныя ўладанні паўстанцаў былі канфіскаваны. Пасля паўстання расійскімі ўладамі быў рэалізаваны комплекс мерапрыемстваў, якія быў накіраваны на ўніфікацыю заходніх губерняў да стандарта ўласна рускіх губерняў. Аднак гэта не вырашыла нацыянальнае пытанне, патрыятычны і рэвалюцыйна-дэмакратычны рух становіцца з часам больш радыкальным.

Канец 50-х – пачатак 60-х гг. XIX ст. – новы уздым польскага нацыянальнага руху, які ахапіў Польшчу, Літву і частку Беларусі. Кульмінацыяй яго стала паўстанне 1863–1864 гг. Аформіліся два яго крылы:

1) *“белыя”*, якія выступалі супраць паўстання як сродку вырашэння задач нацыянальнага руху, аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. шляхам дыпламатычнага націску заходнееўрапейскіх краін на расійскі ўрад;

2) *“чырвоныя”*, яны імкнуліся да ўздыму нацыянальна-вызваленчага паўстання.

Вясной 1862 г. быў створаны ў Варшаве Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК). Летам 1862 г. у Вільні быў арганізаваны Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), ён непасрэдна займаўся падрыхтоўкай паўстання ў Беларусі і Літве. У склад ЛПК уваходзілі Л. Звяждоўскі, Я. Козел-Паклеўскі, Б. Длускі, З. Чаховіч, К. Каліноўскі і інш. У пачатку 1860-х гг. былі створаны мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі: гродзенская, мінская, навагрудская і інш. “Левую” частку паўстанцаў у Беларусі ўзначальваў К. Каліноўскі (1838–1864). Разам з В. Урублеўскім і Ф. Ражанскім ён выдаваў на беларускай мове лацінскім шрыфтам газету “Мужыцкая праўда”. Газета тлумачыла сялянам характар адмены прыгоннага права, заклікала іх не верыць цару і са зброяй у руках ісці здабываць “сапраўдную волю і зямлю”. З кастрычніка 1862 г. К. Каліноўскі ўзначаліў ЛПК.

Паўстанне пачалося раней вызначанага тэрміну, у студзені 1863 г. у Варшаве, што стала нечаканасцю для рэвалюцыянераў Беларусі і Літвы. У спецыяльнай адозве ЦНК заклікаў насельніцтва Беларусі і Літвы далучыцца да руху. Паўстанне было для ўлад таксама нечаканым. Тактыка баявых дзеянняў, прынятая паўстанцамі, была непадобнай да падзей 1830–1831 гг., калі расійскія войскі мелі справу з рэгулярнай арміяй, сфарміраванай польскім паўстанцкім урадам. У час паўстання 1863–1864 гг. разгарнулася партызанская вайна.

1 лютага 1863 г. ЛПК звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам узняцца на ўзброеную барацьбу і падтрымаць паўстанне ў Польшчы. У сваім маніфесце ён прадубліраваў праграмныя дакументы польскага кіраўніцтва. Усе жыхары абвяшчаліся вольнымі і раўнапраўнымі. ЛПК абвясціў сябе Часовым урадам Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім. Першыя паўстанцкія атрады ў заходніх паветах Беларусі з’явіліся ў канцы студзеня 1863 г. з Царства Польскага. Мясцовыя фарміраванні пачалі ствараццца ў сакавіку-красавіку. Найбольш актыўна дзейнічалі паўстанцы на тэрыторыі Гродзенскай і Віленскай губерняў. У раёне Белавежскай пушчы паўстанцкі атрад стварыў В. Урублеўскі, які стаў военачальнікам Гродзенскай губерні. У Кобрынскім павеце ўзняў узброеную барацьбу Р. Траўгут – будучы дыктатар паўстанцаў у Польшчы. У Навагрудскім павеце дзейнічаў атрад У. Борзабагатага, на Міншчыне – А. Трусава і г. д. Аднак агульнага плана дзеяння паўстанцаў не было, адсутнічалі ўзаемадзеянне і ўзаемадапамога паміж атрадамі. Частка іх была знішчана царскімі войскамі яшчэ на стадыі фарміравання, іншым проста не хапала зброі і г. д. Найбольшага поспеху дамогся атрад Л. Звяждоўскага, які ў ноч на 24 красавіка захапіў г. Горкі.

Да канца вясны на ўсходзе Беларусі паўстанне было задушана. Толькі ў Гродзенскай губерні паўстанцы працягвалі ўпарта супраціўляцца.

Сярод кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху адсутнічала адзінства, разгарнулася барацьба за ўладу. Расійскім урадам былі кінуты буйныя сілы для падаўлення паўстання. У маі 1863 г. віленскім генерал-губернатарам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі быў прызначаны М.М. Мураўёў, які паралельна правёў шэраг мерапрыемстваў, якія павінны былі перацягнуць сялян на бок урада. Жорсткімі рэпрэсіўнымі мерамі адміністрацыя віленскага генерал-губернатара прымусіла многіх мясцовых памешчыкаў і вышэйшае каталіцкае духавенства адмовіцца ад падтрымкі паўстання.

Па сацыяльнаму складу ўдзельнікаў паўстанне было шляхецкім. У чэрвені 1863 г. былі арыштаваны многія члены Аддзела кіравання правінцыямі Літвы, некаторыя пакінулі свае пасады і эмігрыравалі. У склад Аддзела былі ўведзены К. Каліноўскі і І. Малахоўскі. Кіраўніцтва паўстаннем зноў перайшло ў рукі «чырвоных». У мясцовыя паўстанцкія арганізацыі былі прызначаны новыя кіраўнікі, але рэальных поспехаў дасягнуць не ўдалося. У канцы жніўня 1863 г. варшаўскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб спыненні ваенных дзеянняў. Асобныя паўстанцы ў Беларусі працягвалі барацьбу яшчэ восенню 1863 г. Летам 1864 г. была ліквідавана апошняя паўстанцкая арганізацыя ў Навагрудскім павеце. К. Каліноўскі ў студзені быў арыштаваны, а ў сакавіку пакараны смерцю на Лукішскай плошчы ў Вільні.

Паўстанне 1863–1864 гг. змяніла на наступныя дзесяцігоддзі ход грамадска-культурных працэсаў. Істотнае ўзмацненне русіфікацыі пасля падаўлення паўстання стала штуршком для пошукаў самаідэнтыфікацыі сярод інтэлігенцыі Беларусі.

### 5. Эканамічнае развіццё беларускіх зямель

Падзелы Рэчы Паспалітай, змена геапалітычных рэалій, уваходжанне у склад Расійскай імперыі істотна паўплывалі на кірунак і тэмпы эканамічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі. У 20-х гг. XIX ст. Беларусь са з'яўленнем першых фабрык і заводаў пачынаецца прамысловы пераварот. Узнікненне мануфактурна-фабрычнай сістэмы ў Беларусі адбылося ў мястэчках і невялікіх населеных пунктах, дзе не было рамесніцкай карпаратыўнай арганізацыі. Мануфактуры ў Беларусі адкрываліся перш за ўсё ў магнацкіх рэзідэнцыях, і іх з'яўленне выклікала супраціўленне з боку рамесніцкіх цэхаў.

Першыя мясцовыя фабрыкі былі таксама адкрыты ў дваранскіх маёнтках. Значная частка памешчыцкіх гаспадарак была нерэнтабельнай. Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі памяншалі сялянскія надзелы, абеззямельвалі прыгонных. Імкненне павялічыць даходнасць гаспадарак праз узмацненне эксплуатацыі сялянства сустракала яго супраціўленне.

Прамысловасць Беларусі развівалася ў кірунку перапрацоўкі пераважна мясцовай мінеральнай, лясной і сельскагаспадарчай сыравіны, аднак паступова некалькі змяніліся прыярытэты ў яе структуры. Найбольш буйныя фабрыкі і заводы знаходзіліся ў гарадах. Аднак 2/3 фабрык і заводаў Беларусі і амаль

палова занятых на іх рабочых былі сканцэнтраваны ў вёсцы. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена спецыялізацыяй беларускай прамысловасці і наяўнасцю ў сельскай мясцовасці таннай рабочай сілы.

Узровень развіцця прамысловасці ў Беларусі быў ніжэйшы, чым у сярэднім на еўрапейскай частцы Расійскай імперыі. Яе тэхнічнае пераўзбраенне да канца XIX ст. не завяршылася. У той жа час паралельнае існаванне рамесніцкіх майстэрняў, мануфактур і фабрык не сведчыла аб адсталасці прамысловага развіцця Беларусі. Яно было абумоўлена арыентацыяй на выкарыстанне пераважна сельскагаспадарчай сыравіны, перапрацоўка якой не патрабавала стварэння вялікіх прамысловых магутнасцей, а таксама структурай мясцовых працоўных рэсурсаў, наяўнасці вялікай колькасці танных працоўных рук.

У час буржуазных рэформаў 60–70-х гг. XIX ст. Беларусь лічылася найбольш падрыхтаванай часткай імперыі і выкарыстоўвалася ў якасці своеасаблівага палігона для іх выпрабаванняў, з другога боку, уплыў рэформ тут быў больш абмежаваны з-за асаблівасцей рэалізацыі ўрадавай палітыкі.

Абмежаванні ў рассяленні яўрэяў прывялі да штучнай канцэнтрацыі іх у гарадах і мястэчках Беларусі і дэфармавалі нацыянальны і часткова саслоўны склад насельніцтва. Гэта сітуацыя ўскладнялася адноснай слабасцю і невялікімі патрэбамі гарадской прамысловасці ў наёмнай рабочай сіле. Сотні тысяч беларускіх сялян вымушаны былі знаходзіць сабе працу на прадпрыемствах і гаспадарках у сельскай мясцовасці ці перасяляцца ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі.

Аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. прывёў да структурнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі – змянялася спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці ў жывёлагадоўчым кірунку (развіваюцца малочная гаспадарка, вінакурэнне і інш.).

Доўгі час асноўнымі шляхамі зносін у Беларусі з'яўляліся водныя, шашэйныя і грунтавыя дарогі, якімі карысталіся для арганізацыі ўнутранага і замежнага гандлю. Чыгуначнае будаўніцтва акрамя ваенна-стратэгічных задач змяніла транзітнае становішча Беларусі ў гандлі Расіі з заходнімі краінамі. Рэгіёны Беларусі, праз якія прайшлі чыгункі, атрымалі значны імпульс для свайго эканамічнага росту. У выніку чыгуначнага будаўніцтва асноўнымі вузламі і цэнтрамі транзітнага гандлю сталі Мінск, Гомель, Орша, Жлобін, Пінск, Мазыр, Слонім, Баранавічы, Лунінец і інш. Істотна скарацілася будаўніцтва сухапутных шляхоў. Толькі ў канцы XIX ст. пачынаецца пракладка новых шашэйных дарог.

Гады паміж рэвалюцыяй 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайной сталі часам імклівых перамен у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі.

Завяршэнне ў пачатку XX ст. прамыслова-тэхнічнага перавароту знайшло працяг у далейшай тэхнічнай мадэрнізацыі фабрычна-заводскай вытворчасці.

Адбываўся рост энергаўзбраення ва ўсіх галінах прамысловасці праз выкарыстанне паравых, электрычных машын, рухавікоў унутранага згарання.

Нягледзячы на поспехі ў развіцці прамысловасці, Беларусь у пачатку XX ст. заставалася аграрным рэгіёнам Расійскай імперыі. Каля 80 % даходу прыносіла сельская гаспадарка.

Агранамічная і тэхнічная дапамога з боку земскіх і ўрадавых установаў у час правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы, станоўча паўплывалі на культуру земляробства і жывёлагадоўлі. Паскарэнне тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтва ў прамысловасці, пераарыентацыя памешчыцкіх гаспадарак на рынак, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва спрыялі стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёну, што аб'ектыўна садзейнічала складванню нацыі. Пашырэнне гандлёва-эканамічных сувязяў паміж рознымі часткамі Беларусі дазволіла прадстаўнікам карэннай нацыянальнасці лепш самаўсвядоміць сваю этнічную агульнасць.

### 6. Заходнерусізм і краёвасць

У сярэдзіне XIX ст. сфарміраваліся інтэлектуальныя асяродкі А. Кіркора ў Вільні, В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску, А. Вярыгі-Дарэўскага ў Віцебску. Беларуская інтэлігенцыя, якая гуртавалася вакол іх, па грамадска-палітычных поглядах знаходзілася пераважна на ліберальных пазіцыях. Па нацыянальна-культурнай праграме прадстаўнікі названых асяродкаў з'яўляліся прыхільнікамі "краёвога", блізкага да беларускага па сваёй сутнасці, патрыятызму. Адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў беларускага лібералізму А. Кіркор зведаў нападкі як з боку прадстаўнікоў польскага грамадскага руху, так і расійскага.

"Краёвая" ідэя была шмат у чым працягам "ліцвінскага" патрыятызму ў Рэчы Паспалітай, звязанага з захаваннем аўтаноміі Вялікага Княства Літоўскага ў складзе дзяржавы. Моцным фактарам фарміравання "краёвасці" як палітычнай плыні стала палітыка русіфікацыі і абмежаванняў у дачыненні католікаў і яўрэяў, якая праводзілася ўрадам Расійскай імперыі на тэрыторыі Беларусі і Літвы пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Канчаткова "краёвасць" аформілася ў пачатку XX ст. Яе цэнтральнай ідэяй было сцвярджэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аўтаноміі з парламентам у Вільні для беларускіх і літоўскіх губерняў. У гады Першай сусветнай вайны гэта ідэя транфармавалася ў праект дзяржаўнай самастойнасці зямель былога Вялікага Княства Літоўскага. Адным з лідэраў краёўцаў у пачатку XX ст. быў Р. Скірмунт.

"Заходнерусізм" на самым пачатку свайго фарміравання як ідэалагічнай плыні меў пэўную ліберальную афарбоўку, што было звязана са спробай з боку рускамоўнага грамадска-культурнага асяродку даказаць няпольскасць беларусаў і тым самым аб'ектыўна садзейнічаць актывізацыі вырашэння пытання аб іх этнічным самавызначэнні.

Асноўныя прынцыпы ідэалогіі «заходнерусізму» былі распрацаваны ў сярэдзіне XIX ст. І. Сямашкам, М. Каяловічам, а таксама знайшлі

адлюстраванне на старонках часопіса «Вестник Западной России», які выдаваўся ў 60–70-я гг. ХІХ ст. К. Гаворскім.

Зыходным пастулатам “заходнерусізму” было сцвярджэнне, што беларусы з’яўляюцца не самастойным этнасам, а заходнім адгалінаваннем рускага народа. Сярод прыхільнікаў гэтай ідэалогіі вылучыліся дзве плыні: больш памяркоўная, ліберальная (М. Каяловіч, А. Пшчолка), і кансерватыўная (К. Гаворскі). Прадстаўнікі першай прызнавалі рэальнасць існавання адметных этнакультурных рыс Беларусі, адзначалі самакаштоўнасць беларускай культуры, магчымасць яе вывучэння для ўзбагачэння агульнарускай, але лічылі справу фарміравання нацыянальнай супольнасці як палітычна шкодную. Наогул прадстаўнікі ліберальнай плыні “заходнерусізму” унеслі значны ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі, развіццё яе статыстыкі, вывучэнне гаспадарчага жыцця; уносілі прапановы па рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, прамысловасці, сістэмы падаткаабкладання. Нярэдка яны свядома імкнуліся сваёй дзейнасцю палепшыць дабрабыт насельніцтва, супрацьстаяць пашырэнню папулярных у той час сярод моладзі сацыялістычных ідэй. Сярод іх сустракаюцца імёны вядомых даследчыкаў Я. Карскага, М. Нікіфароўскага і інш. Прыхільнікі кансерватыўнай плыні лічылі этнічныя асаблівасці беларусаў лакальна-дыялектнымі і вынікам польска-каталіцкай экспансіі, вартымі знішчэння для аднаўлення «рускага» характару краю. У далейшым “заходнерусізм” як ідэалогія і форма этнічнай самасвядомасці часткі гарадскога насельніцтва Беларусі страціў свой пэўны дэмакратызм і фактычна адмаўляў права карэннага насельніцтва на нацыянальную самабытнасць.

## 7. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі. Часопіс “Гоман” і дзейнасць беларускіх народнікаў

Беларускі нацыянальна-культурны рух, паводле аднаго вобразнага параўнання, узрастаў паміж спрэчкамі расійскіх і польскіх шавіністаў за ідэалагічна-культурнае і эканамічнае панаванне на тэрыторыі краю. У асяроддзі выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ў 1810-х – пачатку 1820-х гг. пачалі з’ўляцца парасткі ідэй будучага беларускага нацыянальнага адраджэння. Прафесары Віленскага ўніверсітэта М. Баброўскі, І. Даніловіч паклалі пачатак збірання і вывучэння помнікаў беларускага пісьменства XVI–XVII стст. Яны садзейнічалі абуджэнню цікавасці да гісторыі, культуры, вуснай народнай творчасці беларусаў-студэнтаў – сяброў таварыстваў філаматаў і філарэтаў, перш за ўсё Я. Чачота, Т. Зана і інш. Беларуская інтэлігенцыя таго часу фарміравалася пераважна з выхадцаў духавенства і збяднелай шляхты.

У 1817 г. з’явілася першая навуковая публікацыя, прысвечаная беларускай народнай культуры. У 1822 г. К.Ф. Калайдовіч надрукаваў у “Трудах общества любителей российской словесности” артыкул “О белорусском наречии”, у якім адзначаў асобнасць беларускай мовы ад рускай.

Вядомы чэшскі славіст П. Шафарык у 1842 г. выдаў даследаванне “Славянскі народапіс”, дзе ўпершыню пазначыў тэрыторыю пашырэння беларускай мовы.

У кнізе “Путешествие по Полесью и Белорусскому краю” П. Шпілеўскі акрэсліў ідэю аб чысціні беларускай мовы, яе блізкасці да старажытнай славянскай, пазбаўленасці іншамоўных уплываў.

У сярэдзіне XIX ст. асобныя творы на беларускай мове стварылі Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, У. Сыракомля. Беларуская мова стала асноўнай для творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. Вялікае значэнне для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці мела дзейнасць шматлікіх збіральнікаў і даследчыкаў фальклору, лінгвістаў, гісторыкаў, этнографаў. У другой палове XIX – пачатку XX ст. з’явіліся грунтоўныя працы І. Насовіча, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава. Я. Карскага, М. Доўнара-Запольскага і інш., з выдання якіх пачынаецца развіццё навуковага беларусазнаўства. Стадыя нацыянальнай гітацыі, звязаная з пашырэннем нацыянальнай свядомасці ў больш шырокія слаі насельніцтва, пачынаецца ў 80-х гг. XIX ст., найперш з дзейнасці народніцкай сацыяльна-рэвалюцыйнай арганізацыі “Гоман” і выдання аднаіменнага гектаграфічнага часопіса (1884 г.), беларускіх студэнцкіх арганізацый у Пецярбургу, Маскве.

У пачатку 80-х гг. XIX ст. узнікла беларуская народніцкая арганізацыя ў Пецярбургу. Ініцыятарам выступіла беларускае зямляцтва пры ўніверсітэце. У 1881 г. ім быў падрыхтаваны зварот “Да беларускай моладзі”, у якім інтэлігенцыя і студэнцтва заклікаліся да шырокай грамадскай дзейнасці на карысць Беларусі. З ліберальна-народніцкіх пазіцый былі падрыхтаваны і надрукаваны на гектографе пад псеўданімам *Даніла Баравік* “Лісты аб Беларусі” (снежань 1882 г.). Д. Баравік лічыў, што інтэлігенцыя павінна быць рухавіком народа на шляху яго прагрэсіўнага развіцця пры дапамозе сродкаў, якія адпавядалі ўмовам жыцця людзей і дапамагалі хуткаму фарміраванню самасвядомасці і грамадзянскай волі. Ён выводзіў асноўную задачу інтэлігенцыі Беларусі – культурна-асветніцкую: перш за ўсё, вывучэнне быту, звычаяў, традыцый, культуры, гісторыі беларускага народа. У адказ на іх з’явілася ў студзені 1884 г. “Пасланне да землякоў-беларусаў”, падпісанае псеўданімам Шчыры беларус, дзе ставілася задача барацьбы за звяржэнне самадзяржаўя. На думку аўтара гэтага публіцыстычнага твора, неабходна пазбавіцца ад ўсіх перашкод, якія стварае расійскае самаўладства на шляху новых ідэй, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення Беларусі. У гэты час з ініцыятывай аб’яднання ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі выступіла група “Гоман” у Пецярбургу, якая выпусціла два нумары аднайменнага перыядычнага органа. Арганізацыя ўтварылася па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам былых удзельнікаў Віцебскага рэвалюцыйнага гуртка А. Марчанкі і Х. Ратнера. У склад групы ўваходзілі М. Стацкевіч, У. Крупскі і інш. Яны падтрымлівалі сувязі з гурткамі Мінска, Магілёва, Віцебска і Гродна.

Гоманаўцы ўпершыню заявілі аб асобнасці беларускай нацыі і самастойных задачах беларускага нацыянальнага руху. Аўтарамі-выдаўцамі “Гомана” ў якасці цэнтральнай аб’яднальнай ідэі была прызнана задача абуджэння этнічнай самасвядомасці, нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення народа.

## 8. Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Беларусі

У канцы 1904 г. у Расійскай імперыі абвастрылася палітычная барацьба. Пачатак рэвалюцыі непасрэдна звязаны з расстрэлам 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу масавага мірнага шэсця рабочых, якія накіроўваліся да Зімовага палаца з петыцыяй аб паляпшэнні свайго становішча. Гэта падзея адразу ж знайшла водгук на тэрыторыі Беларусі, дзе студзеньскія палітычныя стачкі ахапілі 25 гарадоў і мястэчак, у іх удзельнічалі больш за 33 тыс. рабочых. З улікам усіх выступленняў антыўрадавы рух ахапіў 30 гарадоў і мястэчак. Ужо 11–17 студзеня прайшлі акцыі пратэсту ў Мінску. Яны ахапілі большасць фабрык і заводаў горада, прыватныя друкарні і рамесніцкія майстэрні. З 12 студзеня пачаліся сходы і мітынгі ў Гомелі. 16 студзеня забастоўка тут набыла агульнагарадскі размах, аднак да яе не далучыліся рабочыя самага вялікага прадпрыемства – чыгуначных майстэрняў. Усяго ў горадзе баставала каля 4 тыс. чалавек. У Смаргоні 13 студзеня забаставала каля 3 тыс. чалавек. Агульнагарадскія стачкі адбыліся таксама ў Гродна, Брэсце, Мазыры, Ашмянах і інш.

У лютым – сакавіку 1905 г. хваля палітычных выступленняў знізілася. Новы ўздым палітычнага рабочага руху быў звязаны са святкаваннем 1 мая. У красавіку – чэрвені ён ахапіў 56 гарадоў і мястэчак Беларусі. Разгарнуўся таксама сялянскі рух у такіх традыцыйных формах як парубкі панскіх лясоў.

Восенню 1905 г. адбыўся чарговы ўздым рабочага руху. У кастрычніку 1905 г. адбылася палітычная стачка, якая ахапіла амаль усю Расійскую імперыю.

Кастрычніцкая палітычная стачка прымусіла ўрад пайсці па шляху рэфармавання дзяржаўнага ладу. 8 кастрычніка 1905 г. кіраўнік урада С.Ю. Вітэ выступіў перад імператарам з прапановамі рэформ. Мікалай II даручыў С.Ю. Вітэ падрыхтаваць тэкст Маніфеста, які быў падпісаны 17 кастрычніка.

У дакуменце прадугледжвалася прадастаўленне насельніцтву свабоды слова, сумлення, саюзаў і сходаў. Ствараўся парламент з правам заканадаўчай ініцыятывы, без адабрэння якога не мог мець сілу ні адзін закон. За імператарам захоўвалася права распускаць Думу і накладваць вета на яе рашэнні.

Да насельніцтва Беларусі дайшлі чуткі аб дараваных свабодах. У Мінску 18 кастрычніка на плошчы Віленскага вакзала быў арганізаваны мітынг, куды сабраліся каля 15–20 тыс. маніфестантаў. Мітынг быў расстраляны з санкцыі мінскага губернатара П. Курлова, загінула да 100 чалавек, паранена каля 300 чалавек. Раніцай 18 кастрычніка адбыўся мітынг у Віцебску, удзельнікі якога патрабавалі ад улад пазнаёміць з тэкстам Маніфеста. У выніку мітынг быў разагнаны таксама з прымяненнем агнястрэльнай зброі. Кастрычніцкая палітычная стачка ахапіла ў Беларусі 32 населеныя пункты, колькасць стачачнікаў толькі ў прамысловасці дасягнула 66 тыс. чалавек. Снежаньская палітычная стачка ахапіла ў Беларусі 17 гарадоў і мястэчак, аднак нідзе справа не дайшла да ўзброенага паўстання.

Узмацненне рэпрэсіўных мерапрыемстваў з боку ўрада не спыніла рэвалюцыйны рух, аднак значна яго аслабіла. У лютым і сакавіку 1906 г.

назіраўся рэзкі спад рабочага руху. Параўнальна высокім заставаўся ўзровень сялянскага руху, аднак і ён у студзені 1906 г. у параўнанні з папярэднім месяцам знізіўся ўдвая.

У другой палове 1906 г. назіраўся спад рабочага руху, адбыліся толькі тры палітычныя стачкі. Эканамічная барацьба аднак прадаўжала быць выніковай, заканчвалася ў асноўным на карысць рабочых. У пачатку 1907 г. паглыбіўся спад у рабочым руху. Палітычных выступленняў не было зафіксавана, выніковасць эканамічных знізілася. Прадпрымальнікі ўсё часцей аб'яўлялі лакаўты. У выніку расло беспрацоўе, як вынік – зніжалася колькасць стачак і іх удзельнікаў.

У 1907 г. назіралася стомленасць і расчараванне шырокіх народных мас рэвалюцыйным рухам, яго вынікамі. 3 чэрвеня 1907 г. Мікалай II распусціў Думу і адначасова насуперак палажэнням уласнага Маніфеста ад 17 кастрычніка, а таксама Асноўных законаў Расійскай імперыі, змяніў выбарчы закон. Паводле Маніфеста ад 3 чэрвеня права адмяняць выбарчыя законы і выдаваць новыя захоўвалася за імператарам. Гэта падзея апазіцыйнымі сіламі была расцэнена як дзяржаўны пераварот і стала завяршэннем рэвалюцыі.

## 9. «Наша ніва» і беларуская нацыянальная ідэя ў пачатку XX ст.

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. сярод беларускай інтэлігенцыі ішла работа па фарміраванні беларускай нацыянальнай ідэі як асновы развіцця нацыянальна-культурнага руху, ідэалагічнай асновы нацытворчых працэсаў.

Фундаментам ідэалогіі беларускага вызваленчага руху стала публіцыстыка Ф. Багушэвіча. У прадмове да зборніка «Дудка беларуская», іншых творах ім дадзена гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне лёсу беларускага народа, падкрэслена пераемнасць багатых дзяржаўна-палітычных традыцый Вялікага Княства Літоўскага з сучаснымі задачамі сацыяльнага і палітычнага вызвалення і культурнага адраджэння беларускага народа.

На пачатку 90-х гг. XIX ст. у Маскве і Пецярбургу дзейнічалі арганізацыі беларускага студэнцтва пад кіраўніцтвам А. Гурыновіча, М. Абрамовіча і інш.

Вялікую ролю адыграла літаратурна-грамадская дзейнасць К. Каганца, А. Абуховіча і інш., краязнаўча-збіральніцкая праца Б. Эпімах-Шыпілы і г.д.

Існавалі Гурток моладзі польска-літоўскай, беларускай і маларускай, Кружок беларускай народнай прасветы і культуры. Былі спробы выпуску нелегальнай газеты "Свабода", заснавання Рэвалюцыйнай партыі Белай Русі. У 1902–1903 гг. на аснове нацыянальна-асветніцкіх гурткоў вучнёўскай і студэнцкай моладзі адбылася палітычная самаарганізацыя беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Была створана Беларуская рэвалюцыйная грамада. Яе стваральнікамі і кіраўнікамі выступілі браты Антон і Іван Луцкевічы, Э. Пашкевіч, А. Бурбіс, К. Каганец (К. Кастравіцкі), В. Іваноўскі і інш. У снежні 1903 г. адбыўся І з'езд Грамады, дзе яна характарызавалася як сацыяльна-палітычная арганізацыя беларускага працоўнага народа і атрымала назву Беларуская сацыялістычная грамада. Было вырашана дабівацца для Беларусі краёвай аўтаноміі з сеймам у Вільні.

Глыбокія якасныя змены адбыліся ў нацыянальным руху ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. Са з’яўленнем беларускамоўнага легальнага друку (“Наша доля», “Наша ніва”, пазней “Беларус”, “Лучынка” і інш.), пашырэннем прафесійных, грамадска-культурных аб’яднанняў і гурткоў (Беларускі настаўніцкі саюз, Гродзенскі гурток беларускай моладзі, Беларускі музычна-драматычны гурток і г. д.), заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі новыя формы і кірункі нацыянальна-культурнага руху.

Вызначальнай рысай урадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі пасля падаўлення рэвалюцыі стаў вялікадзяржаўны імперскі шавінізм, ідэолагі і мясцовыя прапагандысты якога не дапускалі існавання самастойнай беларускай нацыі. Падзел яе праводзіўся па канфесійнай прыкмеце: праваслаўны – рускі, католік – паляк.

Газета “Наша ніва”, заснаваная братамі А. і І. Луцкевічамі, А. Уласавым, А. Пашкевіч (Цёткай) і інш., выдавалася штотыднёва ў Вільні з лістапада 1906 г. да жніўня 1915 г. і садзейнічала выпрацоўцы ідэалогіі нацыянальнага руху. Выданне мела шырокую карэспандэнцкую сетку ва ўсіх кутках Беларусі, у многіх рэгіёнах Расіі, за мяжой. Вакол “Нашай нівы” аб’ядналіся аўтары розных веравызнанняў, палітычных поглядаў, якіх аб’ядноўвала жаданне нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. У 1914–1915 гг. рэдактарам-выдаўцом “Нашай нівы” быў Я. Купала.

Як своеасаблівыя дадаткі да газеты выходзілі “Календары”, брашуры, зборнікі: у 1910 г. – “Беларускі каляндар”; на аснове сельскагаспадарчага аддзела “Нашай нівы” з 1912 г. – часопіс “Саха”; з 1913 г. – літаратурны штомесячнік для моладзі “Лучынка”.

У Вільні ў студзені 1913 г. пачала выходзіць беларускамоўная штотыднёвая газета “Беларус”, якая імкнулася пераадолець рэлігійны раскол беларусаў, давесці, што “усе яны – адно племя, адзін народ”.

У 1908–1911 гг. у Вільні дзейнічала беларускае выдавецкае таварыства “Наша хата”, у 1906–1914 гг. – выдавецтвы “Мінчук”, “Палачанін”, “Саха”, “Вясёлка”. Аднак найбольш прыкметны ўклад у развіццё беларускай выдавецкай справы ў той час унесла суполка «Загляне сонца і ў наша аконца», якая была створана вясной 1906 г. у Пецярбургу. Ужо ў 1906 г. яе намаганнямі былі выдадзены “Беларускі лемантар, або першая навука чытання”, “Першае чытанне для дзетак беларусаў”. Характэрнай асаблівасцю беларускага нацыянальнага друку была параўнальна слабая дыферэнцыяцыя супрацоўнікаў па грамадска-палітычнай прыкмеце. У адных выданнях працавалі разам і сацыялісты, і лібералы, і будучыя хрысціянскія дэмакраты і інш. Усіх іх яднала прыналежнасць да беларускага нацыянальна-культурнага руху, агульнасць яго задач.

У 1913 г. у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута А. Сапуноў пачаў чытаць курс лекцый па гісторыі Беларусі. В. Ластоўскі ў 1910 г. выдаў першы абагульняючы нарыс “Кароткая гісторыя Беларусі”, дзе даў канцэптуальнае выяўленне нацыянальнай гісторыі. У пачатку XX ст. навуковае

абгрунтаванне этнічнай свядомасці знайшло адлюстраванне ў 3-томніку Я. Карскага “Беларусы”, даследаваннях М. Доўнар-Запольскага і інш.

Беларускі нацыянальны рух набыў больш масавы характар у час Першай сусветнай вайны. Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. паўстала надзённае пытанне аб утварэнні беларускай дзяржаўнасці. Яно знайшло і падтрымку значнай часткі беларускага насельніцтва і шляхі рэалізацыі ў абвяшчэнні спачатку Беларускай народнай рэспублікі, а затым у больш пэўным утварэнні БССР.

## *Лекцыя 4.* Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917-1941 гг.

### 1. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне

Расійская рэвалюцыя ў лютым 1917 г. стала адказам на тыя пытанні, якія не былі вырашаны шляхам рэформ. Важнейшым з іх для сялянскай краіны з’яўлялася пытанне аб зямлі. Разбурэнні і страты падчас вайны актуалізавалі патрабаванне міру. Народы Расійскай імперыі вайна прымусіла пашырыць барацьбу за сваё самастойнае існаванне. Не з’яўляліся выключэннем і беларусы. Прадстаўнікі сацыяльных слаёў і груп па рознаму бачылі шляхі вырашэння акрэсленых пытанняў. З сакавіка па лістапад 1917 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 26 палітычных партый і арганізацый, пераважна агульнарасійскіх. Вялікі ўплыў у гарадах і мястэчках меў Бунд. Актывізаваліся арганізацыі прапольскай, літоўскай і украінскай арыентаванасці. У сакавіку 1917 г. аднавіла сваю дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ).

З 25 па 27 сакавіка 1917 г. па ініцыятыве старшыні мінскай арганізацыі БСГ Аркадзя Смоліча адбыўся з’езд беларускіх палітычных партый і арганізацый, на якім прысутнічала каля 150 чалавек: прадстаўнікі БСГ, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, Беларускай партыі народных сацыялістаў, саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў і іншых арганізацый. Быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт для падрыхтоўкі выбараў у Беларускую краёвую раду на чале з Раманам Скірмунтам. Міністру-старшыні Часовага ўрада Г. Я. Львову накіравана запіска аб неабходнасці аўтаноміі для Беларусі. Аднак гэтая прапанова не знайшла падтрымкі, паколькі прадстаўнікі Часовага ўрада не лічылі беларусаў асобным народам.

8–10 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся II з’езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім была абрана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (з кастрычніка 1917 г. мела назву Вялікая Беларуская Рада – ВБР). Яна распачала намаганні па аб’яднанні нацыянальна арыентаваных сіл, аднак эсэры, меншавікі, бундаўцы былі супраць палітычнай аўтаноміі Беларусі.

Між тым, Часовы ўрад не змог вырашыць нават пытанні забеспячэння харчаваннем. Паражэнні на фронце і далейшае абвастрэнне сацыяльных праблем вызвалі наступны палітычны крызіс. Кансерватыўныя сілы здзейснілі спробу ўсталяваць ваенную дыктатуру, для чаго па загаду

галоўнакамандуючага Л.Г. Карнілава ў Петраград былі накіраваны вайсковыя падраздзяленні. Актыўны ўдзел у гэтых падзеях прынялі мясцовыя Саветы, якія ўзніклі ў Беларусі ў лютым – сакавіку 1917 г. Бальшавікі, якія ўзначалілі барацьбу супраць акцыі генерала Карнілава, значна павысілі свой аўтарытэт сярод рэвалюцыйна настроенай часткі насельніцтва. У верасні 1917 г. у ходзе перавыбараў Саветаў яны атрымалі большасць у Мінскім савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Сістэмны крызіс працягваўся. Часовы ўрад праяўляў эканамічную некампетэнтнасць, што вяло дэмакратычную рэвалюцыю да гібелі, а краіну да катастрофы. Разлік на перамогу ў Першай сусветнай вайне быў памылковым. Сяляне стаміліся чакаць аграрную рэформу. Лютаўская рэвалюцыя выклікала да жыцця магутны нацыянальна-вызваленчы рух, але Часовы ўрад не прапанаваў шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання.

Бальшавікі вырашылі скарыстаць сітуацыю, якая склалася ў сталіцы для захопу ўлады. У ноч з 24 на 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне рабочых і салдат. Увечары 24 кастрычніка атрады Чырвонай гвардыі, некаторыя вайсковыя часткі захапілі пошту, тэлеграф, вакзалы, масты. Вечарам 25 кастрычніка 1917 г. адкрыўся II Усерасійскі з’езд саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які прыняў рашэнне аб пераходзе ўлады да Саветаў. Быў заснаваны Савет народных камісараў у якасці Часовага рабочага і сялянскага ўрада (ўзначаліў Уладзімір Ленін), прыняты Дэкрэт аб зямлі і Дэкрэт аб міры.

26 кастрычніка 1917 г. выканкам Мінскага савета абвясціў аб пераходзе ўлады ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Супраць пераходу ўлады Саветам выступілі меншавікі, эсэры, бундаўцы, беларускія і яўрэйскія нацыянальна-дэмакратычныя партыі. 27 кастрычніка быў створаны Камітэт выратавання рэвалюцыі на чале з Т. Калатухіным, які увёў у Мінск часткі Каўказскай дывізіі, зняў вайсковыя пасты Мінскага савета, адхіліў прызначаных ім камісараў. Мінскі савет пагадзіўся на перадачу ўлады Камітэту пры ўмове, што войскі не будуць накіроўвацца на падаўленне паўстання ў Петраградзе і Маскве. У ноч з 1 на 2 лістапада ў Мінск увайшоў браніраваны цягнік, а таксама атрады рэвалюцыйных салдат, якія ўзялі пад абарону Мінскі савет. У канцы кастрычніка – пачатку лістапада савецкая ўлада ўсталявалася ў Віцебску, Гомелі, Полацку, Оршы і іншых гарадах. Абапіраючыся на створаныя пры вайсковых фарміраваннях Ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, бальшавікі праводзілі перавыбары Саветаў і забяспечвалі сабе большасць у іх складзе.

У лістападзе 1917 г. адбыліся з’езд саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, III з’езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, II з’езд армій Заходняга фронту. Яны прынялі рашэнне аб стварэнні адзінага органа кіравання. 26 лістапада быў сфарміраваны Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах), які узначаліў напачатку Мікалай Рагазінскі, а са студзеня 1918 г. – Аляксандр Мяснікоў (Мяснікян). З 170 яго членаў больш за 100 чалавек з’яўляліся ваеннаслужачымі, беларусаў было

ўсяго 3 (левыя эсэры). Непасрэднае кіраўніцтва было ўскладзена на створаны Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці (Карл Ландар). Кіраўніцтва створаных бальшавікамі структур не бачыла перспектыў беларускага нацыянальнага развіцця, меркавала, што стварэнне нацыянальных рэспублік стане перашкодай для сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Беларускія нацыянальныя партыі, якія не прынялі ўладу саветаў, пэўныя надзеі звязвалі з выбарамі ва Устаноўчы сход (лістапад 1917 г.) каб метадамі парламенцкай дэмакратыі дасягнуць поўнага нацыянальнага самавызначэння Беларусі. Выканкам Вялікай беларускай рады пачаў падрыхтоўку свайго Устаноўчага сходу – Усебеларускага з’езда, мэтай якога было стварэнне дэмакратычнай краёвай улады.

## 2. Абвяшчэнне БНР і утварэнне ССРБ

Знамянальнай падзеяй у гісторыі дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі стаў І Усебеларускі з’езд. Асноўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі з’езда сталі два палітычныя цэнтры – Вялікая Беларуская рада (з падпарадкаванай ёй Цэнтральнай Беларускай вайсковай радай) у Мінску і Беларускі абласны камітэт у Петраградзе. ВБР (старшыня Вячаслаў Адамовіч) гуртавала вакол сябе носьбітаў нацыянальнай ідэі, галоўным чынам прыхільнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады. Яны выступалі за абранне краёвага цэнтра ўлады, бясплатную перадачу зямлі працоўнаму народу, стварэнне нацыянальнага войска; развіццё беларускай культуры. У якасці канчатковай мэты вызначалася ўтварэнне аўтаномнай, дэмакратычнай Беларускай рэспублікі, якая б на роўных правах з Расіяй і іншымі рэспублікамі павінна была ўвайсці ў агульнарасійскі федэратыўны саюз.

Усебеларускі з’езд пачаў работу 5 снежня 1917 г., 14 снежня адбылося ўрачыстае адкрыццё. У ім прынялі ўдзел 1872 дэлегаты. З’езд прадстаўляў усё тагачаснае беларускае грамадства. Аблвыкамзах і Паўночна-Заходні камітэт РСДРП(б), усведамляючы пагрозу сваёй уладзе, вызначылі тактыку, накіраваную на зрыў Усебеларускага з’езда. 17 снежня на нарадзе з лідэрамі фракцый быў выпрацаваны тэкст пастановы аб самавызначэнні Беларусі і аб часовай краёвай уладзе. З’езд падтрымаў савецкую форму ўлады ў Беларусі, але выступіў за беларускія саветы, а створаныя бальшавікамі не прызнаваў. Бальшавіцкае кіраўніцтва Беларусі з мэтай захавання ўлады было вымушана выкарыстаць сілу. У ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. з’езд быў разагнаны, а члены прэзідыума з’езда (у тым ліку старшыня з’езда Іосіф Серада) і шэраг дэлегатаў былі арыштаваны. Разгон Усебеларускага з’езда перапыніў натуральны, легітымны шлях руху беларусаў у накірунку сучаснай суверэннай палітычнай нацыі. Высновы, што прагучалі на з’ездзе, сталі ідэйным падмуркам стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

Храналагічна першым крокам станаўлення беларускай дзяржаўнасці з’явілася абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтаму садзейнічаў шэраг знешніх і ўнутраных умоў. Перамовы на савецка-германскай мірнай канферэнцыі ў Брэсце ў канцы студзеня 1918 г. былі перапынены савецкай

бокам. Скарыстаўшы сітуацыю, Германія і Аўстра-Венгрыя 18 лютага 1918 г. аднавілі ваенныя дзеянні на ўсім фронце ад Балтыйскага мора да Карпат. У ноч на 19 лютага перад пагрозай наступлення германскіх войскаў кіраўнікі Аблвыкамзаха пакінулі Мінск. Выканаўчы камітэт Рады заявіў, што аб'яўляе сябе вышэйшай уладай у краі. 20 лютага быў створаны Народны сакратарыят на чале з Язэпам Варонка. 21 лютага, напярэдадні ўступлення нямецкіх войскаў у Мінск, Выканкам звярнуўся да народаў Беларусі з Першай Устаўной граматай, у якой дэкларавалася права беларускага народа на самавызначэнне.

3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй і Германіяй быў падпісаны сепаратны мірны дагавор, згодна з якім прыкладна 85 % этнічнай беларускай тэрыторыі адыходзіла Германіі, 15 % – Савецкай Расіі. Падпісанне Брэсцкага міру падштурхнула Выканаўчы камітэт Рады да выдання 9 сакавіка 1918 г. Другой Устаўной граматы. Гэтым дакументам, «у межах рассялення і лічбавай перавагі беларускага народа», зацвярджалася назва краіны: Беларуская Народная Рэспубліка. Меркавалася, што асноўныя законы зацвердзіць Устаноўчы Сойм, што будзе скліканы на асновах агульнага, роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права. Пацвярджаліся дэмакратычныя свабоды, 8-гадзінны працоўны дзень, адмена прыватнай уласнасці на зямлю. Між тым, тэрыторыя, на якой дэкларавалася ўлада Рады БНР, кантралявалася нямецкімі акупацыйнымі войскамі і савецкай Расіяй. Беларускія землі большасць еўрапейскіх палітыкаў лічыла часткай Расіі.

Дзейсных органаў кіравання на месцах ўрадам БНР створана не было. Усе намаганні кабінета Я. Варонкі былі накіраваны на здабыццё палітычнай падтрымкі з боку нямецкай адміністрацыі Обер-Оста ў Берліне. Але Германія з Савецкай Расіяй заключылі дамову аб непрызнанні Берлінам новых дзяржаўных утварэнняў, якія паўстануць на тэрыторыі Расіі пасля 3 сакавіка 1918 г. Перамовы з нямецкім урадам і стасункі з акупацыйнымі войскамі толькі кампраметавалі БНР. У германскіх войсках беларусы бачылі прыгнятальнікаў і ворагаў, якія неслі голад і разбурэнні. Адмова савецкага кіраўніцтва ад прызнання Беларускай Народнай Рэспублікі ставіла пытанне аб яе суб'ектнасці. У такіх умовах з'явілася Трэцяя Устаўная грамата. Яна ўпершыню аб'яўляла Беларусь незалежнай дзяржавай. Крокам адчаю з'явілася тэлеграма да імператара Германіі Вільгельма II з падзякай за вызваленне Беларусі ад панавання Расіі і з чарговай просьбай аб падтрымцы БНР як дзяржавы. Гэты крок быў вельмі негатыўна ўспрыняты левым крылом Беларускай Сацыялістычнай Грамады і прывёў да яе расколу. БСГ распалася на тры партыі: Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю, Беларускую партыю сацыял-рэвалюцыянераў і Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў.

Дататковым фактарам палітычнага крызісу Рады БНР летам і восенню 1918 г. з'явілася пашырэнне партызанскай барацьбы супраць нямецкіх акупацыйных войскаў. Не змог вырашыць задачу міжнароднага прызнання і змяніўшы Р. Скірмунта на пасадзе кіраўніка Народнага сакратарыята сацыял-федэраліст І. Серада. Без поспеху вярнулася дэлегацыя, накіраваная ў Кіеў у верасні 1918 г. пад кіраўніцтвам А. Луцкевіча. Вельмі складанымі для перамоў

былі пытанні аб дзяржаўнай мяжы. На перамовах з Савецкай Расіяй А. Луцкевіч, не адмаўляючы федэрацыі з Савецкай Расіяй, паставіў умову папярэдняга прызнання ўрада БНР.

У лістападзе 1918 г., пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Германіі нямецкія войскі пачынаюць пакідаць тэрыторыю Беларусі. Урад У. Леніна скасаваў усе папярэднія дамоўленасці з Германіяй, але БНР не была прызнана Савецкай Расіяй. У такіх умовах дзейнасць урада БНР захоўвала толькі фармальнае значэнне. Ініцыятыва ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць перайшла да той часткі дэлегатаў Усебеларускага з’езду, якія захавалі спадзяванні на супрацоўніцтва з урадам Савецкай Расіі. Пачаўся працэс стварэння Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (БСДРП), блізкай па сваёй ідэалогіі да бальшавікоў. 31 студзеня 1918 г. У. Леніным быў падпісаны дэкрэт, у адпаведнасці з якім ствараўся Беларускі нацыянальны камісарыят на правах аддзела Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей РСФСР. Камісарам Белнацкама да мая 1918 г. з’яўляўся Аляксандр Чарвякоў (пасля – Іван Лагун). Белнацкам станавіўся галоўным цэнтрам, які змагаўся за станаўленне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове: вёў палітычную і асветніцкую працу сярод беларусаў, клапаціўся пра бежанцаў, беларускія арганізацыі і ўстановы, якія былі эвакуіраваны падчас Першай сусветнай вайны; займаўся адкрыццём беларускіх школ і клубаў, выдаваў літаратуру на беларускай і рускай мовах. Ідэя беларускай савецкай рэспублікі набывала ўсё большую падтрымку. Аднак імкненне да беларускай дзяржаўнасці нават на аўтаномных пачатках цалкам ігнаравалася кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыкамзаха. Імкненне да нацыянальнага адраджэння ў любых формах яно разглядала як праявы сепаратызму і нацыяналізму.

Нігілістычная пазіцыя цэнтральнага савецкага кіраўніцтва і функцыянераў Заходняй вобласці ў адносінах да дзяржаўнасці Беларусі вызвала занепакоенасць. На канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б), што адбылася ў Маскве 21–23 снежня 1918 г., было прызнана неабходным стварыць Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, абраць Цэнтральнае бюро беларускіх секцый РКП(б) з пяці прыхільнікаў стварэння беларускай дзяржаўнасці на чале з Зміцерам Жылуновічам.

У лістападзе 1918 г. у Варшаве было абвешчана аб адраджэнні Рэчы Паспалітай. Ю. Пілсудскі заявіў аб аднаўленні дзяржавы ў межах 1772 г. Кіраўніцтва Рэчы Паспалітай не абмежавалася этнічнымі польскімі землямі. Польскі сейм заявіў, што “бацькаўшчына Касцюшкі, Міцкевіча і Траўгута належыць да Польшчы, як частка непадзельная”. Ужо ў снежні 1918 г. польская армія заняла Аўгустоўскі, Бельскі паветы. Першыя баі з падраздзяленнямі Чырвонай Арміі адбыліся ў студзені 1919 г.

Прэтэнзіі польскага боку на частку этнічна беларускіх зямель прымусілі бальшавікоў змяніць сваю пазіцыю. Было вырашана стварыць уздоўж заходняй мяжы Расіі своеасаблівы “санітарны кардон” з ліку прыбалтыйскіх рэспублік, Украінскай рэспублікі, а таксама Беларускай савецкай рэспублікі. 27 снежня

1918 г. на нарадзе работнікаў Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП(б) і прадстаўніка Паўночна-Заходняга абкама КП(б)было вырашана пытанне аб стварэнні Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада. У той жа дзень была акрэслена тэрыторыя Беларускай рэспублікі з пяці губерняў: Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай, а таксама вызначаны склад новага ўрада (старшыня і 15 членаў) і паўнамоцтвы рэспублікі.

30 снежня 1918 г. ў Смаленску пачала працу VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая падтрымала прпанову "абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай". Канферэнцыя абвясціла сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі – КП(б)Б. 1 студзеня 1919 г. быў абнародаваны "Маніфест Часовага Работніча-Сялянскага Ураду Беларусі", які быў напісаны З. Жылуновічам. Такім чынам стваралася Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусі. 5 студзеня 1919 г. Часовы ўрад ССРБ пераехаў ў Мінск. Для канчатковага завяршэння працэсу дзяржаўнага будаўніцтва было вырашана склікаць Усебеларускі з'езд саветаў.

### 3. Польска-савецкая вайна і другое абвяшчэнне ССРБ

Утварэнне беларускай дзяржаўнасці неадназначна было ўспрынята не толькі прадстаўнікамі нацыянальных дэмакратычных партый, але і ўдзельнікамі камуністычнага руху. 16 студзеня 1919 г. на пленуме ЦК РКП(б) было прынята рашэнне выдзеліць з беларускай рэспублікі Віцебскую, Смаленскую і Магілёўскую губерні ў склад РСФСР, а Мінскую і Гродзенскую губерні аб'яднаць з Літоўскай ССР. З гэтым не пагадзілася большая частка ўрада ССРБ, урад пакінулі тры наркамы – Фабіян Шантыр, Усевалад Фальскі, Язэп Дыла.

У рабоце І Усебеларускага з'езда Саветаў, які адбыўся 2–3 лютага 1919 г. прыняў удзел старшыня УЦВК РСФСР і сакратар ЦК РКП(б) Якаў Свярдлоў, які зачытаў пастанову ад 31 студзеня аб прызнанні незалежнасці ССРБ. З'езд прыняў Канстытуцыю рэспублікі, дэкларацыю аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР, а таксама рашэнне аб аб'яднанні сацыялістычных рэспублік Беларусі і Літвы ў адну "буферную" дзяржаву. 27 лютага 1919 г. у Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай рэспублік быў створаны сумесны ўрад. Савет Народных Камісараў Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел) узначаліў В. Міцкявічус-Капсукас.

Новае дзяржаўнае ўтварэнне так і не змагло прыступіць да рэалізацыі праграм сацыяльна-палітычнага развіцця. У лютым 1919 г. урад ЛітБел ССР спрабаваў спыніць польскую агрэсію на літоўска-беларускія землі, звяртаўся "да ўсіх народаў, усіх урадаў" з заклікам мірнага вырашэння спрэчных тэрытарыяльных пытанняў. 8 красавіка ЦВК Літоўска-Беларускай ССР уводзіць у рэспубліцы ваеннае становішча. Была праведзена мабілізацыя ў Чырвоную Армію. 1 чэрвеня 1919 г. быў прыняты Дэкрэт УЦВК РСФСР аб ваенна-палітычным адзінстве Украіны, Латвіі, Літвы і Беларусі на чале з

савецкай Расіяй. Заходні фронт быў умацаваны. Аднак летам польскія войскі перайшлі ў наступленне. Была занята Вілейка, потым Маладзечна, Лунінец.

У сувязі з захопам большай часткі тэрыторыі Літоўска-Беларускай Рэспублікі ў ліпені 1919 г. на пасяджэнні ЦК КП(б)ЛіБ было прынята рашэнне аб ліквідацыі Савета абароны ЛітБела і спыненні работы СНК. Так ўрад ЛітБела афіцыйна завяршыў сваю дзейнасць.

8 жніўня 1919 г. польскія войскі захапілі Мінск, у жніўні-верасні – Бабруйск, Барысаў, Жлобін, Рагачоў. Толькі ў кастрычніку іх наступленне было спынена. На захопленых тэрыторыях польскі ўрад стварыў Грамадзянскае кіраўніцтва ўсходніх зямель. Беларусь была падзелена на тры акругі (Віленскую, Брэсцкую, Мінскую), якія ў сваю чаргу дзяліліся на паветы. Было адноўлена памешчыцкае землеўладанне. Польскі рэжым выклікаў рост апазіцыйных настрояў сярод беларускіх палітычных партый і насельніцтва. На захопленай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі дзесяткі нелегальных партыйных камітэтаў, партызанскіх атрадаў. Акрамя бальшавікоў актыўна ўключылася ў партызанскую барацьбу Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), якая мела значны ўплыў у Гродзенскай, Віленскай, Мінскай губернях і з’яўлялася найбольш масавай палітычнай арганізацыяй.

Вясной 1920 г. адбыліся змены на польска-савецкім фронце. Польскія войскі пачалі наступленне на Палессі. Яны захапілі Мазыр, Калінкавічы. На аснове распрацаванага плана ваенных дзеянняў ў сярэдзіне мая пачалося наступленне Заходняга фронту ў Беларусі. 11 ліпеня быў вызвалены Мінск, 14 ліпеня – Вільня, 19 ліпеня – Гродна, 1 жніўня – Брэст. Была рэальная магчымасць аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аднак савецкае кіраўніцтва ў Маскве вырашала іншую задачу – правесці «саветызацыю Літвы і Польшчы». 12 ліпеня 1920 г. быў падпісаны мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР, згодна з якім значная частка беларускай тэрыторыі Гродзеншчыны і Віленшчыны (з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Вільня) была прызнана часткай Літвы. Дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны.

Мінск быў вызвалены ад польскіх войскаў у ліпені 1920 г. Для падрыхтоўкі Дэкларацыі аб абвяшчэнні беларускай дзяржаўнасці была створана камісія з прадстаўнікоў: партыі беларускіх эсэраў (Я. Бялькевіч, П. Берднік, І. Мамонька, М. Пашковіч), ЦК КП(б)Б (А. Чарвякоў, В. Кнорын), ад Беларускай камуністычнай арганізацыі (У. Ігнатоўскі) і ад Бунда (А. Вайнштэйн). Урачыстае абвяшчэнне ССРБ адбылося 31 ліпеня 1920 г. у памяшканні гарадскога тэатра. Беларуская рэспубліка абвяшчалася толькі ў межах Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мінскага, Слуцкага і Мазырскага паветаў. Таму дэкларацыю аб незалежнасці ССРБ не падпісалі прадстаўнікі БПС-Р, якія патрабавалі незалежнасці ССРБ у межах этнічнага самавызначэння.

Летам 1920 г. Чырвоная Армія правяла паспяховае наступленне на Варшаву і Львоў. Савецкі ўрад не прыняў да ўвагі ноту міністра замежных спраў Англіі Керзона (11 ліпеня 1920 г.) аб спыненні баявых дзеянняў на лініі Гродна – Брэст – Карпаты. У пачатку жніўня Чырвоная Армія вяла баі ўжо на

тэрыторыі Польшчы. Гэта выклікала магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым у Польшчы, спрыяла пашырэнню ваеннай, фінансавай дапамогі еўрапейскіх урадаў. Польскае камандаванне 14–16 жніўня 1920 г. флангавым ударам стварыла пагрозу акружэння Варшаўскай групоўкі савецкіх войскаў. Чырвоная Армія пачала паспешлівае адступленне, несучы вялікія страты. 21 жніўня польская армія заняла Брэст.

Жнівеньскія падзеі 1920 г. на польска-савецкім фронце падштурхнулі ваюючыя бакі да пачатку мірных перамоў. Такія перамовы пачаліся 17 жніўня 1920 г. у Мінску, а з 17 верасня – прадоўжыліся ў Рызе. Пазіцыя польскай дэлегацыі была падмацавана новым наступленнем войскаў, якія ў верасні захапілі Бярозу, Ваўкавыск, Пінск. 18 верасня ў Рыгу выехаў старшыня Саўнаркома ССРБ Аляксандр Чарвякоў. Аднак польская дэлегацыя не прызнала яго паўнамоцтвы. Не дапусцілі да перамоў і прадстаўнікоў БНР, якія прыехалі ў Рыгу 5 кастрычніка (А. Цвікевіч, У. Пігулеўскі).

12 кастрычніка 1920 г. адбылося падпісанне дагавора аб перамір'і і прэлімінарных умовах міру. Зацвярджалася дзяржаўная мяжа, пацвярджалася незалежнасць Украіны, Беларусі, а ваенныя дзеянні спыняліся 18 кастрычніка. Па ўмовах перамір'я Мінск заставаўся за савецкім бокам.

Толькі 18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор. Да Польшчы адышла амаль палова беларускай тэрыторыі (Гродзенская губерня, Навагрудскі, Пінскі, частка Слуцкага, Мазырскага і Мінскага паветаў Мінскай губерні, Лідскі, Ашмянскі, Дзіснянскі паветы Віленскай губерні, што складала 98,815 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 3,171 млн чалавек). Беларусы складалі большасць насельніцтва Заходняй Беларусі, аднак на дзяржаўным узроўні беларусаў кваліфікавалі нацыянальнай меншасцю, не прызнавалі іх права на самавызначэнне. Гэтыя тэрыторыі разам з Вільняй і бліжэйшымі ўсходнімі паветамі Літвы, захопленымі Польшчай яшчэ ў 1920 г., атрымалі неафіцыйную назву "Заходняя Беларусь", альбо "крэсы ўсходнія".

## 4. Стварэнне СССР. Фарміраванне тэрытарыяльных межаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР у 1919–1940 гг.

Пасля завяршэння грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, а таксама правалу спадзяванняў бальшавікоў на "сусветную пралетарскую рэвалюцыю" паўстала пытанне далейшага існавання савецкіх рэспублік, створаных на тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Ваенны саюз 1919 г. страціў актуальнасць, а ярка акрэсленых форм палітычнага суіснавання пакуль не існавала. Зразумела, што вяртання да ўнітарнай дзяржавы накшталт былой імперыі таксама не магло быць. У кіраўніцтве РСФСР аформілася дзве тэндэнцыі аб'яднальнай дзейнасці – сталінская "аўтанамізацыі" і ленінская "саюзная" (федэрацыі). Прапанова ўключыць савецкія рэспублік у склад Расійскай Федэрацыі як аўтаномныя адзінкіа стварала падставы для ўзнікнення сепаратысцкіх памкненняў. Ленінскі план прадугледжваў стварэнне саюзу незалежных самастойных савецкіх рэспублік (з правам выхаду), і гэты план атрымаў падтрымку ў рэспубліках.

У студзені 1921 г. згодна з дагаворам БССР і Савецкай Расіі ствараліся аб'яднаныя наркаматы (ваенны, знешняга гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносін, сувязі, ВСНГ) у СНК РСФСР. Пры ўрадзе Расіі стваралася Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР. У лютым 1922 г. савецкія рэспублікі, у тым ліку БССР даверылі Савецкай Расіі прадстаўляць іх інтарэсы на міжнароднай канферэнцыі ў Генуі, дзе вырашаліся пытанні пасляваеннага жыцця ў Еўропе. Актыўна праводзілася агітацыя за стварэнне саюзнай дзяржавы. У выніку большасць дэлегатаў IV Усебеларускага з'езда Саветаў (снежань 1922 г.) выказалася за стварэнне СССР. Была абрана беларуская дэлегацыя на X Усерасійскі з'езд Саветаў, яе узначаліў А.Чарвякоў.

На X Усерасійскім з'ездзе Саветаў 30–31 снежня 1922 г. (ён пераўтварыўся ў І з'езд Саветаў СССР) прадстаўнікамі РСФСР, Украінскай і Беларускай савецкіх сацыялістычных рэспублік, а таксама Закаўказскай федэрацыі Азербайджана, Грузіі і Арменіі (ЗСФСР) былі падпісаны Дэкларацыя аб стварэнні СССР і Саюзны Дагавор. Ад БССР гэтыя дакументы падпісаў А. Чарвякоў. Да кампетэнцыі саюзнага ўрада адносіліся пытанні знешняй палітыкі, гандлю, фінансаў, узброеных сіл, шляхоў зносін, сувязі. Вырашэнне астатніх пытанняў заставалася за ўрадамі рэспублік, і саюзнай Канстытуцыяй 1924 г. не рэгламентаваліся.

Пасля ўваходжання БССР у склад СССР паўстала новая праблема – неадпаведнасць тэрыторыі БССР (у 1922 г. – гэта 6 паветаў былой Мінскай губерні з колькасцю насельніцтва 1,5 млн. чалавек) і тэрыторыі, заселенай пераважна беларусамі.

У сакавіку 1923 г. кампартыя Беларусі звярнулася да кіраўніцтва РСФСР з прапановай вярнуць у склад БССР адабраныя ў студзені 1919 г. тэрыторыі. ЦК РКП(б) згадзілася з гэтай прапановай, але кіруючыя партыйныя работнікі беларускіх губерняў (Смаленскай, Віцебскай і Гомельскай) у складзе РСФСР выказаліся супраць. Патрабаваліся вялікія намаганні, актыўная раз'ясняльная праца, каб пераканаць іх у неабходнасці аб'яднання з БССР.

Адпаведна рашэнню ЦВК РСФСР ад 3 сакавіка 1924 г. да БССР было далучана 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай (былой Магілёўскай) і Смаленскай губерняў. Тэрыторыя павялічылася крыху болей, чым ў два разы, насельніцтва вырасла да 4,2 млн. чалавек.

У жніўні 1924 г. пачалася адміністрацыйная рэформа. Тэрыторыя БССР была падзелена на 10 акруг па 10 раёнаў. У межах кампактнага пражывання нацыянальных меньшасцяў ствараліся нацыянальныя Саветы (яўрэйскія, польскія, рускія, латышскія, нямецкія, украінскія). Аднак за межамі БССР засталася большая частка Гомельскай губерні і частка Віцебскай – Веліжскі, Себежскі і Невельскі паветы). На пачатку 1925 г. было зацверджана новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Стваралася новая трохузроўневая сістэма кіравання: акруга, раён, сельскі савет. Было створана 10 акруг: Бабруйская, Барысаўская, Віцебская, Калінінская, Магілёўская, Мазырская, Мінская, Аршанская, Полацкая і Слуцкая. Акругі аб'ядноўвалі 100 раёнаў і 1202 сельсаветы.

У лістападзе 1926 г. Палітбюро ЦК УКП(б) прыняло рашэнне аб передачы БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. З гэтага часу БССР уяўляла больш-менш адзіны культурны і гаспадарчы рэгіён, на тэрыторыі якого пражывала пераважная большасць прадстаўнікоў беларускай нацыі.

Працэсы цэнтралізацыі, якія вызначыліся на мяжы 20-30-х гг. XX ст. закранулі і адміністрацыйна-тэрытарыяльную сферу. Напачатку, у 1930 г. акругі ўвогуле былі ліквідаваны, на тэрыторыі БССР засталося толькі раённае дзяленне. Правы і функцыі акруговых выканкамаў перайшлі да раённых і гарадскіх саветаў. Больш за 100 раёнаў рэспублікі кіраваліся непасрэдна з цэнтра. Узнікшыя праблемы кіравання запатрабавалі стварэння прамежкавага звяна. У студзені 1938 г. у БССР існаваўшыя на той час 90 раёнаў рэспублікі былі размеркаваны паміж пяццю абласцямі: Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай, Палескай.

1939 г. з'явіўся годам значнага тэрытарыяльнага павелічэння БССР, бо адбылося гістарычнае ўз'яднанне беларускага народа ў складзе адной дзяржавы. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася болей чым на 100 тыс. кв. км, а колькасць насельніцтва ўзрасла да 10 млн. чал. Згодна новаму адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленню на аснове былых польскіх ваяводстваў стваралася пяць абласцей: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская. У 1940 г. у іх складзе быў выдзелены 101 раён. У палітычных інтарэсах пасля ўсталявання савецкай улады ў Літве і пры ўключэнні самой Літвы ў склад СССР саюзнае кіраўніцтва прыняло рашэнне перадаць частку тэрыторыі БССР у склад Савецкай Літвы. Афіцыйна гэта было афармлена як прапанова ўрада і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб далучэнні да Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Свенцянскага раёна і часткі тэрыторыі іншых раёнаў "з пераважна літоўскім насельніцтвам". У выніку тэрыторыя БССР скарацілася на 2,6 тыс. км$^2$.

## *Лекцыя 5.* Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея найноўшай гісторыі

### 1. Прычыны Другой сусветнай вайны

Падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны карэнным чынам паўплывалі не толькі на далейшае развіццё беларускай дзяржаўнасці, але і ўсёй гісторыі чалавецтва.

Прычыны Другой сусветнай вайны:

1) *супярэчнасці і праблемы Версальска-Вашынгтонскай сістэмы* дагавораў. Яна ў палітычным, эканамічным і ідэалагічным планах змяніла ўладкаванне пасляваеннай Еўропы, дала магчымасць прыйсці да ўлады нацыянал-сацыялістам на чале з А. Гітлерам. Пачатак рэалізацыі яго агрэсіўнай

праграмы, якую затым падтрымалі Італія і Японія, стварыў непасрэдную пагрозу развязвання новай ваеннай катастрофы сусветнага маштабу;

2) «*палітыка ўціхамірвання агрэсара*». Ва умовах міжнароднага напружання актуальнай з'яўлялася задача па кансалідацыі разнастайных палітычных сіл для супрацьстаяння пагрозе вайны. З ініцыятывай па стрымліванні патэнцыяльнага агрэсара выступіў СССР, які ў 1934 г. уступіў у Лігу Нацый і стаў пастаянным членам яе Савета. Працягам гэтай палітыкі стала падпісанне ў 1935 г. савецка-французскага і савецка-чэхаславацкага дагавораў. У гэты ж час у ўрадаў Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША мелася свая стратэгія дзеянняў па вырашэнні міжнародных супярэчнасцей – так званая "палітыка ўціхамірвання агрэсара", якая зводзілася да аслаблення германскага націску на Захад і накіраванню яго на Ўсход. Такая пазіцыя вядучых капіталістычных краін прывяла да паступовага ўзмацнення пазіцый фашысцкага блоку – Германіі, Італіі і Японіі. А. Гітлер парушыў шэраг умоў Версальскага дагавора, аднавіўшы ў 1935 г. усеагульную воінскую павіннасць і акупіраваўшы ў 1936 г. Рэйнскую дэмілітарызаваную зону. Адсутнасць адэкватнай рэакцыі з боку краін Захаду на дадзеныя крокі стварыла шырокае поле для далейшай дзейнасці агрэсара. У 1936 г. Германія падпісала пагадненне з Італіяй аб падзеле сфер уплыву, а з Японіяй – антыкамінтэрнаўскі пакт, да якога праз год далучылася Італія. У 1938 г. у склад Трэцяга рэйха была ўключана Аўстрыя. Таксама паводле рашэнняў Мюнхенскай канферэнцыі, якая праходзіла ў гэтым жа годзе пры удзеле кіраўнікоў урадаў Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі і Італіі, Судэцкая вобласць Чэхаславакіі была далучана да Германіі, што дало апошняй значныя стратэгічныя перавагі. І толькі пасля канчатковай акупацыі Чэхаславакіі і заключэння так званага "Стальнога пакту" – дагавора аб ваенна-палітычным саюзе Германіі і Японіі, вясной і летам 1939 г. аднавіліся трохбаковыя палітычныя і ваенныя перамовы Вялікабрытаніі і Францыі з СССР;

3) *пакт Рыбентропа–Молатава даў Германіі свабоду дзеяння для распаўсюджання агрэсіі супраць заходнееўрапейскіх краін*. Адсутнасць канструктыўнай пазіцыі з боку заходнееўрапейскіх краін і растучая напружанасць міжнароднага становішча абумовілі падпісанне 23 жніўня 1939 г. пакта Рыбентропа-Молатава – германа-савецкага дагавора аб ненападзенні тэрмінам на 10 гадоў. Да дакумента быў прыкладзены "Сакрэтны дадатковы пратакол", якім размяжоўваліся сферы ўзаемных інтарэсаў. Яго падпісанне ў абставінах вострага крызісу міжнароднага становішча, які шмат у чым з'яўляўся вынікам палітыкі ўціхамірвання агрэсара, стала вымушаным крокам для СССР. Прыняцце прапановы германскага боку было альтэрнатывай вайны на два франты – з нацысцкай Германіяй на захадзе і мілітарысцкай Японіяй на ўсходзе. У гэтых умовах Савецкі Саюз атрымаў дадатковы двухгадовы тэрмін на ўмацаванне абараназдольнасці і падрыхтоўку да сур'ёзнага выпрабавання, пачатак якога быў толькі пытаннем часу.

## 2. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР

У верасні 1939 г. над Еўропай навісла пагроза пачатку Другой сусветнай вайны. Савецкі Саюз, разумеючы непазбежнасць нападу, вёў перамовы аб стварэнні антыгітлераўскай кааліцыі. Аднак Францыя і Англія імкнуліся падштурхнуць агрэсію на усход, вынікам чаго з’явілася Мюнхенскае пагадненне. Імкнучыся выйграць час для падрыхтоўкі краіны да вайны, 23 жніўня 1939 г. Вячаслаў Молатаў ад імя СССР падпісаў у Маскве Дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, а таксама дадатковы пратакол да яго. Менавіта гэтыя дакументы стварылі знешнепалітычныя ўмовы для ўз’яднання беларусаў, якія супольна разам з палякамі змагаліся супраць нацысткай Германіі.

1 верасня 1939 г. гітлераўская Германія напала на Польшчу. Звязаныя з Польшчай дагаворам аб узаемнай дапамозе, Англія і Францыя 3 верасня 1939 г. аб’явілі вайну Германіі. Аднак практычна ваенных дзеянняў супраць фашысцкай Германіі яны не распачалі. Фармальна вайна набывала міжнародны характар, а ў сапраўднасці Польшча ваявала з гітлераўскай Германіяй адна. Маючы перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, германскія войскі акупавалі значныя тэрыторыі Польшчы, у склад якой па ўмовах Рыжскага міру ўваходзіла Заходняя Беларусь. Былі заняты некаторыя заходнебеларускія населеныя пункты, у тым ліку горад Брэст. Брэсцкую крэпасць у верасні 1939 г. у складзе польскага гарнізона динамічна абаранялі шмат беларусаў з польскага войска. Наркам замежных спраў СССР В. Молатаў 17 верасня 1939 г. уручыў польскаму паслу ў Маскве ноту, у якой паведамлялася, што савецкі ўрад аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці мяжу з Польшчай. Да 25 верасня 1939 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі была цалкам занятая Чырвонай Арміяй.

У некаторых раёнах Заходняй Беларусі яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі пад кіраўніцтвам былых членаў Кампартыі Заходняй Беларусі ствараліся ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, якія арганізоўвалі ўзброеныя атрады рабочых і сялян, раззбройвалі паліцэйскіх і асаднікаў, бралі пад ахову чыгуначныя масты і ваенныя аб’екты. Па меры прасоўвання Чырвонай Арміі па тэрыторыі Заходняй Беларусі ў ваяводскіх і павятовых цэнтрах ствараліся часовыя ўпраўленні. У іх склад уваходзілі рабочыя, прадстаўнікі інтэлігенцыі, а таксама Чырвонай Арміі. У вёсках і мястэчках на агульных сходах сялян абіраліся сялянскія камітэты.

Да верасня 1939 г. палітычным і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі была Вільня. Але па дагавору паміж урадамі СССР і Літвы, падпісанага 10 кастрычніка 1939 г., Вільня і Віленская вобласць агульнай плошчай 900 км$^2$, былі перададзеныя Літве. У выніку цэнтрам Заходняй Беларусі стаў Беласток.

22 кастрычніка 1939 г. прайшлі выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі. На Нацыянальным сходзе, які праходзіў у Беластоку 28–30 кастрычніка 1939 г., былі прыняты:

1) Дэкларацыя “Аб дзяржаўнай уладзе”, якая абвясціла пераход ўлады да Саветаў дэпутатаў працоўных;

2) Дэкларацыя “Аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР” са зваротам да Вярхоўных саветаў БССР і СССР з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у склад савецкай дзяржавы. 2 лістапада 1939 г. V пазачарговая сесія Вярхоўнага Савета СССР пастанавіла задаволіць просьбу Нацыянальнага сходу і ўключыла Заходнюю Беларусь у склад СССР. Пастанова пазачарговай ІІІ сесіі Вярхоўнага Савета БССР ад 12 лістапада 1939 г. аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР і іншыя.

У канцы 1939 – пачатку 1940 г. у заходнебеларускім рэгіёне былі створаны органы савецкай улады, партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Для іх умацавання з усходніх абласцей БССР накіроўваліся вопытныя спецыялісты. Адной з галоўных мэт у гэты час было ўмацаванне абароназдольнасці СССР, важным складнікам якой была нармалізацыя сітуацыі ў сферы народнай гаспадаркі на заходніх межах краіны. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі адбывалася рэканструкцыя існаваўшых раней і будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў.

Сацыялістычныя пераўтварэнні ў вёсцы – гэта раздача беззямельным і малазямельным сялянам звыш 1 млн га зямлі з мэтай далейшай арганізацыі калектыўных гаспадарак. У выніку да сярэдзіны 1940 г. на тэрыторыі былой Заходняй Беларусі пачалі функцыянаваць каля 430 калгасаў, якія аб’ядноўвалі звыш 23 тыс. сялянскіх гаспадарак.

У сацыяльнай сферы уводзіліся сістэма бясплатнага медыцынскага абслугоўвання, развіццё народнай асветы.

Насельніцтва аб’яднанай Беларусі самаахвярна працавала ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, тым самым умацоўвала абараназдольнасць краіны. Праводзіліся работы па ўдасканаленні інжынернага абсталявання заходняй мяжы, што прадугледжвала з’яўленне чатырох ўмацаваных раёнаў – Гродзенскага, Асавецкага, Замбраўскага і Брэсцкага – агульнай даўжынёй каля 450 км. Кожны з іх павінен быў мець глыбіню абароны ад 3 да 8 км. Аднак гатоўнасць новай лініі абароны (Лініі Молатава) на чэрвень 1941 г. складала прыкладна 15–20 %.

### 3. Напад нацысцкай Германіі на СССР

У час другога перыяда Другой сусветнай вайны (22 чэрвеня 1941 г. – 18 лістапада 1942 г.) адбываецца пашырэнне маштабаў баявых дзеянняў і крах германскага плана “маланкавай вайны” на Ўсходзе. Асабліва цяжкімі аказаліся першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны: 22 чэрвеня 1941 г. пасля нападзення гітлераўскіх войск на СССР, пачынаецца яго акупацыя. На баку Германіі выступілі Італія, Румынія, Венгрыя, Фінляндыя, Іспанія, фашысцкі ўрад Славакіі, урад Вішы (Францыя), які парваў дыпламатычныя адносіны з СССР.

На тэрыторыю Беларусі наступала адна з трох груповак Вермахта – група арміі “Цэнтр”, якой кіраваў генерал-фельдмаршал фон Бок, а таксама ІІ паветраны флот Германіі, які складаў 50 % авіяцыі. Удары наносіліся ў першую чаргу па ваенных аб’ектах, чыгуначных вузлах: Беласток, Брэст, Баранавічы. Савецкія пагранічнікі аказвалі рашучае, самаахвярнае супраціўленне. Уздоўж

заходняй граніцы Германіі працістаялі рагрупаваныя на глыбіню 400-600 км каля 50 дывізій Заходняй Асобай ваеннай акругі, якая з 22 чэрвеня 1941 г. была перайменавана ў Заходні фронт (да 2 ліпеня 1941 г. ім камандаваў Дз. Паўлаў). Сілы былі няроўныя, ужо 28 чэрвеня нямецкія танкі ўварваліся ў Мінск. 3-я, 4-я, 10-я арміі першага эшэлона прыкрыцця Заходняга фронту практычна перасталі існаваць.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання вымушана была перайсці да стратэгічнай абароны. Толькі 29 чэрвеня была абвешчана дырэктыва СНК СССР і ЦК УКП(б) з заклікам перайсці на ваенны лад – пачалася дадатковая мабілізацыя ваенаабавязаных, эвакуацыя ў савецкі тыл насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцяў. 30 чэрвеня быў утвораны Дзяржаўны Камітэт Абароны на чале з І.В. Сталіным.

Самаахвярна змагаліся савецкія лётчыкі. У першы дзень вайны ў небе Беларусі было збіта больш за 100 нямецкіх самалётаў. Пры гэтым лётчыкі Д. Кокараў (у раёне Замораў Беластоцкай вобласці), С. Гудзімаў (у раёне Пружан), П. Рабцаў (над Брэстам), А. Данілаў (каля Ліды) і іншыя таранілі варожыя самалёты ў паветры. Камандзір эскадрыллі М. Гастэла і члены яго экіпажа А. Бурдзянюк, Р. Скарабагаты, А. Калінін здзейснілі (пад Мінскам, каля Радашковіч) наземны таран, накіраваўшы свой самалёт на калону варожай тэхнікі.

Цяжкія баі вялі палявыя войскі Чырвонай Арміі у раёне Беластока, Гродна, Жабінкі, Маларыты і іншых населеных пунктаў рэспублікі, на падыходзе да Мінска, які абаранялі воіны двух стралковых карпусоў. Мужна трымалі абарону падраздзяленні 64-й, 100-й, 108-й і 161-й стралковых дывізій, якія дзейнічалі ў Мінскім умацаваным раёне. За першыя тры дні абароны Мінска салдаты 100-й дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра І. Русіянава знішчылі каля 100 варожых танкаў. Адсутнасць рэзерваў і прадуманай сістэмы абароны вымусіла пакінуць сталіцу, у акружэнне трапілі каля 350 тыс. салдат і афіцэраў 3-й, 4-й і 10-й і значная частка сіл 13-й савецкіх армій. Большасць асабістага складу была забіта, частка – трапіла ў палон. Аднак, нягледзячы на гэта, спроба германскіх войскаў з ходу фарсіраваць водны рубеж на Бярэзіне і выйсці да Дняпра не завяршылася поспехам. Тры дні ішлі цяжкія абарончыя баі ў раёне Барысава і ў самім горадзе, трохдзённы калідор даў магчымасць савецкім дывізіям заняць баявыя рубяжы на лініі Дняпра.

Абарона Магілёва (3–26 ліпеня) выйграла час для падрыхтоўкі наступных баёў. У гэты ж час (12–16 ліпеня) ішлі напружаныя баі за Оршу. Менавіта там 14 ліпеня ўпершыню нанесла ашаламляльны ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак (“кацюш”) пад камандаваннем капітана *І. Флёрава*. Жорсткія баі летам 1941 г. адбыліся пад Бабруйскам, Рагачовам, Жлобінам, Гомелем. У жніўні 1941 г. 20 дзён абараняўся Гомель, дзе вораг страціў больш за 80 тыс. чалавек і значную колькасць баявой тэхнікі. У Віцебску, Гомелі, Магілёве, Пінску, а таксама ў Кастрычніцкім, Ельскім, Лельчыцкім, Рагачоўскім і іншых раёнах ствараліся знішчальныя батальёны, групы самаабароны, якія разам з Чырвонай Арміяй абаранялі свае гарады і вёскі.

Нягледзячы на гераічнае супраціўленне часцей Чырвонай Арміі, да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нацысцкімі захопнікамі. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі далі магчымасць савецкаму камандаванню разгарнуць войскі другога стратэгічнага эшалона на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна–Днепр і мабілізаваць непасрэдныя рэзервы краіны. Падчас абарончага этапа Вялікай Айчыннай вайны войскі Чырвонай Арміі страцілі 1,5 млн. чалавек забітымі, параненымі і палоннымі. Людскія страты групы арміі "Цэнтр" былі ніжэйшымі ў 10 разоў, страты ў тэхніцы – ніжэйшыя ў 5 разоў. Да канца лістапада 1941 г. былі захоплены Украіна, Беларусь, Літва, Латвія, Эстонія, шэраг заходніх абласцей РСФСР.

Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі перашкодзілі здзяйсненню Германіяй плана "маланкавай вайны" пад назвай "Барбароса", што развеяла міф аб непераможнасці нямецкага Вермахта.

### 4. Акупацыйны рэжым у Беларусі

На акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў чэрвені 1941 – ліпені 1944 гг. быў усталяваны рэжым тэрору, для якога была характэрна сістэма палітычных, эканамічных, ваенных і ідэалагічных мер. Мэтай гэтага рэжыму была не проста ліквідацыя савецкага грамадска-дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, але і ачыстка гэтай тэрыторыі ад мясцовага насельніцтва.

Акупантамі быў ажыццёўлены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі паводле *"Інструкцыі пра асобныя вобласці"* (план дэцэнтралізацыі і расчлянення тэрыторыі СССР). Беларускія тэрыторіыі увайшлі ў:

1) рэйсхкамісарыят "*Украіна*" (паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей) у

– генеральную акругу "*Валынія-Падолія*";

– генеральную акругу "*Жытомір*" (паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей);

2) рэйхскамісарыят "*Остланд*" (рэзідэнцыя ў Рызе) у:

– генеральную акругу "*Латвія*";

– генеральную акругу "*Літва*" (паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці);

– генеральную акругу "*Беларусь"* (10 акругоў (гебітаў): Баранавіцкі, Барысаўскі, Вілейскі, Ганцавіцкі, Глыбокскі, Лідскі, Мінскі, Навагрудскі, Слонімскі, Слуцкі). На чале генакругі стаяў генеральны камісар гаўляйтар В. Кубэ, які праводзіў чалавеканенавісніцкую палітыку нацызму. Пасля знішчэння В. Кубэ мінскімі падпольшчыкамі ў 1943 г. яго месца заняў групенфюрэр войск СС К. Готберг;

3) *Усходнюю Прусію* (паўночна-заходнія раёны Брэсцкай і Беластоцкай абласцей з гарадамі Гродна і Ваўкавыск);

4) зону армейскага тылу групы армій "*Цэнтр*" (тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, большыя часткі Гомельскай і ўсходніх раёнаў Мінскай абласцей).

Кіраванне акругамі здзяйснялі гебітскамісары, гарадамі – штабскамісары, раёнамі – ортскамісары. Для знешняга самакіравання і ўзмацнення ўплыву на

насельніцтва з мясцовых жыхароў выбіралі ўправы, а ў вёсках прызначаліся старасты, солтасы і войты. На іх ускладвалася функцыя правядзення ў жыццё акупацыйных адміністрацыйных і гаспадарчых мерапрыемстваў.

Рост партызанскага руху прымусіў акупантаў стварыць паліцэйскія фарміраванні з ліку *калабарацыяністаў* (асоб, якія наўмысна супрацоўнічалі з ворагам). У адрозненне ад іншых савецкіх рэспублік, жыхары Беларусі не так актыўна ішлі на службу да акупантаў. Таму недахоп мясцовых калабрацыяністаў акупацыйныя ўлады кампенсавалі ўкраінскімі, літоўскімі і латышскімі паліцэйскімі батальёнамі.

Акупанты прыцягвалі да супрацоўніцтва прадстаўнікоў нацыянальных арганізацый (Беларускай Цэнтральнай Рады, Беларускай саюз самапомачы, Беларуская народная самапомач, Беларускі корпус самааховы, Саюз беларускай моладзі, Беларуская краёвая абарона). Апошняй акцыяй гэтых калабарацыяністаў стаў Другі Усебеларускі Кангрэс 27 чэрвеня 1944 г. у Мінску. Але акупанты не мелі планаў стварыць альтернатыўную савецкай беларускую дзяржаўнасць. Не атрымаўшы шырокай падтрымкі сярод насельніцтва акупаванай тэрыторыі Беларусі, гэтыя нацыяналісты працягвалі сваю антысавецкую дзейнасць на Захадзе. Такім чынам, уся паўната ўлады належала выключна германскай ваеннай і грамадзянскай акупацыйнай адміністрацыі.

### 5. Нямецка-фашысцкі генацыд і дэмаграфічныя страты Беларусі ў вайне. Халакост

Галоўным сродкам ажыццяўлення сваёй палітыкі на акупаваных тэрыторыях фашысты зрабілі палітыку *генацыду* – фізічнага знішчэння поўнасцю або часткова асобных груп насельніцтва (расавых, нацыянальных, палітычных, рэлігійных).

5 студзеня 2022 г. быў падпісаны Закон Рэспублікі беларусь “Аб генацыдзе беларускага народа”, паводле якога пад генацыдам разумеюцца здзейсненныя ў гады вялікай айчыннай вайны і пасля ваенны перыяд нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі, нацыяналістычнымі фарміраваннямі злачынствы, скіраваныя на планамернае фізічнае знішчэнне беларускага народа шляхам забойства і іншых дзеянняў.[1]

На аснове генеральнага плана “Ост” – плана каланізацыі і германізацыі захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза, прадугледжвалася высяленне і знішчэнне народаў Усходняй Еўропы. Нацысты на працягу 30 гадоў планавалі вынішчыць 31 мільён славян (з іх 75 % беларусаў).

Задачам вынішчэння насельніцтва ў час карных аперацый служылі спецкаманды і аператыўныя каманды: “А” – на поўначы, “В” – на Беларусі, “С” – на Украіне, “Д” – на поўдні СССР. Усяго за час акупацыі іх было праведзена на Беларусі 140.

---

[1] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 178.

На Беларусі дзейнічала больш *260* канцэнтрацыйных лагероў смерці, іх філіялаў і падраздзяленняў. З іх 110 – для мірнага насельніцтва, у тым ліку 70 гета для яўрэйскага насельніцтва. Лагеры для ваенапалонных знаходзіліся ў распараджэнні ваеннага камандавання, лагеры для грамадзянскіх – у кіраванні СС і гестапа. За час вайны на беларускіх землях было знішчана ў зоне акупацыі – 1,4 млн. чалавек, іх 700 тыс. – у лагерах. Толькі ў адным Трасцянецкім лагеру было знішчана больш 206 тысяч грамадзян.

Гвалтоўная асіміляцыя і ператварэнне маленькіх беларусаў і палякаў у немцаў – гэта таксама генацыд. За час акупацыі з Беларусі ў Германію было вывезена 30 тыс. дзяцей.

Жудаснай з’явай часоў вайны стаў *Халакост* – пераследаванне і масавае знішчэнне яўрэяў, якія жылі ў Германіі, краінах-саюзніках і на акупаваных імі тэрыторыях. Тут дзейнічалі Нюрнбергскія расавыя законы, паводле якіх прадугледжвалася ізаляцыя асоб яўрэйскага паходжання ў гета і канцэнтрацыйныя лагеры дзеля далейшага знішчэння. На тэрыторыі Беларусі ў гета нацысты змясцілі сотні тысяч яўрэяў як з ліку жыхароў БССР, так і з Аўстрыі, Венгрыі, Галандыі, Германіі, Польшчы, Францыі, Чэхаславакіі і іншых краін. Даследчыкам да гэтага часу дакладна не вядома, колькі ўсяго яўрэйскага насельніцтва было знішчана на тэрыторыі Беларусі за гады акупацыі; па розных падліках – ад 455 тыс. да 800 тыс. чалавек.

Паводле ўдакладненых звестак, агульныя людскія страты Беларусі склалі не менш 2,8–3 млн. чалавек.

### 6. Размах і значэнне партызанскага і падпольнага руху ў Беларусі. Удзел беларусаў у ключавых бітвах Вялікай Айчыннай вайны

На тэрыторыі Беларусі ўсенародная барацьба супраць нацысцкіх захопнікаў разгарнулася ўжо ў першыя дні. На другі дзень вайны быў створаны атрад “Старасельскі” (Жабінкаўскі раён) пад кіраўніцтвам маёра В. Дародных, у склад якога ўваходзілі мясцовыя жыхары, а таксама пагранічнікі і воіны 125-га і 84-га стралковых палкоў. На пяты дзень вайны быў сфарміраваны Пінскі партызанскі атрад пад кіраўніцтвам *В. Каржа*. Да ліку першых належаць атрад «Чырвоны кастрычнік», які дзейнічаў у Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці спачатку пад кіраўніцтвам *Ц. Бумажкова*, затым – *Ф. Паўлоўскага*, а таксама Суражскі атрад у Віцебскай вобласці пад кіраўніцтвам *М. Шмырова*. У ліпені 1941 г. у Беларусі дзейнічалі 35 партызанскіх атрадаў, у жніўні – 61.[2]

Восенню–зімой 1941 г. партызанскі рух пайшоў на спад па прычыне недахопу матэрыяльнага забеспячэння, належнай падрыхтоўкі, а таксама каардынацыі і ўзаемадзеяння партызанскіх атрадаў і груп. З мэтай цэнтралізацыі кіраўніцтва партызанскім рухам з канца 1941 г. пачалася праца па стварэнні Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) пры Стаўцы

[2] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 185.

Вярхоўнага Галоўнакамандавання, які быў сфарміраваны 30 мая 1942 г. (ўзначаліў першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка).

9 верасня 1942 г. з мэтай каардынацыі дзейнасці партызан на тэрыторыі Беларусі, удасканалення арганізацыйнай структуры партызанскіх фарміраванняў, забяспячэння партызан зброяй быў створаны Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР) (другі сакратар ЦК КП(б)Б П. Калінін).

Спрыяла арганізацыі антыгітлераўскай барацьбы з'яўленне так званых Віцебскіх або Суражскіх варот – 40-кіламетровага прарыву германскага фронту на стыку баявых парадкаў нямецкіх груп армій "Поўнач" і "Цэнтр", які праіснаваў з 10 лютага па 28 верасня 1942 г.

Адбывалася ранжыраванне партызанскага руху па вайсковым прынцыпе – з разрозненых атрадаў ствараліся брыгады, якія ўваходзілі ў партызанскія злучэнні, колькасць якіх на тэрыторыі Беларусі дасягала прыкладна 40. Імі вызваляліся вялікія тэрыторыі і ствараліся партызанскія зоны. Функцыянавала каля 20 партызанскіх зон – Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Івянецка-Налібоцкая, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская, Суражская і інш.

Адной з найбольш грандыёзных па сваіх маштабах аперацыяй, якая была праведзена партызанамі Беларусі ў 1943–1944 гг., стала аперацыя пад кодавай назвай «Рэйкавая вайна», мэтай якой быў масавы падрыў чыгунак для дэзарганізацыі мілітарызаваных перавозак ворага.

Першы этап рэйкавай вайны быў прымеркаваны да наступлення Чырвонай Арміі на Белгародска-Харкаўскім напрамку і працягваўся з 3 жніўня да сярэдзіны верасня 1943 г.

Другі этап аперацыі пад кодавай назвай «Канцэрт» (25 верасня па 1 лістапада 1943 г.) скараціў чыгуначныя перавозкі ў тыле ворага амаль на 40 %.

Трэці этап аперацыі (20 чэрвеня па 28 жніўня 1944 г.) ішоў з удзелам усіх мясцовых партызанскіх фарміраванняў, што садзейнічала поспехам Чырвонай Арміі ў вызваленні тэрыторыі Беларусі ад акупантаў.

*Падпольныя* цэнтры, арганізацыі і групы таксама пачалі ўзнікаць з першых дзён акупацыі Беларусі. Падпольшчыкі выпускалі газеты, лістоўкі, праводзілі дыверсійныя акты на чыгунцы і прадпрыемствах, збіралі і перадавалі ў партызанскія атрады звесткі аб руху нямецкіх ваенных эшалонаў, планы размяшчэння варожых ваенных аб'ектаў і г.д. Усяго на акупаванай тэрыторыі БССР дзейнічала:

1) 184 падпольныя арганізацыі КП(б)Б;

2) 10 абласных і 213 міжраённых, гарадскіх і раённых падпольных камітэтаў ЛКСМБ.

Такім чынам, у партызанскіх злучэннях ваявала больш за 374 тыс. чалавек. Яшчэ каля 70 тыс. чалавек дзейнічала ў падполлі.

За самаадданасць, мужнасць і адвагу ў вызваленчай антыфашысцкай барацьбе больш за 140 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, а 92 з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Не ўсе атрымалі ўзнагароды пры жыцці, але подзвіг, здзейснены

нашымі суайчыннікамі, назаўжды застанецца ў памяці беларускага народа і народаў былых савецкіх рэспублік.

## 7. Вызваленне Беларусі. Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён"

Вызваленне тэрыторыі БССР праходзіла ў 2 этапы. Першы праходзіў восенню 1943 – зімой 1944 г., калі была вызвалена ўсходняя і частка паўднёвай Беларусі. 23 верасня 1943 г. Чырвоная Армія вызваліла першы беларускі раённы цэнтр – Камарын, а 26 лістапада 1943 г. – першы абласны цэнтр Беларусі – Гомель.

Напярэдадні вызвалення Беларусі (з 19 верасня па 1 лістапада) партызаны ажыццявілі другі этап «Рэйкавай вайны». У выніку аперацыі быў паралізаваны рух не толькі чыгуначнага транспарту, але аўтатранспарту нямецка-фашысцкіх войск. Да пачатку 1944 г. Чырвоная Армія разам з беларускімі партызанамі вызваліла 40 раёнаў рэспублікі, у тым ліку амаль поўнасцю Гомельскую вобласць, часткі Віцебскай, Магілёўскай і Палескай абласцей. У баях за вызваленне Беларусі ўдзельнічала 1-я польская пяхотная дывізія імя Т. Касцюшкі, сфарміраваная на тэрыторыі СССР. Рэчыца стала першым беларускім горадам, у гонар вызвалення якога 18 лістапада 1943 г. у Маскве быў дадзены артылерыйскі салют.

З 21 па 24 сакавіка 1944 г. ў прыгарадзе Гомеля (Новай Беліцы) адбылася шостая сесія Вярхоўнага Савета БССР, дзе было прынята рашэнне аб пашырэнні паўнамоцтваў рэспублікі: аб стварэнні наркаматаў абароны і замежных спраў.

Другі этап вызвалення тэрыторыі Беларусі – правядзенне Беларускай наступальнай аперацыі "Баграціён" (23 чэрвеня – 29 жніўня 1944 г.). Перад Чырвонай Арміяй стаяла задача поўнасцю вызваліць савецкую тэрыторыю ад гітлераўскіх захопнікаў, аказаць дапамогу народам Еўропы ў вызваленні ад фашызму, канчаткова разграміць ворага.

Вясной 1944 г. на беларускім кірунку захоўвалася стабільнасць. Група армій «Цэнтр» утрымлівала свае пазіцыі. У выніку наступлення войскаў Чырвонай Арміі восенню 1943 – зімой 1944 г. утварыўся выступ у лініі фронту, – "беларускі балкон". Лінію абароны нямецкае камандаванне называла "Фатэрлянд" ("Айчына") і старанна ўмацавала.

У ноч на 20 чэрвеня беларускія партызаны ажыццявілі трэці этап "рэйкавай вайны" з мэтай дэзарганізацыі ваенных перавозак. Дзеянні партызан былі высока ацэнены праціўнікам ужо пасля вайны.

Ажыццяўлялі аперацыю "Баграціён" войскі 4 франтоў (з поўначы на поўдзень): 1-ы Прыбалтыйскі (камандуючы – генерал арміі І.Х. Баграмян) , 3- і Беларускі (камандуючы – генерал арміі І.Д. Чарняхоўскі), 2-і Беларускі (камандуючы – генерал арміі Г.Ф. Захараў) і 1-ы Беларускі (камандуючы – маршал СССР К.К. Ракасоўскі); Дняпроўская ваенная флатылія (камандуючы – капітан 1-га рангу В.В. Грыгор'еў), войскі супрацьпаветранай абароны,

беларускія партызаны, Першая армія Войска Польскага. Каардынавалі іх дзеянні маршалы Г.К. Жукаў і А.М. Васілеўскі.

*Першы этап* наступальнай аперацыі "Баграціён" – 23 чэрвеня – 4 ліпеня 1944 г. быў накіраваны на Мінск з мэтай акружэння і знішчэння групы армій "Цэнтр". Утварылася некалькі такіх "катлоў" (віцебскі, мінскі і інш.0.

Раніцай 3 ліпеня 1944 г. 2-гі танкавы корпус пад камандаваннем А.С. Бурдзейнага, пераадолеўшы супраціўленне ворага, уварваўся ў Мінск. Першым гэта зрабіў экіпаж танка на чале з Д. Фролікавым. Услед за танкістамі ў горад увайшлі 11-я і 31-я арміі 3-га Беларускага фронту. У сярэдзіне дня ў горад уступіў 1-ы танкавы корпус генерала М.Ф. Панова, а за ім 3-я армія 1-га Беларускага фронту. У мінскім "катле" было знішчана 70 тыс. і ўзята ў палон каля 35 тыс. гітлераўскіх салдат і афіцэраў. У выніку ваенных дзеянняў савецкіх войск нямецкая група армій "Цэнтр" была разбіта.

16 ліпеня 1944 г. у Мінску адбыўся ўрачысты парад партызан, у якім удзельнічала больш за 30 тыс. чалавек.

*Другі этап* аперацыі "Баграціён" – 5 ліпеня – 29 жніўня 1944 г. Савецкія войскі 16 ліпеня вызвалілі Гродна, а 28 ліпеня – Брэст. У ходзе Беларускай наступальнай аперацыі была разгромлена група армій "Цэнтр" і іншыя вайсковыя групоўкі праціўніка. Савецкія войскі вызвалілі ад германскіх акупантаў частку тэрыторыі Літвы і Латвіі, выйшлі на мяжу з Усходняй Прусіяй і Польшчай.

17 ліпеня 1944 г. у Маскве быў арганізаваны "парад" нямецкіх ваеннапалонных – усяго больш 57600 чалавек.

Пасля вызвалення Беларусі Вялікая Айчынная вайна прадаўжалася больш за 10 месяцаў. Былі вызвалены краіны Цэнтральнай, Паўднёвай і Усходняй Еўропы. Баявыя дзеянні супраць Германіі завяршыліся Бярлінскай аперацыяй, вынікам якой стала падпісанне ў ноч з 8 на 9 мая 1945 г. Акта аб безагаворачнай капітуляцыі фашысцкай Германіі

## 8. Уклад беларускага народа ў Перамогу

Беларускі народ зрабіў вялікі ўклад у набліжэнне Вялікай Перамогі. Пасля вызвалення Беларусі больш за 600 тыс. яе жыхароў былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію і змагаліся да поўнай капітуляцыі ворага ў 1945 г. Для Беларусі гэта вайна мела ўсенародны і нацыянальна-вызваленчы характар.. Самаадданасць і мужнасць назіралася на пагранічных заставах, на дарогах і пераправах, у паветры – паўсюль, дзе ішлі баі. Партызаны і падпольшчыкі Беларусі наносілі ўдары па камунікацыях і гарнізонах праціўніка, па дарогах, вялі разведвальную работу, рэйкавую вайну, праводзілі рэйды па тылах праціўніка, дэзарганізоўвалі іх дзейнасць. Тэрыторыя Беларусі пераўтваралася ў сапраўдную рэспубліку-партызанку.

Яшчэ да эвакуацыі прамысловая вытворчасць БССР была скіравана на задавальненне ваенных патрэб. У прыватнасці, гомельскія заводы "Гомсельмаш" і "Рухавік рэвалюцыі" займаліся рамонтам вайсковай тэхнікі, станкабудаўнічы завод імя Кірава і Навабеліцкі лесакамбінат

перакваліфікаваліся на вытворчасць супрацьтанкавых мін. Гомельскія чыгуначнікі абсталявалі 30 перасоўных майстэрань для рамонту ў палявых умовах ваенных аўтамабіляў. Рамонтам танкаў і трактароў займаліся ў Клімавічах і Мазыры. Праводзілася эвакуацыя гэтых прадпрыемстваў.

Стваральная праца савецкага народа, у тым ліку і нашых суайчыннікаў, стала адным з фактараў змянення ў канцы 1942 г. на карысць Чырвонай Арміі. На прадпрыемствах абароннай прамысловасці ў асноўным правцавалі жанчыны, састарэлыя людзі, падлеткі і дзеці. Самааддана ў савецкім тыле працавалі чыгуначнікі з Беларусі.

У савецкім тыле працавала і рабіла істотны ўклад у набліжэнне Вялікай Перамогі каля 100 эвакуіраваных з БССР работнікаў вышэйшай школы і навуковага сектара, звыш 400 артыстаў, каля 50 мастакоў, 22 кампазітары і шэраг работнікаў культуры, асветы, аховы здароўя.

Удзел беларусаў у баявых дзеяннях на франтах, партызанская і падпольная барацьба ў тыле ворага, узаемадзеянні партызан з баявымі аперацыямі Чырвонай Арміі, дапамога савецкага тылу – усё гэта дазволіла беларусам здабыць не толькі Перамогу, але і захаваць сваю дзяржаўнасць.

## 9. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў

Вялікая Айчынная вайна з’яўляецца адной з ключавых падзей айчыннай гісторыі навейшага часу. Памяць аб падзеях гэтай вайны духоўна аб’ядноўвае наша сучаснае грамадства і з’яўляецца адным з асноўных складнікаў гістарычнай свядомасці беларускага народа.

У гістарычнай памяці беларусаў Вялікая Айчынная вайна ацэньваецца як сімвалічная падзея для ўсяго народа. З аднаго боку, гэта сімвал смутку, выкліканы шматлікімі людскімі, духоўна-культурнымі і матэрыяльнымі стратамі, якія панесла Беларусь. З другога – сімвал велічы, бо па выніках вайны Беларусь выйшла пераможцай і атрымала прызнанне на міжнародным узроўні.

Адно з найважнейшых свят нашай краіны – Дзень Незалежнасці – адзначаецца 3 ліпеня, што па сутнасці з’яўляецца працягам нацыянальнай традыцыі святкавання вызвалення краіны ад акупантаў, і ў той жа час гэта напамін пра тое, што патрыятызм, любоў да Радзімы, гатоўнасць да абароны Айчыны – гэта аснова дзяржаўнасці, агульная справа ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь.

Памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны ўшаноўваецца ў шматлікіх мемарыялах, абеліcках, помніках. Сярод іх:

- *Манумент Перамогі* (1954 г.) у Мінску – помнік воінам Чырвонай Арміі і партызанам, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны;
- архітэктурна-скульптурнага комплексу «*Мінск – горад-герой*» (1985 г.), гораду Мінску было прысвоена ганаровае званне «Горад-Герой» у 1974 г.;
- мемарыяльны комплекс “*Брэсцкая крэпасць–герой*” (1971). У 1965 г. Брэсцкай крэпасці прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-Герой»,
- мемарыяльны комплекс «*Хатынь*» (1969) у Лагойскім раёне Мінскай вобласці;

- мемарыяльны комплекс “*Курган Славы*” у Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці ў гонар подзвігу воінаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў, якія вызвалялі рэспубліку у 1944 г.;

- мемарыял воінскай славы на Лудчыцкай вышыні ў Быхаўскім раёне (1984) на месцы баёў за вызваленне Беларусі ў 1943–1944 гг.,

- мемарыяльны комплекс “*Прарыў*” каля гарадскога пасёлка Ушачы ў гонар подзвігу партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны і інш.

2 ліпеня 2014 г. быў урачыста адкрыты Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкам і Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі У. Пуціным новы будынак Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны;

Выдатным помнікам подзвігу беларускага народа стала 146-томнае выданне гісторыка-дакументальных хронік “Памяць”, у якіх пайменна ўзгаданы байцы Чырвонай Арміі, загінуўшыя ў баях за Беларусь, воіны-землякі, якія аддалі жыццё на франтах вайны, партызаны, падпольшчыкі, мірныя жыхары – ахвяры нацысцкага генацыду, а таксама ўдзельнікі вайны, якія вярнуліся на радзіму.

Памяць пра вайну захоўваюць 29 беларускіх дзяржаўных архіваў. Вялікай Айчыннай вайне прысвечаны шматлікія творы літаратуры, мастацтва, кінематографа. У гонар знамянальных падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы.

Актыўна вядзецца праца па мемарылізацыі халакосту ў Беларусі. Шэраг помнікаў адкрыты на тэрыторыі былога Мінскага гета і ў іншых месцах масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва. У 2019 г. Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка і федэральны канцлер Аўстрыі С. Курц прынялі ўдзел у адкрыцці помніка ахвярам нацызму “Масіў імён”, прысвечанага памяці 10 тыс. аўстрыйскіх яўрэяў, якія былі знішчаны на тэрыторыі нацысцкага лагера смерці ў Трасцянцы.

На тэрыторыі Беларусі не адбываецца рэвізія гістарычнай памяці, якая суправаджаецца «барацьбой з помнікамі». Беларусы шануюць свае традыцыі і з гонарам адносяцца да мемарыяльнага напаміну аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

## *Лекция 6.* **Аднаўленне і пасляваенная мадэрнізацыя БССР**

### 1. БССР – краіна-заснавальніца ААН

Перамога беларусаў разам з іншымі народамі Савецкага Саюза над нямецка-фашысцкімі захопнікамі акрэсліла кардынальныя змены ў дзяржаўна-палітычным развіцці. На заключным этапе Другой сусветнай вайны вызначыўся істотны рост міжнароднага аўтарытэту і ваенна-эканамічнай магутнасці СССР. Склаліся перадумовы для новага этапа савецкай мадэрнізацыі. Па-першае, змяніўся міжнародны статус БССР. Вярхоўнымі

Саветамі БССР і СССР былі прыняты рашэнні аб стварэнні рэспубліканскіх наркаматаў замежных спраў і абароны. Такія рашэнэнні абумоўліваліся тым, што ўрад СССР імкнуўся захаваць ранейшы ўплыў на вырашэнне найважнейшых пытанняў сусветнай супольнасці і меркаваў гэта ажыццяўляць праз удзел усіх саюзных рэспублік у новай міжнароднай арганізацыі, рашэнне аб стварэнні якой было зацверджана на Тэгеранскай канферэнцыі трох дзяржаў у лістападзе-снежні 1943 г.

Аднак беларускі народ атрымаў такія магчымасці найперш дзякуючы вялікаму ўкладу ў разгром фашысцкай агрэсіі і панесеныя ў выніку вайны велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. Менавіта з такой фармулёўкай толькі дзве савецкія рэспублікі (Беларуская і Украінская) атрымалі згоду ЗША і Англіі, а разам з тым запрашэнне стаць першапачатковымі членамі-заснавальнікамі новай міжнароднай арганізацыі. Для ўдзелу ў канферэнцыі ў Сан-Францыска у красавіку 1945 г. была накіравана дэлегацыя БССР на чале з наркамам замежных спраў БССР К.В. Кісялёвым, якая 26 чэрвеня 1945 г. разам з іншымі 50 дзяржавамі падпісала Статут Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Ужо на першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, якая пачала сваю працу ў студзені 1946 г., увагу міжнароднай грамадскасці прыцягнулі прапановы дэлегацыі Беларускай ССР аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў. Прапанаваны БССР праект рэзалюцыі быў падтрыманы міжнароднай супольнасцю і рэкамендаваў усім урадам распачаць меры да таго, каб арыштаваць усіх ваенных злачынцаў і выслаць у краіны, дзе яны здзяйснялі злачынствы для суда ў адпаведнасці з законамі гэтых дзяржаў.

Міжнародная дзейнасць БССР разгортвалася ва ўмовах жорсткага супрацьстаяння краін Захаду і СССР (“халоднай вайны”) і пільна кантралявалася цэнтральным кіраўніцтвам СССР. У гэтых умовах членства БССР у ААН не прывяло да якіх небудзь істотных змен у становішчы рэспублікі у складзе СССР. Так, 16 жніўня 1945 г., як і раней у 1921 г., без удзелу Беларусі быў падпісаны дагавор аб савецка-польскай мяжы. Са складу БССР Польшчы перадавалася 17 раёнаў Беластоцкай вобласці. Савецка-польская мяжа ў адпаведнасці з рашэннем Крымскай канферэнцыі (люты 1945 г.) прайшла прыкладна па “лініі Керзана” з адхіленнем на карысць Польшчы да 30 км.

У 1958 г. было адкрыта Пастаяннае прадстаўніцтва Беларускай ССР у ААН. Беларусь абіралася непастаянным членам Савета Бяспекі ААН, у Эканамічны і Сацыяльны савет, у розныя функцыянальныя і дапаможныя органы ААН. Беларусь стала адным з аўтараў 10 праектаў рэзалюцый па пытаннях раззбраення. БССР – член спецыялізаваных устаноў ААН: з 1954 года: ЮНЕСКА (Арганізацыя Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі навукі і культуры), з 1957 г. – МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергетыцы), з 1992 г. – Міжнароднага валютнага фонду і інш.

## 2. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне стварыла падставы для трэцяй хвалі мадэрнізацыі краіны, якая адбывалася на аснове сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу СССР. Па-першае, змянілася геапалітычнае становішча Беларусі. Станаўленне так званага "сацыялістычнага лагеру" пашырыла межы ўплыву Савецкага Саюза далёка на захад. Гэта садзейнічала стварэнню ў БССР цяжкай прамысловасці, у першую чаргу праз будаўніцтва трактарнага і аўтамабільнага заводаў. Усведамленне традыцый і патэнцыялу Беларусі акрэсліла выпрацоўку канцэпцыі развіцця, накіраванай на стварэнне ў БССР народна-гаспадарчага комплексу на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Гэта запатрабавала як павышэння агульнаадукацыйнага ўзроўню, так і развіцця ВНУ і навуковых даследаванняў. За перыяд з 1961 г. да першай паловы 1970-х гг. Беларусь па колькасці навучэнцаў на 10 000 насельніцтва апярэдзіла Англію і Францыю, Японію, Італію і ФРГ. У БССР у 1975 г. працавалі 9442 агульнаадукацыйных школы, 131 сярэдняя навучальная ўстанова, 31 ВНУ.[3]

З сярэдзіны 1950-х гг. у свеце пачалася навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая адкрыла магчымасці комплекснай аўтаматызацыі вытворчасці, выкарыстання ЭВМ, новых крыніц энэргіі, матэрыялаў. У сувязі з гэтым у БССР прыярытэтнае разіццё атрымалі галіны вытворчасці, якія вызначалі навукова-тэхнічны прагрэс: прыборабудаванне, радыётэхніка, хімія, нафтахімія, энэргетыка. З 1956 па 1965 г. у рэспубліцы былі ўведзены ў строй звыш 450 прадпрыемстваў (Белаз, Салігорскі калійны камбінат, Магілёўскі металургічны камбінат і інш.). З'явіўся новы від транспарту – трубаправодны. Такім чынам, развіццё прамысловасці Беларусі характарызавалася спробай яе пераходу да навукова-індустрыяльнага тыпу на аснове ўвядзення комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі. Але цэнтралізаваная, планавая эканоміка стрымлівала тэхнічны прагрэс, не спрыяла росту творчай актыўнасці.

У гісторыі краіны прамежак часу ад смерці Сталіна да адстаўкі Хрушчова М.С. (кастрычнік 1964 г.) называюць дзесяцігоддзем палітычнай адлігі. У 1953 г. у БССР пачынаецца паступовы працэс дэмакратызацыі, аднаўлення калектыўных метадаў кіраўніцтва.

Ужо ў чэрвені 1953 г. быў скасаваны надзвычайны рэжым у памежных раёнах (адмяняліся абмежаванні на пражыванне, уезд і выезд, скрацілася кольскасць памежных войскаў, замежныя грамадзяне атрымалі права перамяшчэння амаль па ўсёй тэрыторыі СССР). Але гэтая мера не распаўсюджвалася на тэрыторыю Беларусі (кіраўніцтва баялася паслаблення дзяржаўнай мяжы і пранікнення варожай агентуры).

Аднак крытыка культу асобы і нават проста крытыка дзейнасці І.В.Сталіна не гучала нідзе. Вуліцы, праспекты, установы па-ранейшаму з гонарам насілі гэта імя. Пераломным стаў 1956 г. і ХХ з'езд КПСС. Пасля ХХ з'езду КПСС

[3] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 208.

пачаўся працэс рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. У 1956–1961 гг. Вярхоўны Суд БССР рэабілітаваў дзесяткі тысяч жыхароў рэспублікі. Сярод іх дзяржаўныя, ваенныя і грамадскія дзеячы В.Кнорын, М. Гікала, М. Галадзед, А. Крыніцкі, І. Убарэвіч і інш. Аднак рэабілітацыя праходзіла складана, выбарачна. Да 1988 г. улады не згаджаліся на партыйную рэабілітацыю Дз. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага, В. Ластоўскага. Я. Лёсіка, А. Баліцкага і інш.

Пашыраліся правы рэспублік у дзяржаўным, эканамічным і культурным будаўніцтве. З 1957 г. некаторыя гаспадарчыя пытанні перадаваліся на разгляд Саветам Міністраў саюзных рэспублік**.** У распараджэнне ўрада БССР трапіла некалькі сотняў прадпрыемстваў. 11 сакавіка 1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, у адпаведнасці з якім рэспублікі маглі самастойна вырашаць пытанні абласнога і раённага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання. Ужо ў 1959 г. быў зменены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР. У Беларусі былі ліквідаваны Баранавіцкая, Бабруйская, Палеская, Полацкая, Пінская і Маладзечынская вобласці (замест 10 абласцей засталося 5), скарацілася колькасць раёнаў.

З 1953 па 1956 г. былі зацверджаны дзяржаўны сцяг, гімн і герб БССР. Першыя сакратары ЦК КПБ з 1956 года пачалі выбірацца з беларусаў. Пачынальнікам стаў Кірыла Мазураў (1956–1965), які ў 1953 г. быў прызначаны Старшынёй Савета Міністраў БССР. З яго імем звязаны шматлікія рэформы і рэарганізацыі.

Актывізавалася дзейнасць Саветаў. Але негледзячы на імкненне кіраўніцтва пашырыць функцыі Саветаў, яны па-ранейшаму заставаліся пад пільным наглядам партыйнай наменклатуры, і рэальнай улады не мелі.Больш дэмакратычнай стала дзейнасць самой партыі. Было наладжана рэгулярнае скліканне партыйных з’ездаў і пленумаў ЦК КПСС і саюзных рэспублік. Стала шырока практыкавацца абмеркаванне партыйных і дзяржаўных дакументаў у друку і на сходах працоўных калектываў. XX з’езд КПСС унёс у статут партыі частковыя змяненні, якія садзейнічалі яе росту і ажыўленню дзейнасці. У гэтыя гады партыйную арганізацыю Беларусі ўзначальвалі *М.С. Патолічаў* (1950–56), *К.Т. Мазураў* (1956–65), Савет Міністраў – Мазураў (з 1953), *Т.Я. Кісялёў* (1959–78), Вярхоўны Савет – *В.І. Казлоў*. Усе яны многа зрабілі для развіцця эканомікі, культуры, паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту народа, мелі свае погляды на вырашэнне тых ці іншых праблем, карысталіся павагаю народа.

Лібералізацыя станоўча паўплывала на развіццё духоўнай сферы. Праходзіў працэс раскансервацыі “закрытага грамадства”. Пашыраліся міжнародныя кантакты. У Маскве адбыўся сусветны фестываль моладзі і студэнтаў (1957). БССР у 1954 г. стала членам Міжнароднай арганізацыі працы і ўступіла у Арганізацыю Аб’яднаных Нацый па пытанням адукацыі, навукі і культуры (ЮНЭСКА).

Вялікая ўвага надавалася вырашэнню праблем сацыяльнай палітыкі. У сярэдзіне 1950-х гг. савецкім кіраўніцтвам былі зроблены спробы павярнуць эканоміку да патрэб чалавека. Было зменена падаткаабкладанне, што дазволіла калгаснікам павялічыць прыбытак ад асабістай гаспадаркі. Для гараджан з 1955

г. памяншаецца роля зніжэння цэн як фактару павышэння даходаў. Пераважнае значэнне набывае аплата працы. Вялікае значэнне мела прыняцце закона аб дзяржаўных пенсіях (1956 г.). Апошні ўсталёўваў памер пенсіі ў залежнасці не толькі ад памеру заработнай платы, але і ад працоўнага стажу. У 1960-я гг. значна палепшылася сацыяльнае забеспячэнне сельскіх жыхароў (гарантаваная пенсія калгаснікам, павышэнне пенсіі інвалідам). У рэспубліцы актыўна разгортвалася жыллёвае будаўніцтва.

Сярэдзіна 1950-х гг з’явілася пачаткам новага этапу і для беларускай культуры. Развіццё адукацыі ў гэты перыяд характарызавалася шматлікімі рэформамі і рэарганізацыямі. У 1958 г. замест сямігадовай адукацыі ўведзена васьмігадовая. Сталі працаваць новыя ВНУ: Мінскі радыётэхнічны інстытут (1964), Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці (1965), Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (1966) і інш. Характэрная рыса беларускай навукі гэтага часу – развіццё фундаментальных даследванняў у галіне фізікі, матэматыкі, біялогіі і г.д., аснова для якіх была закладзена у 1952–1969 гг., калі Акадэмію навук БССР узначальваў вядомы беларускі біёлаг В. Купрэвіч.

Сярэдзіна 1950-х гг. характарызавалася актывізацыяй літаратурнага працэсу. Крытычнае пераасэнсаванне восрых праблем гісторыі і сучаснасці выклікала да жыцця і новае пакаленне літаратараў: Н. Гілевіч. Р. Барадулін. В. Быкаў. У. Караткевіч і інш. У літаратурнай дзейнасці беларускіх пісьменнікаў пераважалі творы ваеннай тэматыкі.

### 3. Нарастанне застойных з’яў у 1970-я – першай палове 1980-х гг.

У сярэдзіне 1960-х гг. стомленасць ад непрадуманых рэарганізацый прывяла да кансервацыі сфармаваных за дзесяцігоддзі форм эканамічнага, дзяржаўнаа і грамадска-палітычнага жыцця. Эканоміка Беларусі працягвала развівацца пераважна на экстэнсіўнай аснове. Самай паспяховай для БССР лічыцца восьмая пяцігодка (1966–1970 гг.), калі валавы ўнутраны прадукт (ВУП) вырас больш, чым напалову. У другой палове 1960-х гг. БССР стала пляцоўкай для апрабацыі эканамічнай рэформы А. Касыгіна, якая, дарэчы, на прадпрыемствах Беларусі мела значные вынікі. Пачалі працаваць вытворча-тэхнічнае прадпрыемства “Гарызонт”, на базе Мінскага механічнага завода – Беларускае оптыка-механічнае аб’яднанне, а таксама найбуйнейшае прадпрыемства Усходняй Еўропы – навукова-вытворчае аб’яднане “Інтэграл”.

У пачатку 80-х гг. у свеце пачаўся новы этап НТР. У СССР навукова-тэхнічны прагрэс закрануў толькі абаронную прамысловасць. Беларусь пераўтвараецца у высокатэхналагічны “зборачны цэх”. Пэўнай яго характарыстыкай з’яўлялася тое, што больш за 130 прадпрыемстваў працавалі на ваенна-прамысловы комплекс. Слаба здзяйснялася рэканструкцыя дзеючых прадпрыемстваў. Пры гэтым зніжаліся тэмпы эканамічнага росту, аб чым сведчыла зніжэнне тэмпаў росту нацыянальнага прыбытку і тэмпаў росту прадукцыйнасці працы.

Пасля адстаўкі М.С. Хрушчова ў грамадска-палітычным жыцці пачалося паступовае адступленне ад лібералізацыі і дэмакратычных прынцыпаў

кіравання. У БССР Кірылу Мазурава на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ змяніў такі ж ураўнаважаны, адукаваны кіраўнік – Пётр Машэраў (1965–1980). Перыяд 1965 – 1985 гг. такі ж неадназначны, як і асоба П. М. Машэрава. Тое ж самае можна сказаць і пра Ц.Я. Кісялёва, які амаль 20 гадоў узначальваў Савет Міністраў БССР, а ў 1980–1983 гг. быў першым сакратаром ЦК КПБ. З аднаго боку, рэспубліка сапраўды набывала свой твар, як дзяржава з навукаёмістай тэхналогіяй і вытворчасцю, развітай сельскай гаспадаркай, высокім узроўнем адукаванасці насельніцтва. У той жа час паступова прыходзіла ў заняпад нацыянальная культура, імкліва губляла свае пазіцыі беларуская мова.

Павышалася кіруючая роля партыі, якая з'яўлялася галоўным звяном адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Партыйнае кіраўніцтва абвяшчалася ўніверсальным сродкам вырашэння усіх эканамічных і сацыяльных праблем. У 1971 г. ў статут было ўнесена палажэнне аб праве кантролю партыйнымі арганізацыямі дзейнасці адміністрацыі. У 1977 г. ў 6-м артыкуле Канстытуцыі СССР было замацавана палажэнне аб кіруючай ролі партыі. Гэта прывяло да ўзмацнення улады партакратыі. Адміністрацыйна-камандная сістэма скоўвала ініцыятыву Саветаў, якія не мелі дастатковых правоў, каб весці барацьбу з ведамасным дыктатам. Аказаліся скажонымі і функцыі прафсаюзаў. У 1980 г. членамі прафсаюзаў было амаль 5 млн чалавек. Але адбылося адзяржаўленне прафсаюзаў, яны не маглі выконваць сваю асноўную функцыю – абарона правоў працоўных. Супярчліва працавалі і камсамольскія арганізацыі. З аднаго боку, яны праводзілі значную працу па ідэйна - палітычнаму і працоўнаму выхаванню моладзі. А з другога боку, знаходзіліся пад жорсткім кантролем з боку партыйных камітэтаў, выкарыстоўвалі састарэлыя метады працы. Падаў іх аўтарытэт сярод моладзі.

Узнікла многа нявырашаных сацыяльных праблем. Захоўвалася тэндэнцыя на павышэнне заробкаў. Плацёжаздольны попыт павышаўся хутчэй у параўнанні з вытворчасцю тавараў і паслуг. З 1971 па 1985 г. колькасць грошай у абарачэнні вырасла у 3 разы, а колькасць тавараў народнага спажывання – толькі у 2 разы. Адсюль – дэфіцыт, чэргі, рост цэн, асабліва – на новыя тавары і тавары палепшанай якасці. Вострай заставалася жыллёвая праблема Абвастрылася экалагічная праблема.

### 4. Грамадска-палітычныя працэсы на мяжы 80-90-х гг.

У пачатку 80-х гг. у краіне наспела неабходнасць у масштабным рэфармаванні як сацыяльна-эканамічнай, так і палітычнай сфер жыцця. Сутнасць рэформаў, якія склалі першы этап пераўтварэнняў, была выкладзена Міхаілам Гарбачовым на красавіцкім 1985 г. Пленуме ЦК КПСС. Яго ідэалагічным стрыжнем з'яўлялася меркаванне аб тым, што праблемы варта шукаць не ў недахопах сацыялізму, а ў тым, што патэнцыйныя магчымасці сацыялістычнага ладу выкарыстоўваліся недастаткова. "Паскарэнне", "перабудова" і "галоснасць" сталі ключавымі паняццямі гарбачоўскіх рэформаў.

Галоўная ўвага надавалася эканамічным пераўтварэнням і перабудове міжнацыянальных адносін. Нарадзілася канцэпцыя *новага палітычнага мышлення* і пачалося яе ўкараненне ў сістэму міжнародных адносін. На другім этапе перабудовы, з 1987 г. стрыжнем пераўтварэнняў аб'яўлялася дэмакратызацыя ўсіх сфер жыцця савецкага грамадства, рэфармаванне палітычных інстытутаў і на гэтым падмурку стварэнне новай мадэлі – сацыялізму з чалавечым тварам. Паступова ідэя агульначалавечых дэмакратычных каштоўнасцяў (раздзяленне ўладаў, парламентарызм, прававая дхзяржава, натуральныя і неад'емныя грамадзянскія і палітычныя правы чалавека) выцясняе жорстка класавы падыход да палітычнай дэмакратыі.

Была сфармулявана рэфарматарская палітычная канцэпцыя і пачалася рэалізацыя пераўтварэнняў палітычнай сістэмы. Ад XIX партыйнай канферэнцыі (чэрвень – ліпень 1988 г.) бярэ пачатак палітычная рэформа, першыя крокі якой заключаліся: 1) ва ўвядзенні альтэрнатыўных выбараў ў саветы ўсіх узроўняў; 2) перамяшчэнні ўладных паўнамоцтваў ад партыі да саветаў.

У канцы 1988 г. былі ўнесены змены ў Канстытуцыю СССР. Вышэйшым органам заканадаўчай улады станавіўся З'езд народных дэпутатаў СССР, які фарміраваў Вярхоўны Савет СССР. Быў прыняты новы выбарчы закон, па якім прадугледжваліся свабодныя выбары ва ўсе органы прадстаўнічай улады пераважна на альтэрнатыўнай аснове (1/3 месцаў пакідалася для прадстаўнікоў дзяржаўных грамадскіх арганізацый). У сакавіку 1989 г. адбыліся выбары прадстаўнікоў на З'езд народных дэпутатаў СССР, 60 дэпутатаў былі абраны ад БССР.

Увядзенне элементаў рыначнай эканомікі праходзіла марудна. Захоўваўся кантроль міністэрстваў і ведамстваў над вытворчасцю. Кааператыўны сектар ва ўмовах высокіх падаткаў і цэн на сыравіну і матэрыялы ўяўляў з сябе пераважна спекулятыўны гандаль дэфіцытнымі таварамі. Пагаршэнне спраў у эканоміцы, на харчовым рынку падзенне рэйтынгу партыі і паступовае ўзмацненне напружанасці ў грамадстве прывялі да фарміравання розных падыходаў да вырашэння наспелых праблем. Летам 1989 г. ў саюзных рэспубліках пачаліся працяглыя масавыя забастоўкі працоўных калектываў. Беларусь ў сілу назапашанага эканамічнага патэнцыялу заставалася некаторы час своеасаблівым "аазісам стабільнасці" на прасторы СССР, што падтрымлівала кансерватыўныя настроі ў грамадстве. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі на чале з першым сакратаром ЦК КПБ Я. Сакаловым (1987–1990 гг.) крытычна ставілася да хуткіх палітычных пераўтварэнняў, якія рэалізоўваліся саюзным кіраўніцтвам, лічыла іх непрадуманымі і паспешлівымі.

На палітыку перабудовы адмоўны ўплыў пачынаюць аказваць міжнацыянальныя канфлікты. Абвастраюцца адносіны паміж Арменіяй і Азербайджанам, Грузіяй і Абхазіяй, Грузіяй і Паўднёвай Асеціяй, узрастае напружанасць у Прыбалтыцы, Малдавіі. У рэспубліках узмацняюцца сепаратысцкія настроі. У лістападзе 1988 г. Эстонія прымае Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, якой абвяшчае вяршэнства законаў рэспублікі над

агульнасаюзнымі, рэспубліканскую ўладу на зямлю, нетры, асноўныя сродкі вытворчасці. Пачынаецца “парад суверэнітэтаў”.

Доўгі час неразвітая нацыянальная свядомасць перашкаджала згуртаванню беларускага грамадства пад сцягам нацыянальнай ідэі, якая ў іншых рэспубліках стала адзінай альтэрнатывай камуністычнай ідэі. Але ў канцы 80-х гг. пэўныя грамадскія сілы ў БССР таксама вылучаюць на першы план пытанне аднаўлення суверэнітэту рэспублікі і агульнадэмакратычныя патрабаванні. Лідэрам гэтага руху становіцца створаны у чэрвені 1989 г. у Вільні Беларускі Народны Фронт “Адраджэнне”, які узначальвае Зянон Пазняк.

У сакавіку 1990 г. радыкальная апазіцыя дамаглася адмены 6-га артыкула Канстытуцыі СССР аб кіруючай ролі партыі. Гэта стварыла падставы для фармавання шматпартыйнай сістэмы. Ужо праз два-тры месяцы узніклі новыя партыі: дэмакратычная, кантстытуцыйна-дэмакратычная і іншыя. У сакавіку 1990 г., на III – ім З’ездзе народных дэпутатаў М. Гарбачоў быў абраны прэзідэнтам СССР і спрабаваў выратаваць становішча (захаваць уладу цэнтра), выкарыстоўваючы свае новыя паўнамоцтвы.

Паседжанні і дыскусіі, якія адбываліся на з’ездах, асвятляліся ў сродках масавай інфармацыі, што прыцягвала ў сферу іх абмеркавання шырокія колы насельніцтва. Гэта паўплывала на дынаміку грамадска-палітычнага жыцця і ў БССР. У парадак дня грамадскага абмеркавання выносіцца шэраг вострых праблем. Актуалізуецца тэма рэпрэсій 1930-х гг. З экалагічнага і эканамічнага ў моцны палітычны фактар ператварылася Чарнобыльская катастрофа. Гэта адмоўна адбілася на трываласці палітычнай сістэмы і на падтрымцы ўлады з богу насельніцтва.

4 сакавіка 1990 г. на аснове новага выбарчага заканадаўства адбыліся дэмакратычныя выбары ў Беларусі. На 310 месцаў у Вярхоўным Савеце БССР прэтэндавала 1769 кандыдатаў. Выбарчая кампанія праходзіла ў некалькі тураў, пасля першага тура галасавання было абрана толькі 98 народных дэпутатаў. Тым не менш у маі 1990 г. адбылася першая сесія Вярхоўнага Савета. Беларускі Народны фронт ўтварыў у Вярхоўным Савеце парламенцкую апазіцыю. Дэпутаты прынялі цэлы шэраг заканадаўчых дакументаў аб пераходзе да рынкавых формаў эканомікі, ўзмацненні сацыяльнай абароны насельніцтва, ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай аварыі. 27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Законам ад 28 ліпеня 1990 г. уносяцца змены і дапаўненні ў Канстытуцыю БССР 1978 г. (арт. 6, 7, 49), якія замацоўвалі шматпартыйнасць і прадугледжвалі роўныя ўмовы для дзейнасці розных грамадскіх аб’яднанняў, магчымасць іх удзелу ў выпрацоўцы палітычнага курсу БССР, яе сацыяльна-эканамічным, духоўным развіцці, у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі. Разам з унясеннем паправак у Канстытуцыю БССР Вярхоўны Савет прымае Пастанову “Аб рэгістрацыі грамадскіх аб’яднанняў у Беларускай ССР”.

У рэспубліцы пачалі ўзнікаць палітычныя партыі: Аб’яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Беларуская сялянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада і іншыя. Утварэнне палітычных партый і

аб’яднанняў сведчыла аб глыбокіх зменах у грамадскім жыцці і развіцці дэмакратыі. Негледзячы на невялікі колькасны склад, яны садзейнічалі ўзнікненню плюралізму мыслення, пошуку новых падыходаў да вызначэння складаных праблем грамадскага жыцця.

У 1990 г. у СССР пачынаецца глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс. Змяняецца эканамічная сітуацыя і ў БССР. У красавіку 1991 г. адбываюцца масавыя забастоўкі рабочых у розных гарадах Беларусі. Паступова да эканамічных лозунгаў далучаліся палітычныя: дэмакратызацыя грамадска-палітычнага ладу, нацыяналізацыя маёмасці КПСС-КПБ. Нягледзячы на тое, што выключная большасць беларусаў на рэферэндуме 17 сакавіка 1991 г. прагаласавала за захаванне СССР, для ўсіх стала відавочна бездапаможнасць саюзных уладаў у вырашэнні надзённых пытанняў.

Правал жнівеньскага путчу 1991 г. стварыў спрыяльныя ўмовы на шляху да рэалізацыі дзяржаўнага суверэнітэту. 25 жніўня 1991 г. пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон “Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР” і пастанову “Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР”. Гэтымі актамі аб’яўлялася палітычная і эканамічная незалежнасць рэспублікі. Ва ўласнасць Беларускай ССР пераходзілі прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, размешчаныя на яе тэрыторыі.

Пачаўся працэсс незалежнага дзяржаўнага развіцця Беларусі ў форме парламенцкай рэспублікі, калі ўлада перайшла ад ЦК КПБ да Вярхоўнага Савета. 19 верасня было прынята рашэнне аб змене назвы рэспублікі: з гэтага часу БССР стала называцца “Рэспубліка Беларусь” (скарочана – “Беларусь”). У той самы дзень былі прыняты законы “Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь” і “Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь”. Дзяржаўны сцяг з гэтага часу ўяўляў сабой прамавугольнае палотнішча бела-чырвонага колеру. Дзяржаўным гербам стаў старажытны герб “Пагоня” – выява конніка з занесеным над галавою мячом. Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь быў абраны С. Шушкевіч.

## *Лекцыя 7.* Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь

### 1. Распад СССР и яго прычыны

Распад Савецкага Саюза як адзінай федэратыўнай дзяржавы адбываўся досыць імкліва. У 1989–1991 гг. адбываўся гэтак званы “парад суверэнітэтаў”, калі асобныя саюзныя рэспублікі, а часам нават і аўтаноміі ў складзе гэтых рэспублік, прымалі дэкларацыі аб суверэнітэце. Пры гэтым рэспубліканскі суверэнітэт разумеўся як складовая частка агульнасаюзнага. Але гэта непазбежна прывяло да супярэчнасцей у юрысдыкцыі.

Імкнучыся захаваць агульную федэратыўную дзяржаву на новых дэмакратычных асновах, саюзнае кіраўніцтва ініцыявала правядзенне рэферэндума. На агульнанароднае галасаванне выносілася пытан: "Ці лічыце Вы неабходным захаванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік як абноўленай федэрацыі роўнапраўных суверэнных рэспублік, у якой будуць у поўнай ступені гарантавацца правы і свабоды чалавека любой нацыянальнасці?". Крызіс саюзнай дзяржаўнасці падкрэсліваўся тым фактам, што органы ўлады Грузіі, Літвы, Малдовы, Латвіі, Арменіі і Эстоніі адмовіліся праводзіць галасаванне. У рэферэндуме прынялі ўдзел 80,03 % выбаршчыкаў. Станоўча на пытанне адказалі 76 % з іх. У БССР на ўчасткі для галасавання прыйшлі 83,3 % грамадзян, якія мелі права голасу. 82,7 % з іх падтрымалі захаванне Саюза.

Тым не менш, працэс распаду працягваўся. 1 снежня 1991 г. ва Украіне, якая была другой пасля Расійскай Федэрацыі саюзнай рэспублікай па памерах тэрыторыі, насельніцтву і эканамічнаму патэнцыялу, адбыўся рэферэндум па зацвярджэнню "Акта абвяшчэння незалежнасці Украіны". У ім прынялі ўдзел 84,18 % выбаршчыкаў, з якіх 90,32 % падтрымалі гэта рашэнне. Рэфереэндум стаў каталізатарам цэнтрабежных тэндэнцый.

Ужо 8 снежня 1991 г. ва ўрадавай рэзідэнцыі Віскулі, што знаходзіцца на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў Беларусі, сабраліся дэлегацыі трох саюзных рэспублік: Расіі на чале з прэзідэнтам Барысам Ельцыным, Украіны, якую ўзначальваў прэзідэнт Леанід Кучма, і Беларусі пад кіраўніцтвам старшыні Вярхоўнага Савета Станіслава Шушкевіча. У выніку перамоў было падпісана "Пагадненне пра стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў," вядомае таксама як "Белавежскае пагадненне". У яго прэамбуле ўдзельнікі сустрэчы запісалі: "Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыніў сваё існаванне". Такім чынам быў дэнансаваны Дагавор 1922 г. пра стварэнне СССР. Разама з тым было прызнана, што народы Расіі, Беларусі і Украіны маюць гістарычную еднасць, а Садружнасць Незалежных Дзяржаў успрымалася як новая міждзяржаўная супольнасць. Пасля некаторых разважанняў да "белавежскай тройкі" далучыліся кіраўнікі яшчэ 8 саюзных рэспублік (Азербайджан, Арменія, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Таджыкістан, Туркменістан і Узбекістан). 21 снежня 1991 г. усе разам яны падпісалі ў г. Алматы дэкларацыю і падтрымалі Белавежскае пагадненне.

А ўжо 25 снежня таго ж года першы і апошні Прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў пайшоў у адстаўку. СССР спыніў сваё існаванне.

Галоўнымі прычынамі распаду СССР былі найперш эканамічныя. Планавая адміністрацыйна-камандная эканоміка вяла да празмернага цэнтралізму ў кіраванні ўсёй народнай гаспадаркай. Спробай перабудовы эканомікі стала эканамічная рэформа 1987 г. М. Гарбачоў так вызначыў яе мэту: пераход ад адміністрацыйных да пераважна эканамічных метадаў кіравання, узмацненне зацікаўленнасці працоўных калектываў у выніках сваёй працы, пераўтварэнне таварна-грашовых адносін у асноўны інструмент пад'ёму эканомікі.

У чэрвені 1988 г. кіраўнікі асобных саюзных рэспублік прапанавалі перайсці на прынцыпы рэгіянальнага, ці рэспубліканскага гаспадарчага разліку. З гэтага часу адзіная эканамічная прастора СССР пачала разбурацца. Савецкі Саюз уступіў у паласу глыбокага эканамічнага крызісу.

Другой прычынай распаду СССР была аднапартыйная сістэма, пры якой уся ўлада належала КПСС. Гэта вяло да палітычнай стагнацыі, якая ў літаратуры атрымала назву “застой”. Калі кіраўнікі партыі здолелі пайсці на кампраміс, то аказалася, што час для такіх кампрамісаў ужо прайшоў.

Трэцяя прычына – гэта распачатая ў 1946 г. “халодная вайна”. Супрацьстаянне з Захадам і ўсім капіталістычным светам патрабавала вялікіх намаганняў і сродкаў. Савецкі Саюз аказаўся няздольным вытрымліваць такую напружаную барацьбу працяглы час. Трэба адзначыць, што заходнія, найперш амерыканскія, лідары гэта добра разумелі і пастаянна ўцягвалі СССР у гонку ўзбраенняў, што самым негатыўным чынам сказвалася на стане спраў унутры краіны.

## 2. Палітычны і гаспадарчы крызіс першых гадоў незалежнасці

Як бачна з вынікаў рэферэндуму сакавіка 1991 г., для большасці беларусаў развал адзінай краіны стаў нечаканасцю і ўспрымаўся вельмі балюча. У грамадстве панавала разгубленасць. Рэспубліканскія кіраўнікі спачатку не маглі прызвычаіцца да прыняцця самастойных рашэнняў без позірку ў бок саюзнага цэнтра. Да таго ж была разбурана агульная сістэма кіравання гаспадаркай і размеркавання тавараў. Усе гэтыя абставіны абвастраліся адсутнасцю неабходнай заканадаўчай базы, бо працягвалі дзейнічаць савецкія прававыя нормы. Неабходна было фактычна занава ствараць новую юрыдычную базу дзяржаўнага і эканамічнага будаўніцтва. Аднак гэты працэс ішоў вельмі марудна з-за вострай палітычнай барацьбы ў рэспубліцы.

Паводле ацэнкі экспертаў Сусветнага банка на момант атрымання незалежнасці ў 1991 г. Беларусь лідзіравала сярод рэспублік СНД па паказчыках прыбытку на душу насельніцтва. Рэспубліка мела развіты прамысловы сектар, які з улікам яго долі ва ўнутраным валавым прадукце рабіў яе адной з самых індустрыялізаваных краін свету. Таму крызіс у беларускай экономіцы пачаўся пазней, чым у іншых рэспубліках СССР. Толькі ў 1991 г. упершыню адбылося абсалютнае падзенне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. Крызіс працягваў паглыбляцца і набыў абвальны характар.

Рашэнне новых задач у Беларусі было ўскладнена аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. У зоне радыяактыўнага забруджвання пражывала 2 млн. 100 тыс. чалавек. Агульныя выдаткі, звязаныя з перасяленнем людзей, будаўніцтвам дамоў, выплатай кампенсацый і інш. склалі 16 нацыянальных гадавых бюджэтаў.

Дэзінтэграцыйныя працэсы на тэрыторыі былога СССР асабліва негатыўна адбіліся на Рэспубліцы Беларусь, паколькі яе эканоміка з’яўлялася “зборачным цэхам” і была ў найбольшай ступені інтэгравана з астатнімі часткамі

народнагаспадарчага комплексу Савецкага Саюза. Адбылося разбурэнне планавых метадаў вядзення гаспадаркі пры адсутнасці дзеючых эфектыўных рынкавых механізмаў, былі моцна аслаблены рычагі кіравання дзяржаўным сектарам эканомікі.

У кастрычніку 1990 г. у БССР прымаецца "Дзяржаўная праграма пераходу да рыначнай эканомікі". Пасля зацвярджэння праграмы пераходу да рынку Вярхоўны Савет БССР прыняў шэраг законаў па яе рэалізацыі: "Аб уласнасці", "Аб Нацынальным банку", "Аб прадпрыемстве", "Аб арэндзе", "Аб прадпрымальніцтве" і інш. Распрацаваныя і прынятыя да выканання рынкавыя па сваёй сутнасці праграмы аказалі істотны ўплыў на далейшае дзяржаўнае будаўніцтва, дазволілі набыць вопыт стварэння рынкавай эканомікі, забяспечылі паступовыя змены ў менталітэце насельніцтва (пераход ад уяўленняў абавязковасці ўраўняльнага размеркавання выгод і ўтрыманства да разумення неабходнасці рынкавай гаспадаркі, якая забяспечвае больш высокія даходы за высокапрадукцыйную працу).

У працэсе рэалізацыі гэтай праграмы ўсталяваліся рыначныя цэны на большасць тавараў і паслуг, фармаваліся прадпрымальніцкія, банкаўскія і камерцыйныя структуры. У 1991 г. быў прыняты Закон "Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы", у 1993 г. – Закон "Аб праве ўласнасці на зямлю".

Але пачатак рыначных рэформаў выклікаў негатыўныя з'явы: інфляцыя, талонная сістэма і іншыя. З 1991 г. пачаўся нястрымны рост інфляцыі з-за павышэння і частковай лібералізацыі цэн на прадукцыю і ўвядзення новых тарыфаў на транспартныя паслугі. Страта эканамічных сувязей з іншымі рэспублікамі, рэзкі рост цэн на энерганосьбіты, імпартуемыя сыравіну і матэрыялы, а таксама глыбокія трансфармацыйныя працэсы ў сістэме сацыяльна-эканамічных інстытутаў сталі прычынамі глыбокіх узрушэнняў, якія перажыла Беларусь у 1-й палове 1990-х гг. Крызіс стаў сістэмным. Эканамічны крызіс цяжка адбіўся на многіх паказчыках ўзроўню жыцця. З'явілася беспрацоўе, якога жыхары рэспублікі не ведалі ўжо шмат дзесяцігоддзяў. У цэлым за 1991–1993 гг. узровень жыцця ў Беларусі знізіўся на 34 %. Наглядным паказчыкам глыбіні эканамічнага крызісу і яго негатыўнага ўздзеяння на жыццёвы ўзровень беларускага народа было зніжэнне сярэдняй працягласці жыцця ў 1991–1994 гг. з 71,1 да 68,9 года, у тым ліку ў жанчын – з 75,6 да 74,3 года, у мужчын – з 66,3 да 63,5 года. Хуткімі тэмпамі стала расці смяротнасць насельніцтва Беларусі. Пачынаючы з 1993 г. у Беларусі ўпершыню за апошнія 50 гадоў пачала назірацца тэндэнцыя скарачэння колькасці насельніцтва, якая ў 1993 г. скарацілася на 11,2 тыс., у 1994 г. – на 19,4 тыс. чалавек.

Разам з тым у Беларусі, у адрозненне ад суседніх краін СНД і дзяржаў Балтыі, лібералізацыя цэн спалучалася з захаваннем значнай колькасці рэгулюемых цэн на харчовыя і многія прамысловыя тавары. У выніку ўзмацніўся вываз тавараў з фіксаванымі і рэгуляванымі цэнамі ў суседнія краіны, што спрыяла павелічэнню дэфіцыту на спажывецкім рынку рэспублікі.

Фактычна на той час Беларусь з'яўлялася парламенцкай рэспублікай. Заканадаўчая ўлада належала Вярхоўнаму Савету 12-га склікання (старшыня – С. Шушкевіч). Але асаблівасцю палітычнага жыцця пачатку 90-х гг. была вельмі вялікая роля Кабинета міністраў РБ (В. Кебіч). Паміж гэтымі галінамі ўлады існавалі пэўныя супярэчнсці. Кіраўнікі рэспублікі аказаліся негатовымі ўзяць на сябе самастойнае кіраванне дзяржаўнымі справамі. У Вярхоўным Савеце ўсё яшчэ пераважалі дэпутаты камуністычнага складу, якія спадзяваліся на аднаўленне СССР. Яны нават не клапаціліся аб тым, каб змяніць урад рэспублікі, сфармаваны яшчэ па рашэнню ЦК КПБ.

Асноўныя спрэчкі разгарнуліся вакол пытання, якой быць рэспубліцы: прэзідэнцкай або парламенцкай. Апазіцыя (Беларускі народны фронт) выступала супраць увядзення пасады прэзідэнта з шырокімі паўнамоцтвамі, які б выбіраўся ўсімі грамадзянамі. У той жа час большасць парламента не магла кансалідавацца, бо не мела сталага і харызматычнага лідара. Аднак паступова значная частка выканаўчай улады і дэпутатаў стала аб'ядноўвацца вакол фігуры В. Кебіча. Урад атрымаў дадатковыя паўнамоцтвы ў галіне кіравання, а ў парламенце была створана праўрадавая група дэпутатаў "Беларусь". У выніку адкрытага супрацьстаяння розных палітычных груповак узнік палітычны крызіс канца 1993 г. Насельніцтва ўсё мацней выказвала незадаволенасць станам рэчаў у гаспадарцы, галечай. У рэшце рэшт, С. Шушкевіч быў адхілены 26 студзеня 1994 г. большасцю галасоў ад пасады старшыні парламента, а Вярхоўны Савет узначаліў М. Грыб. Прэм'ер-міністр В. Кебіч здолеў захаваць уладу.

Трансфармацыя грамадска-палітычнай сістэмы, з'яўленне ў ёй новых элементаў, глыбокі эканамічны крызіс – усе гэтыя фактары ставілі перад урадам рэспублікі складаныя задачы і патрабавалі ад яго прымянення новых метадаў кіравання. Беларуская палітычная сістэма мела патрэбу ў моцным цэнтры, які мог бы ўзяць на сябе адказнасць за лёс дзяржавы.

### 3. **Прынятце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

Распрацоўка Канстытуцыі пачалася яшчэ ў 1990 г., калі 20 ліпеня была створана Канстытуцыйная камісія з 74 чалавек. Падрыхтоўка Канстытуцыі была даручана Канстытуцыйнай камісіі, старшынёй якой спачатку быў І. Дзямянцей, з кастрычніка 1992 г. – С. Шушкевіч, а з пачатку 1994 г. – М. Грыб.

У Вярхоўным Савеце разгарэўся канфлікт паміж апазіцый, узначальваемай БНФ, і большасцю дэпутатаў, якія падтрымлівалі В. Кебіча, па пытанню прэзідэнцтва. Апазіцыя імкнулася мінімізаваць значэнне кіраўніка дзяржавы. На іх думку палітычная традыцыя патрабавала парламенцкай формы кіравання.

15 сакавіка 1994 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў новую Канстытуцыю – Асноўны Закон краіны. Беларусь абвяшчалася ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай. Канстытуцыя складалася з прэамбулы, 8 раздзелаў, 8 глаў, 149 артыкулаў. Прызнавалася, што дэмакратычны лад грунтуецца на падзеле улад. Канстытуцыя адзначала

прыярытэт міжнароднага права, у тым ліку Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека. Дзяржаўнаю моваю абвяшчалася беларуская мова. Вышэйшым органам дзяржаўнай улады (заканадаўчай) абвяшчаўся Вярхоўны Савет. Канстытуцыя ўводзіла ў краіне прэзідэнцкую форму праўлення, што істотна змяняла характар і структуру выканаўчай улады. Прэзідэнт абвяшчаўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай ўлады. Праводзячы канстытуцыйную рэформу, беларуская палітычная эліта ў значнай ступені дзейнічала па прыкладу краін Захаду, дзе інстытут прэзідэнства існаваў на працягу некалькіх стагоддзяў і даказаў уласную эфектыўнасць у якасці аднаго з элементаў дэмакратычнай палітычнай сістэмы. Увядзенне пасады прэзідэнта ў Беларусі таксама падкрэслівала незалежны і суверэнны статус новаўтворанай дзяржавы, што ў першыя гады самастойнага існавання нават па псіхалагічных матывах было вельмі важна як для палітычнай эліты, так і для ўсяго беларускага грамадства.

Кандыдытамі на пасаду прэзідэнта былі вылучаны 6 чалавек: А. Дубко, В. Кебіч, А. Лукашэнка, В. Новікаў, З. Пазняк, С. Шушкевіч. Пасля правядення двух тураў перамогу атрымаў А. Р. Лукашэнка. 20 ліпеня 1994 г. ён прынёс прысягу. Старшынёй урада быў абраны М. Чыгір.

Прыход ва ўладу маладога палітыка новай фармацыі прывёў да істотнага абнаўлення беларускай палітычнай эліты. З гэтага моманту ў найноўшай гісторыі Беларусі пачаўся этап прэзідэнцкага праўлення. Першая палова 1990-х гг. – найбольш складаны перыяд у гісторыі незалежнай Рэспублікі Беларусь. Эканамічны крызіс аказаў значны негатыўны ўплыў на сацыяльную сферу. Дэстабілізацыя эканомікі і дэзарганізацыя сацыяльнай сферы выклікалі ў грамадстве пачуццё нявызначанасці, няўпэўненасці ў заўтрашнім дні і разам з тым істотна павысілі палітычную актыўнасць насельніцтва. Гэта быў час назапашвання палітычнага вопыту, школа палітычнай культуры, першы нялёгкі этап у будаўніцтве ўласнай дэмакратычнай дзяржавы. Вопыт дзяржаў, якія перажылі аднапартыйную сістэму, блізкіх па тэрыторыі і колькасці насельніцтва да Беларусі, паказвае, што выхад з эканамічнага крызісу найбольш аптымальна забяспечваецца праз моцную прэзідэнцкую ўладу, перавагай якой з'яўляецца хуткае рэагаванне, прыманне і рэалізацыя найбольш рацыянальных рашэнняў. На моцную асобу арыентаваны і менталітэт беларускага народа. Раней першымі асобамі ў дзяржаве былі Першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі, Старшыня Вярхоўнага Савета, цяпер ім стаў Прэзідэнт. Увядзенне інстытута прэзідэнцтва ў Беларусі адкрыла новы этап у развіцці беларускай дзяржаўнасці, сведчыла пра ўспрыманне дзяржаўна-палітычных інстытутаў дэмакратычных краін.

## 4. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004, 2022 гадоў і іх уплыў на стабилізацыю становішча ў краіне.

Пераможаная на прэзідэнцкіх выбарах апазіцыя не адмовілая ад барацьбы за дзяржаўную ўладу. Рэванш яна меркавала ўзяць на парламенцкіх выбарах у маі 1995 г. Разам з выбарамі ў Вярхоўны Савет у мэтах вырашэння некаторых

спрэчных пытанняў і у адпаведнасці з перадвыбарнай праграмай прэзідэнта быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум.

14 мая 1995 г. было абрана было толькі 18 дэпутатаў, хаця ў галасаванні ўдзельнічалі 64,7 % выбаршчыкаў. Дэпутатацкі мандат прысвойваўся толькі тым дэпутатам, якія у аднамандатных акругах набралі звыш 50 % галасоў пры больш чым 50 % прысутнасці выбаршчыкаў. Пры тым, што у некаторых акругах змагаліся дзесяткі кандыдатаў, вылучэнне пераможца аказалася складанай справай.

Рэферэндум 1995 г., на які было вынесена чатыры пытанні (аб наданні русскай мове роўнага статусу з беларускай мовай; аб устанаўленні новых дзяржаўных сімвалаў; аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і змяненнях у Канстытуцыі, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага, або грубага парушэння Канстытуцыі) завяршыўся вялікай перамогай Прэзідэнта.

28 мая завяршыўся другі тур выбараў у Вярхоўны Савет. За два туры было абрана 119 дэпутатаў (у адпаведнасці з Канстытуцыяй парламент, які налічваў 260 дэпутатаў, мог пачаць працу пры ўкамплектаванні 2/3 месцаў). Парламент аказаўся нелегітымным.

Пасля двух дадатковых тураў (29 лістапада і 10 снежня) парламент пачаў працаваць. Паміж прэзідэнтам і парламентам пачалі нарастаць супярэчнасці, выкліканыя як недасканаласцю распрацоўкі нормаў падзелу улады (прававы аспект), так і рознымі поглядамі на прыроду беларускай дзяржавы і шляхі яе развіцця (палітычны аспект).

Патрэба ў правядзенні народнага галасавання 24 лістапада 1996 г. была абумоўлена неабходнасцю ўдакладнення шэрагу канстытуцыйных палажэнняў. На народнае галасаванне выносілася два блокі пытанняў: ініцыяваныя Кіраўніком дзяржавы (чатыры пытанні) і групай дэпутатаў Вярхоўнага Савета (тры пытанні). Паводле афіцыйных дадзеных, апублікаваных Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, вынікі народнага галасавання 24 лістапада 1996 г. па кожнаму з пытанняў выглядаюць наступным чынам: большасць грамадзян (88,18 %) з ліку тых, якія прынялі ўдзел у галасаванні, падтрымалі прапанову Прэзідэнта краіны А.Р. Лукашэнка аб пераносе святкавання Дня Незалежнасці на 3 ліпеня і толькі 10,45 % выказаліся супраць.

70,45 % беларусаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў прагаласавалі за праект Канстытуцыі, прапанаваны Кіраўніком дзяржавы, і толькі 7,93 % – за праект, прапанаваны дэпутацкімі фракцыямі камуністаў і аграрыяў. Супраць прагаласавалі адпаведна 9,39 і 71,2 %.

82,88 % грамадзян, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, выказаліся супраць свабоднай (без абмежаванняў) куплі і продажу зямлі. За прагаласавалі 15,3 %. Не падтрымалі грамадзяне і адмену ў Беларусі смяротнага пакарання (80,44 % – “супраць”). Час паказвае, што грамадства яшчэ не было гатова да гэтага. Асноўным вынікам рэферэндуму 1996 г. і важнай вяхой у далейшым развіцці суверэннай беларускай дзяржавы з’явілася ўнясенне змяненняў і дапаўненняў

у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнцкі варыянт рэдакцыі Асноўнага Закона стварыў цалкам новую мадэль дзяржаўнага ладу Беларусі.

У адпаведнасці з новай рэдакцый Канстытуцыі замест аднапалатнага Вярхоўнага Савета з 260 дэпутатамі ствараўся двухпалатны Нацыянальны сход, які складаецца з Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў выбіраюцца насельніцтвам) і Савета Рэспублікі (па 8 чалавек выбіраюцца ад кожнай вобласці і Мінска, і 8 чалавек прызначаюцца Прэзідэнтам). Паводле новай рэдакцыі канстытуцыі Прэзідэнт з’яўляецца кіраўніком дзяржавы, гарантам канстытуцыі, правоў і свабод чалавека.

Не менш важнае значэнне для нашай краіны меў рэспубліканскі рэферэндум, які адбыўся 17 кастрычніка 2004 г., на якім народ, па сутнасці, даў ацэнку дзейнасці кіраўніка дзяржавы за дзесяцігадовы перыяд. Прэзідэнт фактычна трымаў экзамен перад грамадзянамі сваёй краіны. Насельніцтва Рэспублікі Беларусь падтрымала палітыку (79,42 %) кіраўніка дзяржавы, прагаласаваўшы за прыняцце часткі першай артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: “Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры таемным галасаванні”. Выбар рашэння быў натуральным. А. Р. Лукашэнка, па азначэнні – народны Прэзідэнт, прапанаваў народу дазволіць яму “скончыць будаўніцтва дома, фундамент якога заклалі разам”. А значыць, захаваўшы дасягнутае, рэалізаваць новыя планы ў імя працвітання Беларусі. Такім чынам, савет з народам – дэмакратычны спосаб вырашэння важнейшых дзяржаўных пытанняў. І факт правядзення рэферэндумаў толькі пацвярджае, што мы жывем у краіне, дзе народ – гаспадар сваёй будучыні. І толькі яму вырашаць, як будаваць сваю дзяржаву. Воля народа, выяўленая на рэферэндумах 1995 і да 1996 гг., лягла ў аснову праводзімай эканамічнай і сацыяльнай палітыкі.

Рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. быў звязаны з канстытуцыйным абмежаваннем Прэзідэнту выбірацца на вышэйшую пасаду ў дзяржаве больш за вызначаныя тэрміны. У свеце вядомы розныя спосабы вырашэння такой праблемы. Аднак А.Р. Лукашэнка вырашыў напрамую звярнуцца да грамадзян. На агульнанароднае галасаванне выносілася наступнае пытанне: “Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнка А.Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь на аснове усеагульнага, свабоднага, раўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні?” Усяго ў рэферэндуме прыняла ўдзел 79,42 % выбаршчыкаў. Ініцыятыву Прэзідэнта падтрымалі 90,1 % тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі. Такім чынам было ўнесена змяненне ў дзеючую Канстытуцыю.

Падзеі 2020 г., якія адбыліся ў Рэспубліцы Беларусь, паглыбілі перакананасць беларускага грамадства і ўлад у неабходнасці абнаўлення Канстытуцыі для ўмацавання суверэнітэту краіны, захавання дзяржаўнасці, міру і грамадзянскай згоды. 27 лютага 2022 г. адбыўся чацвёрты рэспубліканскі

рэферэндум, на які было вынесена адзінае пытанне:”Ці прымаеце Вы змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?” Гэтаму папярэднічаў збор прапаноў па змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь падчас працы дыялогавых пляцовак, што прайшлі на базе ўстаноў адукацыі, грамадскіх арганізацый, у працоўных калетывах у кастрычніку 2020 – лютым 2021 г. Згодна з рэзалюцыяй VI Усебеларускага народнага сходу, які адбыўся 11-12 лютага 2021 г., у сакавіку 2021 г. была створана Канстытуцыйная камісія, задачай якой з’яўлялася распрацоўка прапаноў па змяненні Канстытуцыі.

Удзел у рэферэндуме прынялі 78,61 % грамадзян. На пытанне, вынесенае на ўсенароднае абмеркаванне,  станоўча адказалі 82,86 % гамадзян.

## Раздзел 2. **Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь**

### *Лекцыя 8.* **Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы**

#### 1. Фарміраванне прававых традыцый у Беларусі. «Руская праўда» і Статуты ВКЛ

*Канстытуцыя* (ад лац. constitutio – будова, устанаўленне) – гэта Асноўны Закон дзяржавы, які мае найвышэйшую юрыдычную сілу.

Закон – нарматыўна-прававы акт, які валодае вышэйшай юрыдычнай сілай і выдаецца правдстаўнічым заканадаўчым органам дзяржаўнай улады.

На ранніх этапах развіцця дзяржавы закон амаль не адрозніваецца ад судзебнага рашэння па прыватным пытанні

Руская Праўда» – першы сістэматычны зборнік права ўсходнеславянскіх зямель X–XII стст. Ён не з’яўляецца заканадаўчым помнікам у сучасным сэнсе гэтага слова, хоць і заснаваны на асобных княжацкіх пастановах. «Руская Праўда» – гэта звод пастаноў і судовых звычаяў. Адначасовае распаўсюджванне ўсіх гэтых прававых норм на тэрыторыі Беларусі азначанага часу можна аспрэчваць, але нельга адмаўляць уплыў «Рускай Праўды» на мясцовае звычаёвае права і наступныя кодэксы права.

Старажытнаруская дзяржава аб’яднала ўсходнеславянскія землі толькі на кароткі час (Полацкае княства ўваходзіла ў яе склад крыху больш за 70 гадоў). Яна ўключыла землі, дзе дзейнічала сваё мясцовае звычаёвае права. Звычаёвым правам у перыяд Ранняга сярэднявечча рэгуляваліся ўсе сферы грамадскага жыцця: структура і кампетэнцыя дзяржаўных устаноў, правы і абавязкі розных класаў, саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва, грамадскія, сямейна-шлюбныя, зямельныя, судова-працэсуальныя, крымінальныя і іншыя праваадносіны.

Першыя запісы звычаёвага права Беларусі былі зроблены ў граматах і дагаворах Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Гоцкім берагам (в.Готланд). Нормы звычаёвага права змяшчаюцца таксама ў дагаворах палачан і віцяблян з

Рыгай і Лівонскім ордэнам, у граматах, дадзеных гэтым землям вялікімі князямі літоўскімі.

Істотны прагрэс у галіне абароны правоў чалавека быў дасягнуты на этапе заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Ускладненне ладу дзяржаўнага жыцця патрабавала забяспечыць адзінства права для ўсёй дзяржавы. Першая спроба ўсталяваць адзінства прававых норм на тэрыторыі ВКЛ, абмежаваць самавольства суддзяў, а таксама ўзмацніць прававую ахову феадальнай маёмасці і ўвесці жорсткія меры пакарання злачынцаў была зроблена ў *Судзебніку Казіміра IV 1468* г. Гэты дакумент ўтрымліваў шмат прынцыпаў, якія пазней былі ўключаны ва Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека – напрыклад прынцып невінаватасці («невінаваты, пакуль не даказана адваротнае»).

Побач з назвай «судзебнік» ужываліся яшчэ «ліст», «статут», «закон». «Судзебнікамі» называліся шырокавядомыя дакументы заканадаўства 1497 і 1550 гг.

Судзебнік Казіміра IV у сістэме развіцця заканадаўства ВКЛ дазваляе прасачыць, як на аснове мясцовага звычаёвага права з улікам агульнаеўрапейскіх прававых традыцый і судова-адміністрацыйнай практыкі фарміраваліся агульнадзяржаўныя заканадаўчыя нормы. Разам з тым ён не з’яўляўся яшчэ агульнадзяржаўным кодэксам, ён толькі дапаўняў нормы агульназемскіх прывілеяў. Гэта, магчыма, быў толькі першы крок на шляху да кадыфікацыі і сістэматызацыі феадальнага права, завершаны выданнем трох статутаў Вялікага Княства Літоўскага – у 1529, 1566 і 1588 гг.

Праца па падрыхтоўцы першага Статута Вялікага Княства Літоўскага вялася на працягу некалькіх гадоў і завершылася да 1522 г. падрыхтоўкай праекта. *Статут ВКЛ 1529 г.* з’яўляўся зводам законаў на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясцовага звычаёвага права, пастаноў дзяржаўных і судовых устаноў, прывілеяў. Прозвішчы складальнікаў невядомыя. Статут складаўся з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў. Пазней былі ўнесены дапаўненні, колькасць артыкулаў павялічылася да 283. Статут 1529 г. пашыраўся ў рукапісных спісах (копіях). У ім упершыню былі запісаны нормы, якія абмяжоўвалі правы магнатаў, абвяшчалася правіла, паводле яго і бедныя, і багатыя павінны былі судзіцца па закону. Вялікі князь абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не дапускаць іншаземцаў на дзяржаўныя пасады, не даваць ім маёнткаў, зямель, чыноў, захоўваць існуючыя законы. Статут сцвярджаў прынцып індывідуальнай адказнасці, рэгламентаваў удзел абаронцаў у судовым працэсе. Абараняцца перад судом і даказваць сваю невінаватасць абвінавачаны павінен быў сам, або з дапамогай даверанай асобы.

У час вайны шляхта патрабавала пашырэння сваіх правоў.

*У Статут ВКЛ 1566 г.* былі ўпісаны Віленскі прывілей 1563 г., які ў чарговы раз дэклараваў ураўнаванне ў правах католікаў і праваслаўных, і Бельскі прывілей 1564 г., які гарантаваў неўмяшанне адміністрацыі (ваявод і старастаў) у судовыя справы шляхты. Асноўнымі крыніцамі новай рэдакцыі

Статута сталі іншыя агульназемскія і абласныя прывілеі (граматы), Судзебнік 1468 г., Статут 1529 г. і некаторыя нормы звычаёвага права.

Усяго было 14 раздзелаў, асобна вызначыўся раздзел 4 (судовы лад і судовы працэс). Зацвярджалася стварэнне падкаморскіх (межавых) і земскіх (шляхецкіх) судоў. Абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці; непаўналетнія маглі быць пакараны толькі пасля 14 гадоў.

Імкненне шляхты і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага да адраджэння самастойнасці сваёй дзяржавы, ўлічыць змены ў сацыяльна-эканамічным жыцці абумовілі пачатак працы над новым зборам законаў. Яна да канца 1584 г. была амаль завершана, яшчэ пры жыцці караля Стэфана Баторыя. Статут ВКЛ 1588 г. зацвердзіў кароль Жыгімонт ІІІ.

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г., які быў створаны на высокім тэарэтычным узроўні кваліфікаванымі правазнаўцамі пад кіраўніцтвам *А. Валовіча і Л. Сапегі*, дзейнічаў з 1589 г. да 1840 г.

Насуперак Акту Люблінскай уніі 1569 г. Статут 1588 г. заканадаўча аформіў захаванне Вялікага Княства Літоўскага як дзяржавы; абвяшчаў ідэю верацярпімасці, забараняў перадачу вольнага чалавека за даўгі або злачынства ў няволю, прадугледжваў крымінальную адказнасць шляхціца за забойства простага чалавека. Статут быў надрукаваны на старажытнабеларускай мове ў 1588 г. у Віленскай друкарні Мамонічаў пад наглядам Льва Сапегі. Меў вялікі ўплыў на працэс кадыфікацыі рускага права, падрыхтоўкі Сабornaга ўлажэння 1649 г. З'явіўся адной з важнейшых крыніц (асабліва ў галіне дзяржаўнага права) канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 г.

Пастановы сейма – ухвалы – ігралі важную ролю у развіцці права. Першыя ўхвалы прымаюцца на соймах у першыя дзесяцігоддзі XVI ст., калі ВКЛ вяло напружаную барацьбу за рускія землі з Расійскай дзяржавай. З пачаткам Лівонскай вайны кароль польскі і вялікі князь літоўскі быў вымушаны ўсё больш саступаць патрабаванням шляхты. На вальных соймах у Вільні ў 1559, 1563, 1565 гг. прымаліся не ўхвалы, а «отказы» караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста на «прозьбы» шляхты ВКЛ.

Пастановы агульнага сойма Рэчы Паспалітай у XVII – XVIII стст. падзяляліся на тры групы:

1) тыя, што датычыліся ўсёй Рэчы Паспалітай;

2) рашэнні, якія датычылі толькі Польшчы;

3) рашэнні, якія мелі сілу толькі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Заканадаўчая ініцыятыва належала вялікаму князю і радзе. Абмеркаванне і прыняцце Канстытуцыі праходзілі ў абедзвюх палатах сейма – сенаце і пасольскай палаце («избе»). Канчаткова закон рэдагаваў кароль.

Пасля абнародвання пастаноў на спецыяльных сойміках, яны пасля ўпісваліся ў адпаведныя кнігі, а таксама ў Метрыку Вялікага Княства Літоўскага, з 1732 г. друкаваліся ў зборы законаў і актаў (Volumina legum).

Першай еўрапейскай канстытуцыяй стаў прыняты Чатырохгадовым сеймам Закон аб урадзе ад 3 мая 1791 г. Гэты заканадаўчы акт складаўся з прэамбулы і 11 раздзелаў. Вызначаліся правы і абавязкі ўсіх саслоўяў.

Прадугледжвалася размежаванне «трох улад»: заканадаўчай, выканаўчай і судовай (сейм, урад, судовыя органы). Дзякуючы Канстытуцыі, у Рэчы Паспалітай была зроблена спроба ажыццявіць прынцып парламенцкага спосабу кіравання, але яе палажэнні не былі поўнасцю ажыццёўлены па прычыне бунту рэакцыйных колаў, якія вясной 1792 г. у горадзе Таргавіцы абвясцілі канфедэрацыю і стварылі ўмовы для ўмяшання замежных дзяржаў.

*Перыяд Расійскай імперыі.* У заканадаўстве на тэрыторыі Беларусі ў перыяд можна вызначыць наступныя перыяды:

1) канец XVIII – 30-я гг. XIX ст. Дзейнічалі не толькі нормы права Расіі, але і Статута 1588 г., які перакладаецца на рускую мову;

2) 40-я гг. XIX – пачатак XX ст. Пасля паўстання 1830–1831 гг. Статут ВКЛ быў скасаваны (у 1832–1840 гг.). У расійскім заканадаўстве ў XVIII–XIX стст. права выдання новых законаў належала толькі цару. Існавала велізарная колькасць відаў заканадаўчых актаў, адрозніць заканадаўчы акт ад адміністрацыйнага распараджэння было вельмі складана. Законам прынята лічыць толькі тое «волевыяўленне» манарха, якое змешчана ў «Полном собрании законов Российской империи»;

3) 1905–1917 гг. Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. дэклараваў пачатак канстытуцыйнага ладу, але не гарантаваў яго рэальнага ўсталявання. Але пачалася эвалюцыя ад абсалютызму да канстытуцыйнай манархіі. Права Дзяржаўнай думы на заканатворчасць кампенсавалася тым, што за царом захоўвалася больш поўнае і больш значнае па змесце права заканадаўчай ініцыятывы. Пачынаючы з сакавіка 1917 г. законы выдаваліся Часовым урадам. Звычайна яны падпісваліся міністрам-старшынёй. Так, Пастанова ад 1 верасня аб абвяшчэнні Расіі рэспублікай была падпісана А.Ф. Керанскім.

### 2. Савецкія Канстытуцыі 1919, 1927, 1937, 1978 гг.

У 1917–1919 гг. пачынаецца станаўленне беларускай дзяржавы.

У развіцці заканадаўства Беларусі можна вызначыць некалькі этапаў.

***Першы перыяд 1917–1920 гг.*** – дзейнасці на тэрыторыі Беларусі кароткачасовых дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак; заходняя і цэнтральная часткі Беларусі знаходзіліся пад акупацыяй, тут дзейнічалі законы ваеннага часу і распараджэнні акупацыйных улад. На ўсходзе Беларусі, дзе была ўстаноўлена ўлада Саветаў, захоўвалася ваеннае становішча. Велізарная колькасць дакументаў заканадаўчага характару выдавалася надзвычайнымі бальшавіцкімі органамі – рэвалюцыйнымі камітэтамі, і вызначальную сілу для вырашэння лёсаў тысяч людзей мелі распараджэнні камандзіраў і РВС армій, палкоў, іншых вайсковых адзінак Чырвонай Арміі. Разгарнулася заканатворчасць асобных дзяржаўных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (Заходняй вобласці (камуна) РСФСР, Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, Літоўска-Беларускай ССР). Прынятая ў лютым 1919 г. Канстытуцыя ССРБ не была дакладна распрацаванай, і фактычна на тэрыторыі дзейнічалі законы РСФСР.

***Другі перыяд 1921–1991 гг.*** – заканадаўства БССР; уключае некалькі асобных этапаў:

1) заканадаўства перыяду новай эканамічнай палітыкі; Канстытуцыя СССР 1924 г. замацавала раўнапраўнае становішча ўсіх рэспублік у яго складзе і новую заканадаўчую норму: законы, якія прымаюцца рэспублікамі, павінны адпавядаць законам СССР, пры разыходжанні перавагу маюць апошнія. На пачатку 1920-х гг. былі прыняты ў якасці законаў БССР грамадзянскі, крымінальны, крымінальна-працэсуальны кодэксы і Кодэкс законаў аб працы РСФСР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены, што адбываліся на працягу 1921–1928 гг., замацавала *Канстытуцыя БССР 1927* г.

2) афармленне адміністрацыйна-загаднай сістэмы (1928–1939); дзеючыя прававыя нормы парушаліся. Да сярэдзіны 1930-х гг. былі дзясяткі найменняў дакументаў заканадаўства: дэкрэт, маніфест, пастанова, рэзалюцыя. З прыняццем *Канстытуцыі СССР 1936 г*. была ўведзена адзіная назва – «закон». Для дакументаў выканаўчай улады захаваны найменні «пастанова» і «распараджэнне»;

3) заканадаўства перыяду Другой сусветнай вайны (1939–1945). Пасля ўз'яднання Беларусі шэраг законаў прыняў Народны сход Заходняй Беларусі; прыняты Указ аб крымінальнай адказнасці за распаўсюджванне чутак, Закон «Аб адказнасці за пасобніцтва нямецка-фашысцкім акупантам» і інш. Працягвалі заканадаўчую дзейнасць Вярхоўны Савет БССР і цэнтральныя дзяржаўныя органы СССР;

4) пасляваенны этап развіцця заканадаўства БССР (1945–1991). Да пачатку 1950-х гг. характэрна захаванне большасці важнейшых заканадаўчых норм і палажэнняў ваеннага часу.

Сярэдзіна 1950-х – 1980-я гг. характарызуецца паступовай рэабілітацыяй пацярпелых у гады культу асобы; пашырэннем паўнамоцтваў саюзных рэспублік; распрацоўкай рэспубліканскіх кодэксаў законаў у адпаведнасці з дзеючай канстытуцыяй. Заканадаўчыя паўнамоцтвы меў Вярхоўны Савет БССР, у перапынках паміж яго сесіямі выдаваліся ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Савет Міністраў рэспублікі заканадаўчых функцый не меў, аднак прымаў *падзаконныя* акты.

Працэсы дэмакратызацыі ў СССР на мяжы 80–90-х гг. XX ст. прывялі да змен і дапаўненняў у Канстытуцыю 1978 г. (абмежаванні паўнамоцтваў Прэзідыума Вярхоўнага Савета.

***Трэці перыяд з жніўня – верасня 1991 г.*** – заканадаўства Рэспублікі Беларусь пачаўся з таго, што Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларускай ССР быў нададзены статус канстытуцыйнага акта. Найбольш характэрная рыса заканадаўства – вяршэнства законаў Рэспублікі Беларусь на яе тэрыторыі. 15 сакавіка 1994 г. прымаецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Высока ацэньваючы ролю дакументаў, абвяшчаючых незалежнасць, заўважым, што рэальнае набыццё суверэнітэту, яго атрыбуты (незалежная знешняя і ўнутраная палітыка, харчовая бяспека, энергетычная незалежнасць і

інш.) фарміраваліся пазней, з пашырэннем паўнамоцтваў Прэзілэнта, з сярэдзіны 1990-х гг.

*Канстытуцыя* фармулюе асноўныя прынцыпы грамадскага і дзяржаўнага ладу, характарызуе сацыяльна-эканамічную і палітычную аснову грамадства і дзяржавы. Ва ўмовах ідэалагізацыі ўсіх сфер жыцця ў СССР, канстытуцыі пераважна ствараліся не толькі для рэальнага рэгулявання заканадаўчага працэсу, але і з пэўнымі ідэалагічнымі мэтамі (“Канстытуцыя перамогшага сацыялізму”, “Канстытуцыя развітога сацыялізму”). Пры гэтым змена пэўнай ідэалагічнай канцэпцыі выклікала змену канстытуцыі.

Першая савецкая канстытуцыя – Канстытуцыя РСФСР была прынята 10 ліпеня 1918 г. Усерасійскім з’ездам Саветаў. Яна стала асновай распрацоўкі першай Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (люты 1919 г.). Канстытуцыя ССРБ была менш распрацаванай (мела 3 раздзела), некаторыя важнейшыя канстытуцыйныя нормы (аб выбарчым праве, аб мясцовых органах улады і кіравання, аб бюджэтным праве) не знайшлі тут адлюстравання.

Утварэнне СССР выклікала неабходнасць заканадаўчага афармлення асноўных прынцыпаў саюзнай дзяржавы. *Канстытуцыя СССР 1924* г. дакладна размежавала функцыі і кампетэнцыю, структуру вышэйшых органаў агульнасаюзнай улады і кіравання.

Канстытуцыя БССР 1927 г. юрыдычна аформіла добраахвотнае і свабоднае ўваходжанне БССР у склад СССР, адлюстравала пашырэнне сацыяльнай асновы Савецкай дзяржавы. Яна рэгулявала ўзаемаадносіны СНК БССР з падпарадкаванымі яму органамі кіравання, замацоўвала прававы статус мясцовых органаў улады. Канстытуцыя захавала за рэспублікай права свабоднага выхаду з Саюза.

Новая Канстытуцыя СССР 1936 г. ўсталявала аднастайнасць дзяржаўна-прававых норм на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза. На яе аснове ў 1937 г. прынята чарговая канстытуцыя БССР. Важнейшым органам дзяржаўнай улады ў рэспубліцы абвяшчаўся Вярхоўны Савет. Пры гэтым кампетэнцыя заканадаўчых і выканаўчых органаў БССР была значна звужана. *Канстытуцыя 1937* г. дзейнічала па мерках савецкага часу даволі працяглы тэрмін (да 1978 г.), яе асобныя пункты неаднаразова змяняліся і дапаўняліся.

*Канстытуцыя БССР 1978* г. з’яўлялася адлюстраваннем і дэталізацыяй палажэнняў агульнасаюзнай канстытуцыі.

Абвяшчэнне новых Асноўных законаў Саюза і рэспублік было выклікана пераважна ідэалагічнымі меркаваннямі, таму гэты дакумент з’явіўся яшчэ больш дэкларатыўным і замацаваў ролю кампартыі як «кіруючай і накіроўваючай палітычнай сілы».

## 3. Канстытуцыя 15 сакавіка 1994 г. і характар унесеных у яе змяненняў

27 кастрычніка 1989 г. быў прыняты Закон “Аб зменах і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР” для развіцця дэмакратыі,

удасканалення выбарчай сістэмы, структуры і дзейнасці Саветаў народных дэпутатаў і органаў правасуддзя.

27 ліпеня 1990 г. была прынята Дэкларацыя Вярхоўнага Савета аб дзяржаўным суверэнітэце БССР – на тэрыторыі Беларусі ўстанавілася вяршэнства канстытуцыі і законаў рэспублікі над агульнасаюзнымі нормамі.

Пасля таго як спробы стварэння новага саюзу не завяршыліся поспехам, 25 жніўня 1991 г. быў прыняты Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”. Упершыню ў практыцы заканатворчай дзейнасці найвышэйшага заканадаўчага органа Беларусі быў прыняты канстытуцыйны закон, якому быў нададзены больш высокі статус, чым у Канстытуцыі.

Ва ўмовах пераўтварэнняў пачатку 1990-х гг. Канстытуцыя БССР 1978 г. не адпавядала рэчаіснасці. Па розных пытаннях змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон Вярхоўным Саветам XII склікання прымаліся больш 15 разоў (у 1990–1994 гг.).

Пачатак працы над новай Канстытуцыяй быў пакладзены 22 чэрвеня 1990 г. пастановай Вярхоўнага Савета БССР «Аб утварэнні Канстытуцыйнай камісіі» (увайшлі 74 чалавекі). 1 лістапада 1990 г. былі створаны дзве падкамісіі з працоўнымі групамі.

Да сярэдзіны 1991 г. праект новай канстытуцыі быў падрыхтаваны і ўвосень гэтага года перададзены на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета, прапанаваны да апублікавання. Істотныя дыскусіі (а ў далейшым і палітычная барацьба) разгарнуліся вакол формы кіравання: прэзідэнцкая альбо парламенцкая рэспубліка. На пасяджэнні Вярхоўнага Савета 3 сакавіка 1994 г. былі прыняты апошнія спрэчныя артыкулы (аб дзяржаўнай мове, праве на працу, прызнанні роўнасці на выбарах, рэферэндуме, судзе, Канстытуцыйным Судзе, фінансава-крэдытнай сістэме, змяненні Канстытуцыі).

***15 сакавіка 1994 г.*** Вярхоўны Савет канстытуцыйнай большасцю ў 236 галасоў (пры неабходных 231) прыняў Канстытуцыю цалкам. 237 галасамі быў прыняты Закон «Аб парадку ўступлення ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь», у адпаведнасці з якім канстытуцыя ўступіла ў сілу з моманту апублікавання – 30 сакавіка 1994 г.

Каля паловы артыкулаў Канстытуцыі прысвечаны правам і свабодам. Характэрнымі рысамі новай Канстытуцыі з’явіліся: 1) устанаўленне роўнасці дзяржавы і грамадзяніна; 2) замацаванне ў якасці эканамічнай асновы разнастайных формаў уласнасці; 3) раздзяленне і ўзаемадзеянне ўлад. Абвяшчаючы апошні прынцып, Вярхоўны Савет, па сутнасці, пазбаўляў сябе ўлады. На практыцы гэтага не адбылося.

Вярхоўны Савет на працягу першай паловы 1990-х гг. неаднаразова ўмешваўся ў кампетэнцыю выканаўчай улады. У выніку Прэзідэнт краіны звярнуўся да народа як вышэйшай крыніцы дзяржаўнай улады, выступіўшы ініцыятарам правядзення *рэспубліканскіх рэферэндумаў* па пытаннях ўнясення

змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь (1995. 1996 і 2004 гг.).

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – асноўны закон Рэспублікі Беларусь, які мае вышэйшую юрыдычную сілу і замацоўвае асноўныя прынцыпы і нормы прававога рэгулявання важнейшых грамадскіх адносін. Да юрыдычных уласцівасцей Канстытуцыі адносяць: устаноўчы характар; вяршэнства як юрыдычнага дакумента ў сістэме права; прамое дзеянне; стабільнасць; асаблівую ахову; выніковы характар і замацаванне перспектыў развіцця грамадства; сістэмаўтваральны дакумент для заканадаўства.

27 лютага 2022 г. пасля ўсенароднага абмеркавання на рэферэндуме большасць грамадзян зацвердзіла праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У Канстытуцыі 9 разделаў, 8 глаў і 148 артыкулаў. Найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы, згодна з арт. 2 з'яўляюцца чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі. Канстытуцыя ўвасобіла ў сабе гістарычны вопыт станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Яна грунтуецца на неад'емным суверэнным праве беларускага народа самастойна вызначаць свой лёс і быць поўнапраўным суб'ектам сусветнай супольнасці.

### 4. Чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі як найвышэйшая каштоўнасць і мэта грамадства і дзяржавы, абвешчаная Канстытуцыяй

Канстытуцыя мае найвышэйшую юрыдычную сілу і прамое дзеянне на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Іншыя правы выдаюцца на аснове і у адпаведнасці з Канстытуцыяй.

Дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры дзеля дасягнення унутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы нясуць адказнасць за дзеянні, якія парушаюць правы і свабоды асобы.

Так, абмежаванне правоў і свабод асобы дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў. Смяротная кара да яе адмены можа прымяняцца ў адпаведнасці з законам як выключная мера пакарання за асабліва цяжкія злачынствы і толькі згодна з прыгаворам суда (арт. 24).

Кожны мае права самастойна вызначаць свае адносіны да рэлігіі, асабіста або сумесна вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай (арт. 31.).

Для ажыццяўлення і задавальнення палітычных, сацыяльных, эканамічных, культурных і іншых інтарэсаў грамадзяне маюць права на стварэнне палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў (арт. 36).

Канстытуцыя гарантуе права на жыллё (арт. 48).

У канстытуцыі зацверджаны шэраг іншых правоў, свабод і гарантый іх рэалізацыі.

*Іерархія нарматыўна-прававых актаў*

Прававыя акты або іх асобныя палажэнні, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку супярэчнымі з палажэннямі Канстытуцыі, не маюць юрыдычнай сілы. Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Не дапускаецца заключэнне міжанродных дагавораў, чякія супярэчаць Канстытуцыі.

З Канстытуцыі вынікае наступная іерархія нарматыўных прававых актаў:

1) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;
2) рашэнні рэферэндумаў;
3) рашэнні Усебеларускага народнага сходу;
4) законы;
5) указы;
6) пастановы Савета Міністраў;
7) рашэнні іншых дзяржаўных органаў.

Сістэму нарматыўных прававых актаў і іх віды плануецца замацаваць у абноўленым законе "Аб нарматыўных прававых актах".[4]

# *Лекцыя 9.* Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

## 1. Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў айчыннай гісторыі

У сучаснай беларускай палітычнай сістэме вялікае значэнне мае інстытут прэзідэнцтва. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком беларускай дзяржавы. Кіраўнік дзяржавы гістарычна – альбо манарх, альбо прэзідэнт. Славянская дзяржаўнасць ужо на ранніх этапах развіцця не ўяўлялася без гэтага інстытута – кіраўніка дзяржавы, вярхоўнага кіраўніка, князя.

Функцыі кіраўніка ў раннефеадальных славянскіх дзяржавах супадаюць з функцыямі дзяржавы. Кіраўнік у свядомасці падданых і суседзяў ўвасабляў сабой саму дзяржаву, распаўсюджваў сваю ўладу на дзяржаўную тэрыторыю. На ранніх этапах развіцця інстытута княжацкай улады фігура князя ўяўляецца выключна службовай. Князь выконваў грамадска-карысную «працу», якую яму даручала насельніцтва. Паказальныя ў гэтых адносінах прыклады паклікання-запрашэння князёў з іншага асяроддзя, у тым ліку іншаэтнічнага, якія складалі «ряд» (дамову) з насельніцтвам.

Інстытут княжацкай улады быў звязаны з шэрагам функцый.

---

[4] Больш падрабязна гл.: Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 233–248.

*Вярхоўны галоўнакамандуючы*. Князь узначаліваў войска, клапаціўся аб абароназдольнасці краіны.

*Падатковая сістэма*. Фінансы дзяржавы знаходзіліся ў распараджэнні князя, ён усталёўваў даніны-падаткі і спаганяў іх з дапамогай сваіх органаў прымусу.

*Судовая функцыя*. Князь выступаў у ролі вярхоўнага арбітра, які згладжвае супярэчнасці паміж рознымі групоўкамі грамадства.

*Функцыя кантролю за зямельным фондам*. У славян з моманту зараджэння дзяржавы князь меў спадчыннае права вярхоўнага ўласніка зямлі ў дзяржаве.

У сярэдневяковым грамадстве глыбока адчувалася атаясамленне інстытута вярхоўнай улады з яго патрэбамі і чаканнямі. Сярод славянскага насельніцтва ранняга сярэдневякоўя шырока распаўсюдзілася вера ў залежнасць яго дабрабыту ад асобы кіраўніка.

Нармальнае функцыянаванне грамадства аказваецца немагчымым без ключавой постаці князя. У характэрным для тэолагаў ўсёй раннесярэдневяковай Еўропы трохчленным дзяленні грамадства (oratores, bellatores, laboratories – служыцелі царквы, воіны, работнікі) фігура кіраўніка (у славян – князя, радзей караля) увасабляла натуральны інтэгруючы пачатак, які спрыяе ўзаемавыгаднаму ўзаемадзеянню ўсіх слаёў насельніцтва.

Аўтарытэт князя быў вынікам разумення легітымнасьці ўлады, якая ў хрысціянскай традыцыі абапіралася на словы апостала Паўла «Усялякая ўлада ад Бога». Асобу князя і вышэйшае права, носьбітам якога ён лічыўся ўжо ў сілу свайго нараджэння, ўспрымалі як Божы промысел, бясспрэчны Абсалют. Найважнейшым элементам легітымацыі княжацкай улады ў хрысціянскай усходнеславянскай традыцыі быў рытуал *інтранізацыі* – «паднясення» князя на «дедни і отни стол». Дадзены рытуал быў выкананы і пры «пасаджэнні» на кіеўскі стол у 1068 г. легендарнага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ абрад інтранізацыі быў запазычаны прадстаўнікамі літоўскай пануючай дынастыі, як і тытулатура «вялікі князь».

Сакральнымі асобамі на Беларусі выступалі князі Уладзімір Святаслававіч, Хрысціцель Русі, яго сын Яраслаў Мудры, Усяслаў Чарадзей, Вітаўт і інш. Культ Уладзіміра, у сувязі з яго кананізацыяй, ўзмацніўся ў XIII ст. Уладзімір успрымаўся не толькі як князь, які хрысціў Русь, але і які ўсталяваў для яе хрысціянскае права, збор законаў і правілаў аб судзе, правах і традыцыях праваслаўнай царквы.

Палітыка вялікага князя Вітаўта была скіравана на стварэнне ўласнага вобраза “святога ўладара” праз прыпадабненне да Уладзіміра Святаславіча і вугорскага манарха Іштвана Святога. Вітаўт верыў, што ў адной з прайграных бітваў ён быў цудам выратаваны самой Найсвяцейшай Дзевай Марыяй. Таму ён умацоўваў і распаўсюджваў Марыйны культ і хрысціянскай традыцыі ВКЛ.

У тытулатуры Вітаўта знайшоў адлюстраванне цэлы комплекс ідэй, цесна звязаны і з праваслаўнай, і з каталіцкай канцэпцыяй улады. Вітаўт выступае ў якасці носьбіта вышэйшай улады, якую ён атрымлівае ў спадчыну ад свецкіх

уладароў заходняга і ўсходняга хрысціянскага свету. Менавіта таму яго вярхоўнаму сюзэрэнітэту павінны падпарадкоўвацца ўсе астатнія зямныя манархі. Нават у першай беларускамоўнай гісторыі Беларусі (Вільня, 1910), Вацлава Ластоўскага сустракаецца вобраз Вітаўта як мудрага валадара, вялікага ваяра, “свайго” князя.

Такім чынам, для ментальнасці беларускага народа характэрна перакананне, якое склалася гістарычна, што для эфектыўнага функцыянавання дзяржавы, неабходны яе кіраўнік. Для нашага народа кіраўнік дзяржавы – гэта вярхоўны арбітр, які стаіць над групавымі інтарэсамі і эгаістычнымі памкненнямі асобных груп грамадства. Яго галоўная задача – ахоўваць справядлівы закон для ўсіх.

Тэрмін “*прэзідэнт*” у перакладзе з лацінскай мовы азначае “той, хто сядзіць наперадзе”. Магчыма, у антычныя часы прэзідэнтам называлі старшынаў сходаў. Пасля ўзнікла такая пасада, як прэзідэнт сената. У цяперашнім разуменні тэрмін “прэзідэнт” пачаў ужывацца толькі з канца XVIII ст., калі быў заснаваны інстытут прэзідэнцтва ў ЗША.

Першапачаткова задуманы як частка выканаўчай улады, прэзідэнт ЗША замяніў ў свядомасці грамадзян манарха і стаў ажыццяўляць функцыі кіраўніка дзяржавы. Сучаснае ўяўленне пра прэзідэнта як раз і грунтуецца на атаясамліванні яго з кіраўніком дзяржавы. Эфектыўнасць функцыянавання прэзідэнцтва ў ЗША спрыяла распаўсюджванню гэтага інстытута ў свеце. Сёння інстытут прэзідэнцтва – неад’емны элемент сусветнай палітычнай практыкі – маюць 143 краіны, з іх 140 – члены ААН.

## 2. Прэзідэнтская рэспубліка – выбар беларускага народа

З набыццём незалежнасці ў 1991 г. перад Рэспублікай Беларусь паўсталі стратэгічныя пытанні аб дзяржаўным ладзе і сістэме органаў улады і кіравання ў краіне. Распрацоўка новага Асноўнага Закона была распачата Вярхоўным Саветам яшчэ у 1990 г. У другой палове 1991 г., калі праект Канстытуцыі быў практычна падрыхтаваны, большасць дэпутатаў схілялася да неабходнасці ўвядзення пасады Прэзідэнта.

Згодна з Канстытуцыяй 1994 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з’яўляўся кіраўніком дзяржавы і кіраўніком выканаўчай улады. Урадам быў вызначаны Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь, які ствараўся пры Прэзідэнце, кіраваў Прэм’ер-міністр. Урад нёс двайную адказнасць – перад Прэзідэнтам і перад парламентам. Прэзідэнт быў надзелены шэрагам істотных паўнамоцтваў, аднак на палітычным Алімпе першае месца займаў парламент.

Летам 1994 г. у Рэспубліцы Беларусь адбыліся першыя прэзідэнцкія выбары, на якіх перамог *Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка*. Быў сфарміраваны новы ўрад, пачалася рэалізацыя палітычнай праграмы выбранага Прэзідэнта. Дзейнасць Прэзідэнта сутыкнулася з пэўным супрацьдзеяннем з боку Вярхоўнага Савета. Немагчымасць дасягнення канструктыўнага кампрамісу з парламентам вымусіла А. Лукашэнку вынесці важныя пытанні на разгляд усяго народа.

Праведзены 14 мая 1995 г. рэспубліканскі рэферэндум не змяніў дзяржаўнага ладу, не пераразмяркоўваў паўнамоцтвы, а стаў плебесцытам аб даверу Прэзідэнту і падтрымцы яго палітыкі.

Палітычны крызіс працягваўся. Другі рэферэндум (24 лістапада 1996 г.) прадставіў два праекты новай рэдакцыі Канстытуцыі – ад Прэзідэнта і ад парламента (фракцыі аграрыяў і камуністаў), якія насілі ўзаемавыключальны характар. У першым варыянце прадугледжвалася рэфармаванне ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады з дамінуючым становішчам Прэзідэнта, у другім – скасаванне пасады Прэзідэнта і функцыянаванне дзяржаўнага механізму ва ўмовах вяршэнства заканадаўчага органа. Праект дэпутатаў быў практычна непрымальным для дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь. Па-першае, фарміраванне дзяржаўнага ладу Беларусі без інстытута прэзідэнцтва не ўяўлялася магчымым, паколькі гэты інстытут быў успрыняты станоўча большасцю грамадства Беларусі, пра што сведчыць высокая ступень удзелу выбаршчыкаў у выбарах першага Прэзідэнта краіны – 78,97 % у першым туры і 69,9 % – у другім. Па-другое, скасаванне інстытута прэзідэнцтва, заснаванага гэтым жа парламентам ўсяго два гады таму, сведчыла аб непавазе парламентарыяў да найвышэйшага заканадаўчага акта дзяржавы – Канстытуцыі. Такія «рэвалюцыйныя» змены Асноўнага закона на працягу мізэрнага перыяду часу не мелі пад сабой лагічных абгрунтаванняў. І нарэшце, згодна з дэпутацкім праектам парламент станавіўся непадзельным манапалістам усёй дзяржаўнай улады: прызначаў і звальняў суддзяў вышэйшых судовых інстанцый; прымаў Канстытуцыю і ўносіў у яе змены; прымаў законы і сам іх прамульгіраваў; меў права выказаць вотум недаверу ўраду на любой падставе, паколькі падставы не былі зафіксаваны ў праекце. Прыняцце парламенцкага варыянта прывяло б да парушэння балансу сіл у дзяржаве на карысць парламента, даператварэння яго, па сутнасці, у адзіны і бескантрольны орган дзяржаўнай улады.

Прэзідэнцкі варыянт Канстытуцыі, прыняты на рэспубліканскім рэферэндуме, стварыў цалкам новую мадэль дзяржаўнага ладу Беларусі. У ім найбольш паслядоўна замацавана рэалізацыя прынцыпу падзелу ўлад, адноўлена раўнавага трох галін улады, баланс паміж абавязкамі і правамі кіраўніка дзяржавы, умацаваны статус выканаўчай улады ў сістэме дзяржаўных органаў і яе роля ў кіраванні дзяржавай і грамадствам, што адлюстроўвае сусветную тэндэнцыю другой паловы XX ст. Заканадаўчая ўлада ўжо не знаходзіцца ў прывілеяваным становішчы, яна набыла больш цывілізаваную форму функцыянавання, што азначае канчатковую адмову ад савецкай мадэлі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады.

У канчатковым варыянце правы, абавязкі і статус Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. шляхам змяненняў і дапаненняў, якія былі прыняты на рэспубліканскіх рэферэндумах 17 кастрычніка 2004 г. і 27 лютага 2022 г.

### 3. Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы як гаранта захавання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян

Прэзідэнт Беларусі больш не з'яўляецца кіраўніком выканаўчай улады, ён – Кіраўнік Дзяржавы. Надзяленне Прэзідэнта такім статусам выцякае з неабходнасці забеспячэння ўзаемадзеяння ўлад, устойлівасці дзяржаўнага механізму, пераемнасці і стабільнасці дзяржаўных органаў. Прэзідэнт прадстаўляе Беларусь ўнутры краіны і ў міжнародных адносінах, яго акты не маюць патрэбы ў контрассігнацыі. Прэзідэнт займае асаблівае месца ў дзяржаўным механізме і ў сістэме падзелу ўлад: у арганізацыйным стаўленні ён самастойны (выбіраецца народам), не ўключаны ні ў адну з галін улады. Беспартыйны Прэзідэнт выступае арбітрам паміж living рознымі палітычнымі сіламі, што спрыяе вырашэнню спрэчак паміж імі. Разам з тым ён аказвае істотны ўплыў на фарміраванне і дзейнасць усіх галін улады.

Да Прэзідэнта пераходзяць некаторыя паўнамоцтвы іншых дзяржаўных органаў, у выніку чаго фарміруецца асаблівы інстытут прэзідэнцкай улады, які займае пераважнае становішча ў адносінах да іншых улад. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прызваны ў рамках сваіх задач аб'ядноўваць усе ўлады, спрыяць іх узгодненаму і эфектыўнаму функцыянаванню. У Беларусі пасрэдніцтва Прэзідэнта выведзена за сферу публічных улад, распаўсюджана на адносіны органаў дзяржаўнай улады, дзяржавы і грамадства. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь адыходзіць ад прамога замацавання юрыдычнай прыроды прэзідэнцкай улады з пункту гледжання падзелу ўлад. Яна не ўпісваецца ў класічную трыяду улад і не ўключана якім-небудзь чынам у структуру адной з іх, а выдзелена ў асобную главу. На гэтай падставе ў навуковай літаратуры атрымала пэўнае прызнанне ўяўленне аб прэзідэнцкай уладзе ў кантэксце рэспублікі як *чацвёртай улады*.

Функцыі Прэзідэнта па Канстытуцыі:

- рэалізацыя асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі;
- абарона суверэнітэту, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі;
- падтрымка стабільнасці ў дзяржаве, грамадзянскага міру.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь займае асаблівае месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Згодна з Канстытуцыяй ён з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Прэзідэнт увасабляе адзінства народа, гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.

Кіраўнік дзяржавы прымае меры па ахове суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці, забяспечвае палітычную і эканамічную стабільнасць, пераемнасць і ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады, ажыццяўляе пасрэдніцтва паміж органамі дзяржаўнай улады. Прэзідэнт валодае недатыкальнасцю, яго гонар і годнасць ахоўваюцца законам.

Паўнамоцтвы Прэзідэнта замацаваны пераважна ў арт. 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Гэта:

1) *рэалізацыя выканаўчай улады*; Прэзідэнт з папярэдняй згоды Палаты прадстаўнікоў назначае на пасаду Прэмьер-Міністра; вызначае стуктуру Урада Рэспублікі Беларусь; назначае на пасаду і вызваляе ад пасады намеснікаў Прэм'ер-Міністра; мае права адмяняць акты Урада і г.д.
2) *ўдзел у заканадаўчым працэсе*; Прэзідэнт назначае і чарговыя і пазачарговыя выбары ў Палату Прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі і мясцовыя прадстаўнічыя органы; звяртаецца з пасланнямі да Парламента; падпісвае законы і іншае;
3) *фарміраванне судовай сістэмы*; з папярэдняй згоды Савета Рэспублікі назначае на пасаду Генеральнага пракурора, Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю, Старшыню і членаў Праўлення Нацыянальнага банка і інш.
4) *арганізацыя і фарміраванне дзяржапарату*.

Як кіраўнік дзяржавы ён звяртаецца з пасланнямі да народа пра становішча ў дзяржаве і пра асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі; назначае рэферэндумы; узнагародвае дзяржаўнымі ўзнагародамі, прысвойвае класныя чыны і званні, пазбаўляе дзяржаўных узнагарод і інш.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у галіне знешняй палітыкі і міжнародных адносін вядзе перагаворы і падпісвае міжнародныя дамовы, назначае на пасады і вызваляе ад пасады паслоў і іншых прпадстаўнікоў мінародных арганізацый, прымае даверчыя і адзыўныя граматы дыпламатаў замежных дзяржаў, вырашае пытанні аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь, яго спыненні і прадастаўленні прытулку; ажыцяўляе памілаванне асуджаных.

Прэзідэнт мае шмат іншых абавязкаў і паўнамоцтваў ў сферах: дзяржаўнай кадравай палітыкі, ідэалогіі беларускай дзяржавы, права, сацыяльна-эканамічнай палітыкі, знешняй палітыкі і г.д.

## 4. Прэзідэнт – Галоўнакамандуючы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі ажыцяўляе агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і прымяненнем ваеннай арганізацыі дзяржавы з мэтай забеспячэння ваеннай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Згодна з арт. 84 Канстытуцыі Прэзідэнт з'яўляецца Галоўнакамандуючым Узброенымі Сіламі; назначае на пасады і вызваляе ад пасад вышэйшае камандаванне Узброенымі Сіламі; фарміруе і ўзначальвае Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь; назначае на пасаду і вызваляе ад пасады Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі; уводзіць на тэрыторыі РБ у выпадку ваеннай пагрозы або нападзення ваеннае становічшча, аб'яўляе поўную, або частковую мабілізацыю.

У выпадку гібелі Прэзідэнта ў выніку замаху на яго жыццё, учынення акта тэрарызму, ваеннай агрэсіі і іншых выпадкаў гвалтоўнага характару

Пасяджэнні Савета Бяспекі праводзяцца пад кіраўніцтвам яго старшыні, а па краіне ўводзіцца надзвычайнае становішча.

З 1994 г. ваеннае будаўніцтва ў рэспубліцы накіравана на забеспячэнне ваеннай бяспекі краіны, стварэнне арміі суверэннай і незалежнай Беларусі.

У 1996 г. быў распрацаваны план ваеннай рэформы па будаўніцтву і развіццю Узброеных Сіл да 2000 г., значная увага надавалася удасканаленню кіруючай сістэмы гэтай ваеннай арганізацыі.

2001 г. – прынята Канцэпцыя будаўніцтва Узброеных Сіл на 2001 – 2010 гг. У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 2011 г. "Аб аптымізацыі баявога складу і колькасці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь" у 2011–2015 гг." нацыянальную армію сталі рыхтаваць адпаведна з гэтай Канцэпцыяй.

2015 г. – канкрэтызаваны асноўныя задачы і напрамкі развіцця беларускай арміі ў сучасных умовах, каб максімальна адаптаваць Узброеныя Сілы да рэагавання на магчымыя выклікі і пагрозы: павяліччыўся баявы склад сіл пастаяннай гатоўнасці, развіваўся мабільны кампанент.

2019 г. – зацверджданы План абароны на наступныя 5 год і Канцэпцыя будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 г.

Беларусь свядома выбрала мадэль прэзідэнцткай улады, якая адпавядае гістарычнай і палітычнай традыціі нашага народа. Для беларусаў характэрна разуменне ўлады дзе лідар бярэ на сябе паўнату адказнасці. Прэзідэнт з'яўляецца гарантам канстытуцыйных норм, увасабляе ідэалы аб моцнай і справядлівай уладзе.

## *Лекцыя 10.* Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады

### 1. Трансфармацыя форм урадавай ўлады ў Беларусі

Ключавая роля ў сістэме ўлады і кіраванні Старажытнай Русі належала князю, улада якога з'яўлялася індывідуальна-спадчыннай. Да 80-х гг. X ст. манапольнае права на кіраванне тэрыторыяй рассялення ўсходніх славян набылі прадстаўнікі княжацкай дынастыі Рурыкавічаў, якая вяла сваё паходжанне ад запрошанага "паўночнай канфедэрацыяй плямён" скандынаўскага конунга Рурыка. Іерархію князёў-Рурыкавічаў узначальваў кіеўскі князь, якога больш позні крыніцы называлі тытулам "вялікі князь". Найбольш магутныя кіеўскія князі (Уладзімір Святаславіч, Яраслаў Мудры) маглі насіць таксама тытулы "каган" і "цар". Князь засяроджваў у сваіх руках усю паўнату вышэйшай адміністрацыйнай, заканадаўчай, судовай, ваеннай і сакральнай улады. У цэлым княжацкая ўлада ў Старажытнай Русі – гэта абавязковы атрыбут і ключавы элемент дзяржаўнай сістэмы, без якога не ўяўлялася звычайнае функцыянаванне грамадства.

Дружына князя стала асновай для стварэння судова-адміністрацыйнага апарату. Значная роля дружыны і асобыя адносіны паміж князямі і гэтай групай

прафесійных воінаў (“дружыне нельга загадваць, яе трэба пераконваць”) дазволіла некаторым даследчыкам вылучыць перыяд існавання дружыннай формы дзяржаўнасці. Як вядучы фактар палітычнага жыцця, апарат кіравання і судаводства дружына страціла свае пазіцыі толькі ў час кіравання Яраслава Мудрага (1019–1054). Дружына, акрамя ўсяго іншага, – дарадчы орган.

Пры князях і іх намесніках – пасадніках існавалі спецыяльныя агенты – цівуны, якія выконвалі розныя функцыі (прысутнічалі на судзе князя і пасадніка, нават замяшчалі іх у судзе, вялі княжацкую гаспадарку і г. д.). Па сваім статусе цівуны былі халопамі, г.зн. людзьмі нявольнымі.

Мясцовае кіравання вялікай тэрыторыяй Кіеўскай Русі, дзе пражывалі ўсходнія славяне, фіна-угорскія і балцкія плямёны, эвалюцыянавала ў бок умацавання вярхоўнай улады кіеўскага князя. Усходнеславянскія саюзы плямёнаў рэгулярна плацілі даніну цэнтральнай уладзе (збіралася падчас палюддзя); давалі вайска ў час буйных знешнепалітычных мерапрыемстваў.

У X ст. сцвярджаецца практыка раздачы кіеўскімі князямі “*кармленняў*”. Называць кармленні першай сістэмай мясцовага кіравання не зусім дакладна. У старажытнарускі перыяд яны азначалі часовую перадачу кіеўскім князем права толькі а збор даніны з вызначанай тэрыторыі. У плямёнаў захоўваліся і свой племянны князь, і свая радавая знаць.

У сапраўднасці першай сістэмай кіравання Старажытнай Русі неабходна прызнаць *пасадніцтва* – размяшчэнне «княжых мужоў» у гарадах з валасцямі, пры надзяленні іх вышэйшымі мясцовымі судова-адміністрацыйнымі функцыямі.

Пасля ліквідацыі племянных княжанняў у час праўлення Уладзіміра Святаславіча (980–1015) стала магчымым ажыццяўленне адміністрацыйнай рэформы. У новых цэнтрах на месцах нароўні з пасаднікамі размяшчаліся сыны вялікага князя каб умацаваць уладу цэнтра. У XI–XII стст. пасаднікі выконвалі наступныя функцыі: 1) кантроль за зборам данін і іх размеркаванне ў адпаведнасці з княжацкімі пастановамі; 2) выкананне вышэйшай адміністрацыйнай улады на месцах ад імя князя; 3) збіранне на карысць князя судовых штрафаў ці іх часткі ў сумесным з епіскапам судзе.

Органам мясцовага сялянскага самакіравання заставалася тэрытарыяльная абшчына – *верв*. Верв – гэта тэрытарыяльная акруга, прадстаўнікі якой былі злучаны кругавой адказнасцю па некаторых судова-паліцэйскіх і фінансавых справах. У яе кампетэнцыю ўваходзілі: зямельныя передзелы (пераразмеркаванне зямельных надзелаў), паліцэйскі нагляд, падаткава-фінансавыя пытанні, злучаныя з абкладаннем падаткамі і іх размеркаваннем, рашэнне судовых спрэчак, расследаванне злачынстваў і выкананне пакаранняў. Гарадской арганізацыяй, аналагічнай сельскай верві, была верагодна “вуліца”.

Функцыі кіравання ў княствах-землях і валасцях былі засяроджаны ў руках князя. Адсутнасць князя ўспрымалася як ненармальны стан, менавіта князь і яго адміністрацыя займаліся паўсядзённым кіраваннем, а орган народнага самакіравання – *веча* – не валодаў неабходнымі магчымасцямі для яго арганізацыі.

Кіраўнічыя функцыі князя:

1) ваенная справа;
2) прызначэнне службоўцаў;
3) судовыя;
4) знешнепалітычная дзейнасць;
5) заканадаўчая ініцыятыва;
6) клапаты аб царкве;
7) фінансавая дзейнасць.

У перыяд палітычнай раздробленасці паняцце “дружына” уяўляла складаны сацыяльны калектыў, які ажыццяў кіраванне феадальнай дзяржавай, ваенную службу і асабістую васальную службу князю. У XII–XIII стст. тэрмін дружына ўжо адрозніваўся ад паняцця баяры. Дружына, як правіла, – гэта служылыя князю людзі. У гэты час асноўныя адміністрацыйныя функцыі ўсё часцей ажыццяўляла малодшая дружына (*децкія*). Менавіта з яе складу князь прызначаў службовых асоб для збору падаткаў-даніны і судовых штрафаў. Для пазначэння свабодных служылых князю людзей з’яўляецца тэрмін дваране.

У дадзены перыяд канчаткова змяняецца *сістэма дзяржаўнага кіравання – дружынная замяняецца палацава-вотчыннай*. Фарміруюцца два цэнтры кіравання: двор (палац) і вотчына.

У першай палове XIII ст. з’яўляюцца іншыя дваровыя службовыя асобы – мечаноша, стольнік (кіраўнік службы княжага стала-прастола), пячатнік (захавальнік княжацкай пячаткі), сядзельнічы (кіраўнік верхавым выездам князя). У гэты час князь, які сумяшчаў у сваёй асобе дзяржаўную ўладу і кіраванне ўласнай гаспадаркай, даваў прадстаўнікам свайго двара даручэнні дзяржаўнага характару. *Княжацкі двор* – гэта апарат кіравання княжацкай гаспадаркай, група блізкіх да князя слуг, пастаянны воінскі атрад, які існуе паралельна з інстытутамі, якія ўзніклі на іншай аснове, паступова іх выціскаючы. Так, у гарадах знікае пасада пасадніка, а ў малодшай княжацкай дружыне пачынаюць дамінаваць дваране.

У XII–XIII стст. вялікае значэнне атрымала сістэма імунітэтаў, якія вызвалялі баярскія вотчыны ад княжацкага кіравання і суда. Усталявалася складаная сістэма васальных адносін і адпавядаючая ёй сістэма пазямельнай феадальнай уласнасці. У адрозненне ад заходнееўрапейскай леннай сістэмы ўсе рускія князі з’яўляліся членамі адной сям’і. Васальна-сюзерэнітэтныя сувязі па-за княжацкай сям’ёй былі заснаваны на асабістай залежнасці служкі і гаспадара.

У перыяд палітычнай раздробленасці пашыраецца значэнне царкоўнай арганізацыі. Царква ў асобе мітрапаліта і епіскапаў з іх кіраваннем ператварылася ў своеасаблівы орган дзяржаўнай улады.

## 2. Пасады княжацкай адміністрацыі ў Старажытнай Русі

Дзяржаўнае кіраванне, прадстаўленае княжацкай адміністрацыяй, ахоплівала розныя сферы: адміністрацыйную, ваенную, фіскальную, судовую, знешнепалітычную, «гандлёва-метралагічную», нарэшце, палацава-вотчынную.

Дарадчым органам пры князю была рада (“совет”) (у летапісах сустракаецца як паняцце «сдумаша», адсюль прынятае ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі яго найменне – “Баярская дума”), у якую ўваходзіла бліжэйшае акружэнне князя, старэйшая дружына, а таксама запрошаныя князем асобы. У цэлым княжацкая рада ацэньваецца як вышэйшы орган улады раннефеадальнай дзяржавы, яе называюць “аднапалатным саслоўным органам”. У склад рады ўваходзілі васалы князя, баяры, верхавіна духавенства, часам – княжацкія службоўцы і прадстаўнікі горада, у ваенны час – кіраўнікі саюзнікаў. Кампетэнцыя рады была шырокай: на ёй абмяркоўвалі пытанні заканадаўства, кіравання, адносін з царквой, знешняй палітыкі. У радзе разглядаліся і складаныя судовыя цяжбы. Рада магла браць на сябе выкананне функцый князя ў выпадку яго адсутнасці.

Пасада пасадніка адносіцца да ліку найбольш старажытных органаў улады ўсходніх славян. Пасаднікі маглі атрымліваць ад князёў зямельныя ўладанні, сёла “с людьми и з данью”. У пасадніка заставалася частка сабраных данін-падаткаў і судовых штрафаў і мыт. Разам з рэалізацыяй вышэйшай адміністрацыйнай улады на месцах ад імя князя пасаднік у поўным аб’ёме засяроджваў у сваіх руках збор данін-падаткаў і збіранне судовых мыт. У асобе пасадніка мы выяўляем найстаражытнага прадстаўніка дзяржаўнай адміністрацыі, які выконваў шэраг найбольш важных функцый.

З канца X ст. у Старажытнарускай дзяржаве пачынае фарміравацца дэцымальная (дзесятковая) сістэма. У наш час адкінута меркаванне аб паходжанні дзесятковай сістэмы з інстытутаў рода-племяннной эпохі і доказана яе стварэнне ў дзяржаўны перыяд шляхам арганізацыі княжацкай адміністрацыяй насельніцтва, якое трапіла ў залежнасць. На чале дзясяткаў былі пастаўлены дзясяцкія, а на чале буйнейшых аб’яднанняў у дзесяць дзясяткаў, г.зн. сотні, – соцкія. Пасада тысяцкага ўзгадваецца, перш за ўсё, у якасці ваенных кіраўнікоў, да яго абавязкаў адносіліся і грамадзянскія справы.

Звесткі аб службовых асобах княжацкай адміністрацыі на беларускіх землях у “далітоўскі” перыяд вельмі фрагментарныя. У Полацкай зямлі ўжо ў складзе Вялікага Княства Літоўскага ў якасці судовых “службоўцаў” сустракаюцца цівуны і падпарадкаваныя ім слугі.

Далейшае развіццё сацыяльных інстытутаў у Полацкай і Тураўскай землях прывяло да пашырэння службовага апарату. Так, паўсядзённыя функцыі судовай і фіскальнай сістэм выконвалі памочнікі ўжо названых прадстаўнікоў княжацкай адміністрацыі – вірнікі, мечнікі.

## 3. **Асноўныя службовыя пасады цэнтральнага апарату ў ВКЛ**

Пасля ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага на беларускіх землях даволі працяглы час захоўвалі сваё значэнне ранейшыя органы кіравання і службовыя пасады. Паступова ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім выспяваюць свае асаблівасці ў дадзенай сферы палітычнага жыцця.

Замест калегіяльных галіновых органаў кіравання была створана шырокая сістэма вышэйшых і дваровых пасад, заснаваных на прынцыпах адзінаначалля,

прызначэння, персанальнай адказнасці. Гэтыя службовыя асобы, называемыя *ўраднікамі*, узначальвалі асобныя галіны кіравання і ажыццяўлялі паўсядзённае непасрэднае кіраўніцтва дзяржаўнымі справамі. Самі пасады зваліся ўрадам (урядам). Урады падзяляліся на вышэйшыя і ніжэйшыя.

Да ліку вышэйшых адносілася пасада вялікага (дзяржаўнага) *канцлера*. Ён ведаў дзяржаўнай канцылярыяй, ажыццяўляў кантроль за працай пісараў, сакратароў і іх памчнікаў (дзякаў), захоўваў дзяржаўную пячатку і дзяржаўны архіў – Метрыку ВКЛ, сачыў за ўлікам усяго ўваходнага допісу, які паступае на імя князя (скаргі, прашэнні, данясенні, судовыя справы), дакладваў гаспадару пра паступіўшыя справы, удзельнічаў у распрацоўцы нарматыўных актаў, рыхтаваў матэрыялы да пасяджэнняў рады, рэдагаваў прынятыя рашэнні, мог выдаваць меней важныя акты за сваім подпісам. Намеснікам канцлера быў *падканцлер* – захавальнік малой дзяржаўнай пячаткі (пасада была ўведзена ў 1566 г.). Пад кіраўніцтвам канцлера і падканцлера працавалі *перакладчыкі, рэгенты, сакратары, пісары, дзякі*.

Асноўнай задачай канцылярыі з’яўлялася дакументаванне рашэнняў гаспадара, рады і сейма. Тут жа захоўваўся дзяржаўны архіў. Але дзейнасць канцылярыі не абмяжоўвалася толькі справаводчымі пытаннямі. У ёй выявіліся рысы пасольскай службы, яна выконвала функцыі дзяржаўнай пошты. Акрамя таго, яе службоўцы выконвалі самыя розныя даручэнні ў якасці рэвізораў, мернікаў, камісараў. На канцылярыю былі ўскладзены таксама і судовыя функцыі.

Фінансавыя пытанні знаходзіліся ў веданні земскага (вялікага) *падскарбія*, які вёў улік падаткаў і збораў, якія паступалі ў дзяржаўную казну (скарб), ажыццяўляў іх захоўванне, а таксама па ўказанні гаспадара і рады ажыццяўляў выдачу грошай з дзяржаўнай казны, штогод даючы справаздачу пра сваю працу на сеймах. У падначаленні ў падскарбія земскага знаходзіліся *скарбнікі*, якія сачылі за своечасовым паступленнем сродкаў у казну і разглядалі фінансавыя справаздачы ключнікаў, дзяржаўцаў, цівуноў і іншых асоб мясцовай гаспадарчай адміністрацыі.

Важнае месца сярод цэнтральных ураднікаў займаў *гетман вялікі* (найвышэйшы), які ведаў узброенымі сіламі дзяржавы, іх камплектаваннем і забеспячэннем. Падчас ваеннага паходу ён надзяляўся самымі шырокімі паўнамоцтвамі. У яго кампетэнцыю ўваходзіў разгляд спраў пра злачынствы, якія здзейснілі па службе вайсковыя службовыя асобы, пра нез’яўленне на ваенную службу без паважлівых прычын, пра самавольны сыход з поля бою. У мірны час улада гетмана была меней значнай. Ён кіраваў рэгістрацыяй і зборам служылых людзей, размяркоўваў іх па асобных вайсковых адзінках. Намеснікам гетмана вялікага быў *гетман польны*, які ўзначальваў частку ўзброеных сіл, часцей за ўсё размешчаных у памежжы.

У войску таксама знаходзіўся земскі *харунжы* з земскай харугвай. Ён узначальваў прыватныя і павятовыя харугвы, якія далучыліся да гетманскага войска, выконваў функцыю захоўвання і нашэння падчас цырымоній і ваенных дзеянняў вялікакняжацкай харугвы.

Асобае месца сярод вышэйшыхураднікаў займаў *земскі (вялікі) маршалак*, які ажыццяўляў распарадча-паліцэйскую функцыю ў месцы знаходжання гаспадара і правядзення соймаў. Ён быў захавальнікам парадку і этыкету пры двары. У яго абавязкі падчас сойма ўваходзілі скліканне, старшынстваванне на пасяджэннях сойма і рады пры адсутнасці князя. Ён прымаў паслоў, наведвальнікаў са скаргамі і чалабітнымі, размяшчаў прыбылых на сойм ці аўдыенцыю да князя, вызначаў цвёрдыя кошты на мясцовым рынку, судзіў за злачынствы, зробленыя на сойме.

Па асобных галінах палацавай гаспадаркі прызначаліся і іншыя ўраднікі, сярод якіх: *дворны стольнік* і *падстолі*, якія адказвалі за сервіроўку гаспадарскага стала; *падчашы* і *чашнік*, якія адказвалі за захоўванне гаспадарскіх напояў, прыслугоўвалі князю падчас прыдворных урачыстых абедаў, спрабавалі напоі; краўчы, які адказваў за падрыхтоўку і нарэзку мясных страў для гаспадарскага стала; кухмайстар, што складаў меню для гаспадарскага стала; мечнік, які трымаў вялікакняжацкі меч падчас розных урачыстасцей. У падначаленні дворныхураднікаў знаходзіліся прыдворныя слугі, якія набіраліся, як правіла, з заможных сялян: скацертныя, кухары і пекары, конюхі, вазніцы, саколнікі, псарцы і інш.

Апроч вышэйшыхураднікаў існаваў шэраг меней значных службовых асоб, якія адносіліся да ніжэйшыхураднікаў і ведалі яшчэ больш вузкім кругам пытанняў кіравання – *канюшыя, падключыя, ключнікі, лоўчыя, стайнікі* і інш.

Пасля аб’яднання Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў “дзяржаву абодвух народаў” – Рэч Паспалітую – у арганізацыі кіравання і структуры цэнтральных ураднікаў не адбылося істотных змен.

Важнейшай тэндэнцыяй палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай з’яўлялася ўзрастанне ўладавых магчымасцяў вузкага колу буйнейшых землеўласнікаў – магнатаў. Уплывовыя магнаты прыбралі да рук усе галоўныя дзяржаўный пасады, што дазваляла ім кантраляваць разам з палітычнай сферай таксама і фінансы, і эканоміку, і войска. Разам з ўраўнаваннем правоў шляхты Польскай Кароны і ВКЛ узмацніўся працэс паланізацыі апошняй, як і ўвогуле грамадства Вялікага Княства. Так, з 1696 г. мовай дзяржаўнага справаводства становіцца польская мова.

## 4. З’яўленне міністэрскай формы арганізацыі выканаўчай улады. Беларусы на вышэйшых дзяржаўных пасадах у Расійскай імперыі

Міністэрская форма арганізацыі выканаўчай улады стала вядома ў Беларусі ў перыяд уваходжання яе тэрыторыі ў склад Расійскай імперыі. Рэарганізацыя цэнтральнага кіравання адбылася ў пачатку XIX ст. і не без уплыву паспяховага вопыту дзейнасці міністэрстваў у Францыі. Бюракратычная падпарадкаванасць і строгая іерархія чыноўніцкага апарату, адносная аператыўнасць яго дзейнасці, дакладнасць арганізацыі і справаводства міністэрстваў у найбольшай ступені адпавядалі задачам рэфармавання імперскага ўзроўню кіравання ў Расіі. Маніфестам ад 8 верасня

1802 г. былі ўтвораны пасады васьмі міністраў (ваенна-сухапутных сіл, марскіх сіл, замежных спраў, юстыцыі, унутраных спраў, фінансаў, камерцыі, народнай асветы), паміж якімі былі размеркаваны калегіі, якія дзейнічалі ў краіне да гэтага часу.

У ліпені 1803 г. Аляксандр I прыняў рашэнне канчаткова ліквідаваць калегіі, стварыць у складзе міністэрстваў дэпартаменты, умацаваць прынцыпы адзінаначалля ў іх працы. Увядзенне міністэрстваў выклікала шматлікія спрэчкі паміж прыхільнікамі і праціўнікамі рэформы, але 25 ліпеня 1810 г. імператар Аляксандр I зацвердзіў праект закона «О разделении государственных дел на особые управления». Канчатковае афармленне міністэрскай арганізацыі, размежаванне функцый міністэрстваў, вызначэнне іх месца ў сістэме ўлады ў Расійскай імперыі адбылося паводле заканадаўчага акта «Общее учреждение министерств» ад 25 чэрвеня 1811 г.

Адначасова з міністэрствамі 8 верасня 1802 г. быў створаны Камітэт міністраў, у склад якога ўвайшлі міністры і роўныя ім па рангу кіраўнікі ведамстваў, пазней – страшыня Дзяржаўнага савета, а таксама чыноўнікі па асобнаму прызначэнню імператара. На працягу XIX – пачатку XX ст. Камітэт міністраў захоўваў статус вышэйшай адміністрацыйнай установы ў Расійскай імперыі, аднак ён не паспяваў займацца каардынацыяй дзейнасці асобных міністэрстваў і ведамстваў. Такі парадак прывёў да арганізацыі спачатку неафіцыйна, а з 12 лістапада 1861 г. афіцыйна новага ўрадавага органа – Савета Міністраў, які ўзначаліў імператар і куды ўвайшлі міністры, старшыні Камітэта міністраў і Дзяржаўнага савета, набліжаныя да манарха асобы. Савет разглядаў справы агульнадзяржаўнага ўзроўню.

У перыяд рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. 19 кастрычніка 1905 г. Савет Міністраў быў пераўтвораны ў пастаянна дзеючую вышэйшую ўрадавую установу, на якую ўскладвалася «кіраванне і аб’яднанне» дзеянняў «галоўных начальнікаў ведамстваў» у сферах заканадаўства і вышэйшага дзяржаўнага кіравання. У склад Савета Міністраў уваходзілі ўсе міністры, галоўнаўпраўляючы землеўладкавання і земляробства, обер-пракурор Сінода і дзяржаўны кантралёр. Савет выконваў і пэўныя законадарадчыя функцыі, незалежна ад дзейнасці Дзяржаўнай думы. Камітэт міністраў быў скасаваны 23 красавіка 1906 г.

Фарміраванне чыноўніцкага апарату на тэрыторыі Беларусі адбывалася пераважна за кошт прыезджых служачых – многія пасады ў вышэйшай адміністрацыі займалі рускія чыноўнікі. Найбольш паслядоўна такі падыход да камплектавання чыноўніцкага апарату выявіў сябе пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. і фарміравання новага імперскага курсу ва ўнутранай палітыцы Расіі, звязанага з рэалізацыяй абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да каталіцкага і яўрэйскага насельніцтва. Служба ў заходняй частцы Расійскай імперыі лічылася для прыезджых прадстаўнікоў бюракратычнага апарату найбольш выгаднай і прывілеяванай. Указам імператара ад 5 сакавіка 1864 г. устанаўлівалася 50-працэнтная надбаўка да аклада рускім чыноўнікам у беларускіх і Ковенскай губернях.

## 5. Урад Савецкай Беларусі

Першы ўрад Савецкай Беларусі, створаны 31 снежня 1918 г., складаўся з прадстаўнікоў *Аблвыкамзаха* і беларускіх камуністаў, якія працавалі ў гэты час у Маскве. Часовы рабоча-сялянскі ўрад узначаліў Зміцер Жылуновіч. 2 лютага 1919 г. ён перадаў свае паўнамоцтвы І Усебеларускаму з'езду Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Адобраная з'ездам Канстытуцыя Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь вызначала структуру і кампетэнцыю вышэйшых органаў дзяржаўнай улады. На сваім першым пасяджэнні 5 лютага 1919 г. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) стварыў Вялікі і Малы рэзідыўмы. У Вялікі прэзідыўм уваходзілі ўсе камісары, і дадзены орган фактычна з'яўляўся Саветам Народных Камісараў (СНК).

Вышэйшым органам улады на неакупіраванай польскімі войскамі тэрыторыі стаў *Мінскі губернскі рэўкам*. 31 ліпеня 1920 г. была зацверджана Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, згодна з якой да склікання З'езда Саветаў уся паўната ўлады ў ССРБ належала Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту. На месцах была створана сістэма валасных і павятовых рэўкамаў і толькі ў вёсках — сельскія Саветы. Такая сітуацыя тлумачылася наяўнасцю ваеннага становішча ў прыфрантавой паласе, часткай якой з'яўляліся 6 паветаў Савецкай Беларусі.

Перад Другім з'ездам Саветаў (13–17 снежня 1920 г.) стаяла задача далейшага развіцця на канстытуцыйных асновах беларускай дзяржаўнасці. З'ездам былі прыняты "Дапаўненні да Канстытуцыі ССР Беларусі". У адпаведнасці з новым законам прадугледжвалася стварэнне ўрада – Савета Народных Камісараў як распарадчага і выканаўчага органа. Ён надзяляўся правам выдаваць дэкрэты, распараджэнні, інструкцыі, прымаць усе меры, неабходныя для штодзённага кіраўніцтва. Пра ўсе свае пастановы і рашэнні СНК павінен быў паведамляць у ЦВК, які меў права адмяніць або прыпыніць іх дзеянне, хоць у абодвух органаў быў адзіны старшыня (Аляксандр Чарвякоў). Члены СНК узначальвалі органы галіновага кіравання – народныя камісарыяты. Дапаўненні да Канстытуцыі прадугледжвалі стварэнне наркаматаў: па замежных справах, па ваенных справах, унутраных спраў, юстыцыі, працы, сацыяльнага забеспячэння, народнай адукацыі, фінансаў, земляробства, сувязі, аховы здароўя, а таксама Савета народнай гаспадаркі, Рабоча-сялянскай інспекцыі, Надзвычайнай камісіі.

З утварэннем Саюза ССР быў сфарміраваны ўрад – *Саўнаркам СССР* – на чале з Уладзімірам Леніным. У 1924 г. кіраўніцтва ЦВК і СНК Беларускай ССР размежавалі. Старшынёй урада стаў Іосіф Адамовіч. У межах будаўніцтва Саюза была распрацавана другая Канстытуцыя БССР, якая пасля шматлікіх дыскусій з цэнтральнымі установамі СССР і агульнасаюзнай Кампартыі была прынята 11 красавіка 1927 г. VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў. Асноўная рыса Канстытуцыі 1927 г. – размежаванне функцый дзяржаўных органаў: Адмянялася права СНК БССР у неадкладных выпадках самастойна выдаваць заканадаўчыя акты. Абмежаванне кампетэнцыі СНК ператварала яго ў

выключна выканаўчы дзяржаўны орган, падсправаздачны ЦВК. У 1927–1937 гг. пасаду старшыні СНК БССР займаў Мікалай Галадзед.

Такога ж кшталту змены адбыліся праз 10 гадоў на агульнасаюзным ўзроўні. У адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1936 г. ЦВК СССР фарміраваў урад – *Савет Народных Камісараў*, які з'яўляўся выканаўчым і распарадчым органам. Ён быў адказны перад ЦВК СССР і яго Прэзідыумам.

Згодна Канстытуцыі БССР 1937 г. Савет Народных Камісараў БССР з'яўляўся выканаўча-распарадчым органам. У склад СНК уваходзілі: Старшыня, намеснікі Старшыні, старшыня Савета народнай гаспадаркі, народныя камісары: фінансаў, працы, гандлю, рабоча-сялянскай інспекцыі, земляробства, унутраных спраў, юстыцыі, асветы, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння; кіраўнік Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення – з правам рашаючага голасу; старшыня Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення БССР і ўпаўнаважаныя народных камісарыятаў СССР: па замежных справах, па ваенных і марскіх справах, шляхоў зносін, пошт і тэлеграфаў.

Згодна з Законам СССР ад 15 сакавіка 1946 г. і Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 26 сакавіка таго ж года СНК БССР пераўтвораны ў *Савет Міністраў БССР*. Барацьба супраць уплыву, які займеў у партызанскай рэспубліцы былы кіраўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху Панцеляймон Панамарэнка, акрэсліла адмову ад сумяшчэння пасад Першага сакратара ЦК КП(б)Б і Старшыні Савета Міністраў БССР. Нягледзячы на гэта, падпарадкаванасць кіраўніка ўрада партыйнаму кіраўніцтву з часам толькі ўзмацнялася.

## 6. Функцыі і задачы сучаснага ўрада

З набыццём незалежнасці функцыі выканаўчай ўлады ў Рэспубліцы Беларусь былі замацаваны за Саветам Міністраў. Такая назва беларускага ўрада захавалася з часу прыняцця апошняй Канстытуцыі БССР у 1978 г. і захоўвалася да пачатку дзеяння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. З увядзеннем інстытута прэзідэнцтва ўрадавыя паўнамоцтвы былі ўскладзены на Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, які паводле Канстытуцыі 1994 г. ствараўся пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь для рэалізацыі паўнамоцтваў выканаўчай улады ў галінах эканомікі, знешняй палітыкі, абароны, нацыянальнай бяспекі, аховы грамадскага парадку і іншых сферах дзяржаўнага кіравання. Непасрэднае кіраўніцтва дзейнасцю Кабінета Міністраў ускладалася на Прэм'ер-міністра. Прызначаць і вызваляць ад пасады членаў Кабінета Міністраў меў права выключна Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым, неабходна адзначыць, што Прэм'ер-міністр, яго намеснікі, міністр замежных спраў, міністр фінансаў, міністр абароны, міністр унутраных спраў, Старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь маглі быць прызначаны і вызвалены ад пасады толькі са згоды Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Паводле зменаў, якія былі ўнесены ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках правядзення Рэспубліканскага рэферэндуму 24 лістапада 1996 г., выканаўчую ўладу ў краіне ажыццяўляе *Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь*.

Канчаткова ўрадавыя паўнамоцтвы ад Кабінета Міністраў да Савета Міністраў перайшлі ў студзені 1997 г.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой калегіяльны цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання, які ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе выканаўчую ўладу і кіраўніцтва сістэмай падпарадкаваных яму органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Урад Рэспублікі Беларусь валодае шырокімі паўнамоцтвамі ў эканамічнай і фінансавай сферах, у галіне навукі і адукацыі, у галіне культуры, у сферы архіўнай справы, у галіне аховы здароўя, у галіне сацыяльнага забеспячэння, аховы і аплаты працы, у галіне аховы навакольнага асяроддзя, у галіне гідраметэаралагічнай дзейнасці, у галіне забеспячэння законнасці і правапарадку, у галіне забеспячэння нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці дзяржавы, у галіне ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, у галіне кадравай палітыкі. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе і іншыя паўнамоцтвы, якія ускладзены на яго Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь і актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь валодае правам заканадаўчай ініцыятывы. Па даручэнні Прэзідэнта, па ўласнай ініцыятыве, а таксама ў выпадках, якія прадугледжаны законамі, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь арганізуе распрацоўку праектаў законаў Рэспублікі Беларусь. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь на падставе і ў мэтах выканання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў Рэспублікі Беларусь, актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прымае пастановы і кантралюе іх выкананне. Урад забяспечвае кантроль за выкананнем сваіх пастаноў непасрэдна або праз падпарадкаваныя яму органы дзяржаўнага кіравання і іншыя органы выканаўчай улады. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць быць адменены ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Урад або любы член Урада маюць права заявіць Прэзідэнту аб сваёй адстаўцы, калі лічаць немагчымым далейшае ажыццяўленне ўскладзеных на іх абавязкаў. Урад заяўляе Прэзідэнту аб адстаўцы ў выпадку выказвання Палатай прадстаўнікоў вотуму недаверу Ураду.

### 7. Структура Урада Рэспублікі Беларусь

У склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь уваходзяць Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь, Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, намеснікі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь, міністры, старшыні дзяржаўных камітэтаў, Кіраўнік Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэту, Старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.

Структура Урада Рэспублікі Беларусь за апошнія амаль 30 гадоў неаднаразова змянялася. На аптымізацыю сістэмы органаў дзяржаўнага

кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, якія падначалены Ураду Рэспублікі Беларусь, скіраваны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Аб структуры Урада Рэспублікі Беларусь” ад 5 мая 2006 г., у які неаднаразова ўносіліся змены і дапаўненні. Па стане на 2020 г. структура Урада Рэспублікі Беларусь выглядае наступным чынам: Прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь, намеснікі Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Прэзідыум Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Апарат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Прэзідыум Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь дзейнічае ў якасці яго пастаяннага органа ў складзе Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь, яго намеснікаў, Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Міністра эканомікі, Міністра фінансаў, Міністра замежных спраў. Пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз у месяц пад старшынствам Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Рашэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь прымаюцца большасцю галасоў ад агульнай колькасці яго членаў, афармляюцца ў выглядзе пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і павінны адпавядаць актам, прынятым на пасяджэннях Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Для арганізацыі і кантролю выканання прынятых Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь рашэнняў, ствараецца *Апарат* Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па статусе з’яўляецца міністрам, прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Па стане на 2020 г. у Рэспубліцы Беларусь дзейнічаюць 24 міністэрствы, 7 дзяржаўных камітэтаў і 6 дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. Сярод іх:

– *міністэрствы*: абароны; адукацыі; антыманапольнага рэгулявання і гандлю; архітэктуры і будаўніцтва; аховы здароўя; жыллёва-камунальнай гаспадаркі; замежных спраў; інфармацыі; культуры; лясной гаспадаркі; па падатках і зборах; па надзвычайных сітуацыях; працы і сацыяльнай абароны; прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя; прамысловасці; сельскай гаспадаркі і харчавання; спорту і турызму; сувязі і інфарматызацыі; транспарту і камунікацый; унутраных спраў; фінансаў; эканомікі; энергетыкі; юстыцыі;

– *дзяржаўныя камітэты*: па маёмасці; па навуцы і тэхналогіях; па стандартызацыі; Камітэт дзяржаўнай бяспекі; дзяржаўныя ваенна-прамысловы, пагранічны, мытны камітэты;

– *дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Савету Міністраў* Рэспублікі Беларусь: Беларускі дзяржаўны канцэрн харчовай прамысловасці «Белдзяржхарчпрам»; Беларускі дзяржаўны канцэрн па нафце і хіміі; Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці; Беларускі вытворча-гандлёвы канцэрн лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці; Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх

таварыстваў; Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва. Ураду таксама падпарадкаваны ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

Работай Урада ў Рэспубліцы Беларусь кіруе *Прэм'ер-міністр*, які ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва дзейнасцю Урада і нясе персанальную адказнасць за яго работу; падпісвае пастановы Урада; у двухмесячны тэрмін пасля свайго прызначэння прадстаўляе Парламенту праграму дзейнасці Урада, а ў выпадку яе адхілення прадстаўляе паўторную праграму дзейнасці Урада на працягу двух месяцаў; інфармуе Прэзідэнта аб асноўных напрамках дзейнасці Урада і аб усіх яго найважнейшых рашэннях; выконвае іншыя функцыі, звязаныя з арганізацыяй і дзейнасцю Урада. Прэм'ер-міністр вырашае найбольш важныя пытанні, сярод якіх агульныя пытанні эканамічнай рэформы, пытанні міжнародных фінансава-крэдытных арганізацый, абароны, унутраных і замежных спраў, юстыцыі, бюджэту і фінансаў. Ва ўрадзе ён курыруе працу найбольш важных структурных падраздзяленняў.

За гісторыю незалежнай Рэспублікі Беларусь Урад Рэспублікі Беларусь узначальвалі В. Кебіч (1991–1994), М. Чыгір (1994–1996), С. Лінг (1996–2000), У. Ярмошын (2000–2001), Г. Навіцкі (2001–2003), С. Сідорскі (2003–2010), М. Мясніковіч (2010–2014), А. Кабякоў (2014–2018), С. Румас (2018–2020), Р. Галоўчанка (2020 – па сённяшні дзень).

## *Лекцыя 11.* Заканадаўчая і судовая галіны ўлады

### 1. Перадпарламенцкія формы прадстаўніцтва: вечы і сеймы

З другой паловы XI ст. летапісы адзначаюць актывізацыю дзейнасці веча ў дзяржавах-княствах. Звязана гэта было з ростам насельніцтва гарадоў, павелічэннем колькасці купцоў і рамеснікаў і ў цэлым з узрастаннем іх эканамічнай моцы. Услед за гэтым адзначаецца і ўздым палітычнага значэння гарадоў.

Варта адрозніваць народныя сходы рода-племяннай дадзяржаўнай эпохі і зборы насельніцтва гарадоў і воласці ў дзяржаўны перыяд. Нягледзячы на тое, што яны завуцца аднолькава – "веча" – гэта розныя з'явы.

*Старажытнарускія* княствы-землі нельга прызнаць «рэспублікамі», у іх даволі моцнай была ўлада князёў (манархія), якія засяроджвалі ў сваіх руках асноўныя функцыі кіравання. Крыніцы сведчаць, што насельніцтва гарадоў праяўляла сябе толькі ў экстраардынарных выпадках у сувязі з няздольнасцю княжацкай улады вырашыць тую альбо іншую праблему, з-за знешніх акалічнасцей, пры адсутнасці князя і інш. Веча ў Полацку (у адрозненне ад Ноўгарада Вялікага) не было пастаянна дзеючым органам і не вырашала паўсядзённыя, бягучыя пытанні жыцця зямлі. Між тым на вечы маглі

разглядацца найбольш важныя дзяржаўныя пытанні, але толькі ў тым выпадку, калі па нейкім прычынам ад іх рашэння аказваўся адхіленым князь.

Органы народнага самакіравання ў “далітоўскі” перыяд яшчэ не склаліся ў развітую, пастаянна функцыянуючую сістэму і былі прадстаўлены ў гарадах *вечам*, а ў сельскай мясцовасці – абшчыннымі народнымі сходамі. Абавязковымі ўдзельнікамі народных сходаў у гарадах былі вышэйшыя асобы: князі, царкоўныя іерархі, баяры, багатыя купцы.

Кампетэнцыя вечавых сходаў была даволі шырокая: веча ведала пытаннямі вайны і міру, распараджалася княжацкім сталом, фінансавымі і зямельнымі рэсурсамі воласці, санкцыяніравала грашовыя зборы, удзельнічала ў абмеркаванні заканадаўства, скідвала непажаданую адміністрацыю. Гарады кіраваліся князямі або княжацкай адміністрацыяй (пасаднікамі, тысяцкімі) і ў іх адсутнічалі выбарныя муніцыпальныя структуры адміністрацыйна-судовага і вайсковага самакіравання. У цэлым органы дзяржаўнага (княжацкага) кіравання ў старажытнарускіх княствах на сучасных беларускіх землях дамінавалі над органамі народнага самакіравання.

*ВКЛ.* Умацаванне эканамічных сувязй унутры Вялікага Княства Літоўскага, узмацненне працэсу цэнтралізацыі выклікалі неабходнасць шырэйшага прыцягнення шляхты да рашэння агульнадзяржаўных пытанняў. З XIV ст. пачынаюць склікацца агульнадзяржаўныя сходы прадстаўнікоў класа феадалаў – Вальныя сеймы (соймы). Як орган дзяржаўнай улады сойм утварыўся са старажытных вечавых сходаў асобных зямель-княстваў.

Сойм ВКЛ складаўся толькі з асоб прывілеяванага саслоўя. У XVI ст. сойм з усесаслоўнага ператвараецца ў прадстаўнічы орган, на пасяджэнні якога з’яўлялася не ўся шляхта, а толькі яе прадстаўнікі – па два дэпутата (пасла) ад кожнага павета, якія абіраліся на павятовых сойміках. Гэта становішча было ўведзена ў 1512 г. У пасяджэннях сойма па-ранейшаму маглі браць удзел гасудар, усе паны-радные, службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага кіравання, каталіцкія і праваслаўныя біскупы і ігумены манастыроў.

Збіраліся соймы па меры патрэбы, загадзя вызначаных тэрмінаў склікання сойма не было. Не было і пастаяннага месца іх правядзення: яны збіраліся ў розных гарадах і замках. Працягласць пасяджэнняў магла складаць 2–3 дня, а часам – некалькі месяцаў, але часцей за ўсё яны працягваліся 2–4 тыдні.

У другой палове XVI ст. была зроблена спроба ў заканадаўчым парадку вызначыць кампетэнцыю сойма. Да яго ведання з гэтага часу сталі адносіцца: выбар гаспадара, абмеркаванне ўмоў міжнародных дамоў, пытанні вайны і міру, увядзенне новых і змена старых падаткаў і павіннасцей, усталяванне мытных падаткаў, прыняцце новага і змена дзеючага заканадаўства, разгляд асобных крымінальных спраў, якія закраналі інтарэсы дзяржавы, вялікага князя ці знатных асоб. Акрамя таго, падчас соймаў падаваліся рознага роду чалабітныя і хадайніцтвы павятовай шляхты.

*Рэч Паспалітая.* Згодна з актам Люблінскай уніі 1 ліпеня 1569 г. Карона Польская і ВКЛ зліваліся ў агульную Рэч Паспалітую. Новая дзяржава ўзначальвалася адным манархам, які аднначасова з’яўляўся і каралём польскім,

і вялікім князем літоўскім. Аб’ядноўваліся і соймы (яны павінны былі быць “спольныя”, “абодвух народаў”), а месцам іх правядзення прызначалася Варшава (каранацыйных – Кракаў).

“Парадак Рады Кароннай і Літоўскай” вызначаў склад Сената Рэчы Паспалітай – верхняй палаты вальнага сойма, што складаўся з 90–95 асобаў, ад ВКЛ ўвайшлі два біскупы, 9 ваяводаў і жамойцкі стараста, 10 кашталянаў, міністры. У ніжнюю палату – Пасольскую ізбу – ад ВКЛ было ўключана 44 паслы: па 2 ад кожнага шляхецкага сойміка і 2 асобна ад Вільні. У вальны сойм Рэчы Паспалітай увайшлі і паслы ад Каралеўства Прусія (у той час васал Польшчы). У выніку ў складзе Пасольскай ізбы вальнага сойма Рэчы Паспалітай першапачаткова налічвалася 170 паслоў, з ліку якіх 48 депутатаў з ВКЛ (каля 28 %).

У 1773 г. у Еўропе згодна з рашэннем папы рымскага Клімента XIV быў скасаваны Ордэн езуітаў. Маёмасць апошняга на тэрыторыі Рэчы Паспалітай была перададзена Камісіі нацыянальнай асветы (Адукацыйнай камісіі), якая такім чынам з’явілася першым у Еўропе міністэрствам асветы Новага часу. Адукацыйная камісія заснавала свецкія школы – сярэднія і пачатковыя, рэфармавала праграму навучання, распрацавала агульны статут для ўсіх школ. Тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў Літоўскую правінцыю Адукацыйнай камісіі, у якой вышэйшай навучальнай установай стала Галоўная школа ВКЛ – рэфармаваная ранейшая Віленская езуіцкая акадэмія.

Рэфармаванне органаў кіравання было працягнута ў 1775 г., калі для кантролю над дзяржаўнымі органамі ўлады была створана агульная для ВКЛ і Польскай Кароны Пастаянная Рада. Гэтая ўстанова складалася з 18 сенатараў і 18 паслоў і падзялялася на пяць департаментаў – ваеннага, бюджэтнага (скарбу), замежных спраў, паліцыі і юстыцыі. З ліку дэпутатаў Рады выбіраўся маршал, які мог выступаць у якасці старшыні замест караля.

Наканец, у 1788 г. у Варшаве пачаў работаць “Вялікі”, або “Чатырохгадовы” сойм. Менавіта пад час яго работы быў ажыццяўлёны шэраг важных рэформаў, і зацвярджаны “Урадавы статут” – Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Гэты асноўны закон уладкавання дзяржавы рэгуляваў правы і абавязкі насельніцтва, а таксама прынцыпы арганізацыі дзяржаўнай улады. Разам з Канстытуцыяй ЗША 1787 г., французскай Канстытуцыяй 1791 г. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. была першым пісьмовым асноўным законам свайго часу.

Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. адмяняла выбарнасць караля, “ліберум вета” і канфедэрацыі, выканаўчую ўладу перадавала каралю і радзе міністраў, названай “Вартай законаў”. Сойм заставаўся двухпалатным. Палата дэпутатаў фарміравалася з прадстаўнікоў павятовай шляхты (усяго 204 чал.), выбраных на сойміках; аднак у яе склад былі дададзены “упалнамочаныя гарадоў” у колькасці 24 чал. (яны атрымалі права дарадчага голасу і толькі па справах, якія іх датычацца). Сенат павінен быў складацца са 132 чал., у асноўным са службовых асоб. Рэформы былі скасаваны ў выніку спынення існавання Рэчы Паспалітай.

## 2. Беларускія дэпутаты ў Дзяржаўных думах Расійскай імперыі

Рэвалюцыйны націск 1905 г., актывізацыя грамадскіх сіл, у тым ліку ліберальнай апазіцыі прымусілі Мікалая II пайсці на ўступкі і зацвердзіць 6 жніўня 1905 г. праект стварэння Дзяржаўнай думы, якая павінна была папярэдне распрацоўваць і абмяркоўваць заканадаўчыя прапановы, якія затым перадаваліся ў Дзяржаўны савет і далей на разгляд імператара. Праект быў распрацаваны ў Міністэрстве ўнутраных спраў пад кіраўніцтвам міністра А.Р. Булыгіна. Праект Думы прадугледжваў шматступенчатыя выбары, высокі маёмасны і ўзроставы цэнз.

Ва ўмовах актывізацыі рэвалюцыйных падзей расійскія ўлады вымушаны былі пайсці на ўступкі. Маніфестам 17 кастрычніка 1905 г. прадугледжвалася пашырэнне кола выбаршчыкаў і наданне Думе права заканадаўчай ініцыятывы. У канцы 1905 – пачатку 1906 г. разгарнулася палітычная барацьба розных партый і груп у сувязі з выбарамі ў I Дзяржаўную думу. Урадавыя пазіцыі адстойвалі манархічныя партыі, найбольш уплывовым з якіх быў чарнасоценны «Саюз рускага народа». У саюзе з чарнасоценцамі на выбарах у Думу ў беларускіх губернях выступала права-ліберальная партыя акцябрыстаў. Вельмі актыўна выбарчую кампанію праводзілі кадэты, якія не скупіліся на абяцанні рабочым і сялянам. У беларускіх губернях кадэты ўступалі ў перадвыбарчыя аб'яднанні з польскімі, яўрэйскімі, літоўскімі арганізацыямі. У выбары актыўна ўключылася таксама Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі. Сацыялістычныя, рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі, якія спадзяваліся на новы рэвалюцыйны ўздым, выступілі з тактыкай байкоту выбараў у I Дзяржаўную думу.

Перамогу на выбарах у ***I Дзяржаўную думу*** атрымалі кадэты. З 36 дэпутатаў, выбраных ад беларускіх губерняў, прыхільнікамі кадэтаў былі 29 чалавек. У іх лік уключаны таксама прадстаўнікі Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі і сіяністаў. Астатнія дэпутаты былі сялянамі па сацыяльным паходжанні, з іх пяць адносілі сябе да беспартыйных, адзін – да правых і адзін – да сацыял-дэмакратаў.

Дзейнасць Дзяржаўнай думы пачалася 27 красавіка 1906 г. У ходзе работы Думы пад уплывам вострай палемікі змяніліся палітычныя пазіцыі большасці дэпутатаў ад беларускіх губерняў. Адным з найбольш вострых пытанняў у рабоце Думы стала аграрнае. У сувязі з нязгодай Дзяржаўнай думы з урадавай праграмай вырашэння аграрнага пытання Мікалай II указам ад 9 ліпеня 1906 г. распусціў Думу і прызначыў новыя выбары.

У канцы 1906 – пачатку 1907 г. разгарнулася барацьба вакол выбараў у ***II Дзяржаўную думу***. Спад рэвалюцыйнай барацьбы ўмацаваў пазіцыі ў беларускіх губернях акцябрыстаў і «Саюзу рускага народа». Іх прадстаўнікі ў кастрычніку 1906 г. утварылі «Рускі ўскраінны саюз» пад лозунгам «Расія для рускіх і толькі рускія павінны кіраваць ёю». Сваю дзейнасць ён скіраваў супраць яўрэйскіх і польскіх уплываў ў беларускіх губернях. Кадэты на тэрыторыі Беларусі ў час выбараў страцілі падтрымку мясцовых аўтанамістаў. Перамогу на выбарах у II Дзяржаўную думу ад беларускіх губерняў атрымалі

два блокі: з аднаго боку – саюз акцябрыстаў і праваманархічных (чарнасоценных) арганізацый (15 месц), з другога – аўтанамісты (11 месц). Левыя (народніцкія і сацыял-дэмакратычныя) партыі ў Беларусі пацярпелі паражэнне. Дума другога склікання аказалася больш радыкальнай, чым першая. Відавочна, што на сітуацыю ў Беларусі паўплываў нацыянальна-канфесійны фактар.

Дзейнасць Дзяржаўнай думы другога склікання пачалася 20 лютага 1907 г. Галоўным у яе працы зноў стала аграрнае пытанне. Дэпутаты-аўтанамісты па ранейшаму звязвалі вырашэнне аграрнага пытання з атрыманнем шырокага мясцовага самакіравання. Дэпутаты-сяляне з беларускіх, асабліва Мінскай, губерняў, якія з'яўляліся членамі «Рускага ўскраіннага саюза», бачылі ў ініцыятывах аўтанамістаў пагрозу праваслаўным сялянам. Дума адхіляла ўсе ўрадавыя законапраекты. У 1907 г. ва ўмовах спаду сацыяльных пратэстаў урад 3 чэрвеня 1907 г. распусціў Думу і змяніў выбарчы закон.

У другой палове 1907 г. выбарчая кампанія ў ***ІІІ Дзяржаўную думу*** была ў цэнтры ўвагі палітычных сіл і партый у Расійскай імперыі. Прапольскія землеўласнікі і каталіцкія святары на з'ездзе ў ліпені 1907 г. утварылі «Польскі дэмакратычны саюз Беларусі». З'езд заклікаў дабівацца шырокага мясцовага самакіравання ў заходніх губернях з гарантыяй выбарчых правоў "польскага" насельніцтва. Вельмі актыўна ўключыліся ў выбары праваманархічныя партыі і арганізацыі ("Саюз 17 кастрычніка", «Рускі ўскраінны саюз»). З абраных ад беларускіх губерняў 36 дэпутатаў ІІІ Думы было 12 землеўласнікаў, 7 прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, 5 чыноўнікаў, 11 сялян і адзін каталіцкі святар. Дзяржаўная дума ІІІ склікання пачала сваю працу 1 лістапада 1907 г. Ні адна з думскіх фракцый не валодала большасцю месц. Як і раней, аграрнае пытанне займала значнае месца ў працы ІІІ Думы. Правыя дэпутаты ад беларускіх губерняў падтрымалі вялікадзяржаўную нацыянальную палітыку ўрада. Яны выказваліся за тое, каб руская мова была адзінай мовай навучання ў беларускіх губернях.

У ***IV Дзяржаўную думу*** восенню 1912 г. беларускія губерні прадставілі: 27 мандатаў – прыхільнікі праваманархічных (чарнасоценных) партый і арганізацый, 6 – акцябрысты, 6 – лібералы. Дзейнасць IV Думы пачалася 15 лістапада 1912 г. Правыя дэпутаты ад беларускіх губерняў неаднаразова крытыкавалі ўрад за адсутнасць праграмы дзеянняў, лічылі, што шлях думскага і канстытуцыйнага развіцця прывядзе да гібелі манархіі. Некаторыя з іх патрабавалі ад урада рашучых мер супраць "засілля" палякаў і яўрэяў у заходніх губернях.

### 3. Ад Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта да Вярхоўнага Савета

Першы Усебеларускі з'езд саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, які праходзіў 2–4 лютага 1919 г., вызначыў вяршэнства з'езда Саветаў Беларусі, а ў перыяд паміж з'ездамі – *Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта* (ЦВК). У адпаведнасці з Канстытуцыяй ЦВК Беларусі з'яўляўся вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантралюючым органам.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт стварыў Вялікі і Малы прэзідыумы. Вялікі прэзідыум, куды ўваходзілі ўсе камісары, фактычна з'яўляўся Саветам Народных Камісараў. Узначаліў новы ўрад, які складаўся з былых кіраўнікоў Аблвыканкамзаха, А. Мяснікоў.

13–17 снежня 1920 г. у Мінску адбыўся Другі Усебеларускі з'езд Саветаў БССР, які падцвердзіў, што вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў рэспубліцы застаецца З'езд Саветаў, а паміж з'ездамі ўсю паўнату ўлады ў рэспубліцы будзе ажыццяўляць ЦВК і яго Прэзідыум. З'езд Саветаў павінен быў складацца з прадстаўнікоў гарадскіх, валасных і павятовых саветаў.

30 снежня 1922 г. у Маскве на І з'ездзе саветаў прадстаўнікамі РСФСР, Украінскай і Беларускай савецкіх сацыялістычных рэспублік, а таксама Закаўказскай федэрацыі былі падпісаны Дэкларацыя аб стварэнні СССР і Саюзны Дагавор. Згодна прынятай Канстытуцыі СССР 1924 г. ЦВК СССР складаўся з двух раўнапраўных палат: Саюзнага савета і Савета нацыянальнасцей. ЦВК СССР склікаўся на сесіі тры разы на год. У перыяд паміж сесіямі ЦВК СССР вышэйшым заканадаўчым, выканаўчым і распарадчым органам улады СССР з'яўляўся Прэзідыум ЦВК СССР.

Згодна прынятаяй VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў Канстытуцыі БССР 1927 г. вярхоўным органам улады вызначаўся ЦВК, а СНК быў яму падсправаздачны (арт. 31). Любая пастанова Савета Народных Камісараў магла быць адменена ці прыпынена ЦВК ці яго Прэзідыумам. З'езды Саветаў БССР павінны былі склікацца ЦВК штогод, але заканатворчым органам, па сутнасці, з'яўляўся ЦВК БССР. Старшынёй ЦВК БССР і яго Прэзідыума да 1937 г. быў Аляксандр Чарвякоў.

Рэалізацыя аўтарытарна-цэнтралісткай мадэлі мадэрнізацыі, якая ігнаравала асаблівасці нацыянальнага развіцця, не мела патрэбы ў дакладным функцыянiраванні заканадаўчых структур рэспублікі. Ужо на пачатку 1930-х гг. пачынае парушацца рэгулярнасць склікання З'ездаў Саветаў БССР. Яны збіраліся для таго, каб пацвердзіць ужо прынятыя рашэнні выканаўчых і партыйных органаў.

З прыняццем Канстытуцыі СССР 1936 г. спынілі сваё існаванне З'езды Саветаў. Замест іх і ЦВК СССР быў створаны *Вярхоўны Савет СССР*. Вярхоўны Савет СССР – вышэйшы орган дзяржаўнай улады, які быў правамоцны вырашаць усе пытанні, аднесеныя да ведання СССР, у тым ліку: прыняцце і ўнясенне змяненняў у Канстытуцыю, прыняцце ў склад СССР новых рэспублік, стварэнне новых аўтаномных рэспублік і інш. Вярхоўнаму Савету СССР была нададзена важная кантрольная функцыя – права прызначаць следчыя і рэвізійныя камісіі, што намінальна дазваляла яму кантраляваць дзейнасць усяго дзяржаўнага апарату. Вярхоўны Савет СССР, як і раней ЦВК СССР, складаўся з дзвюх раўнапраўных палат: Савета саюза і Савета нацыянальнасцей.

У гады вайны Вярхоўны Савет БССР працягваў заканадаўчую дзейнасць. Пачынаючы з чэрвеня 1942 г. да 1945 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР адкладаў штогод выбары, прадаўжаючы паўнамоцтвы існуючага складу

Вярхоўнага Савета. Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ніколі не з'яўляўся першай дзяржаўнай асобай, хоць і займаў пэўнае месца ў партыйна-савецкай іерархіі. Адзіным адрозненнем ад структуры і схемы працы саюзных органаў улады заставалася аднапалатнасць Вярхоўнага Савета БССР.

### 4. Нацыянальны сход – двухпалатны парламент у сучаснай Беларусі. Структура і функцыі Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў

Прававую аснову дзейнасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Законы "Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь", "Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь".

Нацыянальны сход з'яўляецца вышэйшым прадстаўнічым і заканадаўчым органам і складаецца з дзвюх палат: Палаты прадстаўнікоў (ад выбаршчыкаў) і Савета Рэспублікі (палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва).

Парламент выконвае функцыі:

1) прадстаўнічую – ў яго складзе працуюць прадстаўнікі народу, якія выбіраюцца ім і часткова назначаюцца, якія атрымалі права ад імя народа прымаць законы і прадстаўляць інтарэсы людзей;

2) заканадаўчую.

Тэрмін паўнамоцтваў Парламента – чатыры гады. Паўнамоцтвы Парламента могуць быць прадоўжаны на падставе закона толькі ў выпадку вайны.

Склад Палаты прадстаўнікоў – 110 дэпутатаў. Выбранне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з законам на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў можа адначасова з'яўляцца членам Урада.

Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 год і які пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш за пяць гадоў.

Члены Савета Рэспублікі выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаваннем па восем членаў. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Адна і тая ж асоба не можа адначасова з'яўляцца членам двух палат Парламента. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў не можа быць дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў. Член Савета Рэспублікі не можа быць адначасова членам Урада. Не дапускаецца сумяшчэнне абавязкаў і іншых пасад.

У выпадках і ў парадку, прадугледжаных Канстытуцыяй, паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў або Савета Рэспублікі могуць быць спынены датэрмінова (па рашэнні Прэзідэнта або на падставе заключэння Канстытуцыйнага Суда ў выпадку сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі).

Палаты збіраюцца на дзве чарговыя сесіі ў год. Першая сесія адкрываецца 2 кастрычніка; яе працягласць не можа быць больш за восемдзесят дзён. Другая сесія адкрываецца 2 красавіка; яе працягласць не можа быць больш за дзевяноста дзён. Калі 2 кастрычніка або 2 красавіка даводзяцца на нерабочы дзень, то сесія адкрываецца ў першы наступны за ім рабочы дзень.

Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі ў выпадку асобай неабходнасці запрашаюцца на пазачарговую сесію.

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі са свайго складу выбіраюць пастаянныя камісіі і іншыя органы для вядзення заканапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія датычацца кампетэнцыі палат. У Палаце прадстаўнікоў працуюць на прафесійнай аснове ў адрозненне ад Савета Рэспублікі. Права заканадаўчай ініцыятывы належыць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі.

***Палата прадстаўнікоў***:

1) разглядае па прапанове Прэзідэнта або па ініцыятыве не менш 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, аб тлумачэнні Канстытуцыі;

2) разглядае праекты законаў, у тым ліку аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь; ваеннай дактрыны; аб асноўным змесце і прынцыпах ажыццяўлення правоў, свабод і абавязкаў грамадзян; аб правах нацыянальных меншасцей; аб зацвярджэнні рэспубліканскага бюджэту і справаздачы аб яго выкананні; устанаўленні рэспубліканскіх падаткаў і збораў і інш.;

3) назначае выбары Прэзідэнта;

4) дае згоду Прэзідэнту на прызначэнне Прэм’ер-міністра;

5) заслухоўвае даклад Прэм’ер-міністра аб праграме дзейнасці Урада і адабрае або адхіляе праграму; паўторнае адхіленне палатай праграмы азначае выяўленне вотуму недаверу Ураду;

6) разглядае па ініцыятыве Прэм’ер-міністра пытанне аб даверы Ураду;

7) па ініцыятыве не менш адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў выказвае вотум недаверу Ураду; пытанне аб адказнасці Урада не можа быць пастаўлена на працягу года пасля адабрэння праграмы яго дзейнасці;

8) прымае адстаўку Прэзідэнта і інш.

***Савет Рэспублікі:***

1) адабрае або адхіляе прынятыя Палатай прадстаўнікоў праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю; аб тлумачэнні Канстытуцыі; праекты іншых законаў;

2) дае згоду на прызначэнне Прэзідэнтам Старшыні Канстытуцыйнага Суда, Старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда, Старшыні і суддзяў Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, Генеральнага пракурора, Старшыні і членаў Праўлення Нацыянальнага банка;

3) выбірае шэсць суддзяў Канстытуцыйнага Суда;

4) выбірае шэсць членаў Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў;

5) адмяняе рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству;

6) прымае рашэнне аб роспуску мясцовага Савета дэпутатаў у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім патрабаванняў заканадаўства і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам і інш.

Рашэнні Палаты прадстаўнікоў прымаюцца ў форме законаў і пастаноў. Пастановы Палаты прадстаўнікоў прымаюцца па пытаннях распарадчага і кантрольнага характару.

Рашэнні Савета Рэспублікі прымаюцца ў форме пастаноў.

Рашэнні палат лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага складу палат, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй.

## 5. Гістарычныя формы судовых органаў у айчыннай гісторыі

Судовыя органы ВКЛ з'ўляліся складовай часткай дзяржаўнага апарату. Іх сістэма ў завершаным выглядзе сфарміравалася ў XVI ст., калі былі створаны і атрымалі заканадаўчае замацаванне земскія, падкаморскія і Галоўны суды. Прагрэсіўнымі рысамі гэтай судовай сістэмы былі: усесаслоўнасць некаторых судоў, аддзяленне некаторых судоў ад адміністрацыі, выбарнасць большасці членаў судоў, высокія патрабаванні маральнага і прафесійнага характару да кандыдатаў на пасады суддзяў, выразны падзел судоў на інстанцыі, перавага калегіяльнасці пры разглядзе справы, публічнасць.

Першапачаткова судовая ўлада на месцах належала вялікакняжацкім ураднікам, ваяводам, старастам і дзяржаўцам. Спецыяльнымі судовымі органамі для простага народа былі копныя суды для сялян і магістрацкія для мяшчан. Такое становішча было зафіксавана ў Статуце 1529 г.

Вышэйшым судовым органам з'ўляўся *Гаспадарскі (Вялікакняжацкі*) суд, які да 1581 г. (да стварэння Галоўнага суда) выступаў як апеляцыйны суд і як суд першай інстанцыі па найбольш важных справах, якія закраналі інтарэсы дзяржавы і шляхты. Гаспадарскі суд быў вышэйшым усесаслоўным калегіяльным судом. Ён ажыццяўляўся вялікім князем з панамі-раднымі і іншымі ўраднікамі. Гаспадарскі суд засядаў у выглядзе сесій, якія праходзілі звычайна ў лістападзе. Пасяджэнні Гаспадарскага суда маглі праходзіць у любым месцы Вялікага Княства Літоўскага, дзе знаходзіўся князь.

Кампетэнцыя Гаспадарскага суда:

– разглядаў спрэчкі аб сіле і значэнні розных дараваных грамат, якія закраналі інтарэсы дзяржаўнай казны,

– палітычныя злачынствы,

– ухіленне ад ваеннай службы, скаргі на злоўжыванне ўладай службовымі асобамі ;

– якасці другой інстанцыі разглядаў любыя справы, якія паступалі да яго ў парадку апеляцыі з ніжэйстаячых судоў.

Рашэнні Гаспадарскага суда лічыліся канчатковымі і абскарджанню не падлягалі. З 1588 г. ён дзейнічае толькі як суд першай інстанцыі па справах пра дзяржаўныя злачынствы; па справах, якія закранаюць маёмасныя інтарэсы дзяржавы; пра незаконныя дзеянні вышэйшых ураднікаў; пра пацвярджэнне прыналежнасці да саслоўя шляхты.

Разнавіднасцю Гаспадарскага суда таксама з'яўляўся *маршалкаўскі суд*, на чале якога стаялі адзін ці два маршалка. Гэты суд разглядаў справы па даручэнні князя, месцам яго пасяджэнняў звычайна з'яўляўся княжацкі двор.

Часам асобныя крымінальныя і грамадзянскія справы разглядаліся гаспадаром і панамі-раднымі на сойме. Такі суд паўстаў у канцы XV ст. і называўся *сеймавым*. У яго апроч гаспадара і радных паноў, паводле Статуту 1588 г., уваходзіла яшчэ 8 дэпутатаў сойма.

Граматай караля Стэфана Баторыя ад 1 сакавіка 1581 г. быў заснаваны Галоўны суд, ці *Галоўны літоўскі трыбунал*. Сесіі праводзіліся кожны год у Вільні, а ў Менску і Навагрудку – папераменна праз год. Уся тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага, такім чынам, была ўмоўна падзелена на 3 судовых акругі, з улікам якіх і разглядаліся судовыя справы ў названых гарадах. Галоўны суд вёў усе справы па апеляцыйных скаргах. Членамі Галоўнага суда былі шляхцічы, якія валодалі нерухомасцю, разбіраліся ў мясцовым праве і звычаях. Колькасць каля 40 чалавек. Усёй працай кіраваў выбраны суддзямі маршалак.

На месцах дзейнічалі суды першай інстанцыі, сярод якіх асноўным лічыўся *замкавы (гродскі) суд* – усесаслоўны суд, які дзейнічаў штомесяц, але не быў адлучаны ад адміністрацыі. Замкі даваліся ў кіраванне ваяводам, а таксама старастам, якія ажыццяўлялі адміністрацыйныя, фінансавыя і судовыя функцыі. У кампетэнцыю гродскага суда ўваходзіў разгляд крымінальных і некаторых грамадзянскіх спраў (невыкананне дамовы пазыкі, арэнды). Гродскі суд ажыццяўляў і адміністрацыйныя функцыі: выконваў рашэнні земскага, Галоўнага суда, фіксаваў завяшчанні, акты дарэння, куплі-продажу, закладу, пазыкі, усынаўлення. Пры гродскім судзе знаходзіліся кат і турма, у якой утрымліваліся зняволеныя.

*Земскі суд* быў выключна выбарным, калегіяльным і цалкам адлучаным ад адміністрацыі судом. Гэта быў і чыста саслоўны суд, які фарміраваўся толькі са шляхты і разглядаў справы толькі ў адносінах шляхты. Земскі суд працаваў 3 сесіі ў год – у студзені, чэрвені і канцы верасня.

Справы, якія тычацца зямельнай уласнасці, былі ў веданні спецыяльна створанага ў 1565 г. на Віленскім сойме *падкаморскага суда*. Гэта быў выбарны, выключна шляхецкі і адлучаны ад адміністрацыі суд. Ён разглядаў толькі адну катэгорыю грамадзянскіх спраў – межавыя спрэчкі па маёнтках. Прычым ажыццяўлялася гэта не калегіяльна, а адным суддзёй – *падкаморыям*. Памочнікамі падкаморыя былі землямеры – каморнікі, якія прызначаліся ім з ліку шляхцічаў.

*Каптуровы суд* з'яўляўся часовым надзвычайным судом і дзейнічаў у перыяд безкаралеўя. Ён ствараўся на аснове спецыяльнай пастановы Вальнага сойма з ліку мясцовых суддзяў.

Судамі для простага народа, у прыватнасці для сялян, апроч суда службовых асоб і феадала, былі *копныя суды* – сходы сялян, скліканыя для разгляду крымінальных спраў. Суддзямі былі прадстаўнікі сялянскіх органаў самакіравання – старцы, а таксама копныя мужы.

Для мяшчан гарадоў, якія атрымалі граматы на магдэбургскае права, засноўваліся *магістрацкія (войтаўска-лаўніцкія і бурмістарска-радзецкія*) суды. Жыхары гарадоў без магдэбургскага права судзіліся ў гродскім судзе.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай ранейшая судовая сістэма часткова захавалася.

У 1775 г. у Расійскай імперыі была праведзена рэформа, вынікам якой стала стварэнне новай сістэмы судоў з яскрава выражаным саслоўным пачаткам. На Полацкую і Магілёўскую губерні яе палажэнні распаўсюдзіліся ў 1778 г. З гэтага часу судаўладкаванне ўключала тры інстанцыі павятовага і губернскага ўзроўняў – ніжнюю, сярэднюю і верхнюю, а таксама вышэйшую судовую інстанцыю – Сенат. Судамі першай (ніжняй) і другой (сярэдняй) інстанцый для дваран з'яўляліся павятовы і верхні земскі суды адпаведна, для купцоў і мяшчан – гарадскі і губернскі магістраты, для вольных сельскіх жыхароў – ніжняя і верхняя расправы. У губернскіх гарадах знаходзіліся суды трэцяй (верхняй) інстанцыі – палаты грамадзянскага і крымінальнага суда, якія мелі ўсесаслоўны характар.

У Беларускай і Мінскай губернях замест саслоўных павятовых судоў і ніжніх расправаў былі ўведзены павятовыя і падкаморскія суды, а ў Літоўскай губерні – гродскія суды. Усе названыя ўстановы ў свой час існавалі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Пасля правядзення ў 1801 г. адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы, у выніку якой замест трох беларускіх губерняў былі створаны пяць (Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская), тут адбыліся змены і ў судаўладкаванні. Крымінальныя справы разглядаліся па агульнарасійскаму заканадаўству, грамадзянскія – па мясцоваму.

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. у пяці беларускіх губернях пачала распаўсюджвацца судовая сістэма па агульнарасійскаму ўзору. З 1831 г. адмянялася дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. у Магілёўскай і Віцебскай губернях, з 1840 г. – Мінскай, Гродзенскай і Віленскай.

Чарговая трансфармацыя судаўладкавання і судаводства адбылася ў выніку правядзення судовай рэформы 1864 г., паводле якой абвяшчаліся шэраг дэмакратычных прынцыпаў: усесаслоўнасць, незалежнасць суда ад адміністрацыі, нязменнасць суддзяў, выбарнасць часткі судовых органаў, спаборнасць і галоснасць судовага працэсу. Прадугледжвалася выбарнасць міравых суддзяў на павятовых земскіх сходах і ў гарадскіх думах. Пры гэтым члены судовых палат і акруговых судоў зацвярджаліся імператарам, а міравыя суддзі – сенатам. Нагляд за дзейнасцю судовых устаноў ажыццяўлялі

пракуроры, якія падначальваліся непасрэдна міністру юстыцыі. Вышэйшай апеляцыйнай інстанцыяй для названых судоў заставаўся Сенат.

Пры разглядзе крымінальных спраў прадугледжваўся ўдзел у судовым працэсе прысяжных засядацеляў, якія незалежна ад суддзяў выносілі рашэнне. Быў створаны інстытут прысяжных павераных (адвакатаў), якія не знаходзіліся на дзяржаўнай службе і не залежалі ад урада. Працэс папярэдняга следства перадаваўся ад паліцыі судовым следчым.

Разам з тым, шэраг спраў трапляў пад юрысдыкцыю валасных (сялянскіх), ваенных, духоўных (кансісторыі) і іншых судоў, якія не былі падначалены Міністэрству юстыцыі. Вышэйшыя дзяржаўныя чыны падлягалі Вышэйшаму крымінальнаму суду.

У Беларусі судовая рэформа пачалася толькі ў 1872 г. Міравыя суддзі тут не выбіраліся, а прызначаліся міністрам юстыцыі па рэкамендацыі мясцовай адміністрацыі. Акруговыя суды, судовыя палаты, прысяжныя засядацелі і прысяжныя павераныя з'явіліся ў беларускіх губернях толькі ў 1883 г. Спіс прысяжных засядацеляў таксама зацвярджаўся ўладамі. У агульных рысах такая сістэма судаводства захоўвалася да апошніх дзён існавання Расійскай імперыі.

З новай уладай прыйшла і новая сістэма судоў. Адпаведнымі дэкрэтамі, якія былі выдадзены органамі савецкай улады ў 1917–1918 гг., былі створаны Рэвалюцыйныя і Касацыйныя трыбуналы. У БССР яны былі заменены Вышэйшым Судом і Вышэйшым Касацыйным Судом толькі падчас правядзення судовай рэформы 1922–1923 гг. Судаўладкаванне БССР было канчаткова аформлена з прыняццем у 1938 г. Закона «Аб судаўладкаванні саюзных і аўтаномных рэспублік». Паводле дадзенага нарматыўнага акту крымінальныя справы і грамадзянскія справы паісках фізічных асоб былі аднесены да кампетэнцыі народных судоў. Грамадзянскія справы паісках юрыдычных асоб і арганізацый разглядаліся абласнымі судамі. Пад іх юрысдыкцыю траплялі і справы аб контррэвалюцыйных злачынствах і крадзяжах сацыялістычнай уласнасці. Функцыі кантролю за гэтымі судамі былі ўскладзены на *Вярхоўны Суд* БССР. Акрамя таго, дзейнічалі спецыяльныя суды: *ваенныя трыбуналы і лінейныя* суды (чыгуначнага і воднага транспарту).

У пачатку 1950-х гг. былі скасаваны неканстытуцыйныя судовыя органы. У 1953 г. у кампетэнцыю Вярхоўнага Суда БССР былі перададзены справы аб цяжкіх дзяржаўных злачынствах. У 1954 г. у складзе вярхоўных судоў рэспублік і абласных судоў былі ўтвораны прэзідыумы, якія надзяляліся правам пераглядаць у парадку нагляду прысуды, рашэнні і касацыйныя вызначэнні па крымінальных і грамадзянскіх справах, што ўзмацняла ролю гэтых органаў.

Чарговая буйная рэформа ў сістэме судаўладкавання СССР адбылася ў 1958 г.: былі вызначаны два ўзроўні судовых органаў – агульнасаюзны (Вярхоўны Суд СССР і ваенныя трыбуналы) і рэспубліканскі (Вярхоўны Суд, абласныя суды і народныя суды). Такая судовая сістэма дзейнічала да 1990-х гг.

## 6. **Віды і паўнамоцтвы сучасных судоў у Рэспубліцы Беларусь**

Сучасная судовая сістэма будуецца на прынцыпах тэрытарыяльнасці і спецыялізацыі і складаецца з Канстытуцыйнага Суда і сістэмы судоў агульнай юрысдыкцыі.

Суды агульнай юрысдыкцыі ажыццяўляюць правасуддзе па грамадзянскіх, крымінальных, адміністрацыйных і эканамічных справах. Сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі складаюць раённыя (гарадскія) суды, эканамічныя суды абласцей (горада Мінска), абласныя (Мінскі гарадскі). У сістэме судоў агульнай юрысдыкцыі могуць ствараецца спецыялізаваныя суды. Колькасны склад суддзяў судоў агульнай юрысдыкцыі ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Узначальвае сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі Вярхоўны Суд.

Раённы (гарадскі), спецыялізаваны суды ствараюцца ў раёне, горадзе абласнога падпарадкавання, які не мае раённага дзялення, раёне ў горадзе. Дапускаецца стварэнне аднаго раённага (гарадскога) суда на раён і горад, а таксама аднаго спецыялізаванага суда на некалькі раёнаў.

У кожнай вобласці Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць абласны суд і эканамічны суд вобласці, а ў горадзе Мінску – Мінскі гарадскі суд і эканамічны суд горада Мінска.

*Абласны (Мінскі гарадскі) суд* складаецца з суддзяў абласнога (Мінскага гарадскога) суда, у тым ліку старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда, першага намесніка і намеснікаў старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда. Абласны (Мінскі гарадскі) суд: разглядае ў межах сваёй кампетэнцыі ў якасці суда першай інстанцыі, у парадку нагляду і па абставінах, якія зноў адкрыліся, грамадзянскія, крымінальныя справы і справы аб адміністрацыйных правапарушэннях; разглядае ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў межах сваёй кампетэнцыі грамадзянскія і крымінальныя справы ў апеляцыйным парадку, а таксама скаргі (пратэсты) на пастановы раённых (гарадскіх) судоў па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях; ажыццяўляе нагляд за судовай дзейнасцю ніжэйстаячых судоў, аказвае ім дапамогу ва ўжыванні заканадаўства; вывучае і абагульняе судовую практыку, вядзе і аналізуе судовую статыстыку; ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

*Эканамічны суд* вобласці (горада Мінска) складаецца з суддзяў эканамічнага суда вобласці (горада Мінска), у тым ліку старшыні эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) і намеснікаў старшыні эканамічнага суда вобласці (горада Мінска). Эканамічны суд вобласці (горада Мінска): разглядае ў межах сваёй кампетэнцыі эканамічныя справы ў якасці суда першай інстанцыі, у апеляцыйным парадку і па абставінах, якія зноў адкрыліся, справы аб адміністрацыйных правапарушэннях у якасці суда першай інстанцыі, а таксама скаргі (пратэсты) на пастановы па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях; вывучае і абагульняе судовую практыку, вядзе і аналізуе судовую статыстыку; рыхтуе прапановы аб удасканаленні заканадаўства, якое

рэгулюе адносіны ў сферы прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці; ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

### 7. Вярхоўны і Канстытуцыйны суды

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь ўзначальвае сістэму судоў агульнай юрысдыкцыі і з'яўляецца вышэйшым судовым органам, які ажыццяўляе правасуддзе па грамадзянскіх, крымінальных справах, справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, эканамічных справах, ажыццяўляе нагляд за судовай дзейнасцю судоў агульнай юрысдыкцыі, рэалізуе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Вярхоўны Суд складаецца з суддзяў Вярхоўнага Суда, у тым ліку Старшыні Вярхоўнага Суда, першага намесніка і намеснікаў Старшыні Вярхоўнага Суда. У складзе Вярхоўнага Суда вылучаюцца Пленум, Прэзідыум, судовая калегія па грамадзянскіх справах, судовая калегія па крымінальных справах, судовая калегія па эканамічных справах, судовая калегія па справах інтэлектуальнай уласнасці. Пры неабходнасці ствараюцца іншыя судовыя калегіі для спецыялізаванага разгляду спраў.

Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае ў межах сваёй кампетэнцыі справы ў якасці суда першай інстанцыі, у касацыйным парадку, у парадку нагляду і па абставінах, якія зноў адкрыліся, а таксама скаргі (пратэсты) на пастановы абласных (Мінскага гарадскога) судоў і пастановы эканамічных судоў абласцей (горада Мінска) па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях; разглядае ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў межах сваёй кампетэнцыі справы ў апеляцыйным парадку; уносіць у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь прапановы аб дачы заключэнняў у адпаведнасці з часткай другой артыкула 112 і часткай чацвёртай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; вывучае і абагульняе судовую практыку, вядзе і аналізуе судовую статыстыку судоў агульнай юрысдыкцыі і дае тлумачэнні па пытаннях прымянення заканадаўства; ажыццяўляе кантроль за выкананнем ніжэйстаячымі судамі пастаноў Пленума Вярхоўнага Суда. Акрамя таго Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь аказвае дапамогу суддзям судоў агульнай юрысдыкцыі па ўжыванні заканадаўства; распрацоўвае прапановы аб удасканаленні заканадаўства; вывучае дзейнасць судоў агульнай юрысдыкцыі, заслухоўвае інфармацыю старшыняў, першых намеснікаў, намеснікаў старшыняў і суддзяў судоў агульнай юрысдыкцыі аб дзейнасці адпаведных судоў; ажыццяўляе арганізацыйнае, матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае забеспячэнне дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі, а таксама арганізацыйнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне органаў судзейскай супольнасці; вырашае ў межах сваёй кампетэнцыі пытанні, якія вынікаюць з міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, а таксама пытанні супрацоўніцтва з судамі замежных дзяржаў, замежнымі і міжнароднымі арганізацыямі; ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

***Канстытуцыйны Суд*** Рэспублікі Беларусь заснаваны ў красавіку 1994 г. Ён з'яўляецца органам судовага кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве і забяспечвае вяршэнства Канстытуцыі і яе непасрэднае дзеянне на тэрыторыі краіны. Паўнамоцтвы: дае заключэнні аб канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, міжнародных дагаворных і іншых абавязацельстваў Рэспублікі Беларусь, актаў міждзяржаўных утварэнняў, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь; дае заключэнне аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння палатамі Нацыянальнага сходу Канстытуцыі; прымае рашэнні аб канстытуцыйнасці законаў, прынятых Нацыянальным сходам (за выключэннем законаў, падрыхтаваных у сувязі з заключэннем, выкананнем, прыпыненнем дзеяння і спыненнем міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь), да іх падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь; прымае рашэнні аб адпаведнасці Канстытуцыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія не ўступілі ў сілу; прымае рашэнні аб наяўнасці фактаў сістэматычнага або грубага парушэння мясцовымі Саветамі дэпутатаў патрабаванняў заканадаўства; дае афіцыйнае тлумачэнне дэкрэтаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія датычацца канстытуцыйных правоў, свабод і абавязкаў грамадзян; выкладае сваю пазіцыю аб дакументах, якія прыняты (выдадзены) замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і закранаюць інтарэсы Рэспублікі Беларусь у частцы адпаведнасці гэтых дакументаў агульнапрызнаным прынцыпам і нормам міжнароднага права; праводзіць праверкі канстытуцыйнасці асобных напрамкаў нарматворчай дзейнасці і правапрымяняльнай практыкі судоў, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў; прымае рашэнні аб ліквідацыі ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой недакладнасці; прымае штогадовыя пасланні Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Грамадзянін па пытанні канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў не можа звярнуцца ў Канстытуцыйны Суд напрамую, але ён мае права накіраваць свой зварот упаўнаважаным органам, дзе прадугледжаны спецыяльны механізм па разглядзе такіх зваротаў. Правам звароту ў Канстытуцыйны Суд валодаюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, палаты Нацыянальнага сходу, Вярхоўны Суд, Савет Міністраў.

### 8. Парадак падбору і прызначэння суддзяў

Канстытуцыйны Суд фарміруецца ў колькасці 12 суддзяў з высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне права: шэсць суддзяў прызначаюцца Прэзідэнтам, шэсць суддзяў выбіраюцца Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Суддзі Канстытуцыйнага Суда прызначаюцца (абіраюцца) на 11 гадоў і могуць быць прызначаны (абраны) на новы тэрмін.

Старшыня Канстытуцыйнага Суда прызначаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь са згоды Савета Рэспублікі з ліку суддзяў Канстытуцыйнага Суда тэрмінам на 5 гадоў. Суддзёй Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь можа

быць прызначаны (абраны) грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які валодае беларускай і рускай мовамі, мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, з’яўляецца высокакваліфікаваным спецыялістам у галіне права, мае, як правіла, вучоную ступень і валодае высокімі маральнымі якасцямі.

Кандыдатам на пасаду суддзі суда агульнай юрысдыкцыі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 25-гадовага ўзросту.

Суддзі раённых (гарадскіх), спецыялізаваных, абласных (Мінскага гарадскога) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска) прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Старшыні Вярхоўнага Суда. Суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь прызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь са згоды Савета Рэспублікі па прадстаўленню Старшыні Вярхоўнага Суда.

## *Лекцыя 12.* Рэгіёны Беларусі. Палітычныя партыі, грамадскія аб’яднанні

### 1. Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях

Першымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Высокага сярэдневякоўя з’яўляліся Полацкае і Тураўскае княствы. Іх палітычная структура, як і ўсіх іншых старажытнарускіх княстваў перыяду палітычнай раздробленасці, заключала ў сабе два ўзроўні: *княствы-зямлі і княствы-воласці*. Княствы-землі былі буйнымі адзінкамі і валодалі незалежнасцю. Воласці вылучыліся у часы палітычнай раздробленасці і падпарадкоўваліся галоўнаму прастолу.

У складзе Полацкага княства на працягу XII – пачатку XIII ст. вылучыліся Полацкая, Віцебская, Менская, Друцкая воласці, а таксама, магчыма, Лукомльская, Ізяслаўская, Лагожская і Барысаўская. У склад Тураўскай зямлі ўваходзілі Тураўская, Пінская, Гарадзецкая, Дубровіцкая і Чартарыйская воласці. Шэраг іншых сучасных беларускіх тэрыторый уваходзіў у склад Чарнігаўскага, Смаленскага, Валынскага (з 1199 г. – Галіцка-Валынскага) і Кіеўскага княстваў. Для іх палітычнага развіцця былі характэрны агульныя для ўсяго старажытнарускага рэгіёну з’явы – далейшае драбленне на княствы-воласці і міжусобная барацьба.

Межы асобных княстваў-зямель і княстваў-валасцей ў старажытнарускі перыяд не былі дакладна вызначаны і тым больш маркіраваны. Прыналежнасць да той ці іншай воласці вызначалася данніцкімі абавязацельствамі насельніцтва.

У сярэдзіне XIII ст. значная частка ўсходнеславянскіх зямель аказалася ў падпарадкаванні новага дзяржаўнага ўтварэння, створанага мангольскімі

заваёўнікамі, – Залатой Арды; іншая (у тым ліку беларускія землі) – у арбіце ўплыву Вялікага Княства Літоўскага.

На працягу XIII–XIV стст. да Вялікага Княства Літоўскага быў далучаны шэраг княстваў былой Старажытнай Русі. Працэс уключэння зямель у склад ВКЛ ажыццяўляўся рознымі шляхамі: у адных выпадках – ваеннай сілай, у іншых – шляхам дынастычных шлюбаў, у трэціх – на падставе дамовы паміж князямі ці паміж кіруючымі коламі дзвюх дзяржаў. На добраахвотна-дамоўнай аснове ў склад ВКЛ увайшлі, напрыклад, Менскае і Полацкае княствы, на аснове дынастычнага шлюбу – Віцебскае княства.

Тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага падчас найбольшага пашырэння складала 900 тыс. км$^2$. Дзяржаўны лад і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне складаліся па меры фарміравання самой дзяржавы. Першапачаткова дзяржаўны лад ВКЛ характарызаваўся дзяленнем краіны на дзве часткі: цэнтральную (галоўную) і землі мяжуючыя («якія прыслухоўваюцца»). Адносіны з мяжуючымі землямі будаваліся на асабістай залежнасці іх князёў ад вялікага князя, г.зн. на аснове *сюзерэнітэту-васалітэту*.

У склад цэнтральнай часткі ўваходзілі Ашмянская, Берасцейская, Віленская, Вілкамірская, Ваўкавыская, Гарадзенская, Клецкая, Кобрынская, Капыльская, Лідская, Менская, Нясвіжская, Наваградская, Пінская, Рэчыцкая, Слонімская, Слуцкая, Трокская, Тураўская і Упіцкая землі, якія ў гістарычных дакументах мелі агульную назву – ***Літва***.

Да зямель мяжуючых адносіліся: Падляшша, Валынь, Падолле, Кіеўшчына, Чарнігава-Северская, Смаленская, Віцебская, Полацкая землі і Жмудзь. Яны захоўвалі сваю дзяржаўна-прававую адасобленасць. Тут працягваў дзейнічаць адасоблены мясцовы апарат дзяржаўнага кіравання на чале са сваімі ранейшымі князямі, якія захавалі свае ранейшыя тытулы. У Полацку і Віцебску працягвала функцыянаваць веча, дзе вырашаліся шматлікія пытанні мясцовага самакіравання.

Пасля абрання на вялікакняжацкі пасад Альгерда (1345–1377) цэнтральная частка была падзелена на дзве ваенна-адміністрацыйныя акругі, якія затым атрымалі назву ваяводстваў – Віленскага і Троцкага, што было выклікана неабходнасцю адбіваць на захадзе напады Польшчы і крыжакоў, а на ўсходзе – ардынцаў.

Напачатку XVI ст. у ВКЛ была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, у выніку якой было заснавана яшчэ 5 ваяводстваў – Віцебскае, Полацкае, Наваградскае, Смаленскае і Падляшскае. Віленскі сойм 1565–1566 гг. падзяліў ВКЛ на 13 ваяводстваў і 30 паветаў, дзе кіравалі намеснікі вялікага князя – ваяводы і старасты. Гэта спрыяла далейшай цэнтралізацыі.

*Рэч Паспалітая*. Уся тэрыторыя дзяржавы паздзялялася на ваяводствы і паветы, адбывалася ўніфікацыя з адміністрацыйным падзелам у Польшчы. У выніку на беларускіх землях ВКЛ з’явіліся ваяводствы:

1) Берасцейскае (у складзе Берасцейскага і Пінскага паветаў),

2) Віленскае (Браслаўскі, Віленскі, Лідскі, Ашмянскі, Вількамірскі паветы),

3) Віцебскае (Віцебскі і Аршанскі паветы),

4) Менскае (Менскі, Рэчыцкі і з 1569 г. – Мазырскі павет),

5) Мсціслаўскае (не было падзелу на паветы),

6) Навагародскае (Ваўкавыскі, Новагародскі і Слонімскі паветы),

7) Полацкае (не было падзелу на паветы),

8) Троцкае (Гродзенскі, а таксама Ковенскі, Троцкі, Упіцкі паветы).

Існаваўшыя ў складзе ВКЛ Кіеўскае (акрамя Мазырскага павета) і Падляшскае ваяводствы ў 1569 г. былі ўключаны ў склад Каралеўства Польшча.

*Расійская імперыя*

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай на далучаных тэрыторыях былі створаны Магілёўская і Пскоўская губерні. З Пскоўскай губерні ў хуткім часе была выдзелена Полацкая, куды ўвайшлі галоўным чынам беларускія землі. На беларускіх землях, якія засталіся ў складзе ВКЛ, у 1791 г. былі створаны новыя паветы: у Берасцейскім ваяводстве Пінска-Зарэчанскі і Кобрынскі, у Віленскім ваяводстве – Завілейскі і Эшышскі, у Новагародскім – Слуцкі.

Пасля другога і трэццяга падзелаў РП былі ўтвораны Мінская, Віленская і Слонімская губерні, якія хутка сталі намесніцтвамі. На землях, якія заставаліся ў складзе ВКЛ, існавала Гарадзенскае ваяводства (было ўтворана з Гарадзенскага павета Троцкага ваяводства).

Пасля рэформы 1796–1797 гг. у сучасных межах Беларусі і Літвы ўжо існавалі Беларуская з цэнтрам у Віцебску, Мінская і Літоўская з цэнтрам у Вільні губерні.

Згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам 1801 г. створаны:

1) Беларускае генерал-губернатарства (Віцебская і Магілёўская губерні);

2) Літоўскае генерал-губернатарства (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні).

У 1863 г. беларускія губерні былі аб’яднаны пад агульным кіраўніцтвам віленскага генерал-губернатара.

Указам ад 18 снежня 1842 г. былі зменены адміністрацыйныя межы губерняў: тэрыторыя Беластоцкай вобласці перададзена ў склад Гродзенскай губерні, створана Ковенская губерня, частка Гродзенскай губерні ўвайшла ў склад Віленскай (Лідскі павет) і Мінскай (Навагрудскі павет) губерняў, Дзісненскі і Вілейскі паветы перадаваліся з Мінскай у Віленскую губерню. Уведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел практычна без змен пратрымаўся да пачатку XX ст. У гэты час у сёняшніх дзяржаўных межах Беларусі існавалі 35 паветаў (усяго ў адміністрацыйных граніцах пяці беларускіх губерняў – 47 паветаў).

Губерню ўзначальваў губернатар. Губерні як больш буйныя адзінкі падзяляліся на паветы, якія ў сваю чаргу – на воласці (ніжэйшую адміністрацыйную адзінку сялянскага самакіравання).

*Заходняя Беларусь* у Польшчы падзялялася на ваяводствы і гміны.

*Савецкая Беларусь.*

*Заходняя вобласць*, створаная пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у складзе Віленскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў з цэнтрам у Мінску, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ўключала Віленскую, Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні. У лютым 1918 г. яе цэнтр быў перанесены ў Смаленск. У красавіку 1918 г. у склад Заходняй вобласці ўвайшла Смаленская губерня. У снежні гэта вобласць была перайменавана ў Заходнюю камуну. Апошняя была скасавана пасля абвяшчэння ССРБ 1 студзеня 1919 г.

У прынятай I Усебеларускім з’ездам саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 2–4 лютага 1919 г Канстытуцыі нічога не было сказана аб мясцовых органах дзяржаўнага кіравання. У студзені – лютым 1919 г. у Беларусі была створана адзіная сістэма дзяржаўнай улады: камбеды былі аб’яднаны з саветамі, былі ліквідаваны ваенна-рэвалюцыйныя камітэты.

Мясцовыя органы ўлады ў разглядаемы перыяд падвяргаліся частым рэарганізацыям. У пачатку 1920-х гг. мясцовыя органы ўлады былі прадстаўлены павятовымі і валаснымі з’ездамі саветаў, гарадскімі і сельскімі саветамі і іх выканаўчымі камітэтамі. У выканкамах былі створаны галіновыя аддзелы (земляробства, юстыцыі, сацыяльнага забеспячэння, народнай асветы, працы, прадуктаў харчавання, дарожна-будаўнічы, аховы здароўя і інш), якія сталі падведамаснымі ўстановамі адпаведных наркаматаў.

У сярэдзіне 1920-х гг у БССР было праведзена *раяніраванне* ў мясцовым кіраванні: на ўзроўні сельсаветаў, якія ўзбуйняліся, ствараліся нацыянальныя сельсаветы. Усяго было створана 1202 узбуйненых сельсавета, з якіх 42 нацыянальных і 48 местачковых.

У 1924 г. на тэрыторыі БССР было скасавана ранейшае і зацверджана новае адмністрацыйна-тэрытарыяльная дзяленне – акругі з падзелам на раёны, пасля акругі былі скасаваны, уведзена абласное дзяленне. Да верасня 1939 г. БССР складалася з 5 абласцей: Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай і Палескай.

Вынікам савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. было далучэнне да Другой Рэчы Паспалітай заходніх тэрыторый Беларусі (Заходняй Беларусі). На гэтых землях асноўнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі з’яўляліся ваяводствы (Беластоцкае, Навагрудскае, Палесскае ваяводствы) і ў іх складзе – паветы. У красавіку 1922 г. была створана Віленская зямля на правах ваяводства, якая ўключала Браслаўскі, Віленска-Троцкі, Ашмянскі і Свянцянскі паветы. У ліпені 1922 г. да Віленскай зямлі былі далучаны Вілейскі, Дзісненскі і Данілавіцкі паветы. Нарэшце, у снежні 1925 г. было створана Віленскае ваяводства.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР Вільня і Віленскі край у лістападзе 1939 г. па рашэнню кіраўніцтва СССР былі перададзены Літве. На астатняй тэрыторыі Заходняй Беларусі былі створаны 5 абласцей (Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская вобласці) і 101 раён.

У лістападзе 1940 г. у склад Літоўскай ССР была перададзена частка тэрыторыі БССР, у выніку былі скасаваны 3 раёны: Гадуцішкаўскі, Парэчскі і Свянцянскі.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны акупіраваная германскімі захопнікамі тэрыторыя БССР была падзелена на генеральную акругу «Беларусь» (уваходзіла ў склад рэйхскамісарыята «Остланд»), тылавы раён групы армій «Цэнтр», акругу «Беласток» (уключана ў склад правінцыі «Усходняя Прусія»). Частка беларускіх зямель аказалася ў складзе рэйхскамісарыята «Украіна» і генеральнай акругі «Літва».

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад германскіх захопнікаў 3 раёны Брэсцкай і 17 раёнаў Беластоцкай абласцей у верасні 1944 г. былі перададзены ў склад Польшчы, а Беластоцкая вобласць была скасавана.

20 верасня 1944 г. былі створаны новыя вобласці: Бабруйская, Гродзенская, Полацкая, Маладзечанская. Такі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на 12 абласцей праіснаваў да 1954 г.  З сярэдзіны 1950-х гг. да сярэдзіны 1960-х гг. адбылася чарговая рэарганізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР. 8 студзеня 1954 г. былі скасаваны Баранавіцкая, Бабруйская, Пінская, Палеская і Полацкая вобласці, іх раёны былі пераразмеркаваны паміж іншымі абласцямі. 20 студзеня 1960 г. была скасавана Маладзечанская вобласць. Акрамя таго на працягу 1956–1662 гг. у БССР адбывалася ўзбуйненне раёнаў за кошт скасавання шэрага з іх. Пазней – у 1965–1966 гг. – было праведзена аднаўленне, а таксама стварэнне новых раёнаў.

У далейшым істотных змен не адбывалася. Існаваўшы з таго часу падзел Беларусі на 6 абласцей – Брэсцкую (16 раёнаў), Віцебскую (21 раён), Гомельскую (21 раён), Гродзенскую (17 раёнаў), Мінскую (22 раёны), Магілёўскую (21 раён) – захаваўся да сённяшняга часу.

## 2. Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная (арт. 9). У Рэспубліцы Беларусь выдзяляюцца адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і тэрытарыяльныя адзінкі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка – частка тэрыторыі, у межах якой ствараюцца і дзейнічаюць мясцовы Савет дэпутатаў і выканаўчы і распарадчы орган (вобласць, раён, сельсавет, горад, пасёлак гарадскога тыпу).

Тэрытарыяльная адзінка - населены пункт, у якім не ствараюцца мясцовы Савет дэпутатаў і выканаўчы і распарадчы орган (раён у горадзе, тэрыторыя спецыяльнага рэжыму выкарыстання (запаведнік, нацыянальны парк, заказнік, тэрыторыя помніка прыроды, біясферны рэзервант, землі гісторыкакультурнага прызначэння, землі абароны, свабодная) эканамічная зона).

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь падзелена на адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі першага, другога (базавага) і трэцяга (першаснага) узроўняў.

Першы ўзровень складаюць шэсць абласцей (Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская) і горад Мінск, які мае асаблівы статус сталіцы Рэспублікі Беларусь.

Базавы ўзровень адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення складаюць раёны (у Беларусі іх 118) і гарады абласнога падпарадкавання (10 гарадоў); трэці адміністрацыйна-тэрытарыяльны ўзровень складаюць тэрыторыі, на якія падзяляюцца раёны – гарады раённага падпарадкавання, пасёлкі гарадскога тыпу, сельсаветы.

Па стане на 1 студзеня 2020 г. колькасць раёнаў у Рэспубліцы Беларусь складае 118: 16 раёнаў – у Брэсцкай вобласці, 21 – у Віцебскай, 17 – у Гродзенскай, 21 – у Гомельскай, 22 – у Мінскай, 21 – у Магілёўскай. Што датычыцца тэрыторый населеных пунктаў, якія не з'яўляюцца адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, яны разам з іншымі тэрыторыямі ўваходзяць у прасторавыя межы сельсаветаў.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы ўваходзяць у кампетэнцыю Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (арт. 97).

У сувязі з тым, што існуючы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь усталяваўся больш за палову стагодзя таму, калі існавала іншая сацыяльна-эканамічная (арыентацыя на калектывізацыю і індустрыялізацыю) і грамадска-палітычная (зрастанне дзяржаўнага апарату з партыйным) сітуацыя, узнікае пытанне аб магчымым яго рэфармаванні. Адзначаецца таксама існаванне значнага адрознення асобных раёнаў Беларусі па колькасці насельніцтва, узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечаннасці інфрастуктурай. 14 раённых цэнтраў змяшчаюцца на адлегласці больш за 200 км ад свайго абласнога цэнтра (Паставы, Ляхавічы, Лельчыцы і інш.), а 16 райцэнтраў знаходзяцца бліжэй да Мінска, чым да свайго абласнога цэнтра (Асіповічы, Ашмяны і інш.).

Апошні раз буйное адміністрацыйнае пераўтварэнне ў краіне адбылося ў 1989 г.: у Горацкі раён Магілёўскай вобласці перасялілася шмат жыхароў з адселеных з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС вёсак, таму са складу раёна вылучылі новы – Дрыбінскі. Між тым некаторыя пераўтварэнні ў сферы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі ўжо неаднаразова ажыццяўляліся ў апошнія гады. Так, у Мінскай вобласці ў 2006 г. змены адбыліся ў Салігорскім, Пухавіцкім, Мядзельскім раёнах; у 2007 г. – у Клецкім і Бярэзінскім; у 2009 г. былі зменены тэрыторыі 32 сельсаветаў. Пастаянна змяняюцца межы гарадоў (асабліва Мінска). Адбываліся дробныя змены і дзяржаўнай граніцы: напрыклад, за апошнія гады некалькі разоў мянялі лінію граніцы з Украінай – у Лельчыцкім і Лоеўскім раёнах.

Найбольш істотныя змены адбыліся ў 2019 г. Згодна з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 2019 г. змяніліся граніцы Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей (уступіў у сілу з 1 снежня 2019 г.). Гэтыя змены датычацца 55 раёнаў (16 – у Брэсцкай вобласці, 22 – у Мінскай і 17 – у Гродзенскай); патрабавалася прывесці ў адпаведнасць межы сельскіх саветаў,

якія знаходзіліся на стыку дадзеных абласцей і раёнаў. Неабходнасць у гэтых пераўтварэннях была выклікана ажыццяўлёнымі раней меліярацыйнымі і іншымі гаспадарчымі работамі, будаўніцтвам аб’ектаў транспартнай інфраструктуры, што ў выніку прывяло да несупадзення адміністрацыйных межаў з цвёрдымі контурамі мясцовасці (рэкамі, меліярацыйнымі каналамі, дарожнай сеткай, лясных масівамі, прасекамі і інш.). Найбольш буйная змена заключалася ў перанясенні вёскі Карытніца, якая была адзіная ў Лідскім раёне на левым беразе Нёмана, у Дзятлаўскі раён.

### 3. Функцыі і паўнамоцтвы мясцовага кіравання і самакіравання

На ўсіх узроўнях публічнай улады дзяржаўныя органы выконваюць адну і тую ж мэту – найбольш эфектыўна распарадзіцца дэлегаванай грамадствам уладай для рашэння агульнадзяржаўных задач.

Асновы прававога становішча органаў мясцовага кіравання і самакіравання, асобных форм непасрэднай дэмакратыі замацаваны:

- ў Законе ад 4 студзеня 2010 г. “*Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь*”;

- у Раздзеле V (артыкулы 117–124) Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Органамі мясцовага кіравання і самакіравання з’яўляюцца *мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя рэферэндумы, сходы* і іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах.

Мясцовыя *Саветы дэпутатаў* выбіраюцца жыхарамі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (вёскі, горада, раёна, вобласці) тэрмінам на чатыры гады. Саветы дэпутатаў працуюць у форме сэсій, якія збіраюцца не радзей аднаго разу ў квартал. На сэсіях дэпутаты мясцовых Саветаў зацвярджаюць праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця свайго горада або раёна, распараджаюцца выдаткамі і даходамі мясцовых бюджэтаў, камунальнай уласнасцю, усталёўваюць мясцовыя падаткі і зборы, абмяркоўваюць іншыя пытанні, звязаныя з развіццём сваёй тэрыторыі. У камунальнай уласнасці, як правіла, знаходзіцца маёмасць дзяржаўных органаў той ці іншай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, жыллёвы фонд і жыллёва-камунальная гаспадарка, а таксама прамысловыя, будаўнічыя, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, прадпрыемствы гандлю, бытавога абслугоўвання насельніцтва і транспарту, іншыя прадпрыемствы, арганізацыі, установы аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту.

Саветы дэпутатаў падсправаздачныя ў сваёй дзейнасці грамадзянам, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі, і адказныя перад імі. Дзейнасць Саветаў дэпутатаў забяспечваецца за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

У функцыянаванні мясцовага самакіравання знаходзіць выяўленне права грамадзян на мясцовае самакіраванне.

Рэалізацыя кіраўніцкіх функцый мясцовымі органамі ў нашай краіне ажыццяўляецца як у форме мясцовага кіравання, так і ў форме самакіравання. *Сістэма мясцовых органаў кіравання* ў Рэспубліцы Беларусь *складаецца з*

*абласных, гарадскіх, раённых, пасялковых і сельскіх выканкамаў*, а таксама *мясцовых адміністрацый*.

Выканаўчым і распарадчым органам з’яўляецца выканаўчы камітэт з правамі юрыдычнай асобы.

Вылучаюць тры віды выканаўчых камітэтаў:

– першасны ўзровень – сельскія, пасялковыя, гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання);

– базавы ўзровень – гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання);

– абласны ўзровень – абласныя і Мінскі гарадскі.

Такім чынам, асноўным выканаўчым і распарадчым органам на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі з’яўляецца *мясцовы выканкам* – калегіяльны орган кіравання агульнай кампетэнцыі. Ён забяспечвае вырашэнне ўсіх пытанняў кіравання і складаецца са старшыні выканкама, яго намеснікаў, кіраўніка спраў (або сакратара) і членаў выканаўчага камітэта.

Першы намеснік старшыні, намеснікі старшыні, кіраўнік спраў і члены абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады старшынёй выканаўчага камітэта па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Першы намеснік старшыні, намеснікі (намеснік) старшыні, кіраўнік спраў (сакратар) і члены раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага выканаўчых камітэтаў прызначаюцца старшынёй адпаведнага выканаўчага камітэта па ўзгадненні з вышэйстаячым выканаўчым камітэтам.

Абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты падсправаздачныя і падкантрольныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і Савету Міністраў Рэспублікі, выканаўчыя камітэты пярвічнага і базавага ўзроўняў – Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і вышэйстаячым выканаўчым і распарадчым органам.

Выканаўчы камітэт адказны перад адпаведным Саветам па пытаннях, аднесеных да кампетэнцыі Савета.

Пасяджэнні выканаўчага камітэта склікаюцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу на месяц і лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш за 2/3 членаў ад устаноўленага складу выканаўчага камітэта.

Асобна трэба казаць аб мясцовай адміністрацыі, якая з’яўляецца выканаўчым і распарадчым органам на тэрыторыі раёна ў горадзе. Мясцовыя адміністрацыі валодаюць правам юрыдычнай асобы, уваходзяць у сістэму органаў выканаўчай улады і адносяцца да органаў мясцовага кіравання. Мясцовая адміністрацыя – калегіяльны орган агульнай кампетэнцыі, які складаецца з кіраўніка мясцовай адміністрацыі, яго намеснікаў і членаў мясцовай адміністрацыі. Мясцовыя адміністрацыі былі створаны пасля скасавання ў гарадах раённых Саветаў дэпутатаў і іх органаў у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 1995 г. №383 «Аб правядзенні рэформы органаў мясцовага кіравання і самакіравання». Паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі шмат у чым супадаюць з паўнамоцтвамі раённых выканаўчых камітэтаў.

### 4. Гісторыя развіцця палітычных арганізацый у Беларусі

У канцы XIX ст. на арэну палітычнай барацьбы выходзіць новая сіла – рабочы клас. У 1898 г. ў Мінску на Першым з’ездзе была абвешчана Расійская сацыял-дэмакратычна рабочая партыя (*РСДРП*). У Беларусі народніцкія арганізацыі вялі прапагандысцкую працу сярод працоўных, інтэлігенцыі шляхам распаўсюджвання літаратуры, стварэння гурткоў, правядзення сходаў. Народнікамі была распрацавана праграма рабочых членаў партыі «Народная воля» ў ПаўночнаЗаходнім краі», па якой ставілася задача вызвалення працоўнага саслоўя з-пад эканамічнага, палітыка-грамадскага і маральнага прыгнёту. Пабудова новага грамадства звязвалася з пераходам зямлі і прылад працы ў агульную уласнасць усіх працоўных, ва ўласнасць сацыялістычнай дзяржавы, заменай наёмнай працы агульнай працай. Палітычная частка праграмы абвяшчала свабоду слова, друку, саюзаў, сходок, самакіраванне палітычных груп і г.д. У вобласці маральнасці – свабода сумлення, пачуццяў, думкі, навукі, абавязковае бясплатнае навучанне і г.д.

Прафесійныя арганізацыі выступалі ініцыятарамі і кіраўнікамі забастовачных выступленняў. Разам з пашырэннем карных мер, царызм спрабаваў уздзейнічаць на рабочы рух праз палітычныя і грамадскія арганізацыі. Ідэю стварэння легальных арганізацый высунуў начальнік маскоўскага ахоўнага аддзялення С.В. Зубатаў. У Беларусі такой арганізацыяй з’явілася створаная ў 1901 г. “*Яўрэйская незалежная рабочая партыя*”. Партыя імкнулася замяніць рэвалюцыйнае вучэнне эвалюцыйным, адмаўляла ўсе формы і віды насілля.

Народніцкія гурткі, якія адмяжаваліся ад эвалюцыянізму, называлі сябе *сацыялістамі-рэвалюцыянерамі*. У Мінску адбылося аб’яднанне груп народніцкага кшталту у “*Рабочую партыю палітычнага вызвалення Расіі*” (у асноўным з рабочых). У сакавіку-красавіку 1900 г. мінская арганізацыя была правалена, яе друкарня разгромлена паліцыяй. Тыя сацыялісты-рэвалюцыянеры, якія засталіся на волі, працягвалі працу ў Мінску, Гомелі і іншых гарадах. На базе гэтых гурткоў была створана *Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэры)*.

*Беларуская Сацыялістычная Грамада* (1903) таксама належала да народніцкіх партый. Першае найменне – Беларуская Рэвалюцыйная Грамада. У снежні 1903 г. – Беларуская Сацыялістычная Грамада. Распалася ў ліпені 1918 г., калі рэспубліку акупавалі нямецкія войскі. Арганізатары: А.І. Луцкевіч (Антон Навіна), І.І. Луцкевіч, К. Кастравіцкі (Кастусь Каганец), Ф. Стацкевіч, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.

БСГ заяўляла, што яна будзе імкнуцца да знішчэння прыватнай уласнасці на зямлю і змагацца за прадастаўленне кожнаму чалавеку права на індывідуальнае карыстанне зямлёй. БСГ – першая ў рэспубліцы нацыянальна-дэмакратычная партыя сацыялістычнага кірунку. Яна дамагалася звяржэння самадзяржаўя і абвясціла сваёй канчатковай мэтай зацвярджэнне сацыялізму ў Беларусі.

У сацыял-дэмакратычным і рабочым руху ў заходніх губернях вядучую пазіцыю займаў *Бунд*.

На Другім з'ездзе РСДРП (1903 г.) прынялі праграму, па якой планавалася: разбурыць буржуазны грамадскі і дзяржаўны лад. Партыя раскалолася на *бальшавікў і меншавікоў*.

Выхад Бунда з РСДРП спрыяў стварэнню інтэрнацыянальных пралетарскіх арганізацый у Заходнім краі.

Адным з першых палітычных аб'яднанняў кансерватараў на беларускіх землях сталі чарнасоценцы. Выхад для грамадства чарнасоценцы бачылі ў вяртанні да «спрадвечных пачаткаў: самадзяржаўя, праваслаўя, народнасці». Пасля царскага маніфеста ад 17 кастрычніка 1905 г., які падараваў дэмакратычныя свабоды, чарнасоценны рух распаўсюдзіўся па ўсёй краіне. Самая буйная чарнасоценная арганізацыя – *"Саюз рускага народа"*.

Палітычныя пратыі прымалі актыўны ўдзел у выбарах у Дзяржаўную думу. У выніку рэвалюцыйных падзей 1917 г. узмацніўся ўплыў бальшавікоў. На аснове асобных груп у снежні 1918 г. ствараецца *Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі*. Да 1928 г. яна ўсталёвае *аднапартыйную сістэму* ў рэспубліцы, калі партыя кантралявала ўсе палітычныя і эканамічныя рэсурсы.

### 5. Пераход ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнасці

Адмена III з'ездам народных дэпутатаў СССР у сакавіку 1990 г. канстытуцыйнага палажэння (арт. 6 Канстытуцыі СССР), якое замацоўвала аднапартыйнасць і манаполію КПСС, адкрыла магчымасць для прызнання розных нефармальных аб'яднанняў легітымнымі палітычнымі структурамі і стварэння палітычных партый.

9 кастрычніка 1990 г. быў прыняты Закон СССР "*Аб грамадскіх аб'яднаннях*", у адпаведнасці з якім для стварэння палітычнай партыі патрабавалася не меней 100 членаў. Пачатак фарміравання палітычных партый Беларусі звязаны са з'яўленнем і станаўленнем у 1986–1987 гг. markdownрознага роду дыскусійных клубаў і нефармальных арганізацый ("Талака", "Спадчына", "Тутэйшыя", "Мартыралог Беларусі" і інш.). Яны выступалі за дэмакратызацыю грамадства, прававую дзяржаву, свабоду слова, друку, адраджэнне нацыянальнай культуры, наданне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы, плюралізм розных форм уласнасці, эканамічную незалежнасць і суверэнітэт Беларусі.

У кастрычніку 1988 г. на базе нефармальных аб'яднанняў быў створаны аргкамітэт Беларускага народнага фронту (БНФ) за перабудову "Адраджэньне", устаноўчы з'езд якога адбыўся ў чэрвені 1989 г. у Вільні. Пасля БНФ пераўтварыўся ў партыю і перайшоў на антыкамуністычныя пазіцыі.

XIX канферэнцыя КПСС (1988 г.) дала дабро на існаванне іншых партый у краіне. У Беларуси з'явіліся:

– Аб'яднаная дэмакратычная партыя (1990 г.), з 1995 г. – "Нацыянальна-дэмакратычная партыя беларусаў";

– Беларуская сялянская партыя,

– Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада,

– Беларускі хрысціянска-дэмакратычны саюз

– Партыя камуністаў Беларуская (прыпыніла дзейнасць пасля Жнівеньскага путчу да 1993 г.) і іншыя.

Значнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі стала прыняцце Вярхоўным Саветам Закона "*Аб палітычных партыях*" у кастрычніку 1994 г.: (у 2005 г прыняты ў новай рэдакцыі). На развіццё партыйнай сістэмы ў Беларусі істотны ўплыў аказалі выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1995 г. Выбары ў вышэйшы прадстаўнічы і заканадаўчы орган улады выявілі ступень падтрымкі выбаршчыкамі розных палітычных партый. Ні адна партыя ў Беларусі не мае права манапалізаваць уладу і зрабіць сваю ідэалогію дзяржаўнай, г.зн. абавязковай для ўсіх грамадзян. Структуры палітычных партый фарміруюцца толькі па тэрытарыяльным прынцыпе.

На працэс фарміравання шматпартыйнасці ў Беларусі зачны ўплыў аказаў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі беларусь ад 26 студзеня 1999 г. "Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў і грамадскіх аб'яднанняў", была праведзена іх перарэгімтрацыя.

# Раздзел 3. **Беларусь на мяжы культур і цывілізацый**

## *Лекцыя 13.* Этнагенэз беларусаў. Народы і рэлігіі Беларусі

### 1. Асноўныя гіпотэзы аб паходжанні беларусаў

Адным з важнейшых крытэрыяў існавання адметнага этнасу лічыцца наяўнасць этнічнай самасвядомасці. *Этнічная (нацыянальная) самасвядомасць* перш за ўсё фіксуе (магчымымі спосабамі) прыналежнасць людзей да пэўнага этнасу, уключае меркаванні членаў этнасу аб характары дзейнасці сваёй супольнасці, яе ўласцівасцях і дасягненнях, так званыя этнічныя аўтастэрэатыпы. Наяўнасць назвы народа – этноніма – сведчыць аб асэнсаванасці членамі этнасу іх асаблівага адзінства і адрознення ад членаў іншых падобных агульнасцей.

Больш паслядоўна адметнасць групы выяўляецца ў такіх аб'ектыўных прыкметах культуры, як мова і рэлігія, супольная тэрыторыя, дзяржаўныя структуры.

Пераважная большасць даследчыкаў лічыць, што пераход да нацыянальнай мадэлі ў Еўропе пачаўся ў эпоху ранняга Новага часу (XVI–XVII стст.). Нацыянальную свядомасць гэтага перыяду вызначаюць як супольную ментальнасць, якая дае насельнікам акрэсленага абшару пачуццё агульнай самаідэнтычнасці. Станаўленне нацыі заўсёды звязана з барацьбой за палітычную самастойнасць у выпадку, калі да гэтага дзяржаўнасці не было, альбо калі яна была страчана раней. Нацыянальная свядомасць таксама звязана

з існаваннем класа альбо групы людзей, здольных да рэакцыі на выклікі чужых культур,

Асноўныя гіпотэзы аб паходжанні беларусаў.

I. «*Племянная*» – беларускі народ – вынік камбінацыі, культурнага змяшэння і ўзамеадзеяння ўсходнеславянскіх плямёнаў – крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, валынянаў. Лакальны варыянт падобнай канцэпцыі – крывіцкая тэорыя паходжання беларусаў. Беларусазнаўца і лінгвіст Яўхім Карскі лічыў, што беларусы сфармаваліся як вынік скрыжавання ўсходнеславянскіх плямёнаў – дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў, а таксама часткова неславянскіх – ятвягаў і галядзі. Іх этнічнае збліжэнне пачалося ў эпоху палітычнай раздробленасці Старажытнай Русі, а канчатковае зліццё ў адну, беларускую, народнасць, адбылося ў выніку іх аб'яднання ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIII–XIV стст.

II. Вацлаў Ластоўскі развіваў так званую *«крывіцкую» тэорыю беларускага этнагенеза*. Галоўным этнічным кампанентам беларусаў з'яўляюцца крывічы, якія стварылі самастойныя Полацкую, Смаленскую і Пскоўскую дзяржавы. Менавіта крывіцкія дыялекты сталі асновай беларускай мовы. Беларускі народ, такім чынам, народ крывіцкі. В. Ластоўскі прапагандаваў ідэі аб вяртанні ў жыццё нібыта «спрадвечнай» назвы нашай краіны – Крывія.

III. П. Растаргуеў лічыў, што *першапачатковае ядро беларусаў – дрыгавічы і радзімічы*. На аснове гэтых этнічных утварэнняў пазней аформіліся ўсе важнейшыя рысы беларускамоўнай супольнасці.

IV. *Канцэпцыя славянскага аўтахтанізму*. Беларусы – самы «чысты» славянскі народ, выток славянства. Яны з вельмі даўніх часоў займалі ўласную тэрыторыю і ні з кім этнічна не змешваліся. Праславянскія рысы, характэрныя для ўсіх славянскіх народаў, з'яўляюцца зыходнымі беларускімі рысамі. Чэшскі славіст Любарта Нідэрле лічыў беларускія землі (Палессе) найбольш старажытнай часткай славянскай прарадзімы.

V. Канцэпцыя, у якой *беларусы разглядаюцца як найчысцейшы ў этнічным плане славянскі народ*, як народ, які ўвасабляе сабой ідэальны славянскі антрапалагічны тып, распрацавана Мітрафанам Доўнар-Запольскім. Паводле яе, беларускі народ ніколі не зліваўся з прадстаўнікамі іншых народнасцей, увасабляе сабой ідэальны славянскі антрапалагічны тып, у той час як велікарусы змешваліся з фінскімі і цюркскімі плямёнамі, а ўкраінцы ўяўляюць сабой пярэстую этнічную сумесь славян з цюркамі. Падкрэслівалася, што беларусы – спрадвечны, аўтахтонны народ на сваёй зямлі, што ніколі ніякія іншыя народы не сяліліся на гэтай тэрыторыі. Сама назва краіны – Беларусь, – паводле М. Доўнар-Запольскага, з'яўляецца сведчаннем адметнасці беларускай гісторыі, бо беларусы не зведалі мангола-татарскай няволі, таму і сталі «вольнай», «Белай» Руссю.

VI. *Тэорыя аб паходжанні беларусаў з супольнасці гістарычнай Русі. «Старажытнаруская» канцэпцыя*: ў IX – XIII стст. існавала старажытнаруская народнасць – агульны продак усіх сучасных усходнеславянскіх народаў.

Усходнія славяне падзяліліся на тры галіны і ўтварылі тры блізкароднасныя, але самастойныя народы ў выніку неспрыяльных знешнепалітычных абставін – мангольскага нашэсця і страты старажытнарускай дзяржаўнасці. Уваходжанне ўсходнеславянскіх зямель у розныя дзяржаўныя ўтварэнні ўрэшце рэшт прывяло да замацавання і паглыблення мясцовых моўных і культурных адметнасцей, якія замацаваліся ў мове і культуры сучасных беларусаў, рускіх і украінцаў (А. Шахматаў). Канцэпцыя аб існаванні старажытнарускай народнасці набыла завершанасць пасля Вялікай Айчыннай вайны.[5]

VII. «*Субстратная» балцкая канцэпцыя*. Сутнасць: ўсходнеславянскае насельніцтва ў ходзе каланізацыі Усходняй Еўропы асімілявала мясцовае насельніцтва. Славяне – продкі сучасных беларусаў, маюць балцкі субстрат, сучасныя украінцы – іранскі, рускія – фіна-угорскі. У выніку гэтага ўзаемадзеяння ўзніклі адметныя мовы і адметная духоўная і матэрыяльная культура кожнага з усходнеславянскіх народаў (В. Сядоў).

## 2. Этапы фарміравання беларускага народа

*Дагістарычны этап*. Беларускі народ сфарміраваўся не адразу. Самы старажытны перыяд, этнічная «дагісторыя», *індаеўрапейскі*. Гэта перыяд індаеўрапейскага адзінства, агульнасці, што існавала ў эпоху бронзавага веку (III – II тысячагоддзе да н.э.) на тэрыторыі Еўразіі – агульных продкаў армян, славян, балтаў, грэкаў, германцаў, кельтаў, раманцаў, хетаў, іранцаў і шэрага іншых этнічных агульнасцей. Старажытнейшая моўная спадчына, якая ацалела і дайшла да нас з той эпохі – санскрыт. У лінгвістыцы існуе паняцце агульнай індаеўрапейскай лексікі – тых слоў, якія ёсць ва ўсіх сучасных індаеўрапейскіх мовах. Гэта агульная спадчына захавалася і дайшла да нашых дзён у агульнасці паданняў, легенд, казак, традыцыйных арнаментаў і сімвалаў, характэрных для ўсіх сучасных народаў, маючых індаеўрапейскае паходжанне.

Наступны перыяд нашай дагісторыі – *балта-славянскі*. Самыя блізкія мовы сярод індаеўрапейскіх – мовы балцкай і славянскай моўнай груп. Гэта дазваляе выказаць меркаванне аб існаванні ў эпоху ранняга жалезнага веку (I тысячагоддзе да н.э) некалі адзінай агульнасці – агульных продкаў усіх славянскіх і балцкіх народаў.

*Протагістарычны этап. Перыяд агульнаславянскага адзінства*. Канчатковы працэс афармлення ўласна праславянскай, а потым і раннеславянскай агульнасці, звязаны з познезарубінецкімі (другая палова I – II ст. н.э.) і вытворнымі ад іх старажытнасцямі кіеўскага культурнага кола (II – п.п.V ст. н.э.). Нямецкі археолаг І. Вернер яшчэ у 1972 г. выказаў меркаванне аб фармаванні праславянскага масіва насельніцтва на тэрыторыі лясной зоны Усходняй Еўропы, на Палессі, у Паўднёвай Беларусі, перад з’яўленнем славян

[5] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 331–334.

На сённяшні дзень, дзякуючы даследаванням беларускіх археолагаў даведзена, што самыя раннія комплексы бяспрэчна славянскай, пражскай культуры знаходзяцца на беларускім Прыпяцкім Палессі – па радыявугляродным метадзе яны датуюцца IV ст. Гэтыя славянскія старажытнасці ўзніклі на грунце помнікаў познезарубінецкай традыцыі. Такім чынам, Прыпяць на сённяшні дзень разглядаецца не як рака славяна-балцкага памежжа, а як унутранняя, важнейшая артэрыя пражскай культуры на раннім этапе яе развіцця.

Беларускае Палессе – зыходная тэрыторыя, дзе адбылося нараджэнне і афармленне агульнаславянскай супольнасці.

Верхняе Панямонне і Беларускае Падзвінне – гэта тыя землі, якія былі заселены балтамі не толькі ў эпоху ранняга жалезнага веку, але яшчэ (часткова) і ў раннім сярэдневякоўі.

*Перыяд усходнеславянскага адзінства, час Старажытнарускай Русі.* У ходзе асваення агульнаславянскай супольнасцю зямель Усходняй Еўропы ўзніклі этнічныя новаўтварэнні, якія існавалі ў IX – XII стст. – у навуковай літаратуры іх завуць плямёнамі, ці саюзамі плямёнаў. На поўначы і паўночным усходзе Беларусі існавала магутная этнічная супольнасць крывічоў, на усходзе і паўднёвым усходзе жылі радзімічы, землі цэнтральнай і паўднёвай часткі краіны былі асвоены дрыгавічамі і валынянамі. На паўночным захадзе і поўначы Беларусі ў той час жылі плямёны балтаў (продкаў сучасных літоўцаў, яцвягаў і часткі латышоў (латгалаў). Усходнія славяне былі больш развітыя ў цывілізацыйным плане, мелі ўласную дзяржасць. Усходнеславянскія супольнасці, як на тэрыторыі Беларусі, так і Украіны і часткі еўрапейскай Расіі, увайшлі ў склад дзяржавы, якая мела супольную назву Русь і кіравалася дынастыяй князёў Рурыкавічаў.

Паняцце Русі і Рускай зямлі ў шырокім сэнсе ўжывалася яно заўсёды ў якасці канфесіоніма (прыналежнасць да Рускай = Кіеўскай мітраполіі) і палітоніма (дзяржаўна-генеалагічная агульнасць, створаная Рурыкавічамі). Тэрмін «Русь» у дачыненні да насельніцтва Беларусі першапачаткова з’яўляўся этнасацыонімам і азначаў прыналежнасць да княжацкага дома, дружыны і купецтва.

Фарміраванне першапачатковай (цэнтральнай) часткі этнічнай тэрыторыі беларусаў адбывалася ў XIII – XIV стст. і ў першай палове XV ст. на мяжы двух такіх рэгіёнаў як – Віленшчына, Гродзеншчына, Міншчына і суседняе Падняпроўе.

*Эпоха ВКЛ. Нараджэнне ўласна беларускай этнічнай супольнасці.* Менавіта за тэрыторыяй былых княстваў Падзвіння і Падняпроўя – Полацкага, Віцебскага, Смаленскага, Друцкага і Свіслацкага – паводле мясцовай традыцыі ВКЛ, у XVI ст. устойліва захоўвалася назва «Русь» (побач з назвамі іншых гістарычных рэгіёнаў: Літвой, Палессем, Валынню, Падляшшам).

У эпоху ВКЛ канчаткова афармляюцца важнейшыя суб’ектыўныя і аб’ектыўныя прыкметы старабеларускай этнічнай супольнасці:

1. Наяўнасць агульнай саманазвы («русь», «русін», «рускі»).

2. Агульная дзяржаўная тэрыторыя.

3. Літаратурная мова, якая стала афіцыйнай мовай дзяржавы.

Такім чынам, тэрмін «Русь» і вытворныя ад яго азначэнні «рускі», «русін» на працягу стагоддзяў выкарыстоўваліся нашымі продкамі ў якасці ўласных саманазваў, акрэслівалі іх уласную ідэнтычнасць.

*Літвіны і русіны.* У асобных беларускіх даследаваннях настойліва праводзіцца думка аб страце тэрмінам «Літва» ў другой палове XVI ст. свайго этнічна балцкага напаўненя, як і сцвярджаецца аб выкарыстанні тэрміна «літвін» у якасці субэтноніма насельніцтвам Заходняй Беларусі і існаванні змешанага балта-славянскага «літвінскага субэтнасу». Сапраўды, тэрмін «Літва» ў сярэдневякоўі быў шматсэнсоўным і полісемантычным. У XIV—XVI стст. Ён ужываўсяу некалькіх сэнсавых значэннях: 1) палітонім, ці абазначэнне ўсёй дзяржавы – ВКЛ; 2) харонім, ці «Літва ў вузкім сэнсе» – гістарычны цэнтр дзяржавы, які складаўся з заходнебеларускіх і ўласна літоўскіх (аукштайцкіх) зямель; 3) Літва ў сэнсе этнічна балцкім.

У XVI – пачатку XVII ст. адбываюцца істотныя змены ў этнаканфесійнай самаідэнтыфікацыі эліты і Усходняй, і Заходняй Беларусі. Калі ў папярэдні час русінская самасвядомасць была непарыўна звязана з праваслаўнай традыцыяй, то ў гэту эпоху адбываецца насычэнне тэрміна «русін» этнічным зместам у поўным сэнсе гэтага слова, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі самаідэнтычнасці, сярод якіх важнейшымі становяцца мова і этнічнае паходжанне. У гэты ж час фарміруецца канцэпцыя аб існаванні некалькіх «рускіх» народаў.

Першым гістарычна вядомым нам «русінам» з такой ментальнасцю быў Францыск Скарына, які ўсведамляў сваю этнічную прыналежнасць менавіта як «рускую» па мове. Прадстаўнікамі русінскай шляхты пратэстанскага веравызнання быў Васіль Цяпінскі.

*Этнічныя працэсы ў эпоху Рэчы Паспалітай.*

Канец XVI – першая палова XVII ст. сталі часам трыумфу польскай культурнай традыцыі, польская мова і латынь станавіліся важнейшай адзнакай прыналежнасці да эліты. Існавала надзвычай эфектыўная сістэма езуіцкай адукацыі, выдавецкая дзейнасць касцёла.

У выніку масавай рэлігійнай канверсіі адбылася падвойная (ментальная і моўная) асімляцыя русінскай шляхты. З гэтага часу на субэтнічным узроўні яна пачынае адчуваць сябе літвінамі, а на дзяржаўным – сваю прыналежнасць да польскай палітычнай нацыі. Прыналежнасць эліты ВКЛ да «палітычнай нацыі» грунтавалася на адзінстве мовы, культурнай і прававой традыцыі ўсёй эліты «Польшчы». Атрымалася, што старабеларуская культурная і моўная традыцыя, традыцыі ўсходнеславянскай «далітоўскай» княжацкай дзяржаўнасці беларускіх зямель пачынаюць успрымацца акаталічанай шляхтай як «чужыя», як гісторыя блізкага, але суседняга этнасу. Гэта мела сумныя наступствы ў далейшым.

*Нацыятворчыя працэсы на землях Беларусі ў XIX – XX стст.* Далучыўшы беларускія землі, Расійская імперыя сутыкнулася з вялікімі складанасцямі ў іх

інкарпарацыі. Галоўнай з іх была паланізацыя. Традыцыі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. мусілі прывесці да стварэння новай польскай нацыі – аднароднай, размаўляючай на адной мове, уніфікаванай заканадаўча. Рэалізацыя падобнага праекта прадугледжвала ліквідацыю аўтаномнага статуса ВКЛ і абавязковую паланізацыю ўсіх жыхароў. Амаль уся высокая культура першай паловы XIX ст., створаная прадстаўнікамі мясцовай шляхты, была варыянтам польскай культуры. Людзі, якія адчувалі сваё беларускае паходжанне імкнуліся развіваць беларускую культуру, ясна ўсвядомілі, дзякуючы адукацыі, праз вывучэнне ўласнай гістарычнай традыцыі, этнаграфіі, фальклору, генеалогіі, што іх радзіма – Беларусь. Яны імкнуліся інстытуалізаваць беларускую культуру, надаць права грамадзянства беларускай мове ў пачатковай школе, праваслаўнай царкве і каталіцкім касцёле (П. Шпілеўскі, З. Даленга-Хадакоўскі і інш.).

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. працэсы паланізацыі былі прыпынены, а пасля паўстання 1863–1864 гг. дамінаванне імперскай традыцыі стала пераважнным па ўсіх накірунках. Пры гэтым «просты» беларускі люд, сяляне, русіфікацыяй былі закрануты мінімальна. Моўнай русіфікацыі перашкаджала адсутнасць земскіх школ у Беларусі і малапісьменасть большай часткі беларускага насельніцтва. Дзякуючы гэтым абставінам, мясцовая рэгіянальная ідэнтычнасць мела магчымасць развівацца у катыгорыях заходнерусізму.

*Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі.* Нацыянальная ідэя – адказ на пытанні народа: адкуль мы? Хто мы? Куды мы ідзем? Класік заходнерускай гістарыяграфіі М. Каяловіч стварае вобраз Беларусі як прыгнечанай палякамі зямлі. Яму належыць і пальма першынства ў навуковым вызначэнні тэрыторыі Беларусі, стварэнне канцэпцыі, што Беларусь «там, дзе ёсць беларуская мова».

Менавіта беларуская праваслаўная інтэлігенцыя заходнерускага кшталту сцвярджала, што этнаграфічным рабункам з’яўляюцца спробы аддаваць католікаў палякам па прычыне іх канфесійнай прыналежнасці. Агульнасць мовы, матэрыяльнай культуры, тэрыторыі, гістарычнага лёсу як нацыянальныя прыкметы беларусаў – гэта ўсё пастулявалася менавіта заходнерусамі.

У пачатку 1880-х гг. выходзяць адно за адным заклікі беларускіх народнікаў, адзін з якіх падпісаны псеўданімам «Даніла Баравік», а яшчэ адзін – «Шчыры беларус». У 1884 г. з’яўляецца часопіс «Гомон». У гэтых лістах, брашурах, часопісе прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі сцвярджаюць сам факт існавання свайго народа і яго права на дзяржаўнасць у выглядзе федэрацыі з Расіяй.

Гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі ў пачатку XX ст. стаў прыхільнікам стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Мовазнавец Яўхім Карскі, стваральнік 3-томнай працы “Беларусы”, ўвёў у навуковы дыскурс паняцце «старабеларуская мова» і “старабеларускае пісьменства”, сваёй творчасцю завяршыў этнаграфічную фазу канструявання беларускай нацыі. Важкі ўклад у працэс беларускага нацыятварэння выпала ўнесці Ф. Багушэвічу (выдаў у 1891 г. на беларускай мове зборнік вершаў “Дудка беларуская”). У 1902 г. у

Пецярбургу Браніслаў Эпімах-Шыпіла стварыў “Круг беларускай народнай прасветы і культуры”. У 1906 г. выходзяць газеты “Наша доля” і “Наша ніва”. Ідэі аб самабытнасці беларускай нацыі развіваліся ў жорсткай канфрантацыі з польскай элітай Беларусі, якая бачыла ў беларускім руху толькі расійскую інтрыгу супраць “польскасці” на “крэсах”.

Хто мы? Мы беларусы. Гэта значыць, што большая частка з нас з’яўляецца спадкаемцамі Русі Літоўскай (Белай Русі), ўсходнеславянскай русі або русінаў праваслаўнага веравызнання.

Беларускія татары, мусульмане-суніты, беларускія яўрэі-іудзеі і вялікаросы-стараверы стагоддзямі жывуць разам з этнічнымі беларусамі на адной зямлі. Мы ўсе разам перажывалі і агульнае гора, і агульную радасць, таму ўсе мы, грамадзяне Беларусі, незалежна ад расы, веравызнання і этнічнай прыналежнасці, сёння складаем ***беларускую палітычную нацыю***. Нас аб’ядноўвае агульная любоў да нашага нацыянальнага дому, агульная салідарнасць, узаемапавага і узаемадапамога, агульныя традыцыйныя маральныя каштоўнасці.

## 3. Гісторыя фарміравання асноўных этнічных груп у Беларусі

У эпоху ВКЛ асноўная частка насельніцтва сучасных зямель Беларусі складалася з праваслаўных русінаў, балтамоўных літвінаў, латышоў, палякаў, яўрэяў, татар, цыган. Гэта этнічная структура насельніцтва Беларусі працягвала існаваць, з неістотнымі зменамі, на працягу ўсяго існавання Расійскай імперыі.

***Рускія.*** У выніку рэформы патрыярха Нікана і расколу Рускай Праваслаўнай царквы ў другой палове XVII – пачатку XVIII стст. у Беларусь перасялілася некалькі дзесяткаў тысяч рускіх, якія ўтварылі тут замкнёную этнаканфесійную групу стараабраднікаў (раскольнікаў). Да канца XIX ст. колькасць рускіх склала 235 тыс. чалавек, ці 3,6 % усяго насельніцтва.

***Палякі,*** народ заходнеславянскай моўнай групы. Большасць веруючых палякаў – каталікі. Узмацненне польскага этнакультурнага ўплыву ў Беларусі адбылося пасля Люблінскай уніі 1569 г. Частка беларускага насельніцтва, асабліва прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, гарадской вярхушкі, прымаючы каталіцкую веру, змяняла сваё этнічнае самавызначэнне. Да пачатку XX ст. паланізаваную беларускую шляхту ўстойліва прылічвалі да палякаў.

***Латышы.*** Народ балцкай моўнай групы. Як асобная этнічная група на тэрыторыі Беларусі, латышы пачалі фарміравацца толькі з канца XVIII ст., перасяленнем латышскіх каланістаў на паўночна-усходнія беларускія землі. На Віцебшчыне латышы ўтваралі хутары і невялікія сельскія паселішчы, на Магілёўшчыне – пераважна вёскі. У 1897 г. найбольш значныя групы латышоў жылі ў Віцебскім (каля 4 тыс. чалавек), Полацкім (каля 1,7 тыс. чалавек), Аршанскім (да 3,7 тыс. чалавек) і Быхаўскім (каля 1 тыс. чалавек) паветах. Большасць веруючых латышоў у Беларусі былі лютэране, нязначная частка – каталікі і праваслаўныя.

***Літоўцы.*** Народ балцкай моўнай групы. Арыстакратыя літоўскага паходжання ў эпоху ВКЛ мела тэндэнцыю да абеларушвання, а з другой паловы XVII ст. – да паланізацыі. Тая ж тэндэнцыя была характэрна і для літоўскага гарадскога насельніцтва. Перад Першай сусветнай вайной толькі на ўсходзе Беларусі жыло каля 10 тыс. літоўцаў.

***Яўрэі.*** У XIV – XV стст. на тэрыторыі ВКЛ стала рассяляцца субэтнічная група яўрэяў – ***ашкеназы***. Яны размаўлялі на нямецка-яўрэйскай мове ідыш. Першыя буйныя абшчыны яўрэяў склаліся ў Берасці і Гародні. У 1560-я гг. агульная колькасць яўрэяў на тэрыторыі ВКЛ дасягала 20 тыс. чалавек, а ў 1628 г. – каля 40 тыс. У гарадах мястэчках Беларусі яны складалі да 10 % насельніцтва.[6] Асноўнай сферай іх дзейнасці стаў гандаль, фінансавыя аперацыі і рамяство.

У XVI ст. аформілася абшчынная форма яўрэйскага самакіравання – кагал. Вышэйшым іх органам былі ваады – з’езды рабінаў (духоўных кіраўнікоў веруючых абшчын) і кагальных прадстаўнікоў. У 1623–1764 гг. на чале яўрэяў ВКЛ быў Літоўскі ваад.

Пастановы соймаў Рэчы Паспалітай (1764, 1768 гг.) скасавалі шэраг ранейшых прывілеяў яўрэяў (у тым ліку права набываць шляхецтва) і ўвялі абмежавальныя меры ў сферы рамёстваў і гандлю. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі ўсе беларускія губерні былі ўключаны ў мяжу яўрэйскай аселасці.

***Татары.*** Народ цюркскай моўнай групы ва Ўсходняй Еўропе і Паўночнай Азіі. Першыя звесткі пра знаходжанне татараў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да XIV ст. У 1395 г. Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша і яго людзей, якія пасяліліся ў ваколіцах Ліды. Шмат татараў было перасалена ў ВКЛ у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў у 1397 г. (гэта дата традыцыйна лічыцца пачаткам пасялення татараў на тэрыторыі Беларусі). Татары былі размешчаны каля Вільні, у Лідскім, Ашмянскім, Навагародскім, Берасцейскім паветах, на ўмовах нясення вайсковай службы яны атрымалі зямельныя ўладанні.

У Беларусі татары пасяляліся родаплемяннымі групамі (улусамі). Татары ў ВКЛ не мелі права ўдзельнічаць у выбарах у сойм і мясцовыя соймікі, займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

У XVI – пачатку XVII ст. татары ВКЛ паступова страцілі родную мову і сталі карыстацца беларускай. На беларускай мове, але арабскім пісьмом, была створана багатая літаратура беларуска-літоўскіх татараў – кітабы (кнігі па навуцы чытання Карана), тэфсіры (кнігі-падручнікі з каментарыямі і тлумачэннямі Карана), хамаілы (малітоўнікі) і інш. У XIX ст. узнікаюць новыя цэнтры татарскага насельніцтва ў Паўночнай Беларусі – у Відзах, Докшыцах, Глыбокім, Мядзеле. Агульная колькасць татараў на беларускіх землях у 1897 г. склала 13 877 чалавек.

---

[6] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 356.

***Цыганы.*** Продкі – выхадцы з Індыі (канец І тыс. н.э.). На тэрытрыі Беларусі вылучаюцца групы так званых рускіх цыганоў (жывуць на Ўсходзе Беларусі, саманазва «руска рома», а паводле веравызнання – праваслаўныя) і беларуска-літоўскіх цыганоў (паўночна-заходняя Беларусь і памежныя раёны Літвы, саманазва «польска рома», паводле веравызнання – каталікі). У Беларусі цыганы з'явіліся ў XV ст., прывандраваўшы з Польшчы і Германіі. Славіліся як добрыя спецыялісты ў гадоўлі і вывучцы каней, высокапрафесійныя кавалі. Найбольш значным цэнтрам аселых цыганоў было мястэчка Мір, дзе яны ў другой палове XVIII ст. заснавалі суконныя, палатняныя і футравыя мануфактуры. Тут жа знаходзілася рэзідэнцыя і найбольш вядомага «цыганскага караля» (выбарны вярхоўны правіцель цыганоў, паўнамоцтвы якога падцвярджалі магнаты ці каралеўская канцылярыя) Яна Марцінкевіча.

У складзе Расійскай імперыі насельніцтва беларускіх тэрыторый заставалася шматнацыянальным. Але этнічная прыналежнасць у той час вызначалася па роднай мове, паколькі навукова абгрунтаванае паняцце нацыі ці нацыянальнай прыналежнасці значнай частцы жыхароў былі незразумелыя. Паводле данных перапісу 1897 г. у беларускіх губерніях 63,5 % ад агульнай колькасці складалі беларусы, 5,8 % – рускія, 5 % – палякі, 14,1 % – яўрэі, 11,6 % – украінцы, літоўцы, латышы і інш.[7]

## 4. Нацыянальная структура Беларусі ў 20–90-х гг. XX ст. Этнічны склад сучаснай Беларусі

Пасля Першай сусветнай вайны нацыянальная структура насельніцтва амаль не змянілася. У нацыянальнай структуры насельніцтва БССР (Усходняй Беларусі) па перапісу 1926 г. дамінавалі беларусы – 80,6 %. Жылі таксама яўрэі (8,2 %), рускія (7,7 %), палякі (2,0 %), украінцы (0,7 %), іншыя (0,8 %).

У 20-30-я гг. нацыянальныя групы ў БССР атрымалі правы на нацыянальна-культурнае будаўніцтва. У 1921 г. дэкрэтам ЦВК БССР мове ідыш быў нададзены статус дзяржаўнай разам з беларускай, рускай і польскай. Былі створаны і яўрэйскія нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – 19 местачковых і 3 сельскія саветы. Актыўна развівалася яўрэйская адукацыя і культура. Таксамі былі створаны цыганскія, латышскія, літоўскія, польскія рускія нацыянальныя сельсаветы. Аднак у канцы 1930-х гг. развіццё культуры і адукацыі на нацыянальнай мове ў Беларусі было згорнута. У Вялікую Айчынную вайну цыганы і яўрэі зведалі генацыд з боку нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

[7] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 358.

У пасляваенны час паводле перапісу 1959 г.нацыянальны склад быў наступны: беларусы – 81,1 %, рускія – 8,2 %, палякі – 6,7 %, яўрэі – 1,9 %, украінцы – 1,6 %, татары – 0,1 %, і іншыя супольнасці – 0,4 %.[8]

Апошні савецкі перапіс 1989 г. паказаў невялікія змены ў этнічнай структуры насельніцтва: зменшылаcа ўдзельная вага беларусаў, палякаў, яўрэяў, вырасла доля рускіх.

З набыццём краінай незалежнасці колькасць беларусаў у этнічнай структуры павялічылася з 77,9 % у 1989 г. да 83, 7 % у 2009 г. Колькасць рускіх істотна зменшылася, таксама скарацілася колькасць палякаў і ўкраінцаў.

*Этнічны склад сучаснай Беларусі.* Згодна з дадзенымі перапісу 2019 г. на тэрыторыі рэспублікі пражываюць прадстаўнікі больш за 140 этнасаў, 9,4 млн чалавек. Пераважную большасць насельніцтва Беларусі складаюць беларусы – 84,9 %. Найбольш шматлікімі меншасцямі з'яўляюцца прадстаўнікі тытульных нацый суседніх дзяржаў. Рускія складаюць 7,5 % насельніцтва, палякі – 3,1 %, украінцы – 1,7 %. Міграцыйныя працэсы ва Усходняй Еўропе значна паўплывалі на этнічны склад насельніцтва Беларусі.

## 5. Канфесійная гісторыя Беларусі

У старажытныя расы на беларускіх землях панавала язычніцтва. Але ў сярэднявеччы яно ўжо не адпавядала існуючым палітычным сувязям з краінамі Цэнтральнай Еўропы і Візантыяй. Распаўсюджванне хрысціянства ў гэты час звязана з палітыкай кіеўскага князя Уладзіміра. У 988 г. ён «крести же и всю землю Русскую от конца и до конца и идолы сокруши». У гарадах пачалі стварацца тэрытарыяльныя царкоўныя акругі – *епархіі* на чале з епіскапамі. Епіскапская кафедра была створана ў 992 г. у Полацку, у 1005 г. у Тураве.

З прыняццем хрысціянства на беларускіх землях з'явілісая першыя культавыя пабудовы (храмы, манастыры), адкрываліся школы, ўтварылася свая школа дойлідства, пашырылася асвета, развівалася кніжная культура.

Да канца XII ст. у Еўропе склаліся дзве рэлігійныя зоны: *праваслаўна-візантыйская і рымска-каталіцкая.* Беларусь была на памежжы двух хрысціянскіх веравызнанняў.

*Рэлігійная сітуацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім.* Вялікаму Княству Літоўскаму быў уласцівы нацыянальна-рэлігійны дуалізм. Язычніцкая Літва і праваслаўная Русь мірна суіснавалі пад уладай вялікіх князёў. Гедымін, будучы язычнікам, не перашкаджаў, як і яго папярэднікі, распаўсюджванню хрысціянства на падуладных яму землях, запрашаў каталіцкія місіі на свае тэрыторыі. Падпісанне ў 1385 г. Крэўскай уніі змяніла рэлігійную сітуацыю на беларускіх землях. Збліжэнне з Польшчай спрыяла пашырэнню каталіцтва, узмацненню сувязей з заходняй культурай. У той жа час праваслаўе ўмацоўвала свае пазіцыі на ўсходнеславянскіх (беларуска-ўкраінскіх) землях ВКЛ. Беларускія землі ўваходзілі ў склад Полацкай, Тураўскай, часткова Смаленскай

[8] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 361.

і Уладзіміра-Брэсцкай епархій. Яны былі аб’яднаны ў Кіеўскую мітраполію, падпараткаваную Канстанцінопальскаму патрыярху.

Пасля пераезду кіеўскага мітрапаліта ва Уладзімір (1299), а потым у Маскву вялікія літоўскія князі дамагаюцца ад Канстанцінопаля прызначэння асобнага мітрапаліта для сваёй дзяржавы. У 1317 г. з дазволу патрыярха была заснавана Літоўская мітраполія з рэзідэнцыяй у Навагародку. Ёй адпарадкоўваліся Полацкая і Тураўская епархіі. У 1415 г. Вітаўт дамогся ад епіскапаў выбару мітрапалітаў без згоды патрыярха. Яны прызначаліся вялікім князем.

Распаўсюджванне каталіцызму адбывалася пры актыўнай падтрымкі дзяржавай касцёла. Каталіцкая царква замацавалася на літоўскіх і беларускіх землях. Прывілеі для феадалаў-католікаў, асаблівы статус касцёла пагоршылі становішча праваслаўнай духоўнай іерархіі, абвастрылі этнарэлігійныя адносіны. У канцы XV – першай палове XVI ст. былі прыняты дзяржаўныя акты аб замацаванні правоў і прывілеяў праваслаўнай царквы. У гэты час захоўвалася раўнавага праваслаўя і каталіцтва.

Пераемнкікі Аляксандра Жыгімонт I Стары і Жыгімонт II Аўгуст падтрымалі рэлігійную талерантнасць у Вялікім Княстве Літоўскім. У дзяржаве з’явілася каля 90 новых праваслаўных храмаў. У 1563 г. Жыгімонт II выдаў прывілей, які адмяняў усе абмежаванні на рэлігійнай глебе. Верацярпімасць стварыла спрыяльную глебу для распаўсюджвання гуманістычных ідэй і Рэфармацыі.

У першай палове XVI ст. *Рэфармацыя* ахапіла большасць краін Еўропы, у тым ліку Польшу. Рэфармацыя на тэрыторыі Беларусі развівалася ў рэчышчы еўрапейскага руху. У адрозненне ад заходнееўрапейскай яна развівалася тут на феадальнай аснове і мела іншую сацыяльную базу. У рэфармацыйны рух былі ўцягнуты магнаты, частка дробнай і сярэдняй шляхты. Асноўнымі рэфармацыйнымі плынямі ў Вялікім Княстве Літоўскім былі кальвінізм, лютэранства, антытрынітарызм. Актывізацыя радыкальнага накірунку ў Рэфармацыі назіраецца ў другой палове XVI ст. У рэлігійных дыскусіях прынялі актыўны ўдзел беларускія асветнікі Сымон Будны (1530–1593), Васіль Цяпінскі (1530–1603).

У адказ каталіцка царква распачала палітыку контррэфармацыі, скарыстаўшы для гэтага новую царкоўную стратэгію. Ствараліся навучальныя ўстановы, якія рыхтавалі місіянераў, рэфармаваліся і ствараліся новыя манаскія ордэны, сярод якіх вылучаўся ордэн езуітаў «Таварыства Ісуса» (1534). На землях ВКЛ першыя езуіты з’явіліся ў 1569 г. Яны былі запрошаны віленскім біскупам. У апошняй трэці XVI ст. пазіцыі каталіцтва значна ўзмацніліся. Кароль Стэфан Баторый, магнатэрыя подтрымалі дзейнасць езуітаў: ахвяравалі землі і грошы, дапамагалі ў адкрыцці навучальных устаноў, шпіталяў, аптэк. Каталіцтва набывала ўсё больш прыхільнікаў не толькі сярод шляхты, якая раней падтрымлівала пратэстанцтва, але і праваслаўных магнатаў.

Падзеі другой палавіны XVI ст. змянілі геапалітычнае становішча Княства. Лівонская вайна, якая прынесла велізарныя страты, падштурхнула эліту ВКЛ

да падпісання Люблінскай уніі (1569). Новае дзяржаўнае ўтварэнне – Рэч Паспалітая – аддавала перавагу каталіцкаму кліру ў фарміраванні адзінай дзяржаўнай веры насельніцтва. У гэтых умовах адрадзілася ідэя царкоўнай ўніі. Гэту лінію актыўна падтрымліваў Ватыкан, які бачыў актывізацыю дзейнасці заснаванага ў 1589 г. Маскоўскага патрыярхату. Кіраўнікі ВКЛ разлічвалі на стварэнне незалежнай ад Масквы царквы. 6–9 кастрычніка 1596 г. Брэсцкі царкоўны сабор аформіў уніяцкую царкву. Праціўнікі ўніі правялі ў Брэсце альтэрнатыўны сабор, на якім адлучылі арганізатараў уніі ад праваслаўнай царквы. Па краіне пракацілася хваля выступленняў праваслаўнага духавенства.

Нацыянальна-рэлігійная канфрантацыя абвастрылася ў першай палове XVII ст. Насаджэнне ўніяцтва прывяло да народных паўстанняў (расправа з уніяцкім архіепіскапам І. Кунцэвічам у Віцебску). Урад Рэчы Паспалітай у 1633 г. афіцыйна прызнаў праваслаўную царкву, што знізіла канфесійную напружанасць у грамадстве. У другой палове XVII ст. на тэрыторыі Рэчы Паспалітай католікі складалі 43 % насельніцтва, уніяты – 33 %, праваслаўныя – 10%, іудзеі – 9 %, іншыя – 5 %.[9]

Пракаталіцкая дзяржаўная палітыка прывяла ў XVIII ст. да значнага скарачэння праваслаўных і пратэстанцкіх прыходаў. Цэнтрам праваслаўя была Магілёўская епархія. Дыскрымінацыйная рэлігійная палітыка ўлад Рэчы Паспалітай ужо ў канцы XVII ст. стварыла так званае «дысідэнцкае пытанне». У XVIII ст. яно набыло міжнародны характар. У абарону аднаверцаў (праваслаўных, пратэстантаў) уключыліся замежныя краіны (Расія, Прусія, Швецыя), якія будуць доўгі час выкарыстоўваць дысідэнцкае пытанне ў вырашэнні сваіх геапалітычных задач.

*У эпоху Расійскай імперыі.* Стратэгічным кірункам канфесійнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі на працягу XIX ст. стала ўпарадкаванне структур хрысціянскіх і нехрысціянскіх канфесій, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі, і стварэнне механізма кіравання імі па ўзору праваслаўнай царквы. Да сярэдзіны 20-х гг. XIX ст. фактычна праводзілася палітыка неўмяшання ва ўнутрыцаркоўныя справы. Параўнальна шырокай свабодай у гэты час карысталіся каталіцтва і пратэстантызм. У 1810 г. было створана Галоўнае ўпраўленне духоўных спраў замежных веравызнанняў, да кампетэнцыі якога былі аднесены каталіцтва, іўдаізм і іслам. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі да 1820 г., пакуль афіцыйна не былі забаронены, дзейнічалі езуіцкія місіі. У 1812 г. статус акадэміі атрымала Полацкая езуіцкая калегія. Сітуацыя змянілася ў перыяд праўлення імператара Мікалая І, які шукаў апору ў праваслаўнай царкве і палітыку павернуў у кірунку больш жорсткага кіравання неправаслаўнымі хрысціянскімі канфесіямі.

Асаблівы клопат у першай палове XIX ст. выклікала выпрацоўка мерапрыемстваў у дачыненні ўніяцкай царквы. Узмацненне ўплыву каталіцызму на яе дзейнасць прывяло да спроб рэфармавання, выпрацоўкі

[9] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с. – С. 367.

мерапрыемстваў па звужэнні сферы ўплыву ўніяцтва. У 1839 г. адбыўся Полацкі царкоўны сабор, на якім на тэрыторыі Расійскай імперыі была скасавана ўніяцкая царква. Уніяцкія епархіі былі далучаны да праваслаўнай царквы. Больш 1,6 млн уніятаў, 1500 святароў перайшлі ў асноўную для дзяржавы канфесію.

Канфесійны склад насельніцтва Беларусі, нягледзячы на ўніфікацыйныя мерапрыемствы ўрада Расійскай імперыі і пашырэнне ўплыву праваслаўнай царквы, вызначаўся стракатасцю. У канцы 50-х гг. ХІХ ст. 58,1 % насельніцтва беларускіх губерняў былі праваслаўнымі, 29,9 % – каталікамі, 9,8 % – іўдзеямі, 1,6 % – стараверамі, 0,4 % – пратэстантамі, 0,1 % – мусульманамі.

Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. прымаўся шэраг мер па ўстанаўленні больш жорсткага кантролю за каталіцкім духавенствам і манастырамі ў заходніх губернях. У той жа час асаблівая ўвага ва ўрадавай палітыцы на тэрыторыі заходніх губерняў надавалася павелічэнню колькасці праваслаўных храмаў. На ўсёй тэрыторыі Беларусі будаваліся і рамантаваліся праваслаўныя цэрквы, пераводзіліся з унутраных губерняў святары.

Адным з кірункаў канфесійнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі стала ўвядзенне абмежаванняў у дачыненні да яўрэяў (іўдзеяў). У 1792 г. была усталявана мяжа аселасці яўрэяў, якая прадугледжвала для іх абмежаванне магчымасці вольнага перамяшчэння і выбару месца жыхарства па-за межамі вызначаных заходніх губерняў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі і Царства Польскага. У 1864 г. яўрэі ў межах мяжы аселасці былі пазбаўлены права набываць зямлю. Яўрэі, якія прымалі хрысціянства, таксама ва ўмовах Расійскай імперыі пазбаўляліся многіх негатыўных момантаў сваёй прыналежнасці да іншародцаў.

Пасля паўстання 1863–1864 гг. былі накладзены таксама абмежаванні на свабоду перамяшчэнняў ксяндзоў. Яны масава пераходзілі ў праваслаўе, аднак пазней такая практыка ў значных памерах ужо не прымянялася.

У пачатку ХХ ст. былі зроблены асобныя паслабленні ў функцыянаванні рэжыму абмежавальных законаў у дачыненні да яўрэяў і католікаў, але ён не быў скасаваны. У красавіку 1905 г. імператар Мікалай ІІ выдаў Указ аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці, дзе на заканадаўчым узроўні сцвярджалася права на свабоду веравызнання для асоб неправаслаўнай канфесіянальнай прыналежнасці. Указам былі адменены існаваўшыя забароны і абмежаванні ў дачыненні неправаслаўных хрысціянскіх канфесій, легалізаваны стараверы.

*Канфесійная палітыка ў БССР у 1920–1930-я гг.* У БССР, як і ва ўсім СССР, вялася татальная барацьба з рэлігіяй і царквой. Ідэалагічную аснову гэтай палітыкі склалі творы заснавальнікаў камуністычнай ідэалогіі К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна, пастановы ЦК УКП(б), а заканадаўчую – дэкрэты СНК Расійскай Федэрацыі і БССР, пастановы, інструкцыі дзяржаўных органаў СССР.

У 1920–1930-я гг. праводзілася маштабная кампанія па закрыцці культавых устаноў і выкарыстанні іх у «народнагаспадарчых і культурна-

асветных мэтах» – пад склады, кінатэатры, клубы. Адным са сродкаў барацьбы з рэлігіяй была масавая атэістычная прапаганда. З 1925 г. дзейнічаў Саюз Ваяўнічых Бязбожнікаў (СВБ). У пачатку 1930-х гг. савецкая дзяржава пачала новую маштабную кампанію па барацьбе з рэлігіяй. У 1932 г. планавалася закрыццё навучальных устаноў па падрыхтоўцы духавенства, у 1933 г. – ліквідацыя манастыроў і забарона рэлігійнай літаратуры, у 1934 г. – высылка духавенства, у 1935 г. – пераабсталяванне храмаў пад савецкія ўстановы, у 1936–1937 гг. – замацаванне дасягнутых поспехаў і святкаванне канчатковай перамогі атэізму.

У сярэдзіне 1920-х гг. на тэрыторыі БССР дзейнічалі дзве каталіцкія дыяцэзіі – Мінская і Магілёўская. Яны падпарадкоўваліся Варшаўскаму архіепіскапу. Назіралася актывізацыя пратэстанцкіх абшчын. У Беларусі пражывала значная колькасць прадстаўнікоў іўдзейскай канфесіі. Барацьба з іўдаізмам пачалася з катэгарычнай забароны на арганізаванае выхаванне дзяцей. Першымі крокамі былі ліквідацыя пачатковых школ пры сінагогах і рэлігійных установах.

*Канфесійная сітуацыя ў Заходняй Беларусі ў часы польскай акупацыі (1921–1939 гг.).* Заходняя Беларусь характарызавалася высокім узроўнем рэлігійнасці насельніцтва. У першай Канстытуцыі ІІ Рэчы Паспалітай Польскай, прынятай 17 сакавіка 1921 г., у артыкулах 110–116, 120 вызначаліся правы і магчымасці развіцця нацыянальных меншасцей, гарантавалася «поўная ахова і свабоднае адпраўленне рэлігійных культаў, роўнасць у грамадскіх і палітычных правах» усім жыхарам Польшчы незалежна ад рэлігіі, нацыянальнасці, колеру скуры, мовы. Аднак артыкул 114 прызнаваў *першынство каталіцкай веры*, адзначаючы, што сярод усіх роўных першай з'яўляецца каталіцкая вера, і што важнейшыя пасады могуць займаць толькі асобы каталіцкага веравызнання. У дзяржаўных установах, на пошце, на чыгунцы маглі працаваць толькі католікі. Канстытуцыя 1935 г. паўтарала асноўныя палажэнні ў пытаннях веравызнання Закон тым самым замацаваў дамінуючае становішча каталіцызму ў Заходняй Беларусі.

Найважнейшай і неадкладнай задачай канфесійнай палітыкі польскага ўрада было адмежаванне праваслаўнай царквы ад уплыву Маскоўскай патрыярхіі. У гэтым дзяржава знайшла прыхільнікаў у асобе некаторых праваслаўных епіскапаў. 14 чэрвеня 1922 г. на саборы епіскапаў у Варшаве было прынята рашэнне аб *аўтакефаліі* праваслаўнай царквы ў Польшчы. 17 верасня 1925 г. Сінод епіскапаў урачыста абвясціў праваслаўную царкву ў Польшчы аўтакефальнай. Тым не менш праваслаўная царква ўвесь перыяд складала для польскага ўрада пэўную праблему, бо замінала працэсам асіміляцыі беларускага насельніцтва, ператварэння яго ў палякаў. У канцы 1935 г. быў створаны Камітэт па нацыянальных справах, які займаўся рэгуляваннем юрыдычнага статусу праваслаўнай царквы. Сярод важнейшых былі вызначаны праблемы дэрусіфікацыі, барацьба з беларускім і ўкраінскім рухам, выключэнне рускай мовы з выкладання рэлігіі ў школах, пропаведзей у цэрквах. Што датычыць розных пратэстанцкіх арганізацый, а таксама

іўдзейскіх і мусульманскіх, то ўрадавая палітыка і не стрымлівала іх дзейнасці, і не садзейнічала ўмацаванню іх пазіцый.

Адной са складаных праблем для праваслаўнай царквы была *рэвіндыкацыя* – працэс перадачы каталіцкаму касцёлу культавых будынкаў, зямель, іншай рухомай і нерухомай маёмасці, што да 1793–1839 гг. належала ўніятам, але была адпісана царскім урадам праваслаўнай царкве.

Польскія ўлады імкнуліся ператварыць праваслаўе ў інструмент паланізацыі, але ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд аформіўся рух за беларусізацыю праваслаўнай царквы.

У пачатку 1930-х гг. цэнтрам неапратэстанцкага руху у Заходняй Беларусі з’яўлялася Палескае ваяводства. У 1920-я гг. на землях Заходняй Беларусі і Украіны па рашэнні Папы Пія XI адбывалася аднаўленне касцёла ўсходне-славянскага (візантыйска-славянскага) абраду, або *неауніі*, але гэта не атрымала масавай падтрымкі нават сярод былых уніятаў.

Сярод нехрысціянскіх веравызнанняў налічвалася найбольш яўрэйскіх абшчын. На тэрыторыі Заходняй Беларусі існавалі нешматлікія групы стараабрадцаў, мусульман і караімаў.

*Канфесійная палітыка Савецкай улады ў Заходняй Беларусі (1939–1941 гг.).* У адрозненне ад усходніх абласцей, дзе барацьба з рэлігіяй прывяла да амаль поўнага знішчэння рэлігійнага жыцця, у заходніх абласцях гэтага не адбылося. З лістапада 1939 г. уводзілася савецкае заканадаўства аб рэлігійных культах. Вясной 1940 г. былі ўведзены ўстановы ЗАГС, якія пераняли ад касцёлаў і цэркваў метрычныя кнігі, а таксама рэгістрацыю нараджэнняў, пахаванняў і шлюбаў. Забаранялася дзейнасць усіх рэлігійных арганізацый, якія існавалі ў міжваенны перыяд, выкладанне рэлігіі ў школах, а духавенству – з’яўляцца ў бальніцах і дамах грамадскай апекі (састарэлых, інвалідаў) для аказання пастырскіх паслуг. Былі нацыяналізаваны ўсе будынкі, якія належалі цэрквам, касцёлам, манастырам, сінагогам. Аднак у барацьбе з рэлігіяй савецкая ўлада надавала ў першую чаргу значэнне не рэпрэсіўным, а ідэалагічным і прапагандысцкім мерам.

*Канфесійная палітыка гітлераўцаў у акупіраванай Беларусі (1941–1944 гг).* Адносіны немцаў да праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай цэркваў залежалі ад таго, наколькі дзейнасць канфесій можа быць выкарыстана для рэалізацыі планаў акупацыйнай палітыкі. У заходніх абласцях БССР, дзе быў большы ўплыў каталіцызму, адносіны немцаў да касцёла былі больш жорсткімі. Тут мелі месца рэпрэсіі ў дачыненні да духавенства – расстрэлы і абмежаванні яго дзейнасці. У акрузе Беларутэнія пры пасрэдніцтве гаўляйтэра Вільгельма фон Кубэ беларускімі нацыяналістамі-калабарантамі рабіліся спробы абвяшчэння аўтакефаліі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла, а таксама выкарыстанння беларускай мовы ў набажэнствах. Але ў кожным выпадку галоўная мэта акупацыйнай улады была адна – адгарадзіць царкву ад уплыву Маскоўскай Патрыярхіі, а касцёл – ад Ватыкана.

У верасні 1942 г. у Мінскім Спаса-Прэабражэнскім манастыры адбыўся сабор духавенства, інспіраваны нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, на якім

было абвешчана аб устанаўленні аўтакефаліі Беларускай праваслаўнай царквы і аддзяленні яе ад Маскоўскай Патрыярхіі. Але кананічнага прызнання ні з боку Памесных цэркваў, ні большасці духавенства і веруючых Беларусі яна не атрымала.

Значная частка праваслаўнага духавенства не прыняла акупацыйны рэжым, маральна і матэрыяльна дапамагала савецкім партызанам і падпольшчыкам, воінам Чырвонай Арміі. Святчэннікі забяспечвалі партызан прадуктамі, медыкаментамі, хавалі параненых, выдавалі неабходныя спраўкі аб тым, напрыклад, што падазроныя мясцовыя жыхары з'яўляюцца людзьмі глыбока веруючымі і нібыта не маюць да партызан ніякага дачынення. Духавенства, якое было западозрана ў антынацысцкім супраціўленні, жорстка каралі – палілі храмы, рабавалі царкоўную маёмасць.

*Канфесійная палітыка ў БССР у 1944 – 1991 гг.* 29 мая 1944 г. пастановай СНК СССР № 625 зацвярджалася «Палажэнне аб Савеце па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР». Уладныя структуры прымалі розныя меры для абмежавання дзейнасці канфесій, іх уплыву на насельніцтва.

Да Рускай праваслаўнай царквы савецкі ўрад праяўляў своеасаблівую лаяльнасць, ствараючы некаторыя магчымасці для царкоўнага адраджэння і пашырэння яе ўплыву. Па-ранейшаму захоўвалася негатыўнае стаўленне да каталіцкага касцёла і пратэстантаў. На Усесаюзнай нарадзе Упаўнаважаных Савета па справах рэлігійных культаў (Масква, 20 мая 1945 г.) была агучана ацэнка дзейнасці канфесій у гады Вялікай Айчыннай вайны, іх адносін з акупацыйнымі ўладамі, уклада ў барацьбу з акупантамі.

Важным напрамкам савецкай канфесійнай палітыкі была прапаганда атэізму партыйнымі, савецкімі, камсамольскімі і іншымі арганізацыямі. Пры Хрушчове ў 1954 г. палітыка «прымірэнства» была асуджана. У наступныя дзесяцігоддзі атэістычную прапаганду разглядалі як важны напрамак ідэалагічнай работы.

Перабудова, якая праводзілася ў 1985–1990 гг. у СССР і БССР, спыніла ганенні на праваслаўную і іншыя цэрквы. Распачалося адкрыццё прыходаў, веруючым вярталіся царкоўныя будынкі. У 1988 г. у Беларусі шырока адзначалася 1000-годдзе Хрышчэння Русі. У 1989 г. быў створаны Беларускі Экзархат Маскоўскага Патрыярхату (Беларуская праваслаўная царква) на чале з Мінскім мітрапалітам Філарэтам (Вахрамеевым).

### 6. Канфесійны склад насельніцтва Рэспублікі Беларусь. Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў канфесійнай сферы

Рэспубліка Беларусь – шматканфесійная дзяржава, у якой зарэгістравана 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў. Агульная колькасць рэлігійных арганізацый на 1 студзеня 2023 г. – 3417.

Вядучае месца ў рэлігійным жыцці краіны займае Беларуская праваслаўная царква, якая аб'ядноўвае больш чым 1700 праваслаўных прыходаў, 15 епархій, 6 духоўных навучальных устаноў, 36 манастыроў, 1

місію. З 2014 г. дзейнічае Духоўна-адміністрацыйны цэнтр – Мінская Экзархія, які ўключае сінодскія аддзелы і камісіі.

Рымска-каталіцкая царква ў Рэспубліцы Беларусь аб’ядноўвае 4 епархіі, якая налічваюць каля 500 парафій. Дзейнічае 6 духоўных навучальных устаноў, 11 місій і 9 манастыроў, 16 каталіцкіх абъяднанняў.

У Беларусі больш як 1 тыс. пратэстанцкіх рэлігійных арганізацый, 34абшчыны старавераў, 3 іудзейскія рэлігійныя аб’яднанні, 24 мусульманскія рэлігійныя супольнасці. У 2015 г. зарэгістравана будысцкае таварыства ў г. Мінску “Шен Чен Линг” традыцыі Бон.

Канфесіянальная палітыка дзяржавы накіравана на падтрыманне і ўмацаванне міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі, у першую чаргу з Беларускай праваслаўнай царквой. Ва ўзаемаадносінах з рэлігійнымі арганізацыямі дзяржава кіруецца заканадаўча замацаваным прынцыпам роўнасці рэлігій перад законам і ўлічвае іх уплыў на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

У адпаведнасці з артыкулам 31 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожны мае права самастойна вызначаць сваё дачыненне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай, выказваць і распаўсюджваць перакананні, звязаныя з дачыненнем да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Артыкул 4 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” гарантуе права кожнага на свабоду выбару атэістычных або рэлігійных перакананняў, а менавіта: самастойна вызначаць сваё дачыненне да рэлігіі, аднаасобна або сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію або не спавядаць ніякай. Акрамя гэтага, у адпаведнасці з артыкулам 5 указанага Закона кожны мае права свабодна выбіраць, мець, мяняць, выказваць і распаўсюджваць рэлігійныя перакананні і згодна з імі дзейнічаць, удзельнічаць у адпраўленні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам. Пры гэтым ніхто не абавязаны паведамляць аб сваім дачыненні да рэлігіі і не можа падвяргацца якому-небудзь прымусу пры вызначэнні свайго дачынення да рэлігіі або няўдзелу ў дзейнасці рэлігійных арганізацый.

У адпаведнасці з часткай 3 артыкула 16 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь забараняецца дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды або звязана з парушэннем праў і свабод грамадзян, а таксама перашкаджае выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў або наносіць шкоду іх здароўю і маральнасці. Канстытуцыя краіны і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» устанаўліваюць роўнасць усіх рэлігій і веравызнанняў перад законам. У адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам рэлігійныя арганізацыі падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі.

## *Лекцыя 14.* Дзяржаўныя сімвалы Беларусі

### 1. Гістарычная сімволіка на беларускіх землях

Беларускія землі са старажытных часоў мелі сваю сістэму сімвалаў і знакаў. У цэлым яна супадала з агульнаўсходнеславянскім сімвалічным значэннем светабудовы.

Першы афіцыйны сімвал – графічны друк князя Ізяслава Полацкага, сына вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча быў выяўлены ў 1954 г. Уяўляе сабой пячатку на свінцовай пласціне – варыянт знака Рурыкавічаў (трызубец з крыжом наверсе і надпісам на старажытнарускай мове “Ізяслаў”).

Як дзяржаўны сімвал Полацкай зямлі з пачатку 80-х гг. XIV ст. выкарыстоўвалася выява ідучага льва, з лілеяй над ім. Лілея – сімвал Багародзіцы. Леў, як вядома, быў універсальным сімвалам Русі. Леў метафарычна ўвасабляў выяву Хрыста-Пераможцы, “Хрыста ў славе”.

Паступова, з утварэннем Вялікага княства Літоўскага, стаў распаўсюджвацца новы герб – Пагоня. Варта адзначыць, што выкарыстанне ўзброенага вершніка ў якасці эмблемы было шырока распаўсюджана ў Еўропе і сустракаецца задоўга да зўяўлення герба часоў ВКЛ.

У перыяд развіцця геральдыкі ў ВКЛ вершнік стаў асновай дынастычнага герба Гедымінавічаў. Самая ранняя вядомая выява вершніка на пячатках Гедымінавічаў належыць Нарымонту (сыну Гедыміна), князю полацкаму. Захавалася яго пячатка на дакуменце 1338 г.

Найбольш скончаны выгляд вершніка з занесеным над галавой мячом, з’яўляецца на пячатцы Ягайлы 1380 г. З хрышчэннем Ягайлы ў 1386 г. у яго вершніку з’явіўся шчыт з падвойным крыжом, хутчэй за ўсё ён сімвалізаваў хрышчэнне.

Пачынаючы з Вітаўта, вершнік з мячом становіцца асноўным сімвалам дзяржавы. Замест ранейшага атаясамлення “рыцара са зброяй” з асобай вялікага князя яго пачынаюць разумець, як сімвал абаронцы Айчыны. Пры гэтым герб Пагоні ўспрымаўся не толькі як палітычны атрыбут улады, але і як сакральны сімвал, адзін з варыянтаў выявы Георгія Перамаганосца.

Герб ВКЛ доўгі час не меў імя. Назва “Пагоня” з’явілася ў канцы XV – пачатку XVI ст. Першым гербу імя Пагоня даў польскі храніст Марцін Бельскі ў 1551 г. Варта адзначыць, што храніст няправільна зразумеў герб, угледзеўшы ў ім пераследніка, які скакаў услед за ворагам. Ва ўсіх выявах XV – XVI стст. (як і ў большасці пазнейшых) вершнік і конь знаходзяцца ў становішчы абароны – сустрэчнага кантрудара, адпаведна трымаецца і меч. Гэта цалкам адпавядае ідэі абаронцы, выяўленай у легендах і хроніках ВКЛ. Аднак імя герба хутка набыло папулярнасць і замацавалася, г. зн. Бельскі абапіраўся на ўжо існавалае тлумачэнне сімволікі герба.

Пасля далучэння беларускіх земляў да Расійскай Імперыі “Пагоня” працягвае выкарыстоўвацца на працягу некаторага часу, разам з гербам Маскоўскай Русі – двухгаловым арлом, у дзяржаўных дакументах. Пагоня стала

сімвалам далучаных земляў і замацавалася на гербах гарадоў Вільні, Полацка, Віцебска і адпаведных губерняў.

У пачатку XX ст. у беларусаў не было сваёй агульнапрызнанай сімволікі. У якасці сімвалічнага абазначэння выкарыстоўваліся нацыянальныя ўпрыгожанні і ўборы.

Найстарэйшы праект беларускага дзяржаўнага сцяга стварыў беларускі архітэктар, прадстаўнік беларускага руху, выхадзец з мсціслаўскага дваранства, Лявон Вітон-Дубейкоўскі. У 1916 г. ён зрабіў накід флага, выкарыстоўваючы традыцыйныя славянскія колеры – сіні, чырвоны і белы.

25 сакавіка 1917 г. у Менску сабраўся З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. У якасці сімвала Белай Русі быў вывешаны белы флаг. Але дэлегаты з'езда, убачыўшы ў белым сцягу сімвал контррэвалюцыі ці капітуляцыі, прапанавалі дадаць у яго чырвоны колер.

У 1917 г. перад Усебеларускім з'ездам быў аб'яўлены конкурс на флаг. Перамог архітэктар і журналіст Дуж-Душэўскі, які распрацаваў праект бел-чырвона-белага сцяга. Пад гэтым сцягам у снежні 1917 г. у г. Мінску праходзіў Першы Усебеларускі з'езд. Трэба прызнаць, што бел-чырвона-белы сцяг – гэта першы ў гісторыі Беларусі сцяг, пад якім удзельнікі Усебеларускага з'езда заявілі пра сябе як беларусы. Але назваць названы сцяг нацыянальным нельга, бо ён быў прыняты толькі ўдзельнікамі з'езда і пераважнай колькасці беларусаў быў зусім невядомы. Пры гэтым нараўне з бел-чырвона-белым сцягам на Усебеларускім з'ездзе выкарыстоўваўся і чырвоны сцяг – партыйны сцяг Беларускай сацыялістычнай грамады.

Бел-чырвона-белы сцяг быў абвешчаны сцягам БНР. У той жа час адрадзілася ідэя выкарыстання старажытнай Пагоні ў якасці герба БНР. Выява "Пагоні" змяшчалася на пячатках розных установаў БНР. Фактычна бел-чырвона-белы сьцяг БНР стаў сцягам прагерманскіх, а не нацыянальных сілаў у Беларусі.

Бел-чырвона-белы сцяг выкарыстоўвала Рускае народна-добраахвотніцкае войска Булак-Балаховіча, створанае на польскія сродкі. Захапіўшы на Палессі шэраг раёнаў, Булак-Балаховіч "праславіў" бел-чырвона-белы сцяг не дасягненнямі нацыянальнага адраджэння, а рабаваннем, гвалтам і жахлівымі яўрэйскімі пагромамі.

Бел-чырвона-белы сцяг таксама быў дыскрэдытаваны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Калабарацыяністы стварылі прагерманскія арганізацыі, якім нацысцкі рэжым дазволіў выкарыстоўваць бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоню". Пры гэтым ніводзін партызанскі атрад не змагаўся з акупантамі пад бел-чырвона-белы сцягам.

У сілу пэўных палітычных прычын бел-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня" сталі дзяржаўнымі сімваламі ў верасні 1991 г. Аднак па выніках рэферэндуму, які адбыўся 14 мая 1995 г., былі прыняты беларускім народам новыя дзяржаўныя сімвалы. Зараз бел-чырвона-белы сцяг з'яўляецца сімвалам апазіцыі.

Першым дзяржаўным сцягам Савецкай Беларусі стаў чырвоны сцяг з ініцыяламі ССРБ. Варта заўважыць, што дзяржаўны сцяг Савецкай Беларусі мяняўся яшчэ некалькі разоў. Толькі ў 1951 г. у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы з'явіўся чырвона-зялёны сцяг з белым нацыянальным арнаментам. Праект названага дзяржаўнага сцяга БССР распрацаваў мастак Мікалай Гусеў.

Першы герб Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь нічым не адрозніваўся ад герба Беларускай ССР, акрамя надпісу на стужках. Узнікненне СССР у 1922 г. спарадзіла ініцыятыву пошуку новага герба нашай рэспублікі. Работы праводзіліся з канца лютага 1924 г. па 11 сакавіка 1927 г. На VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў быў зацверджаны новы герб БССР (праект мастака В. Волкава пасля ўнясення паправак).

У жніўні 1938 г. быў зацверджаны новы варыянт герба БССР, які праіснаваў да распаду СССР.

Дзяржаўны гімн Беларускай ССР створаны ў 1944 г. Музыка *Нестара Сакалоўскага*, словы *Міхаіла Клімковіча*. Быў нацыянальным гімнам у 1955–1991 гг. Затым да 2002 г. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь выконваўся без слоў.

## 2. Дзяржаўныя сцяг, герб, гімн Рэспублікі Беларусь

Па выніках рэфернтдума 14 мая 1995 г. былі прыняты сучасныя Дзяржаўны герб і сцяг Рэспублікі Беларусь. Да 2023 г. некалькі разоў уносіліся некаторыя карэктывы.

***Дзяржаўны сцяг*** Рэспублікі Беларусь мае від прамавугольнага палатна, шырыня і даўжыня якога суадносяцца як 1:2. Яно падзелена па гарызанталі на дзве розныя па велічыні паласы: зялёную знізу, 1/3 шырыні і чырвоную зверху, 2/3 шырыні. Уздоўж дрэўка размешчана вертыкальная арнаментная паласа чырвонага колеру на белым фоне – сімвал сувязі пакаленняў.

Лічыцца, што ў аснове арнаменту на сцягу ляжыць узор "Узыходзячае сонца", вытканы ў 1917 г. Матронай Маркевіч. Адзначым, што бела-чырвоныя колеры традыцыйныя ў культуры беларусаў.

Колеры прынята чытаць так.

1. Чырвоны колер здаўна сімвалізуе сонца. Разам з тым – гэта колер сцягоў Чырвонай арміі, кроў салдат і партызан, якія вызвалілі нашы землі ад нацыскіх захопнікаў, ён увасабляе подзвіг беларускага народа; сімвал сілы, адвагі, кахання.

2. Зялёны – сімвал свабоды, радасці і здароўя, надзеі і працвітання, увасабленне прыроды краіны – лясных багаццяў, палёў, веры ў яе невычэрпную сілу.

3. Белы колер сымалізуе духоўную чысціню і гасціннасць беларусаў.

Што да арнаменту, то ён сімалізуе нацыянальны характар, духоўную чысціню беларусаў.

У цэнтры ўзору знаходзіцца вертыкальна выцягнуты ромб – старажытны сімвал узыходзячага сонца; увасабленне ідэі ўрадлівасці зямлі. У цэнтры

асноўнага ромба – дзве лініі, якія перасякаюцца, з чатырма кропкамі паміж імі (сімвалізуюць засеянае поле; чароўнае пажаданне спрыяльнага развіцця падзей). Парныя ромбы ўверсе і ўнізе арнаменту сімвалізуюць ідэю працягу жыцця, аднаўлення хлеба. Паміж імі і цэнтральнай фігурай размешчаны лініі з чатырох прастакутнікаў з рысачкамі, якія адыходзяць ва ўсе бакі – ідэя дабра, надзеі на лепшае, пажаданне ўрадлівасці і будучыні дабрабыту; усё, што просіць чалавек, каб спраўдзілася.

Сучасны Дзяржаўны сцяг Беларусі з’яўляецца прыемнікам Дзяржаўнага флага БССР 1951 г. Але трэба адзначыць, што калі на савецкім сцягу арнамент быў белым на чырвоным фоне, то на цяперашнім – арнамент чырвонага колеру на белым фоне.

***Дзяржаўны герб*** Рэспублікі Беларусь з’яўляецца сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Ён уяўляе сабой размешчаны на сярэбраным полі залаты контур Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, накладзены на залатыя промні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Уверсе поля знаходзіцца пяціканцовая чырвоная зорка. Герб апраўлены вянком з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева – кветкамі лёну. Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай, у сярэдняй частцы якой у падставе Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь у два радкі напісаны золатам словы “Рэспубліка Беларусь”.

Зямны шар – гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў. Саюз Зямлі і Сонца – галоўны знак жыцця. Чырвоная зорка – сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх намераў. Залаты контур Беларусі ў залатых промнях сонца дэманструе, што краіна шчаслівая і напоўнена дабрабытам. У малюнку герба захаваны галоўныя нацыянальныя і духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянская еднасць, праца, любоў да свету.

Герб нашай краіны – адзін з нямногіх, на якім намаляваны контур дзяржавы. Яго з’яўленне не выпадковае і сведчыць аб непахіснасці межаў, суверэнітэце, незалежнасці Беларусі.

Выява Дзяржаўнага герба размяшчаецца на будынках органаў улады і шэрагу дзяржаўных устаноў, унутры службовых кабінетаў іх кіраўнікоў, а таксама на пячатках гэтых органаў, на манетах, пашпартах грамадзян Рэспублікі Беларусь. У адрозненне ад Дзяржаўнага флага, Дзяржаўны герб мае больш афіцыйнае значэнне, таму не прадугледжваецца магчымасць яго свабоднага выкарыстання грамадзянамі. У прыватнасці, забараняецца яго размяшчэнне на візітных картках асоб, якія не з’яўляюцца дзяржаўнымі служачымі.

***Дзяржаўны гімн*** Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой музычна-паэтычны твор, які выконваецца ва ўрачыстых выпадках, пералік якіх замацоўваецца ў заканадаўстве. Дзяржаўны гімн аб'ядноўвае людзей краіны ў адзіны народ. Сучасны нацыянальны гімн з’яўляецца пераемнікам гімна Беларускай ССР, што з'яўляецца сімвалічным сведчаннем павагі да гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Да 2002 г. нацыянальны гімн часоў БССР выконваўся без слоў. У 2002 г., адпаведна ўказу кіраўніка дзяржавы, быў праведзены конкурс на стварэнне тэксту і музыкі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Усе прадстаўленыя на конкурс варыянты дзяржаўнага гімна трансляваліся 6–9 чэрвеня 2002 г. па беларускім тэлебачанні і радыё, каб грамадзяне краіны маглі зрабіць свой выбар. У грамадстве адбылося актыўнае і зацікаўленае абмеркаванне новай дзяржаўнай ініцыятывы. А пяць конкурсных тэкстаў гімна былі апублікаваны ў газеце "Советская Белоруссия" 7 чэрвеня 2002 г. Грамадзяне рэспублікі галасавалі па тэлефоне, а таксама лістамі і тэлеграмамі ў Міністэрства інфармацыі. Удзел у гэтай беспрэцэдэнтнай акцыі прынялі 119 тыс. беларусаў. 42,3 % удзельнікаў апытання выбралі гімн на музыку Н. Сакалоўскага з трыма тэкставымі версіямі. У сувязі з гэтым конкурсная камісія 10 чэрвеня 2002 г. рэкамендавала зацвердзіць музыку Н. Сакалоўскага і тэкст М. Клімковіча і *Уладзіміра Карызны*.

2 ліпеня 2002 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 350 "Аб Дзяржаўным гімне Рэспублікі Беларусь" зацверджаны тэкст і нотнае выданне (ноты) Дзяржаўнага гімна. 8 снежня 2002 г. тэлеканал АНТ анансаваў акцыю "Праспяваем гімн разам", якую падтрымаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка. Больш за 3000 чалавек – прафесійныя і самадзейныя хоры – разам выканалі Дзяржаўны гімн на плошчы 8 сакавіка ў Мінску. Акцыя стала штогадовай і прымеркавана да Дня Незалежнасці. З кожным годам яе маштаб растуць, да яе далучаюцца рэгіёны, удзельнічаюць зоркі і вядомыя спартоўцы.

Дзяржаўны гімн выконваецца ў пачатку і ў шэрагу выпадкаў пасля заканчэння важных дзяржаўных і грамадскіх падзей, у тым ліку пры ўступленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на пасаду – пасля прынясення ім Прысягі. Гімн выконваецца ў пачатку і перад заканчэннем вяшчання, а ў выпадку кругласутачнага вяшчання – у 6 гадзін і ў 24 гадзіны, у навагоднюю ноч, пасля таго, як гадзіннік праб'е 24 гадзіны.

Грамадзяне могуць выконваць (праслухоўваць) Дзяржаўны гімн падчас народных, працоўных, сямейных святаў і іншых урачыстых мерапрыемстваў пры забеспячэнні неабходнай павагі да яго. У якасці знака павагі да Дзяржаўнага гімна пры яго афіцыйным выкананні прысутныя слухаюць яго стоячы (мужчыны без галаўных убораў, ваеннаслужачыя, іншыя асобы, для якіх прадугледжана нашэнне форменнай вопраткі, у адпаведнасці з заканадаўствам).

Больш падрабязна з тым, у якіх выпадках выконваецца і можа выконвацца Дзяржаўны гімн, можна азнаёміцца ў главе 4 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. №301-З "Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь".

### 3. Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь і іх значэнне

Дзяржаўныя святы, святочныя дні, памятныя і святочныя даты ўстанаўлівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Цяпер дзейнічае Указ Прэзідэнта

Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 1998 г. № 157 “Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь”.

У адпаведнасці са зміненнямі і дапаўненнямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 г., дзяржаўныя і святочныя дні ўстанаўлівае Усебеларускі народны сход.

Дзяржаўныя святы ўстанаўліваюцца ў азнаменаванне падзей, якія маюць асаблівае гістарычнае або грамадска-палітычнае значэнне для Рэспублікі Беларусь, якія аказалі істотны ўплыў на развіццё беларускай дзяржавы і грамадства.

Святочныя дні ўстанаўліваюцца ў азнаменаванне іншых падзей, прысвечаных традыцыйным датам, ушанаванню работнікаў пэўнай прафесіі, галіны гаспадаркі або сферы дзейнасці і г.д.

Памятныя даты звязаны з іншымі гістарычнымі падзеямі ў жыцця дзяржавы і грамадства ці традыцыйна адзначаюцца асобнымі катэгорыямі грамадзян.

Святочныя даты – гэта традыцыйна адзначаныя значнай колькасцю грамадзян падзеі, якія не надзяляюцца ў Рэспубліцы Беларусь афіцыйным статусам дзяржаўнага свята, святочнага дня або памятнай даты.

Афіцыйныя ўрачыстыя мерапрыемствы, ваенныя парады, артылерыйскія салюты і феерверкі праводзяцца з нагоды дзяржаўных свят у адпаведнасці з заканадаўствам.

Дзяржаўныя святы

1. Дзень Канстытуцыі – 15 сакавіка;

2. Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі – 2 красавіка;

3. Дзень Перамогі – 9 мая;

4. Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь – другая нядзеля мая;

Заснаваны 12 красавіка 2023 г. згодна з указам Прэзідэнта Беларусі № 105, якім карэкціраваны ўказ ад 26 сакавіка 1998 года № 157 “Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь”.

5. Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) – 3 ліпеня (Галоўнае дзяржаўнае свята);

6. Дзень народнага адзінства – 17 верасня.

## *Лекцыя 15.* **Сацыяльна-эканамічная мадэль сучаснай Беларусі**

### 1. Перадумовы беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэлі развіцця

Мадэль айчыннага спацыяльна-эканамічнага развіцця акрэслена тэарэтычнымі, гістарычнымі і сацыяльна-псіхалагічнымі перадумовамі.

Трэба мець на ўвазе, што адбылася змена тэарытычных падыходаў да мадэрнізацыі грамадства. З прычыны таго, што ў 1960–1970-я гг. многія з краін

так званага “трэцяга свету” абралі не заходнееўрапейскі шлях мадэрнізацыі, а шукалі свой своеасаблівы накірунак развіцця, абапіраючыся на свае гістарычныя і прыродна-геаграфічныя асаблівасці, істотна змяніліся тэарэтычныя падыходы да мадэрнізацыі грамадства. У сацыялогіі нарастаючую папулярнасць набывае канцэпцыя шматстайнасці сучаснасці (multiple modernities), згодна якой традыцыя – гэта неад’емны элемент любой сацыяльнай культуры: як усялякай сацыяльнай арганізацыі ў цэлым (ці так званае традыцыйнае, ці сучаснае грамадства), так і кожнага яе элемента паасобку (традыцыі, напрыклад, захоўваюць сваю значнасць нават у такіх найбольш рацыяналізаваных і дынамічных галінах чалавечай дзейнасці, як навука і тэхналогія). Вызначалася выключная роля норм, традыцыі ў захаванні стабільнасці сацыяльнай сістэмы, паколькі чалавек дзейнічае, упарадкоўвае рэальнасць у адпаведнасці з уяўленнямі, якія ён засвоіў іператварыў у свае перакананні, і што сталі матывацыяй яго дзеянняў. Традыцыя як сацыяльная форма выяўлення агульнага закона пераемнасці валодае ўстойлівасцю, дазваляе збіраць культурны вопыт, ажыццяўляць яго перадачу, а дынамічнасць садзейнічае ўзбагачэнню, узаемадзеянню традыцый з іншымі з’явамі грамадскага жыцця. Фарміруючыся на працягу шматлікіх стагоддзяў, традыцыя назапашвае гістарычны вопыт, мудрасць народа, забяспечвае ўзаемасувязь паміж мінулым і сучасным.

Не менш істотным з’яўляецца ўлік гістарычных перадумоў. Традыцыйнае грамадства беларускай вёскі не адчула ў поўнай ступені кардынальнай трансфармацыі, праз якую прайшла Заходняя Еўропа (уключаючы поўнае разбурэнне адносін у грамадзе). Лёс беларускага сялянства – гэта шмат у чым лёс беларускага этнасу. Шэраг рыс беларускага сялянства склаўся гістарычна, на працягу стагоддзяў. Роля традыцыі для беларускага вяскоўца была выключнай. Абшчына з яе ўраўняльнасцю да пачатку ХХ ст. у Беларусі хутка знікае. Бачыцца зусім не выпадковым, што П.А. Сталыпін, які ўзрос і склаўся як дзяржаўны дзеяч ў заходніх губернях Расійскай імперыі, ва ўмовах развіцця сялянскай рэвалюцыі зрабіў адну з найбольш значных ў Расійскай імперыі спроб рэфармавання вёскі. Месца абшчыны ў Беларусі заняла сялянская грамада, якая заставалася важнейшым рэгулятарам сацыяльных адносін, перш за ўсё ў сферы зямель агульнага карыстання (лес, выпасы, сенакос). Яна ўспрымалася як нейкі калектыўны, аб’ядноўваючы пачатак, у якім злучыліся з часоў “Гомана” нацыянальныя і сацыяльныя патрабаванні беларусаў. На пачатку ХХ ст. загучаў заклік Янкі Купалы: “А хто там ідзе, а хто там ідзе ў агромністай такой грамадзе? Беларусы”. Асноўным крытэрыям справядлівасці вызначалася праца і размеркаванне па выніках працы.

Каб зразумець асаблівасці беларускай мадэлі развіцця, неабходна прыняць пад увагу і сацыяльна-псіхалагічныя перадумовы. Можна даволі хутка змяніць абсталяванне і стварыць новыя вытворчасці, але вельмі марудна змяняюцца эканамічныя паводзіны грамадзяніна, якія засноўваюцца на папярэднім вопыце працы. Цэлыя пакаленні беларусаў ўзраслі ва ўмовах калектыўнай вытворчасці, дзе важнейшымі стымуламі з’яўляліся не толькі і не столькі эканамічныя

механізмы, колькі найперш, адміністрацыйныя. Да таго ж у пераходны перыяд у дзяржавы не заўсёды меліся ў дастатковай колькасці сродкі для значнага матэрыяльнага заахвочвання. "Новая эканамічная палітыка" ў Беларусі XXI ст. павінна была ўлічыць вопыт развіцця СССР XX ст., калі акцэнт выключна на матэрыяльнай зацікаўленасці і дробнай сямейнай вытворчасці спарадзіў цэлы шэраг супярэчнасцей, якія былі выкарыстаны пры зломе нэпу. Фарсіраванне пры рэфармаванні сельскай гаспадаркі, якое адбылося ў Расіі на пачатку 90-х гг. XX ст, дало новы, блізкі вопыт для фарміравання свайго ўласнага беларускага падыходу.

## 2. Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця

Мадэль развіцця, якая рэалізуецца з сярэдзіны 1990-х гг., зыходзіць, як адзначае шэраг беларускіх і замежных экспертаў, з канкрэтных беларускіх умоў і ў той жа час улічвае вопыт эканамічнай трансфармацыі ў шэрагу замежных краін. Упершыню разгорнутую характарыстыку гэтай мадэлі даў Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка. У сакавіку 2002 г. ён вылучыў наступныя рысы беларускай мадэлі развіцця: – моцная і эфектыўная дзяржаўная ўлада, якая забяспечвае палітычную стабільнасць, сацыяльную справядлівасць і бяспеку; роўнасць розных форм уласнасці; галоўны крытэрый развіцця эканомікі – эфектыўнасць вядзення гаспадаркі; прыватызацыя разглядаецца не як самамэта, а як сродак пошуку зацікаўленых інвестараў, стварэнне эфектыўнага ўласніка; шматвектарнасць знешнеэканамічнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі міжгаспадарчых сувязей; актывізацыя інтэграцыйных працэсаў, перш за ўсё эканамічных, з краінамі СНД і Расіяй; моцная сацыяльная палітыка дзяржавы, інвестыцыі ў здароўе, адукацыю, прафесійнае і культурнае развіццё асобы, а таксама адрасная сацыяльная дапамога. Такім чынам, беларуская мадэль накіравана на фарміраванне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, заснаванай на вядучай ролі дзяржавы ў гаспадарчым жыцці і забеспячэнні высокага ўзроўню сацыяльнай абароненасці насельніцтва.

Беларуская эканамічная мадэль увабрала шмат у чым у сябе рысы развіцця неаіндустрыяльных краін, якія развіваюцца ў рэгіёнах Паўднёвай, Паўднёва-Усходняй і Усходняй Азіі – ад Індыі да Паўднёвай Карэі, і спалучае традыцыйныя прынцыпы функцыянавання рыначнай эканомікі і спецыфіку нацыянальнай эканомікі Рэспублікі Беларусь, традыцыі і менталітэт беларускага народа. У беларускай эканамічнай мадэлі вядучая роля адводзіцца дзяржаўнаму сектару: на долю дзяржпрадпрыемстваў прыпадае каля 50% ВУП, ад дзяржпрадпрыемстваў паступае каля 40% валютнай выручкі. На гэтых прадпрыемствах створана каля паловы рабочых месцаў. На першым этапе мадэрнізацыі толькі дзяржава рэальна магла быць яе галоўным суб'ектам: з прычыны адсутнасці буйнога прыватнага бізнесу дзяржаве даводзілася браць на сябе яго функцыі. Разам з тым, дзяржава аказвае падтрымку і прыватнаму прадпрымальніцтву, разглядаемаму ў якасці важнага элемента эканамічнай сістэмы краіны. У цяперашні час недзяржаўныя прадпрыемствы, якіх да пачатку трансфармацыі практычна не было, ствараюць каля паловы ВУП; на

прыватны сектар цяпер прыпадае каля 60 % усяго экспарту краіны і палова занятасці насельніцтва.

На працягу многіх гадоў хутка раслі заработная плата і іншыя віды даходаў насельніцтва, што дало шэрагу экспертаў падставу называць беларускую эканамічную палітыку “славянскім кэйнсіянствам”. Забяспечваючы павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва, гэта палітыка не толькі спрыяла эканамічнаму росту, але і гарантавала сацыяльную стабільнасць у краіне. У адрозненне ад Расіі і шэрагу іншых постсавецкіх краін у Беларусі значная ўвага надавалася росту плацежаздольнага попыту насельніцтва як фактару ўздыму эканомікі. Прымаліся меры па недапушчэнні моцнага сацыяльнага расслаення, праводзілася палітыка пераразмеркавання даходаў на карысць малазабяспечаных слаёў насельніцтва.

Характэрнай рысай беларускай мадэлі стала высокая ступень цэнтралізацыі кіравання, калі ключавыя пытанні эканамічнай палітыкі вырашаюцца непасрэдна Прэзідэнтам Беларусі, надзеленым неабходнымі для гэтага паўнамоцтвамі. У межах беларускай мадэлі рэалізуецца курс на забеспячэнне шматвектарнасці знешнеэканамічных сувязей. Рэспубліка мае гандлёвыя адносіны больш чым з 200 краінамі свету; пры гэтым асноўнымі гандлёвымі партнёрамі з’яўляюцца краіны СНД. Кіраўніцтва рэспублікі, нягледзячы на шэраг праблем у двухбаковых адносінах, праводзіць курс на збліжэнне і інтэграцыю з Расіяй у рамках створанай дзвюма краінамі Саюзнай дзяржавы.

Гады рэалізацыі беларускай эканамічнай мадэлі (перш за ўсё перыяд 1996–2008 гг.) былі ў цэлым вельмі паспяховымі. Беларуская эканоміка не толькі досыць хутка пераадолела наступствы глыбокага трансфармацыйнага спаду першай паловы 1990-х гг., але і дабілася значнага росту асноўных эканамічных паказчыкаў. Беларусь, у адрозненне ад большасці іншых постсавецкіх краін, пазбегла дэіндустрыялізацыі, захаваўшы найважнейшыя галіны прамысловасці і найбуйнейшыя прадпрыемствы і падвоіла свой ВУП у параўнанні з 1991 г. Варта пры гэтым падкрэсліць, што такі значны эканамічны рост быў дасягнуты ў краіне, пазбаўленай буйных запасаў энерганосьбітаў, ва ўмовах амаль поўнага спынення (шмат у чым па палітычных матывах) прадастаўлення Беларусі заходніх крэдытаў. У апошнія гады краіна прыступіла да мадэрнізацыі эканомікі на інавацыйнай аснове. Так, падчас выканання Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця на 2011–2015 гг. было ўведзена ў эксплуатацыю больш за 130 новых прадпрыемстваў і вытворчасцей, створана або мадэрнізавана каля 20 тыс. працоўных месцаў. Значныя поспехі былі дасягнуты ў развіцці сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь. Паводле звестак міжнародных арганізацый, Беларусь уваходзіць у дзясятку краін з найменшай сацыяльнай няроўнасцю: разрыў у даходах паміж найбольш багатымі і найбольш беднымі ў Рэспубліцы Беларусь прыкладна такі ж, як у Германіі, Аўстрыі і Швецыі. Сацыяльная сітуацыя ў Беларусі характарызуецца таксама адноснай стабільнасцю рынку рабочай сілы і нізкім узроўнем зарэгістраванага беспрацоўя.

Важнымі фактарамі бурнага эканамічнага росту былі, у прыватнасці, унутраны спажывецкі попыт і інвестыцыі ў асноўны капітал, якія ажыццяўляюцца ў асноўным дзяржавай або прама (праз бюджэт) або са сродкаў кантраляваных дзяржавай прадпрыемстваў і банкаў. Істотнай асаблівасцю беларускай эканомікі з’яўляецца яе велізарная залежнасць ад знешніх умоў, у тым ліку ад стану эканомік краін-партнёраў і дынамікі знешнегандлёвых цэн на асноўныя экспартныя і імпартныя тавары. Таму да ліку найбольш важных фактараў функцыяніравання эканомікі Беларусі неабходна аднесці знешнеэканамічную дзейнасць. Гэта вызначаецца дзвюма прычынамі. Па-першае, вытворчы патэнцыял краіны залішні для ўнутранага рынка. Па-другое, значная колькасць канкурэнтназдольных вытворчасцей не могуць функцыяніраваць без імпартнай прамежкавай прадукцыі. У структуры беларускага экспарту найбольшую долю займае экспарт карысных выкапняў і нафтапрадуктаў, а таксама машынабудаўнічая прадукцыя і прадукцыя хімічнай вытворчасці. У структуры імпарту пераважаюць карысныя выкапні, нафта і машынабудаўнічая прадукцыя.

### 3. Дзяржава для народа – галоўны прынцып айчыннай сацыяльна-эканамічнай мадэлі

У першыя гады суверэннага існавання ў эканоміцы Беларусі назіраліся крызісныя з’явы, што выявілася ў зніжэнні ўсіх галоўных макраэканамічных паказчыкаў, падзенні аб’ёмаў вытворчасці і кошту беларускага рубля, які быў уведзены ў абарачэнне з 1992 г., росце інфляцыі і знешняй запазычанасці. Прычыны паглыблення крызісу заключаліся ў рэзкай змене знешнеэканамічных умоў, непадрыхтаванасці да правядзення самастойнай эканамічнай палітыкі, асабліва ў сферы фінансавых, крэдытна-грашовых і знешнеэканамічных адносін, непаслядоўных і недастаткова прадуманых і эфектыўных рыначных пераўтварэннях. Істотнае скарачэнне аб’ёмаў вытворчасці перш за ўсё было абумоўлена скарачэннем выпуску прамысловай прадукцыі па прычыне рэзкага падаражання матэрыяльных рэсурсаў і абвастрэння праблемы збыту выробленых тавараў. Апошняе было абумоўлена стратай традыцыйных рынкаў збыту і неэфектыўным пошукам новых ў Азіі, Афрыцы і на Бліжнім Усходзе, а таксама нізкім узроўнем канкурэнтаздольнасці прадукцыі, што стала наступствам скарачэння інвестыцый у навуку і новыя тэхналогіі.

У цяжкім стане апынуўся і аграрны сектар Беларусі па прычыне склаўшагася непарытэту цэн – дысбалансу цэн паміж сельскагаспадарчай і прамысловай прадукцыяй, які з года ў год павялічваўся. Калі за 1991–1994 гг. цэны на дызельнае паліва выраслі ў 237 тыс. разоў, на камбайны – у 149 тыс., на трактары – у 67 тыс., то закупачныя цэны на збожжа павялічыліся толькі ў 6 тыс. разоў, буйную рагатую жывёлу – у 5,4 тыс. разоў і г.д. Такім чынам, каб у 1991 г. вытворцу сельскагаспадарчай прадукцыі набыць тону дызельнага паліва, неабходна было прадаць 12 кілаграм мяса буйной рагатай жывёлы, а ў 1994 г. – ужо 469 кг. Склаўшаяся сітуацыя прывяла да таго, што не абнаўлялася

тэхнічная база беларускіх калгасаў, у не дастатковай ступені вытворчы працэс забяспечваўся ўгнаеннямі і хімічнымі сродкамі аховы раслін. Працягвала нарастаць унутраная і знешняя запазычанасць Беларусі. Пры гэтым, акрамя афіцыйнай знешняй запазычанасці за гэты час рэспубліка нарасціла і вялікую цякучую знешнюю запазычанасць, перш за ўсё перад Расійскай Федэрацыяй за энерганосьбіты. Перавага імпарту над экспартам не толькі прывяла да недахопу валютных сродкаў у краіне, але і садзейнічала падзенню курсу беларускага рубля, што ў сваю чаргу абумовіла рост цэн і выдаткаў прадпрыемстваў на сыравіну, матэрыялы і іншыя віды прадукцыі, якія завозіліся.

Глыбокі эканамічны крызіс пачатку 1990-х гг., які паставіў народную гаспадарку Беларусі на мяжу абвалу, актуалізаваў пытанне аб неабходнасці распрацоўкі новай эканамічнай стратэгіі, якая б дапамагла вывесці краіну са складанага становішча. З гэтай нагоды Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка ўнёс на разгляд Вярхоўнага Савета праграму неадкладных мер па выхаду эканомікі рэспублікі з крызісу, якая была адобрана 30 верасня 1994 г. Дадзеная праграма ўтрымлівала комплекс узаемазвязаных неадкладных мер, накіраваных перш за ўсё на прыпыненне спаду вытворчасці, тармажэнне інфляцыі, утрыманне належнага ўзроўню жыцця і сацыяльнай абароненасці, недапушчэнне масавага беспрацоўя і рэзкага маёмаснага расслаення. Праграмай прадугледжвалася прыняцце неадкладных мер агульнаэканамічнага характару, сярод якіх: аздараўленне фінансавай і грашова-крэдытнай сістэм; нармалізацыя знешнеэканамічных адносін, стабілізацыя нацыянальнай валюты; сацыяльная падтрымка найбольш неабароненых слаёў насельніцтва; удасканаленне аплаты працы; узмацненне дзяржаўнага рэгулявання ў эканоміцы; пераадоленне спаду вытворчасці.

Рэалізацыя праграмы дазволіла ўжо ў 1995 г. некалькі зменшыць інфляцыю, знізіць дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, затармазіць падзенне ўзроўню жыцця народа, прыпыніць абвальны спад вытворчасці. Нягледзячы на крызісную сітуацыю ў эканоміцы рэспублікі, працэс рыначных пераўтварэнняў ажыццяўляўся. У канцы 1995 г. у асноўным было завершана фарміраванне эканамічных інстытутаў суверэннай дзяржавы; створана незалежная крэдытна-грашовая і банкаўская сістэма; сфарміраваны органы кіравання, пачала фарміравацца інфраструктура рынку тавараў, рабочай сілы і капіталу. У гэтых умовах стала актуальнай новая задача – стварыць перадумовы для пераходу ад спаду вытворчасці да яе стабілізацыі і пэўнага росту. У гэтых мэтах былі распрацаваны “Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг. Прыярытэты: экспарт, жыллё, харчаванне”, якія былі прыняты ўдзельнікамі Першага Усебеларускага народнага сходу 20 кастрычніка 1996 г, а 14 лістапада – зацверджаны спецыяльным указам. Гэтым крокам была замацавана пабудова мадэлі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі як перспектыўнага шляху пераўтварэнняў.

Дадзеная мадэль была пабудавана па прынцыпах канстытуцыйных гарантый асабістых правоў і свабод грамадзян, свабоды прадпрымальніцтва,

выбару прафесіі і месца працы, роўнасці ўсіх форм уласнасці, гарантыі яе недатыкальнасці і выкарыстання ў інтарэсах асобы і грамадства, забеспячэння ўзаемасувязі дабрабыту работніка і вынікаў яго працы, сацыяльнай абароны непрацаздольных і іншых сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва, сацыяльнага партнёрства (паміж дзяржавай, прафсаюзамі і саюзамі прадпрымальнікаў). Сацыяльная арыентацыя рыначнай эканомікі дазваляла, з аднаго боку, захаваць сацыяльныя заваёвы народа, а з другога – выкарыстоўваць рыначныя механізмы для павышэння эфектыўнасці эканамічнай сістэмы, яе ўспрымальнасці да навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ствараючы ўмовы для рыначнай эканомікі, дзяржава ў сваёй эканамічнай палітыцы імкнецца да дасягнення такіх прынцыповых мэт, як рост дабрабыту народа, высокая ступень занятасці, спрыяльнае для жыцця навакольнае асяроддзе.

## 4. Усебеларускія народныя сходы. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 1996–2000 гг., якая была прынята на Першым Усебеларускім народным сходзе, прадугледжвала не толькі пабудову айчыннай сацыяльна-эканамічнай мадэлі, але і шэраг мер па выхаду з крызіснага становішча беларускай эканомікі. У якасці галоўнай мэты разглядаліся: паступовы ўздым эканамічных паказчыкаў і павышэнне ўзроўню дабрабыту насельніцтва Беларусі. Рэалізаваць праграму планавалася ў два этапы. У першыя два гады (1996–1997 гг.) прадугледжвалася дасягненне макраэканамічнай стабілізацыі, спыненне спаду вытворчасці і забеспячэнне яе ўстойлівага развіцця, зніжэнне узроўню інфляцыі, умацаванне плацёжнай і фінансавай дысцыпліны. У сувязі з гэтым неабходна было стварыць механізмы стымулявання прадпрымальніцтва, умацаваць нацыянальную валюту з адначасовым змяншэннем даларызацыі эканомікі, удасканаліць сістэму падаткаабкладання і г.д.

У наступныя гады (1998–2000 гг.) меркавалася аднавіць эканамічны рост, у сувязі з чым неабходна было здзейсніць перабудову эканомікі на аснове навукаёмістых рэсурсазберагальных тэхналогій, скараціць долю неэфектыўных вытворчасцей, стварыць дзейсны механізм высокаэфектыўных інвестыцый, абараніць беларускіх вытворцаў на ўнутраным і знешнім рынках шляхам правядзення палітыкі пратэкцыянізму і стымулявання экспарту, развіць інфраструктуру рынку і г.д. Для выканання праграмы была рэарганізавана сістэма кіравання эканомікай – прынята Генеральная схема кіравання народнай гаспадаркай на 1996–2000 гг.

Дадзеная пяцігодка стала важным этапам у працэсе пераадолення крызісных з’яў, якія былі выкліканы распадам СССР і фарміраваннем новай структуры эканомікі. Ужо ў 1996 г., упершыню за перыяд існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь, адбыўся прырост. У параўнанні з папярэднім 1995 г. ВУП вырас на 3 %, вытворчасць прамысловай прадукцыі – на 4 %, сельскагаспадарчай прадукцыі – на 2 %, спажывецкіх тавараў – на 9 %. Аднак

гэтыя паказчыкі былі яшчэ вельмі далёкімі да ўзроўню дакрызіснага 1990 г. Тым не менш, можна канстатаваць пачатак паступовага пераадолення падзення аб’ёмаў вытворчасці.

У працяканні эканамічных працэсаў у Беларусі ў другой палове 1990-х гг. вылучаюцца дзве фазы. Падчас першай, якая закранула перыяд з 1996 г. да першай паловы 1998 г., назіраліся высокія тэмпы росту эканамічных паказчыкаў. Для другой фазы, якая храналагічна ахапіла канец 1998 г.–2000 г., было характэрна замаруджванне тэмпаў росту. Замаруджванне ў многім было выклікана вынікамі крызісу 1998 г. у эканоміцы Расійскай Федэрацыі, а залежнасць ад яе беларускай эканомікі была высокай. У цэлым, падчас выканання праграмы на 1996–2000 гг. былі дасягнуты значныя поспехі. У 2000 г. удалося не толькі дасягнуць, але і пераўзысці на 10 % узровень 1990 г. у вытворчасці тавараў народнага спажывання, а ў цэлым па выпуску прамысловай прадукцыі – на 1 %. Разам з тым, нягледзячы на значны рост у параўнанні з 1995 г., па шэрагу асноўных паказчыкаў (ВУП, вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, інвестыцыях у асноўны капітал і інш.) у 2000 г. узроўню 1990 г. дасягнуць не ўдалося.

У сувязі з гэтым у 2001 г. пачаўся новы этап трансфармацыі эканомікі Беларусі. Была распрацавана “Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг.”, якая была прынята на Другім Усебеларускім народным сходзе 18 мая 2001 г. і зацверджана ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 жніўня 2001 г. Праграма прадугледжвала стварэнне высокаэфектыўнай сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі з дзейснымі механізмамі дзяржаўнага і рыначнага рэгулявання. Асноўнымі прыярытэтамі новай праграмы былі вызначаны: нарошчванне экспарту тавараў і паслуг, развіццё аграпрамысловага комплексу і звязаных з ім галін, актывізацыя інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці, далейшае развіццё жыллёвага будаўніцтва, фарміраванне эфектыўнай сістэмы аховы здароўя. Па стану на 2005 г. асноўныя задачы эканамічнай праграмы былі не толькі выкананы, але і перавыкананы. У 2005 г. быў зафіксаваны самы нізкі за папярэднія 15 гадоў узровень інфляцыі – 8 %. За 2001–2005 гг. ВУП павялічыўся на 43,1 %, а ў параўнанні з 1990 г. – на 27 %, вытворчасць прамысловай прадукцыі – на 51,8 % і 53 % адпаведна, вытворчасць спажывецкіх тавараў на 50,4 % і 66 %. Неабходна таксама адзначыць, што па стану на пачатак 2006 г. каля 16 % прамысловых прадпрыемстваў заставаліся стратнымі. Пры росце на 15 % вытворчасці ў жывёлагадоўлі адбылося зніжэнне тэмпаў вытворчасці прадукцыі раслінаводства, што ў значнай ступені было звязана з дрэннымі ўмовамі надвор’я. Па-ранейшаму заставалася высокай матэрыяла- і энергаёмістасць прадукцыі, недастатковымі былі прыток інвестыцый і інавацый у вытворчасць, нізкімі – пенсіі, стыпендыі і іншыя сацыяльныя выплаты.

Гэтыя і іншыя задачы павінны былі вырашацца падчас выканання праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. “Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010

гг.” была прынята на Трэцім Усебеларускім народным сходзе, які адбыўся 2–3 сакавіка 2006 г., і зацверджана адпаведным указам ад 16 чэрвеня 2006 г. Галоўнай яе мэтай было вызначана далейшае павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва на аснове павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі, стварэння дзяржавы, зручнай для людзей. Прыярытэтамі сацыяльна-эканамічнага развіцця на чарговую пяцігодку былі вызначаны: усебаковае гарманічнае развіццё чалавека, фарміраванне эфектыўнай сістэмы аховы здароўя; інавацыйнае развіццё нацыянальнай эканомікі, энерга- і рэсурсазберажэнне; нарошчванне экспартнага патэнцыялу краіны; развіццё аграпрамысловага комплексу і звязаных з ім галін, сацыяльнай сферы вёскі; развіццё малых і сярэдніх гарадоў; жыллёвае будаўніцтва.

Трэці пяцігадовы этап у гісторыі эканамічнага развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь быў этапам актыўнага эканамічнага росту. Яго асновай стала фарсіраванае развіццё ўнутранага рынку і нарошчванне інвесціравання за кошт знешніх займаў. Валавы ўнутраны прадукт за пяцігодку павялічыўся на 42,1 %, вытворчасць прамысловай прадукцыі – на 47,8 %, прадукцыі сельскай гаспадаркі – на 24,8 %. Па вытворчасці важнейшых відаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў разліку на душу насельніцтва Беларусь захавала лідзіруючыя пазіцыі сярод краін СНД. Беларускі аграпрамысловы комплекс не толькі ў поўным аб’ёме забяспечыў харчовую бяспеку краіны, але і экспартаваў значныя аб’ёмы прадуктаў харчавання. Паслядоўна павялічваліся ўзровень і якасць жыцця насельніцтва. За 2006–2010 гг. рэальныя грашовыя даходы беларускіх грамадзян выраслі на 79,1 %.

Варта адзначыць, што з 2009 г. у рэспубліцы назіралася запавольванне тэмпаў эканамічнага росту, што было выклікана негатыўным уплывам сусветнага фінасавага крызісу. Рэзкае паслабленне эканамічнай актыўнасці ў свеце стварыла значныя праблемы для беларускай эканомікі. Цэны на тавары беларускага экспарту ўпалі, знізіўся попыт на пэўныя віды прадукцыі, узніклі затрымкі з разлікамі, доступ на крэдытныя рынкі стаў цяжкім. З такімі праблемамі сутыкнулася ўся сусветная эканоміка, і Беларусь не магла быць выключэннем.

У гэтай сувязі былі прыняты рашэнні па ўдасканальванні дзелавога клімату ўнутры краіны для стварэння больш спрыяльных умоў для функцыяніравання прадпрыемстваў усіх форм уласнасці, павышэння іх канкурэнтаздольнасці ва ўмовах жорсткай барацьбы на знешніх рынках, якія ў гэты час звузіліся. Акрамя таго, былі прыняты дадатковыя меры, скіраваныя на перавод эканомікі на інавацыйны шлях развіцця, стымуляванне айчынных вытворцаў да стварэння і ўкаранення новай высокатэхналагічнай прадукцыі, заснаванай на выніках навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх (тэхналагічных) прац.

Чацвёртым Усебеларускім народным сходам, які адбыўся 6–7 снежня 2010 г., былі адобраны Асноўныя палажэнні “Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг." Галоўнай мэтай чарговага пяцігадовага этапу эканамічнага развіцця дзяржавы былі вызначаны рост

дабрабыту і паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва на аснове ўдасканалення сацыяльна-эканамічных адносін, інавацыйнага развіцця і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Падчас ажыццяўлення чарговай праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця сур'ёзны ўплыў на народную гаспадарку краіны працягвалі аказваць негатыўныя знешнія фактары, да ліку якіх у першую чаргу варта аднесці вынікі сусветнага эканамічнага крызісу. Тым не менш, нягледзячы на неспрыяльныя знешнія эканамічныя умовы, за 2011–2015 гг. Рэспубліка Беларусь здолела выйсці на станоўчы рост эканомікі і па шэрагу кірункаў атрымаць істотныя вынікі. У прыватнасці, ВУП на душу насельніцтва па парытэту пакупніцкай здольнасці вырас з 15,4 тыс. долараў ЗША ў 2010 г. да 17,7 тыс. долараў ЗША ў 2015 г. Беларусь увайшла ў лік краін з сярэднім узроўнем даходу. У 2015 г. аб'ём знешнегандлёвага абароту краіны больш чым на 9 % перавысіў ВУП, суадносіны экспарту тавараў і паслуг і ВУП склала больш за 50 %, што можа характарызаваць Рэспубліку Беларусь як краіну з адкрытай эканомікай.

23 чэрвеня 2016 г. дэлегаты Пятага Усебеларускага народнага сходу ўхвалілі асноўныя палажэнні "Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг." і падтрымалі яе галоўную мэту – павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця.

11-12 лютага 2021 г. адбыўся Шосты Усебеларускі народны сход, які падвеў вынікі працы па выкананню заданняў папярэдняй пяцігодкі. Было вызначана, што ўдалося забяспечыць рост узроўня жыцця насельніцтва, захаваць бяспеку і суверэнітэт краіны. Валавы ўнутраны прадукт на душу насельніцтва ўзрос на 14%. У краіне забяспечана стабільная занятасць насельніцтва, рэальны заробак вырас больш, чым у 1,3 разы. Кожны мае магчымасць атрымаць якасную адукацыю. Па індэксу адукацыі краіна ўваходзіць у топ-30 перадавых краін свету.

У рэйтынгу Сусветнага банка "DoingBusiness 2020" (вядзенне бізнэсу) Бераруь заняла 49-ю пазіцыю сярод 190 эканомік свету. Разам з тым, застаюцца невырашанымі шэраг пытанняў. Неабходны больш інтэнсіўны рост валавога унутранага прадукту, экспарту, інвестыцый. Патрэбны дадатковыя стымулы для росту насельніцтва.

Шосты Усебеларускі сход (11-12 лютага 2021 г.) ухваліў асноўныя палажэнні "Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг.», якая была зацверджана ў ліпені 2021 г. Галоўнай мэтай гэтай праграмы з'яўляецца забеспячэнне стабільнасці ў грамадстве і рост дабрабыту грамадзян за кошт мадэрнізацыі эканомікі, нарошчвання сацыяльнага капіталу, стварэння камфортных умоў для жыцця, працы і самарэалізацыі чалавека. Сацыяльная дзяржава застаецца нязменным нацыянальным брэндам Беларусі.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя прыярытэты: шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальнае асяроддзе, дзяржава-партнер.

# *Лекцыя 16.* Беларусь у геапалітычнай прасторы

## 1. Геапалітычны фактар фармавання беларускай дзяржаўнасці. Характарыстыка сучаснага геапалітычнага становішча Беларусі

Геапалітычнае становішча аказала вялікі ўплыў на развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях. Фармаванне беларускай дзяржаўнасці адбывалася ў складаных геапалітычных умовах. Барацьба геапалітычных арыентацый у перыяд фарміравання беларускай нацыі, барацьба як з германскімі, так і з польскімі інтэрвентамі, дамаганні новастворaных суседніх дзяржаў на беларускія тэрыторыі перашкаджалі стварэнню беларускай дзяржаўнасці. Толькі падтрымка і дапамога Беларускай ССР садзейнічалі стварэнню беларускай нацыянальнай дзяржавы на савецкай аснове. Але межы беларускай дзяржавы часта фармаваліся без удзелу саміх беларусаў, знешнімі сіламі – перш за ўсё, спачатку Савецкай Расіяй, затым кіраўніцтвам СССР.

Беларусы здолелі стварыць сваю нацыяцэнтрычнцую дзяржаву толькі ў 1991 г. Набыццё незалежнасці дало магчымасць самастойна ажыццяўляць знешнюю палітыку, накіраваную на рэалізацыю нацыянальна-дзяржаўных інтарэсаў беларускага народа на міжнароднай арэне.

Да сярэдзіны 1994 г. вядучую ролю ў распрацоўцы, прыняцці і рэалізацыя рашэнняў у сферы знешняй палітыкі Беларусі належала Вярхоўнаму Савету і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пасля правядзення першых прэзідэнцкіх выбараў у 1994 г. кіраўнік дзяржавы гарантуе рэалізацыю асноўных напрамкаў знешняй палітыкі, прадстаўляе Рэспубліку Беларусь у адносінах з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі.

Асаблівасці сучаснага геапалітычнага становішча Беларусі.

1. Па памерах тэрыторыі Беларусь займае 13-е месца сярод больш як 40 краін Еўропы. Па плошчы тэрыторыі Беларусь супастаўная з такімі краінамі, як Вялікабрытанія ці Румынія. Калі параўноўваць з нашымі суседзямі, Беларусь шматкроць пераўзыходзіць па плошчы Латвію і Літву, але значна саступае Украіне і Польшчы, ня кажучы ўжо пра Расею.

2. Тэрыторыя Беларусі вельмі кампактная – яе працягласць з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход складае 550 – 650 км. У геапалітычным плане гэта з'яўляецца адначасова і плюсам і мінусам.

Плюсы:

– спрыяе раўнамернаму засваенню тэрыторыі. Няма аддаленых малаасвоеных ускраін.

– Працягласць межаў адносна невялікая і іх прасцей ахоўваць.

Галоўны мінус у тым, што ў выпадку ўзнікнення якіх-небудзь спрэчак і супярэчнасцей нашы суседзі могуць лёгка пераарыентаваць свае транзітныя патокі ў абход Беларусі і пазбавіць нашу краіну прыбытку ад транспартнага транзіту.

3. Па колькасці насельніцтва сярод суседзяў Беларусь пераўзыходзіць Латвію і Літву, але шматкроць саступае Расіі, Польшчы і Украіне. Па шчыльнасці насельніцтва Беларусь пераўзыходзіць такія суседнія краіны, як

Латвія і Расія, але ўступае па гэтым паказчыку Польшчы, Украіне і Літве. Па ўдзельнай вазе гарадскога насельніцтва Беларусь крыху адстае ад большасці краін Еўропы, але апярэджвае большасць постсавецкіх рэспублік.

4. Беларусь мае адносна аднастайны, спрыяльны для стабільнага развіцця нацыянальны склад. Беларусы складаюць пераважную большасць насельніцтва краіны.

5. Рэспубліка Беларусь – дзяржава ў «цэнтры» Еўропы. Яна знаходзіцца паміж Заходняй супольнасцю і Расіяй.

6. Рэспубліка Беларусь мяжуе з пяццю дзяржавамі:

– на паўночным захадзе з Літвой,

– на поўначы – з Латвіяй і Расійскай Федэрацыяй,

– на паўночным усходзе і ўсходзе – з Расійскай Федэрацыяй,

– на поўдні – з Украінай,

– на захадзе – з Польшчай.

Прычым Расія, Украіна і Польшча з'яўляюцца ўплывовымі ў эканамічных, ваенных і прыродна-рэсурсных адносінах суседзямі, з якімі Беларусь цесна звязваюць гістарычныя, палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі.

7. Мяжа не мае ярка выяўленых прыродных рубяжоў, што абумовіла перасячэнне на тэрыторыі Беларусі гандлёвых, эканамічных і культурных шляхоў зносін.

8. Транзітнасць. У геапалітычным аспекце Беларусь з'яўляецца краінай, якая знаходзіцца на стратэгічным перакрыжаванні; на скрыжаванні транспартных шляхоў «поўнач – поўдзень – захад – усход».

З дзесяці транс'еўрапейскіх транспартна-камунікацыйных калідораў два непасрэдна праходзяць па яе тэрыторыі. Беларусь – скрыжаванне, дзе сыходзяцца найважнейшыя транс'еўрапейскія калідоры, абазначаныя па міжнароднай класіфікацыі нумарам 2 (Захад–Усход) і нумарам 9 (Поўнач–Поўдзень) з адгалінаваннем 9b.

Транспартна-камунікацыйныя калідоры, якія праходзяць праз тэрыторыю Беларусі, звязваюць:

- Расію з краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы,

- Украіну і Малдову – з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, паўночным захадам Расіі.

- праз Беларусь пракладзены ўчастак транскантынентальнай чыгуначнай магістралі, якая перасякае ўсю Еўразію ад Ціхага да Атлантычнага акіяна.

Па тэрыторыі Беларусі праходзяць самыя кароткія шляхі ў Еўропу і для іншых краін СНД – Казахстана, дзяржаў Сярэдняй Азіі.

Беларусь размяшчаецца на водападзеле Чорнага і Балтыйскага мораў – на шляху з паўночна-еўрапейскага і прыбалтыйскага рэгіёну ў краіны Паўднёвай Еўропы і Блізкага Усходу.

9. Адсутнасць выхаду да мора. Рэспубліка Беларусь – унутрыкантынентальная краіна, адна з 37 краін свету, якія не маюць прамога выхаду да мора. Беларусь жа ў гэтым плане поўнасцю залежыць ад транзіту праз тэрыторыю суседніх дзяржаў.

Аднак гэты недахоп можна кампенсаваць развітой унутрырэгіянальнай рачной сістэмай і актыўным выкарыстаннем блізкіх марскіх партоў суседніх дзяржаў (Калінінград, Гданьск, Вентспілс, Клайпеда), якія знаходзяцца на адлегласці 250-350 км ад беларускіх рубяжоў.

10. Беларусь – дзяржава, якая валодае даволі абмежаванымі прыроднымі рэсурсамі. У той жа час яна знаходзіцца блізка да мінеральна-сыравінных баз.

У Беларусі найбольш працяглая мяжа з дзяржавамі, якія валодаюць магутным прыродна-рэсурсным патэнцыялам. Так, з Расіі рэспубліка атрымлівае неабходную колькасць нафты, газу, каля 60 % каменнага вугалю, 55 % чорных і каляровых металаў, дзелавую драўніну і шматлікае інш.

11. Беларусь – пастаўшчык чыстага кіслароду для паветранага басейна Еўропы. У той жа час яе вялікай тэрыторыі падвергліся радыеактыўнаму забруджванню з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Такім чынам, Беларусь па еўрапейскіх мерках можна разглядаць як сярэднюю па памерах і насельніцтву краіну (супастаўную з Аўстрыяй, Бельгіяй, Венгрыяй, Грэцыяй). Беларусь атачаюць краіны, якія ў асноўным пераўзыходзяць яе па плошчы тэрыторыі, колькасці насельніцтва, эканамічнаму і прыродна-рэсурснаму патэнцыялу. Выключэнне тут складаюць толькі Латвія і Літва. Усе суседзі Беларусі маюць больш выгаднае, чым наша краіна, геаэканамічнае становішча. Праз іх таксама праходзяць транзітныя шляхі паміж Расіяй і Еўропай. Але ў дадатак да гэтага ўсе яны маюць важную перавагу, якой няма ў Беларусі – выхад да мора, г.зн. магчымасць устанаўліваць прамыя сувязі з аддаленымі краінамі і рэгіёнамі свету.

Адсутнасць выхаду да мора абумоўлівае неабходнасць супрацоўніцтва з краінамі Балтыйскага рэгіёна, Расіяй і Украінай з мэтай выкарыстання іх марскіх партоў. У той жа час Беларусь размешчана недалёка ад галоўных паліўна-энергетычных баз замежных дзяржаў, што аказала і прадаўжае аказваць станоўчы ўплыў на яе гістарычнае, сацыяльна-эканамічнае развіццё і гаспадарчую дзейнасць насельніцтва.

Недахопы геапалітычнага становішча Беларусі павінны кампенсавацца развіццём чалавечага капіталу.

### 3. Шматвектарнасць знешняй палітыкі. Расія і Кітай - стратэгічныя партнёры Беларусі. Блізкая і далёкая дуга міжнародных адносін

14 лістапада 2005 г. прыняты Закон “Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь”, які вызначае прынцыпы, стратэгічныя мэты, асноўныя задачы і напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы. Фундаментальным прынцыпам знешняй палітыкі з’яўляецца шматвектарнасць.

Курс на шматвектарнасць знешняй палітыкі прадугледжвае развіццё збалансаваных канструктыўных адносін з партнёрамі ў розных рэгіёнах свету. Пры выбудоўванні міжнароднага дыялогу Беларусь кіруецца прынцыпамі:

- дабрасуседства ў адносінах з сумежнымі краінамі,
- міралюбнасці, роўнасці і ўзаемнай павагі,
- неўмяшанні ва ўнутраныя справы, адмовы ад ціску і прымусу.

У цэлым міжнародная актыўнасць Беларусі:

1) забяспечвае абарону дзяржаўнага суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян,

2) стварае спрыяльныя знешнепалітычныя і знешнеэканамічныя ўмовы для павышэння ўзроўню дабрабыту народа, развіцця палітычнага, эканамічнага, інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу дзяржавы.

Да гэтага часу Рэспубліка Беларусь усталяваны дыпламатычныя адносіны са 183 дзяржавамі свету. Сетка загранустаноў на 1 сакавіка 2023 г. налічвае 71 дыпмісію: 57 пасольстваў, 2 пастаянныя прадстаўніцтвы, 11 генеральных консульстваў і 1 консульства. З улікам акрэдытацыі паслоў па сумяшчальніцтве Беларусь прадстаўлена ў 105 дзяржавах.[10]

Аб’ектыўна важным для Беларусі партнёрам з'яўляецца Еўрапейскі саюз і ЗША. Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Еўрапейскім саюзам былі ўстаноўлены ў жніўні 1992 г. У сакавіку 1995 г. у г. Бруселі (Бельгія) было падпісана Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і ЕС.

Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і ЗША былі ўстаноўлены 28 снежня 1991 г. У 1992 г. у Вашынгтоне пачало працаваць Пасольства Рэспублікі Беларусь у ЗША.

У першыя гады існавання дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і ЗША быў створаны падмурак супрацоўніцтва ў палітычнай, гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах. Ажыццёўлены візіты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнкі ў ЗША ў 1995, 2000, 2005 і 2015 гг., у тым ліку для ўдзелу ў сесіях Генеральнай Асамблеі ААН. У 1994 г. Рэспубліку Беларусь наведаў Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.

Аднак у 2020–2023 гг. на фоне беспрэцэдэнтнага палітычнага і эканамічнага націску Еўрапейскага саюза, ЗША і іншых краін Захаду на Беларусь адносіны з імі трансфармаваліся з партнёрскіх і ўзаемавыгадных у жорсткае супрацьстаянне. Разам з тым, Беларусь застаецца адкрытай для дыялогу з заходнімі краінамі з мэтай выхаду на пазітыўную траекторыю супрацоўніцтва, найперш у гандлёва-эканамічнай і інвестыцыйнай сферах.

Прытрымліваючыся адзіных падыходаў да развіцця адносін з усімі замежнымі партнёрамі на аснове раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялога, Беларусь у той жа час, як і любая іншая дзяржава, канцэнтруе свае знешнепалітычныя намаганні на шэрагу найбольш важных і перспектыўных вектараў. Сярод іх – перш за ўсё Расійская Федэрацыя, стратэгічнае саюзніцкае ўзаемадзеянне з якой будуецца на аснове Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Стратэгічнае партнёрства, развіццё саюзніцкіх адносін з Расійскай Федэрацыяй абумоўлены геаграфічнай і культурна-гістарычнай блізкасцю дзвюх краін і народаў, узаемадапаўняльнасцю эканомік, цеснымі кааперацыйнымі сувязямі беларускіх і расійскіх кампаній.

---

[10] Внешняя политика Беларуси // Министерство иностранных дел Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://mfa.gov.by/foreign_policy/general_information/

Расія традыцыйна – асноўны гандлёвы партнёр Беларусі і буйнейшы экспартны рынак для беларускіх тавараў. Па выніках 2022 г. узаемны тавараабарот дзвюх краін павялічыўся амаль на 15 %.

На долю Расіі прыпадае больш за палову аб'ёму знешняга гандлю Рэспублікі Беларусь.

Беларусь і Расія эфектыўна развіваюць супрацоўніцтва ў такіх сферах, як энергетыка, транспарт, прамысловая каапeрацыя.

У 2022 г. пачата рэалізацыя сумесных праектаў па выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі на базе флагманаў беларускай прамысловасці.

Беларусь і Расія эфектыўна каардынуюць свае дзеянні на міжнароднай арэне ў адпаведнасці з Праграмай узгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі, якая прымаецца кожныя два гады.

Значныя вынікі дасягнуты ў сферах абароны і бяспекі, антытэрарыстычнай дзейнасці, барацьбы са злачыннасцю. Падпісаны шэраг двухбаковых дакументаў у сферы ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Створана і функцыянуе рэгіянальная групоўка войскаў (сіл) Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, ажыццяўляецца ўзаемадзеянне паміж сістэмамі СПА дзвюх краін. Праводзяцца сумесныя вучэнні.

Адпрацоўваецца комплекс пытанняў па аператыўнай і баявой падрыхтоўцы войскаў. Удасканальваецца праваахоўная дзейнасць. У Беларусі і Расіі фарміруецца адзіная нарматыўная база ў сферы барацьбы са злачыннасцю. На тэрыторыях дзвюх дзяржаў праводзяцца ўзгодненыя мерапрыемствы па папярэджанні, выяўленні і спыненні супрацьпраўных дзеянняў з боку арганізаваных злачынных груповак, актаў тэрарызму, гандлю людзьмі. Сумеснымі намаганнямі на заходняй граніцы дзяржаў – удзельніц Саюзнай дзяржавы створаны надзейны бар'ер наркатрафіку і нелегальнай міграцыі.

У пераліку найбольш важных задач захоўваюцца пытанні забеспячэння роўных правоў грамадзян дзвюх краін, стварэння адзінай сістэмы сацыяльных гарантый, збліжэння і паступовай уніфікацыі ўнутранага заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сферы. Сёння грамадзяне Беларусі і Расіі маюць практычна аднолькавыя магчымасці для працаўладкавання, выбару месца жыхарства, атрымання адукацыі, медыцынскай дапамогі і сацыяльнага забеспячэння. Пры перасячэнні беларуска-расійскай граніцы беларусам і расіянам не патрабуецца праходжання пагранічнага кантролю, мытнага нагляду, атрымання і запаўнення міграцыйнай карты.

Актыўна развіваецца двухбаковае супрацоўніцтва ў сферы культуры. Адным з найбольш буйных і вядомых сумесных праектаў з'яўляецца штогадовы фестываль “Славянскі базар у Віцебску”. Рэгулярна на ўзаемнай аснове праводзяцца міжнародныя фестывалі мастацтваў, мастацкія выставы, кіна- і тэатральныя фестывалі.

Сумесныя праграмы, якія ахопліваюць навуковую і навукова-тэхнічную сферы, прамысловасць, будаўніцтва, інавацыі і новыя тэхналогіі, космас, IT-тэхналогіі, працягваюць заставацца эфектыўным механізмам паглыблення

інтэграцыі, стымулюючы пашырэнне кааперацыйных сувязей паміж беларускімі і расійскімі суб'ектамі гаспадарання.[11]

Асноўны партнёр Беларусі ў Азіі – Кітайская Народная Рэспубліка. Беларуска-кітайскія адносіны маюць дружалюбны характар, іх адрознівае ўзаемная павага бакоў, неўмяшанне ва ўнутраныя справы адзін аднаго і поўнае ўзаемаразуменне па асноўных пытаннях сучасных міжнародных адносін.

Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і КНР устаноўлены 20 студзеня 1992 г. У верасні 2022 г. на двухбаковай сустрэчы на палях саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва лідэры Беларусі і Кітая прынялі сумесную дэкларацыю аб вывадзе адносін на новы ўзровень – усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства.

Паміж бакамі створаны механізмы рэгулярных абменаў візітамі на вышэйшым і высокім узроўнях. Так, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка 13 разоў наносіў візіты ў Кітай.

Вядзецца актыўны міжпарламенцкі дыялог. У Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Усекітайскім сходзе народных прадстаўнікоў дзейнічаюць працоўныя групы па міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Таксама ажыццяўляецца супрацоўніцтва па лініі Міжнародны аддзел ЦК КПК – Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Функцыянуе Беларуска-Кітайскі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве, створаны ў 2014 г. Пасяджэнні Камітэта праводзяцца па чарзе раз на два гады. На рэгулярнай аснове сустракаюцца яго сустаршыні. Дынамічна развіваюцца міжведамасныя і міжрэгіянальныя беларуска-кітайскія кантакты.

Краіны паспяхова супрацоўнічаюць у міжнародных арганізацыях, аказваючы ўзаемную падтрымку па прынцыповых пытаннях.

Па выніках рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 31.08.2015 № 5 “Аб развіцці двухбаковых адносін Рэспублікі Беларусь з Кітайскай Народнай Рэспублікай” кожная вобласць і г. Мінск ужо маюць тры і больш пабрацімскія рэгіёны ў КНР, чым забяспечаны ахоп практычна ўсіх кітайскіх адміністрацыйных адзінак першага. ўзроўню.

Адным з важных напрамкаў далейшага ўмацавання двухбаковага палітычнага стратэгічнага супрацоўніцтва з'яўляецца ператварэнне Рэспублікі Беларусь у вядучага рэгіянальнага ўдзельніка ініцыятывы “Адзін пояс – Адзін шлях” уздоўж кантынентальнага моста паміж Еўропай і Азіяй (у 2019 г. праект ахопліваў 65 краін у Азіі, Еўропе і Афрыцы).

У рамках міждзяржаўнага кітайска-беларускага супрацоўніцтва паспяхова развіваецца праект “Вялікі камень”. На 1 лютага 2023 г. у індустрыяльным парку зарэгістраваны 104 рэзідэнты з 15 краін з агульным аб’ёмам заяўленых інвестыцый $1,32 млрд.

Дынамічна развіваюцца беларуска-кітайскія гандлёва-эканамічныя сувязі. Кітай традыцыйна ўваходзіць у тройку гандлёвых партнёраў Беларусі. За 2022 г. тавараабарот Беларусі і Кітая склаў $5,79 млрд. Асноўныя тавары экспарту:

[11] Беларусь и Россия // Министерство иностранных дел Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://mfa.gov.by/bilateral/russia/ © При использовании материалов сайта ссылка на МИД Беларуси обязательна

калійныя ўгнаенні, ялавічына, мяса і харчовыя субпрадукты свойскай птушкі, лесаматэрыялы, малако і вяршкі згушчаныя і сухія. Вядзецца актыўная работа па ўстараненню тэхнічных бар'ераў у гандлі. Па стане на 14 лютага 2023 г. у сістэме Галоўнага мытнага ўпраўлення КНР зарэгістраваны 172 экспартныя рэгістрацыйныя нумары для 149 беларускіх вытворцаў харчовай прадукцыі.

Актыўна развіваецца і інвестыцыйнае супрацоўніцтва з Кітаем. За кошт урадавых пазык Кітая па дзеючых крэдытных пагадненнях рэалізавана 25 праектаў на агульную суму каля $4,73 млрд, у стадыі рэалізацыі знаходзяцца 4 праекты на суму $2,26 млрд.

Актыўна развіваецца супрацоўніцтва ў сферы бяспекі, вайсковага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Беларусі і Кітая падпісана больш за 500 прамых дагавораў аб супрацоўніцтве. У 2022-2023 навучальным годзе ў Кітаі навучалася 477 беларускіх грамадзян, а ў Беларусі атрымлівалі адукацыю каля 6 тыс. грамадзян Кітая.[12]

Адзін з асноўных знешнепалітычных і знешнеэканамічных прыярытэтаў Беларусі – прадуктыўнае супрацоўніцтва з краінамі СНД і Грузіяй.

На якасна новы ўзровень выходзіць узаемадзеянне з краінамі "***далёкай дугі***" беларускай знешняй палітыкі – Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Важным напрамкам шматвектарнага знешнепалітычнага курса Беларусі з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва з дзяржавамі Паўднёвай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі.

Азіяцкі рэгіён уяўляе сабой безумоўны прыярытэт для Беларусі, у першую чаргу, як ёмісты, перспектыўны і хутка пашыраемы рынак для беларускіх тавараў і паслуг, як перспектыўны донар інвестыцый у эканоміку Беларусі. Краіны рэгіёну імпартуюць, у тым ліку, шырокі спектр прадукцыі, аналагічнай Рэспублікай Беларусь. Ёсць аб'ектыўныя перадумовы для папулярызацыі беларускіх тавараў і паслуг.

Асобныя краіны рэгіёну ўваходзяць у лік сусветных лідэраў па аб'ёме прамых інвестыцый за мяжу, што можа быць выкарыстана Рэспублікай Беларусь для развіцця перспектыўных галін нацыянальнай эканомікі.

Створаны механізмы ўзаемадзеяння на палітычным узроўні, наладжана міжпарламенцкае супрацоўніцтва, развіваецца дыялог у гандлёва-эканамічнай, прамысловай, навуковай-тэхнічнай, культурнай, адукацыйнай і іншых сферах. З дзяржавамі рэгіёну ў Беларусі сфарміравана трывалая дагаворна-прававая база супрацоўніцтва, якая прадаўжае развівацца, дапаўняючыся новымі пагадненнямі ў перспектыўных галінах супрацоўніцтва.

Беларусь паспяхова супрацоўнічае з дзяржавамі рэгіёну ў міжнародных арганізацыях, аказваецца ўзаемная падтрымка па прынцыповых пытаннях.

Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з 51 з 54 краін афрыканскага кантынента і ўсімі дзяржавамі блізкаўсходняга рэгіёну. У 9 краінах паспяхова працуюць беларускія дыпламатычныя прадстаўніцтвы.

[12] Лукашенко прибыл с государственным визитом в Китай // Белта [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.belta.by/president/view/lukashenko-napravilsja-s-gosudarstvennym-vizitom-v-kitaj-552822-2023/

Беларускія паслы акрэдытаваны па сумяшчальніцтве ў 19 краінах Афрыкі і Блізкага Усходу.

У сваю чаргу ў Рэспубліцы Беларусь 8 дзяржаў Афрыкі і Блізкага Усходу прадстаўлены на ўзроўні пасольстваў і 7 краін – на ўзроўні ганаровых консулаў. Цэлы шэраг паслоў (37 кіраўнікоў дыпмісій афрыканскіх і блізкаўсходніх дзяржаў з рэзідэнцыямі ў г. Маскве, а таксама ў г. Берліне) акрэдытаваны ў Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве.

Супадзенне пазіцый па большасці актуальных пытанняў міжнароднага парадку дня, блізкасць падыходаў па рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця садзейнічае пашырэнню супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з блізкаўсходнімі і афрыканскімі краінамі ва ўсіх галінах. Беларусь традыцыйна падтрымлівае адносіны дружбы і ўзаемнай падтрымкі з дзяржавамі Афрыкі і Блізкага Усходу ў розных універсальных міжнародных арганізацыях, перш за ўсё ААН і Руху недалучэння, а таксама мае статус наглядальніка ў буйнейшых рэгіянальных арганізацыях – Афрыканскім саюзе і Лізе арабскіх дзяржаў. Супрацоўніцтва з прыярытэтнымі партнёрамі на Блізкім Усходзе і ў Афрыцы – Егіптам, Зімбабвэ, Ізраілем, Сірыяй, ПАР, краінамі Аравійскага паўвострава – захоўвае сваю станоўчую дынаміку. Абмен візітамі на вышэйшым і высокім узроўні, які рэгулярна ажыццяўляецца, пазітыўна ўплывае на развіццё двухбаковага супрацоўніцтва з краінамі рэгіёну.

Асаблівае значэнне для Рэспублікі Беларусь з яе экспартаарыентаванай эканомікай захоўвае “эканамічная дыпламатыя”.

Ключавым напрамкам супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з дзяржавамі Афрыкі ў гандлёва-эканамічнай сферы з’яўляецца пашырэнне экспарту прадукцыі і паслуг. Вядзецца сістэмная работа па асваенні новых рынкаў на афрыканскім кантыненце.

У той жа час найбольш перспектыўным напрамкам узаемадзеяння з краінамі Персідскага заліва і Ізраілем з’яўляецца развіццё інвестыцыйнага супрацоўніцтва. Прапрацоўваюцца і рэалізуюцца сумесныя інвестпраекты ў галіне стварэння новых вытворчасцей, будаўніцтва, сельскай гаспадаркі, гасцінічнага бізнесу, гандлю і інш.

У шэрагу краін рэгіёну ўжо створаны сумесныя прадпрыемствы па вытворчасці сучаснай аўтамабільнай і трактарнай тэхнікі па беларускіх тэхналогіях.

Беларускія прадпрыемствы і арганізацыі актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных выставах і кірмашах, якія праводзяцца ў краінах Афрыкі і Блізкага Усходу.

Нарошчванне супрацоўніцтва з дзяржавамі Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна, а таксама буйнейшымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі гэтага рэгіёну адпавядае доўгатэрміновай мэце забеспячэння збалансаванай знешняй палітыкі Беларусі.

Лацінская Амерыка прадстаўляе цікавасць для нашай краіны як важная платформа інтэграцыі ў сусветныя гандлёва-гаспадарчыя сувязі. Эканомікі Беларусі і вядучых краін гэтага рэгіёну структурна дапаўняюць адна адну.

Пасля ўстанаўлення ў 2019 г. дыпламатычных адносін з Садружнасцю Багамскіх астравоў і Барбадосам Беларусь падтрымлівае дыпламатычныя адносіны з усімі 33 дзяржавамі Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна.

Беларускія пасольствы дзейнічаюць у Аргенціне, Бразіліі, Венесуэле, Калумбіі і на Кубе. Большасць кіраўнікоў беларускіх дыпламатычных місій, акрамя краін свайго пастаяннага знаходжання, акрэдытаваны па сумяшчальніцтве ў суседніх дзяржавах. Дзякуючы гэтаму Беларусь ужо зараз афіцыйна прадстаўлена ў большасці найважнейшых краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна.

Цяпер асноўныя знешнепалітычныя намаганні Беларусі ў Лацінскай Амерыцы сканцэнтраваны на замацаванні палітычнага дыялога з прыярытэтнымі партнёрамі, а таксама на выбудоўванні плённых гандлёва-эканамічных адносін з іншымі найбольш перспектыўнымі краінамі рэгіёну.

Такім чынам, Беларусь праводзячы шматвектарную знешнюю палітыку, імкнецца расшыць і паглыбіць супрацоўніцтва са сваімі стратэгічнымі партнёрамі – Расіяй і Кітаем.

**4. Беларусь у інтэграцыйных супольнасцях. Саюзная дзяржава Расіі і Беларусі**

Рэспубліка Беларусь з’яўляецца актыўным удзельнікам Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД) – рэгіянальная міждзяржаўная арганізацыя, галоўнай мэтай якой з’яўляецца супрацоўніцтва ў палітычнай, эканамічнай, экалагічнай, гуманітарнай, культурнай і іншых галінах паміж шэрагам краін, якія некалі ўваходзілі ў склад СССР.

СНД створана 8 снежня 1991 г. кіраўнікамі Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Украіны, якія падпісалі Пагадненне аб яго стварэнні. Праз два тыдні, 21 снежня 1991 г. у Алма-Аце часткі адзінаццаці суверэнных дзяржаў (акрамя прыбалтыйскіх дзяржаў і Грузіі, якая была членам СНД у 1993–2009 гг.) падпісалі Пратакол да гэтай Дамовы ў якім падкрэслілі, што паказаныя краіны на раўнапраўных пачатках утвараюць Садружнасць Незалежных Дзяржаў. Удзельнікі сустрэчы аднадушна прынялі Алма-Ацінскую Дэкларацыю, якая пацвердзіла прыхільнасць былых саюзных рэспублік да супрацоўніцтва ў розных галінах знешняй і ўнутранай палітыкі, што абвясціла гарантыі выканання міжнародных абавязацельстваў былога Саюза ССР.

У г. Мінску размяшчаецца штаб-кватэра Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У сталіцы Беларусі неаднаразова прымаліся лёсавызначальныя для ўсіх дзяржаў Садружнасці рашэнні. Так, 22 студзеня 1993 г. у Менску на саміце СНД быў прыняты Статут Садружнасці. Яго не падпісалі Украіна і Туркменістан, якія тым самым дэ-юрэ не з’яўляюцца дзяржавамі – членамі СНД, а могуць быць аднесены толькі да дзяржаў – заснавальніц і дзяржаў – удзельніц Садружнасці.

Рэспубліка Беларусь з’яўляецца актыўным удзельнікам ***Еўразійскага эканамічнага саюза***. Гэтая арганізацыя найбуйнейшая у свеце па ахопе

тэрыторыі (20,3 млн. км$^2$) на постсавецкай прасторы. Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе падпісаны прэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстан і Расійскай Федэрацыі 29 мая 2014 г. у г. Астане. Дагавор набыў моц 1 студзеня 2015 г. 2 студзеня 2015 г. членам Саюза стала Рэспубліка Арменія, 12 жніўня 2015 г. – Кыргызская Рэспубліка.

Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе прадугледжвае дасягненне некалькіх мэт: 1) стварэнне ўмоў для стабільнага развіцця эканомік дзяржаўчленаў у інтарэсах павышэння жыццёвага ўзроўню іх насельніцтва; 2) імкненне да фарміравання адзінага рынку тавараў, паслуг, капіталу і працоўных рэсурсаў у рамках ЕўрАзЭС; 3) усебаковая мадэрнізацыя, кааперацыя і павышэнне канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік ва ўмовах глабальнай эканомікі.

З 1 кастрычніка 2016 г. рэалізуецца Пагадненне аб свабодным гандлі паміж ЕўрАзЭС і В’етнамам. У 2018 г. падпісаны Пагадненне аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ЕўрАзЭС з Кітаем і Часовае пагадненне, якое вядзе да ўтварэння зоны свабоднага гандлю Саюза з Іранам (уступілі ў сілу ў 2019 г.). 25 кастрычніка 2019 г. падпісана пагадненне аб свабодным гандлі з Сербіяй.

Трэба заўважыць, што ўдзел Беларусі ў інтэграцыйным аб’яднанні ЕўрАзЭС прывёў да прыкметнага паляпшэння многіх эканамічных паказчыкаў. Правядзенне ўзгодненай палітыкі ў рамках ЕўрАзЭС дазволіла Беларусі ўмацаваць прамысловы патэнцыял і развіць кааперацыйныя сувязі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў і спадарожную інфраструктуру. Беларусь пашырыла эканамічныя сувязі з трэцімі краінамі, абараніла інтарэсы беларускіх вытворцаў на знешнім рынку.

Рэспубліка Беларусь удзельнічае ў АДКБ (Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы) – рэгіянальнай міжнароднай арганізацыі, створанай у 2002 г. і заснаванай на Дагаворы аб калектыўнай бяспецы 1992 г. Заўважым, што Беларусь далучылася да Дагавора аб калектыўнай бяспецы 31 снежня 1993 г. – праз паўтара гады пасля падпісання дагавора шасцю першапачатковымі ўдзельнікамі (Арменіяй, Казахстанам, Кыргызстанам, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам).

Ключавымі задачамі АДКБ з’яўляюцца забеспячэнне нацыянальнай і калектыўнай бяспекі, паглыбленне ваенна-палітычнага ўзаемадзеяння, каардынацыя знешнепалітычных пазіцый па міжнародных і рэгіянальных праблемах бяспекі, умацаванне шматбаковых механізмаў супрацоўніцтва, уключаючы ваенны складальнік, развіццё супрацоўніцтва па процідзеянні сучасным выклікам і пагрозам бяспецы.

Трэба заўважыць, што ў рамках АДКБ Беларусь набывае ўзбраенні, ваенную і іншую спецыяльную тэхніку на льготных умовах (не па экспартных, а па ўнутраных цэнах), хоць большая частка ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Мінскам і Масквой адбываецца на двухбаковай аснове. Паводле ацэнак

беларускага ўрада, у выпадку выхаду з АДКБ прамыя страты для абароннай прамысловасці Беларусі штогод склалі б $300–350 млн.[13]

Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя з'яўляюцца дзяржавамі – удзельніцамі *Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы* ад 8 снежня 1999 г. Дзякуючы яго рэалізацыі беларуская эканоміка атрымала значныя перавагі ад цеснага супрацоўніцтва ў розных сферах. Стварэнне зоны свабоднага гандлю і ўніфікацыя мытных тарыфаў павялічылі ёмістасць рынку для беларускіх прадпрыемстваў і забяспечылі нарошчванне беларускага экспарту ў напрамку асноўнага рынку збыту беларускай прадукцыі. Стварэнне агульнага рынку працы пашырыла для грамадзян Беларусі магчымасці рэалізацыяй свайго працоўнага патэнцыялу на абшарах Саюзнай дзяржавы. Даступнасць расійскай адукацыі для беларускай моладзі, у тым ліку і ў найлепшых ВНУ свету, на бюджэтнай аснове павышае ўзровень кваліфікацыі спецыялістаў, занятых і ў беларускай эканоміцы.

Працэс аб'яднання транспартных сістэм адбіўся на скарачэнні бар'ераў пры ажыццяўленні міжнародных перавозак, прыцягваючы міжнародных перавозчыкаў на транспартныя шляхі Беларусі.

Супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы дае Беларусі магчымасці забеспячэння патрэбнасцей унутранага рынку ў энергарэсурсах і з'яўляецца асновай эканамічнай бяспекі рэспублікі.

Фарміраванне адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы дае магчымасць паскорыць мадэрнізацыю эканомікі і павышае ўзровень інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Правядзенне ўзгодненай макраэканамічнай палітыкі стымулявала маштабнае выйсце беларускіх прадпрыемстваў на расійскі рынак і развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва дзвюх краін. Гэта дало магчымасць беларускім прадпрыемствам наладжваць кааперацыйныя сувязі з расійскімі кампаніямі, павышаючы эканамічную эфектыўнасць гаспадарчай дзейнасці. У 2023 г. у Беларусі працуе больш за дзве тысячы арганізацый з удзелам расійскага капіталу.

Такім чынам, Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам шэрага інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы: уваходзіць у СНД, АДКБ і ЕўрАзЭС, а таксама будуе Саюзную дзяржаву з Расіяй.

---

[13] Потери для оборонной промышленности Беларуси при выходе из ОДКБ будут $300-350 млн ежегодно – Головченко // Белта. – Режим доступа : https://www.belta.by/economics/view/poteri-dlja-oboronnoj-promyshlennosti-belarusi-pri-vyhode-iz-odkb-budut-300-350-mln-ezhegodno-403568-2020/

# 2. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЕЛ

## 2.1. Тэматычныя планы практычных заняткаў

Семінар 1. **Вялікае княства Літоўскае – поліэтнічная феадальная дзяржава Усходняй Еўропы**

1. Прычыны і асноўныя канцэпцыі ўзнікнення ВКЛ.
2. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ, аб’яднанне беларускіх зямель у яго складзе.
3. Барацьба за аб’яднанне Русі. Адносіны з Ордэнам і Залатой Ардой.
2. Крэўская ўнія і вестэрнізацыя сацыяльна-палітычных інстытутаў. Магдэбургскае права.
3. Прававое і палітычнае значэнне Люблінскай уніі.
4. Становішча беларускіх земляў у складзе Рэчы Паспалітай. Паланізацыя і “шляхецкая дэмакратыя” як фактары палітычнага, культурнага і грамадскага развіцця дзяржавы.
5. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай, прычыны палітычнага крызісу.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Дзяржаўнасць як сацыяльна-палітычны і культурны феномен.
- ✓ Ключавыя пытанні гісторыі беларускай дзяржаўнасці.
- ✓ Крыніцы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці.
- ✓ Агульнаруская ідэя і барацьба за аб’яднанне Русі.
- ✓ Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях. Старажытная Русь.
- ✓ Вадохрышча Русі як фактар цывілізацыйнага выбару.
- ✓ Месца ўсходнеславянскіх земляў у сістэме сярэднявечных міжнародных адносін.

Літаратура:

Верашчагіна, А. Гісторыя канфесій у Беларусі : мінулае і сучаснасць / А. Верашчагіна, А. Гурко. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 157 с.

Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) : манаграфія / І. У. Вішнеўская. – Мінск, 2008. – 296 с.

Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён) : вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо ; пад рэд. А. Ф. Вішнеўскага; Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Акадэмія МУС. – Мінск, 2003. – 319 с.

Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т. 1 : Старажытная Беларусь : ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал. : М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 351 с.

Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам. У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Вышэйшая школа, 2006. – 416 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

История белорусской государственности : в 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2018. – 598 с.

Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапаможнік : у 2 ч. / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск: БДУ, 2004.

Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапамож. / Я. А. Юхо. У 2 ч. Ч. 1. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 352 с.; Ч. 2. – 2003.

## Семінар № 2. **Беларусь у складзе Расійскай імперыі**

1. Раздзелы Рэчы Паспалітай.
2. Русіфікацыя і дэпаланізацыя. Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст.
3. Паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі.
4. Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі.
5. Заходнерусізм і краёвасць. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі.
6. Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Беларусі.
7. "Наша ніва" і беларуская нацыянальная ідэя ў пачатку XX ст. Актывізацыя нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Пытанне дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі першай паловы XIX ст.
- ✓ Актывізацыя нацыянальнага руху ў гады Першай сусветнай вайны.
- ✓ Першая сусветная вайна на белорускіх землях.

Літаратура:


Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пач. XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 1 / А.А. Каваленя [і інш.]. Рэд. кал. А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 584 с.

Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 573 с.

История белорусской государственности : в 5 т. Т. 2. Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н.В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома: Н.В. Смехович, А.В. Унучек, Е.Н. Филатова ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 413 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: Ігар Аляксандравіч Марзалюк, Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, Сяргей Мікалаевіч Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

Семінар № 3. **Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў XX стагоддзі**

1. Рэвалюцыі 1917 г. і беларускае пытанне.
2. Усебеларускі з'езд 1917 г. Абвяшчэнне БНР.
3. Стварэнне ССРБ. ЛітБелССР. Другое абвяшчэнне беларускай рэспублікі на савецкай аснове.
4. Польска-савецкая вайна. Рыжскі мірны дагавор 1921 г., яго наступствы для беларускай дзяржаўнасці.
5. Фарміраванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Асаблівасці нацыянальна-дзяржаўнай мадэлі СССР.
6. Стварэнне ў БССР індустрыяльна-аграрнай рэспублікі ў 20-я - 30-я гг. XX ст.
7. Фарміраванне межаў і адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад БССР у 1919–1939 гг.
8. Супярэчнасці ў развіцці сацыяльна-культурнай сферы БССР у 1920-я – 1930-я гг.
9. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1950-х - першай палове 1960-х гг.
10. Нарастанне застойных з'яў у 1970-я – першай палове 1980-х гг. Грамадска-палітычныя працэсы ў БССР на мяжы 80-90-х гг. XX ст.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Белнацкім і яго роля ў стварэнні БССР.
- ✓ Рэалізацыя нацыянальна-дзяржаўнай мадэлі развіцця ў 1920-я гг.
- ✓ Дасягненні і трагедыі савецкай эпохі.
- ✓ Фарміраванне тэрытарыяльных граніц і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання БССР у 1919 – 1945 гг.
- ✓ Пасляваенная мадэрнізацыя ў БССР.

Літаратура:

Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стст. : Курс лекцый / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 656 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: Ігар Аляксандравіч Марзалюк, Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, Сяргей Мікалаевіч Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2018. – 573 с.

Круталевич, В. А. История Беларуси : становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В. А. Круталевич. – 2-е изд., доп. – Минск : Право и экономика, 2003. – 585, [3] с.

Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам : станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.

## Семінар № 4. **Вялікая Айчынная вайна - ключавая падзея найноўшай гісторыі**

1. Прычыны і пачатак Другой сусветнай вайны.
2. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
3. Напад нацысцкай Германіі на СССР.
4. Акупацыйны рэжым у Беларусі і палітыка генацыду. Дэмаграфічныя страты Беларусі ў вайне.
5. Партызанскі і падпольны рухі ў Беларусі.
6. Вызваленне Беларусі. Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён".
7. Уклад беларускага народа ў Перамогу. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Удзел беларусаў у ключавых бітвах Вялікай Айчыннай вайны.
- ✓ Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя "Баграціён" – выбітнае дасягненне савецкага ваеннага мастацтва.
- ✓ БССР – краіна-заснавальніца ААН.

Літаратура:

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: Ігар Аляксандравіч Марзалюк, Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, Сяргей Мікалаевіч Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

Великая Отечественная война Советского народа (в контексте Второй мировой войны) : пособие для учреждений общ. сред. образования с бел. и рус. языками обучения / А. А. Коваленя [и др.] ; под ред. А. А. Ковалени. – Минск : Изд. центр БГУ, 2020. – 231 с. : ил., карт.

Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапаможік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / А. А. Каваленя і інш. – Мінск : Выд. цэнтр Беларус. дзярж. ун-та, 2004. – 278, [1] с.

Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск : Беларуская навука, 2016. – 495 с.

## Семінар № 5. **Этапы развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

1. Распад СССР і яго прычыны. Палітычны і гаспадарчы крызіс першых год незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
2. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і першыя выбары Прэзідэнта. Прэзідэнцкая рэспубліка – выбар беларускага народа.
3. Развіццё інстытута кіраўніка дзяржавы ў гістарычнай рэтраспектыве (манархічная ўлада, вышэйшае кіраўніцтва ў савецкі перыяд).
4. Парадак выбараў, функцыі і паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
5. Рэферэндумы 1995, 1996, 2004 гг., іх уплыў на стабілізацыю абстаноўкі ў краіне.
6. Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця Беларусі ў XXI ст.
7. Сучасныя дасягненні беларускай дзяржавы.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Фарміраванне прававых традыцый у Беларусі.
- ✓ Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
- ✓ Асаблівасці грамадска-палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI ст.
- ✓ Асаблівасці манархічнай формы праўлення.
- ✓ Спецыфіка партыйна-дзяржаўных узаемаадносін у савецкі час.
- ✓ Функцыі і паўнамоцтвы кіраўніка дзяржавы як гаранта захавання Канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян.

Літаратура:


Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) : манаграфія / І. У. Вішнеўская. – Мінск, 2008. – 296 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: Ігар Аляксандравіч Марзалюк, Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, Сяргей Мікалаевіч Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

История белорусской государственности : в 5 т. Т. 5. Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX — начало XXI в.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н. В. Смехович; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. — Минск : Беларуская навука, 2020. — 759 с. : ил.

Становление и развитие белорусской государственности / А. Г. Кохановский и др. – Минск : Белорусский государственный университет, 2011. – 42, [2] с.

Семінар № 6. **Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні**

8. Гістарычныя формы выканаўчай улады ў Старажытнай Русі, ВКЛ, Расійскай імперыі. Савет Народных Камісараў і далейшае развіццё выканаўчай улады ў савецкі час.
9. Урад як вышэйшы орган выканаўчай улады, яго функцыі і задачы. Структура Урада Рэспублікі Беларусь. Прэм’ер-міністр.
10. Гістарычныя формы заканадаўчай улады на беларускіх землях: веча, сейм, Дзяржаўная дума. Савецкая форма народнага прадстаўніцтва: ЦВК і Вярхоўны Савет.
11. Нацыянальны сход – двухпалатны парламент у суверэннай Беларусі. Структура і функцыі Рады Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў.
12. Гістарычныя формы судовых органаў у айчыннай гісторыі. Судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь.
13. Гісторыя развіцця палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі (канец XIX ст. – 1990 г.).
14. Пераход да шматпартыйнасці. Нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб'яднанняў у Беларусі.
15. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні ў Рэспубліцы Беларусь, іх тыпалагізацыя, роля ў развіцці грамадства і дзяржавы.

Тэмы рэфератаў:

- ✓ Прыняцце Канстытуцыі і першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
- ✓ Канстытуцыя як асноўны закон дзяржавы.
- ✓ Трансфармацыя форм урадавай улады ў Беларусі.
- ✓ Функцыі і задачы сучаснага ўрада.
- ✓ Асноўныя службовыя асобы цэнтральнага апарата ў ВКЛ.
- ✓ Нацыянальны сход як працяг традыцый двухпалатнага парламента ў суверэннай Беларусі.
- ✓ Віды і паўнамоцтвы сучасных судоў у Рэспубліцы Беларусь.
- ✓ Беларускія дэпутаты ў Дзяржаўных Думах Расійскай імперыі.
- ✓ Тыпалагізацыя палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы.

Літаратура:

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І. М. Абрамаў [і інш.]; пад рэд. А. П. Вайтовіч [і інш.]. – Мінск : “Беларуская энцыклапедыя”, 2000. – 429 с.

Василевич, Г. А. Конституция Республики Беларусь. Научно-практический комментарий / Г. А. Василевич. – Минск, 2005. – 486 с.

Васілевіч, Р. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р. А. Васілевіч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо. – Мінск : Права і эканоміка, 2001. – 362 с.

Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) : манаграфія / І. У. Вішнеўская. – Мінск, 2008. – 296 с.

Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзён) : вучэб. дапаможнік / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо ; пад рэд. А. Ф. Вішнеўскага; Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Акадэмія МУС. – Мінск, 2003. – 319 с.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: Ігар Аляксандравіч Марзалюк, Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі, Сяргей Мікалаевіч Ходзін, Д.У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г.Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск : Маладзёжнае навуковае супрацоўніцтва, 2002. – 248 с.

Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. – 3-е выд. – Мінск : Амалфея, 2009. – 399 с.

Лукашенко, А. Г. Исторический выбор Беларуси : Лекция Президента Республики Беларусь в Белорусском государственном университете, Минск, 14 марта 2003 г. – Минск : БГУ, 2003. – 45, [2] с.

Малиновский, В. И. История белорусской государственности : Учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипломного образования / В. И. Малиновский. – Минск : Беларусь, 2003 – 199 с.

Основы идеологии белорусского государства : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования / В. А. Мельник. – 3-е изд., исправленное. – Минск : Вышэйшая школа, 2013. – 342, [1] с.

Проблемы формирования белорусской государственности в XX – начале XXI века : избранные труды Н. С. Сташкевича / под науч. редак. А. Н. Данилова, В. С. Кошелева. – Минск : РИВШ, 2012. – 240 с.

Сороковик, И. А. Особенности становления государственности Беларуси на советской основе и подготовка Конституции 1927 г. : монография И. А. Сороковик. – Минск : А.Н. Вараксин, 2020. – 178 с.

Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапамож. / Я. А. Юхо. У 2 ч. Ч. 1. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 352 с.; Ч. 2. – 2003.

Яковчук, В. И. Теория и практика государственного управления : история развития: пособие / В. И. Яковчук. – Минск : Акад. упр. при Президенте Республики Беларусь, 2016. – 164 с.

